Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

**А.Л. Міхайлава**

# ЭТНАПЕДАГАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ ВА ЎМОВАХ ПОЛІКУЛЬТУРНАГА СОЦЫУМУ: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

***Манаграфія***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2018*

УДК 37.035.6:364:378.14
ББК 74.65+74.489.86
М69

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 6 ад 27.06.2018 г.

Адобрана навукова-тэхнічным саветам ВДУ імяП.М. Машэрава. Пратакол № 6 ад 25.05.2018 г.

Аўтар: дацэнткафедры сацыяльна-педагагічнай работы ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат педагагічных навук**А.Л. Міхайлава**

Рэцэнзенты:
загадчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы
ВДУ імя П.М. Машэрава,доктар педагагічных навук,
прафесар*Г.П. Арлова*;
дэкан факультэта перападрыхтоўкі кадраў па педагогіцы і псіхалогіі
УА “ВДМУ”,доктар педагагічных навук*З.С. Кунцэвіч*

**Міхайлава, А.Л.**

**М69** Этнапедагагічная падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах полікультурнага соцыуму: тэарэтыка-метадалагічны аспект:манаграфія / А.Л. Міхайлава. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2018. – 158 с.
ISBN 978-985-517-680-1.

Манаграфія змяшчае вынікі навуковага даследавання праблемы этнапедагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах полікультурнага соцыуму ў тэарэтыка-метадалагічным асвятленні.

Адрасавана студэнтам, магістрантам, аспірантам, выкладчыкам, а таксама тым, хто цікавіцца пытаннямі актуалізацыі этнапедагагічнага патэнцыялу ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў.

**УДК 37.035.6:364:378.14**
**ББК 74.65+74.489.86**

**ISBN 978-985-517-680-1**

© Міхайлава А.Л., 2018
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2018

Репозиторий ВГУ

# УВОДЗІНЫ

У навуковым выданні пададзены тэарэтыка-метадалагічныя асновы этнапедагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах полікультурнага соцыуму.

Значнасць вывучэння дадзенай праблемы прадыктавана шэрагам абставін, што склаліся ў сучасным грамадстве, паколькі яны аказваюць істотны ўплыў на сістэму прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы.Сучасныя пераўтварэнні ў сусветнай прасторы карэнным чынам змянілі структуру еўрапейскага грамадства ў накірунку яго дэмакратызацыі, этнічнай талерантнасці і полікультурнасці. Вынікі такіх пераўтварэнняў закранулі ў тым ліку і сацыяльную прастору Рэспублікі Беларусь. Дадзеныя абставіны прывялі да неабходнасці актывізацыі нацыянальнай самасвядомасці прадстаўнікоў этнічных груп, народаў у новых сацыяльна-культурных умовах, вызначылі мэтазгоднасць і патрэбу ў распрацоўцы сістэмы каштоўнасцей, сэнсу і прызначэння полікультурнай адукацыі.

У межах полікультурнай прасторы і сучаснай сацыяльна-культурнай, сацыяльна-педагагічнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, што характарызуюцца сацыяльнай ізаляцыяй, маргіналізаванасцю і недастатковай адаптаванасцю пэўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва да новых сацыяльна-культурных каштоўнасцей, узнікае вострая патрэба падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы, здольных не толькі прафесійна вырашаць многія сацыяльныя праблемы прадстаўнікоў розных этнічных груп і народаў, але і паспяхова камунікаваць і знаходзіць агульную мову з імі. У сваю чаргу, паспяховая камунікацыя ў межах прафесійнага ўзаемадзеяння залежыць не толькі ад ведання асаблівасцей культур іншых народаў нашай шматнацыянальнай дзяржавы, але і ўзроўню этнічнасці самога спецыяліста сацыяльнай сферы і наяўнасці ў яго этнапедагагічных ведаў і ўменняў.

Мэтазгоднасць распрацоўкі і апрабацыі праграмы пацвярджаецца, у тым ліку, і праз наяўнасць наступных супярэчнасцей: паміж сацыяльным і дзяржаўным заказам на самаразвіццё, творчую і прафесійную самарэалізацыю выпускнікоў ВНУ і недастатковай распрацаванасцю канцэптуальных асноў станаўлення будучага спецыяліста для работы ва ўмовах полікультурнага соцыуму, а таксама несістэмнай практыкай стварэння неабходных і дастатковых умоў для індывідуалізацыі працэсу прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў з улікам іх этнічнай / нацыянальнай прыналежнасці; паміж патрабаваннем гарманічнага развіцця кампанентаў полікультурнага асяроддзя, у якім функцыянуе і развіваецца складанаарганізаваная сістэма ВНУ, і фрагментарным, падчас стыхійным, падыходам да яе стварэння ў рэгіёне альбо, наогул, падтрымка працэсаў глабалізацыі.

Рэпазіторый ВГУ

Метадалагічную аснову даследавання складаюць навуковыя прынцыпы комплекснага і сістэмнага падыходаў (Б.Г. Ананьеў, У.А. Барабаншчыкаў, А.У. Брушлінскі, Б.Ф. Ломаў, С.Л. Рубінштэйн, У.Д. Шадрыкаў); дзейнаснага, суб'ектна-дзейнаснага і асобасна арыентаванага падыходаў (К.А. Абульханава-Слаўская, Л.С. Выгоцкі, В.В. Давыдаў, А.М. Лявонцьеў, А.В. Мудрык, В.А. Пятроўскі, К.К. Платонаў,В.І. Слабодчыкаў).

Тэарэтычным базісам выступаюць разуменне індывідуальнасці асобы студэнта як яе непаўторнасці і ўнікальнасці (Г.С. Абрамава,Б.Г. Ананьеў, Б.С. Братусь, У.П. Зінчанка,В.С. Мерлін, В.І. Слабодчыкаў, С.Л. Франк, М.А. Халодная); уяўленні пра сутнасць і механізм самавызначэння асобы, яе сацыялізацыі (К.А. Абульханава-Слаўская, Л.І. Анцыферава,Р. Бернс, Л.І. Бажовіч, Л.С. Выгоцкі, В.В. Давыдаў, А.М. Лявонцьеў, А.В. Мудрык, В.А. Пятроўскі, С.Л. Рубінштэйн, І.Д. Фрумін); канцэпцыі культураадпаведнасці адукацыі (К.А. Аляксандрава, І.Я. Відт, Э.У. Загвязінская, Н.Б. Крылова, С.А. Пілюгіна, Л.В. Школяр); канцэпцыя этнапедагагічнай адукацыі і пераемнасці народнай і навуковай педагогікі (Г.П. Арлова, Г.Н. Волкаў, М.І. Стэльмаховіч, Я.І. Сяваўка, Я.І. Ханбікаў, А.П. Хінтыбідзэ, А.Л. Хрыстава); даследаванне міжкультурнага ўзаемадзеяння і этнакультурнай кампетэнтнасці (В.В. Грыцэнка, Л.П. Косцікава, Н.М. Лебедзева, Т.В. Паштарова, Я.М. Рэзнікаў, Т.М. Смотрава, Т.Г. Стэфаненка, А.М. Татарка, Г.Г. Філіпчук, Н.Я. Шустава).

Нягледзячы на наяўнасць шэрага канцэпцый, тэорый, што закранаюць праблему прафесійнага станаўлення спецыяліста ва ўмовах полікультурнай прасторы, фундаментальнага даследавання, якое б закранала пытанні этнапедагагічнай падрыхтоўкібудучага спецыяліста сацыяльнай сферы для эфектыўнай работы ва ўмовах полікультурнага соцыуму, да цяперашняга часу няма. Варта адзначыць, што грунтоўнай падставай для з'яўлення манаграфіі паслужыў удзел у якасці выканаўцы ў сумесных з НАУ ВПА "Смаленскі гуманітарны ўніверсітэт" навуковых праектах "Поликультурная среда вуза как условие реализации индивидуальной траектории профессионального становления будущего специалиста" (2010–2012 гг.), "Русский и белорусский фольклор как фактор формирования этнической идентичности детей младшего школьного возраста в поликультурном социуме" (2014–2017 гг.), а таксама навукова-даследчая работа ў якасці выканаўцы па дзяржаўнай праграме"Этнокультура как детерминанта, определяющая успешность профессиональной подготовки будущих специалистов социальной сферы в поликультурном социуме: этнопедагогический аспект" (2016–2020 гг.), якая працягваецца і зараз. Усё вышэйзгаданае і прадвызначыла выбар тэмы даследавання "Этнапедагагічная падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах полікультурнага соцыуму:

Репозиторий ВГУ

тэарэтыка-метадалагічны аспект”. Намі ў межах дадзенага навуковага выдання былі пастаўлены наступныя задачы:

1) абгрунтаваць сукупнасць палажэнняў, што складаюць тэарэтыка-метадалагічную аснову даследавання праблемы этнапедагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме;

2) вызначыць і ахарактарызаваць параметры дыягнаставання ўзроўню падрыхтаванасці да прафесійнай дзейнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме ў кантэксце іх этнапедагагічнай падрыхтоўкі;

3) распрацаваць навукова абгрунтаваную мадэль этнапедагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме.

Манаграфія можа быць выкарыстана ў сферы прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы да работы ў полікультурнай прасторы рэгіёнаў, перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыйнай і сацыяльнай сфер, у сістэме сацыяльнай абароны насельніцтва, а таксама ў дзейнасці сацыяльна-педагагічных і псіхалагічных службаў устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь. Манаграфія таксама адрасаванавыкладчыкам устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў для сацыяльнай і адукацыйнай сфер, аспірантам, магістрантам, студэнтам, а таксама тым, хто цікавіцца пытаннямі актуалізацыі этнапедагагічнага патэнцыялу ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў.

Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 1

## ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ПРАБЛЕМЫ ЭТНАПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ Ў ПОЛІКУЛЬТУРНЫМ СОЦЫУМЕ

### 1.1. Паняційна-тэрміналагічны апарат даследавання праблем этнапедагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме

Пачатак XXI стагоддзя азнаменаваўся высокімі тэмпамі эвалюцыйных сацыяльных змен, што выявілі тэндэнцыю накіраванасці на чалавека ў прафесійнай дзейнасці арганізацый як у агульнадзяржаўным маштабе, так і ў лакальным: “арыентацыя на чалавека і яго дзейнасць – аснова поспеху арганізацый і эканамічнага росту цывілізаваных краін” [15, с. 11].Сутнасць праблемы, якая закранула многія арганізацыі і краіны ў 90-я гады XX стагоддзя, заключалася ў тым, што чалавек не паспяваў адаптавацца да тых змен, якія былі ўнесены ў дадзены свет іншымі людзьмі. Таму “генезіс крызісу, яго крыніцы знаходзяцца ўнутры чалавечай дзейнасці” [15, с. 12].

Паняцце “дзейнасць” азначае, згодна з дакладнай трактоўкай М.П. Бяляцкага, “працэс стварэння чалавекам умоў для свайго існавання і развіцця або выкарыстання дадзеных умоў для пераўтварэння знешняга асяроддзя ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі той арганізацыі, з якой звязана яго дзейнасць” [15, с. 12]. Так, дзейнасць выступае, з аднаго боку, як праяўленне пэўнага віду працы – разумовай ці фізічнай, а з другога боку, як адзін з механізмаў фарміравання чалавека і інтэгральная характарыстыка развіцця арганізацыі, якую прадстаўляе чалавек.

Характарызуючы ўвогуле дзейнасць чалавека ў арганізацыях сацыяльнай сферы, трэба адзначыць, што спецыялісты па сацыяльнай рабоце і сацыяльныя педагогі выступаюць своеасаблівымі пасрэднікамі паміж канкрэтным чалавекам, які адчувае патрэбу ў пэўным відзе дапамогі, яго сям’ёй, другімі спецыялістамі, установамі і грамадствам у цэлым. А.А. Чарнецкая, аўтар падручніка па тэхналогіях сацыяльнай работы, справядліва зазначае, што ў цяперашні час “прафесіяналізм, што раней трактаваўся толькі як валоданне канкрэтнай прафесіяй і дастаткова поўна інтэрпрэтаваўся ў межах функцыяналісцкага падыходу, цяпер часта не абмяжоўваецца ведамі тонкасцей прафесіі, а прадугледжвае сістэмныя да яе адносіны і наяўнасць шэрага якасцей (атрыбутаў), якія забяспечваюць дадзеныя адносіны на ўзроўні практыкі” [142, с. 3–4]. У якасці такіх атрыбутаў аўтар называе сацыяльную крэатыўнасць і прафесійную талерантнасць. Дадзеныя атрыбуты, з аднаго боку, з’яўляюцца своеасаблівымі новаўтварэннямі ментальнасці прадстаўнікоў

Рэпазіторый ВДУ

кожнага з народаў і народнасцей, з другога боку, маюць тэндэнцыю да ўніверсалізацыі.

Адна з мэт работы – аперацыяналізацыя паняцця “прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме, дэтэрмінаваная этнапедагагічнайкампетэнтнасцю”.

Канцэптуальнай асновай даследавання з’явіліся філасофска-метадалагічны аналіз кампетэнтнаснай парадыгмы ў адукацыі (А.Л. Андрэеў) [3]; кампетэнтнасны падыход у вывучэнні адукацыйных стандартаў (В.Л. Жук, В.В. Краеўскі, А.В. Хутарскі) [40], [71], [154]; глабалізацыя і нацыяналізацыя ў фарміраванні прафесійнай кампетэнтнасці спецыяліста сацыяльнай сферы (А.А. Баўэр, У.П. Барысенкаў, Н.Ю. Кліменка) [12], [60].

Паняцце “кампетэнтнасць” уключае ў сябе складаны, ёмісты змест, што інтэгруе прафесійныя, сацыяльна-педагагічныя, сацыяльна-псіхалагічныя, прававыя і іншыя характарыстыкі. У абагуленым выглядзе кампетэнтнасць спецыяліста прадстаўляе сабой сукупнасць здольнасцей, якасцей і ўласцівасцей асобы, неабходных для паспяховай прафесійнай дзейнасці ў пэўнай сферы. Згодна з меркаваннем Н.Ю. Кліменка, “крытэрыем прафесійнай кампетэнтнасці служаць грамадская значнасць вынікаў працы спецыяліста, яго аўтарытэт, сацыяльна-працоўны статус у пэўнай галіне ведаў (дзейнасці)” [60, с. 23].

У сценах ВНУ будучы спецыяліст атрымлівае асновы прафесійнай кампетэнтнасці як сукупнасці ведаў і ўменняў, што вызначаюць рэзультатыўнасць працы; як аб’ёму навыкаў выканання задачы; як камбінацыі асобасных якасцей і ўласцівасцей; як комплексу ведаў і прафесійна значных асобасных якасцей; як вектара прафесіяналізацыі; як адзінства тэарэтычнай іпрактычнай гатоўнасці да працы; як здольнасці ажыццяўляць складаныя культураадпаведныя віды дзеянняў. Разнастайнасць і шматпланавасць сутнасці паняцця “прафесійная кампетэнтнасць” звязана з прымяненнем да трактоўкі наступных навуковых падыходаў: асобасна-дзейнага (Н.Ю. Кліменка) [60], сістэмна-структурнага (А.Л. Андрэеў, В.В. Краеўскі, А.В. Хутарскі) [3], [71], [154], культуралагічнага (А.А. Баўэр, У.П. Барысенкаў, Т.В. Паштарова) [12], [131].

Прафесійная кампетэнтнасць педагога разглядаецца як інтэгральная характарыстыка, што вызначае здольнасць вырашаць прафесійныя праблемы і тыповыя прафесійныя задачы, якія ўзнікаюцьу рэальных сітуацыях у прафесійнай дзейнасці, выкарыстанне ведаў, прафесійнага і жыццёвага вопыту, каштоўнасцей і схільнасцей. Здольнасць разумеецца не як “прадвызначанасць”, а як “уменне”. Здольны азначае “ўмее рабіць”.

Асэнсаванне кампетэнтнасці спецыяліста XXI стагоддзя, па меркаваннях шэрага вучоных, павінна грунтавацца на развіцці яго інтэгратыўных і аналітычных здольнасцей [154].

Да істотных прымет кампетэнтнасці, абумоўленых пастаяннымі зменамі ў свеце, адносяццапатрабаванні да “паспяховага дарослага”:

–кампетэнтнасць мае дзейны характар абагуленых уменняў у спалучэнні з прадметнымі ўменнямі і ведамі ў канкрэтных галінах;

–кампетэнтнасць праяўляецца ва ўменні ажыццяўляць выбар, зыходзячы з адэкватнай ацэнкі сябе ў канкрэтнай сітуацыі.

У педагагічнай і псіхалагічнай навуках існуе шэраг падыходаў да разгляду і абгрунтавання сутнасці паняцця “кампетэнтнасць”. У прыватнасці, у межах функцыянальна-дзейнага падыходу да разумення сутнасці і зместу ключавога паняцця адносна падрыхтоўкі будучых педагогаў вучоныя Н.В. Кузьміна, В.А. Сласцёнін, Р.Х. Шакураў вызначаюць кампетэнтнасць у якасці адзінства “тэарэтычнай і практычнай гатоўнасці да ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці, да выканання прафесійных функцый, пры якім асноўныя параметры прафесійнай кампетэнтнасці зададзены функцыянальнай структурай педагагічнай дзейнасці і ўключаюць шэраг тэарэтычных і практычных уменняў: аналітычных, прагнастычных, праектыўных, рэфлексіўных, арганізатарскіх, камунікатыўных”.Прадстаўнікі аксіялагічнага падыходу – К.А. Абульханава-Слаўская, Б.С. Гершунскі, В.Г. Варанцова, М.С.Розаў – разумеюць кампетэнтнасць як адукацыйную неабходнасць, прычым “прафесійная кампетэнтнасць дапускае ўвядзенне чалавека ў агульнакультурны свет каштоўнасцей, і менавіта ў дадзенай прасторы чалавек рэалізуе сябе як спецыяліст і прафесіянал”.Прадстаўнікі ўніверсальнага падыходу (Ю.Ф. Абрамаў, М.Б. Есаулава,Ф.Г. Зіятдзінава, І.А. Калеснікава, Л.М. Лясохіна, Л.М. Міціна, Г.М. Празументава, М.С. Розаў) звязваюць кампетэнтнасць з базіснай кваліфікацыяй, якая адначасова дазваляе чалавеку арыентавацца ў шырокім коле пытанняў, у тым ліку і па-за межамі яго вузкай спецыялізацыі, што забяспечвае сацыяльную і прафесійную мабільнасць асобы, адкрытасць да змен і творчага пошуку, здольнасць і гатоўнасць абнаўляць уласныя веды. Аўтары падтрымліваюць “цэласны погляд на педагога як на чалавека ў прафесіі, які заключаецца ў тым, што асаблівасці яго асобы праяўляюцца, перш за ўсё, праз спецыфіку педагагічнай дзейнасці, бо менавіта яна дапускае ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі і ўздзеянне на іх”.

Прафесійная кампетэнтнасць таксама з’яўляецца складаным пытаннем у навуцы і практыцы, паколькі існуе шэраг трактовак згаданага тэрміна. Мы аб’ядналі асноўныя погляды на сутнасць і змест паняцця “прафесійная кампетэнтнасць” шэрага вядомых вучоных у табліцу 1.1.

Так, у традыцыйным разуменні змест прафесійнай кампетэнтнасціпрадстаўляе сабой сукупнасць ключавых, базавых і спецыяльных кампетэнцый.

Ключавыя кампетэнцыі неабходны для любой прафесійнай дзейнасці, паколькі яны звязаны з поспехам асобы ў свеце, які дынамічна развіваецца. Базавыя кампетэнцыі адлюстроўваюць спецыфіку пэўнай прафесійнай дзейнасці (педагагічнай, медыцынскай і г.д.), а спецыяльныя – канкрэтнай прадметнай або надпрадметнай сферы прафесійнай дзейнасці.

Репозиторий ВГУ

Табліца 1.1 – Сутнасць і змест паняцця “прафесійная кампетэнтнасць”

| № | Аўтар | Сутнасць паняцця | Змест і структура прафесійнай кампетэнтнасці | Крыніца |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Байдэнка Валянцін Іванавіч, доктар педагагічных навук, прафесар, член Нацыянальнай акадэміі педагагічных навук Украіны | Разглядае выключна прафесійныя кампетэнцыі: “гэта гатоўнасць і здольнасць мэтазгодна дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннямі справы, метадычна арганізавана і самастойна вырашаць задачы і праблемы, а таксама самаацэньваць вынікі сваёй дзейнасці. Іншымі словамі, гэта звязаны з прадметам навыкі – адпаведныя метады і тэхнічныя прыёмы, уласцівыя розным прадметным галінам”, с.6. | Вылучае тры групы кампетэнцый:<br>1. “Агульныя кампетэнцыі … разглядаюцца як здольнасць, заснаваная на ведах, вопыце, каштоўнасцях, схільнасцях, якія набываюцца ва ўсіх трох тыпах адукацыйнай практыкі: фармальнай, нефармальнай, інфармальнай”, с.6.<br>2. “Персанальныя кампетэнцыі ахопліваюць асобасныя якасці, такія як самастойнасць, самапавага, надзейнасць, усвядомленая адказнасць, пачуццё абавязку, развіццё самаўсвядомленай арыентацыі на каштоўнасці”, с.7.<br>3. “Акадэмічныя кампетэнцыі, якія інтэрпрэтуюцца як авалоданне метадалогіяй і тэрміналогіяй, уласцівымі асобнай галіне ведаў, разуменне дзеючых у ёй сістэмных узаемасувязей і ўсведамленне іх аксіяматычных меж”, с.7. | Байденко, В. Компетенции в профессиональном образовании (К освоению компетентностного подхода) / В. Байденко // Высшее образование в России. – 2004. – №11. – С.3–13. |
| 2. | Болатаў Віктар Аляксандравіч, доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі, г.Масква | “Спосаб існавання ведаў, уменняў, адукаванасці, які спрыяе асобаснай самарэалізацыі, знаходжанню свайго месца ў свеце, з прычыны чаго адукацыя паўстае як высокаматываваная і ў сапраўдным сэнсе асобасна арыентаваная, якая забяспечвае максімальную запатрабаванасць асобаснага патэнцыялу, прызнанне асобы асяроддзем і ўсведамленне ёй самой уласнай значнасці”, с.12. | У большасці прац абгрунтоўваецца кампетэнтнасная мадэль (без канкрэтызацыі кампетэнцый).<br>Кампетэнцыя з’яўляецца “сферай адносін, што існуюць паміж ведамі і дзеяннем у чалавечай практыцы”, с.12. | Болотов, В.А. Компетентностная модель: от идеи к образовательной программе / В.А. Болотов, В.В. Сериков // Педагогика. – 2003. – №10. – С. 8–14. |

Рэпазіторый ВДУ

*Працяг табліцы 1.1*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3. | Грынкруг Леў Саламонавіч, кандыдат тэхнічных навук, рэктар Дальнеўсходняй дзяржаўнай сацыяльна-гуманітарнай акадэміі, г. Бірабіджан | Не вызначае сутнасць паняцця. | Разглядае не кампетэнцыі, а ключавыя кампетэнтнасці ў структуры мадэлі выпускніка ВНУ:<br>“1) ключавыя, агульныя для сучасных спецыялістаў розных профіляў;<br>2) агульнапрафесійныя, базавыя для ўсіх прадстаўнікоў дадзенай прафесіі;<br>3) спецыяльныя, абумоўленыя канкрэтнай прадметнай сферай прафесійнай дзейнасці”, с.72. | Гринкруг, Л.С. Системный подход к проектированию модели выпускника / Л.С. Гринкруг // Педагогическое образование и наука. – 2009. – №3. – С. 70–75. |
| 4. | Жук Вольга Леанідаўна, доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, г.Мінск | “1) якасць чалавека, які валодае ўсебаковымі ведамі, вопытам практычнай дзейнасці ў якой-небудзь сферы, погляды якога з’яўляюцца аўтарытэтнымі;<br>2) інтэграваная характарыстыка сацыяльна-прафесійнай якасці асобы; вынік прафесійнай падрыхтоўкі ва ўстанове вышэйшай адукацыі, якая забяспечвае прадуктыўнае вырашэнне шырокага кола прафесійных, сацыяльных і асобасных задач”, с. 547–548. | “3 групы кампетэнцый: акадэмічныя, прафесійныя, сацыяльна-асобасныя. У выніку яны забяспечваюць сфарміраванасць сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка ўстановы вышэйшай адукацыі” (спасылка на Макет адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі I ступені Рэспублікі Беларусь, зацверджаны 13.06.2006), с.548. | Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. Т. 1: А–М / науч. ред. С.П. Самуэль, З.И. Малейко, А.П. Чернякова. – Минск: РУП “Издательство "Адукацыя івыхаванне"”, 2015. – 735 с. |

Репозиторий БГУ

*Працяг табліцы 1.1*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5. | Зімняя Ірына Аляксееўна, доктар псіхалагічных навук, прафесар, акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі, г.Масква | Прааналізавала і вызначыла генезіс развіцця ўяўленняў і разумення паняццяў “кампетэнтнасць” і “кампетэнцыя”. | Асноўныя кампетэнцыі (віды):<br>“1.Кампетэнцыі, якія адносяцца да самога чалавека як асобы, суб’екта дзейнасці, стасункаў (кампетэнцыі здароўезберажэння, кампетэнцыі каштоўнасна-сэнсавай арыентацыі ў свеце, кампетэнцыі інтэграцыі, кампетэнцыі грамадзянскасці, кампетэнцыі самаўдасканалення, самарэгулявання, самаразвіцця, асобаснай і прадметнай рэфлексіі, сэнс жыцця, прафесійнае развіццё, моўнае і маўленчае развіццё, авалоданне культурай роднай мовы, авалоданне замежнай мовай).<br>2.Кампетэнцыі, якія адносяцца да сацыяльнага ўзаемадзеяння чалавека і сацыяльнай сферы (кампетэнцыі сацыяльнага ўзаемадзеяння, кампетэнцыі ў стасунках).<br>3.Кампетэнцыі, якія адносяцца да дзейнасці чалавека (кампетэнцыі пазнавальнай дзейнасці, кампетэнцыі дзейнасці, кампетэнцыі інфармацыйных тэхналогій”, с. 12–13. | Зимняя, И.А. Ключевые компетенции – новая парадигма результата образования / И.А. Зимняя // Эксперимент и инновации в школе. – 2009. – № 2. – С. 7–14. |
| 6. | Іваноў Дзмітрый Іванавіч, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры адукацыйнага менеджменту МДУ імя М.В. Ламаносава, г. Масква | “Характарыстыка, якая даецца чалавеку ў выніку ацэнкі эфектыўнасці / неэфектыўнасці яго дзеянняў, накіраваных на вырашэнне пэўнага кола значных для дадзенай супольнасці задач / праблем”, с.6. | “Тры вялікія класы кампетэнцый:<br>1. Прафесійныя (спецыяльныя), неабходныя дадзенаму спецыялісту для рэалізацыі яго прафесійнай дзейнасці.<br>2. Надпрафесійныя, неабходныя, каб эфектыўна працаваць у арганізацыі.<br>3. Ключавыя кампетэнцыі, у якія ўваходзяць уменні і якасці, неабходныя кожнаму члену дадзенага грамадства для яго паспяховай сацыялізацыі”, с. 8–9. | Иванов, Д. Компетентности и компетентностный подход в современном образовании / Д. Иванов. – М.: Чистые пруды, 2007. – 32 с. |

Репозиторий ВГУ

*Працяг табліцы 1.1*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7. | Равэн Джон, прафесар Эдынбургскага ўніверсітэта, Вялікабрытанія | “Спецыфічная здольнасць, якая неабходна для эфектыўнага выканання канкрэтнага дзеяння ў канкрэтнай прадметнай сферы і ўключае вузкаспецыяльныя, асаблівага роду прадметныя навыкі, спосабы мыслення, а таксама разуменне адказнасці за свае дзеянні”, с. 55–56. | Вылучаны ў выніку маштабнага даследавання 37 розных відаў кампетэнцый, якія магчыма згрупаваць у чатыры асноўныя групы: ажыццяўленне самастойнай дзейнасці (напрыклад, здольнасць прымаць правільныя рашэнні, уважлівыя адносіны да праблем, звязаных з дасягненнем пастаўленай мэты і інш.); ажыццяўленне дзейнасці ў складзе каманды / рабочай групы (напрыклад, здольнасць да сумеснай работы дзеля дасягнення мэты, устаноўка на ўзаемны выйгрыш і шырыня перспектывы і інш.); ажыццяўленне кіраўніцкай дзейнасці (напрыклад, здольнасць вырашаць канфлікты і змягчаць непаразуменні, гатоўнасць займацца арганізацыйным і грамадскім планаваннем і інш.); уладкаванне свайго ўласнага жыцця (напрыклад, даследаванне акаляючай рэчаіснасці для выяўлення яе магчымасцей і рэсурсаў, тэндэнцыя да больш дакладнага разумення каштоўнасцей і ўстановак у адносінах да канкрэтнай мэты і інш.), с. 63–65, 72–73. | Равен, Дж. Компетентность в современном обществе / Дж. Равен. – М.: Когито-Центр, 2002. – 396 с. |
| 8. | Увядзенскі Вадзім Мікалаевіч, доктар педагагічных навук, прафесар кафедры педагогікі і методыкі прафесійнай | “Сукупнасць ведаў і ўменняў, якія вызначаюць выніковасць працы; аб’ём навыкаў выканання задачы; камбінацыя асобасных якасцей і ўласцівасцей; комплекс ведаў і прафесійна значных якасцей; вектар прафесіяналізацыі; адзінства тэарэтычнай і практычнай гатоўнасці | Разглядае не кампетэнцыі, а <u>кампетэнтнасці</u>, размяркоўваючы іх на тры ўзроўні ў мадэлі прафесійнай кампетэнтнасці педагога ў сістэме павышэння кваліфікацыі:<br>– “агульны – ключавыя і аперацыянальныя кампетэнцыі;<br>– прыватны – кампетэнтнасці службовай групы ў пэўнай адукацыйнай установе;<br>– канкрэтны – кампетэнтнасці асобнага педагога ў межах установы”, с.52. | Введенский, В.Н. Моделирование профессиональной компетентности педагога / Н.В. Введенский // Педагогика. – 2003. – №10. – С. 51–55. |

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

*Заканчэннетабліцы 1.1*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | адукацыі Белгародскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў і культуры, г. Белгарад | да працы; здольнасць ажыццяўляць складаныя культураадпаведныя віды дзеянняў і інш.”, с. 51. У межах прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста “можна гаварыць пра веды, уменні і навыкі, здольнасці, г.зн. пра гатоўнасць спецыяліста”, с. 51. | | |
| 9. | Хутарскі Андрэй Віктаравіч, доктар педагагічных навук, член-карэспандэнтРасійскай акадэ-міі адукацыі, г.Масква | “Вопытнае авалоданне чалавекам адпаведнай кампетэнцыяй, што ўключае яго асабістыя адносіны да яе і прадмета дзейнасці”, с.14. | “Іерархія кампетэнтнасцей:<br>1)ключавыя (базавыя) кампетэнцыі, якія адносяцца да метапрадметнага зместу адукацыі;<br>2)агульнапрадметныя кампетэнцыі, якія адносяцца да пэўнага цыкла вучэбных прадметаў і адукацыйных сфер;<br>3)прадметныя кампетэнцыі, якія фарміруюцца пры вывучэнні канкрэтных вучэбных прадметаў”, с.14. | Хуторской, А.В. Компетентность как дидактическое понятие: содержание, структура и модели конструирования / А.В. Хуторской, А.Н. Хуторская (2004) // http://khutorskoy.ru/books. |
| 10. | Шалашова Марына Міхайлаўна, доктар педагагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута непарыўнай адукацыі МДПУ, г.Масква | “Інтэгральная якасць асобы, што характарызуе гатоўнасць вырашаць узнікаючыя ў працэсе жыцця і прафесійнай дзейнасці праблемы з выкарыстаннем ведаў, вопыту, індывідуальных здольнасцей”, с.54; “характарызуе інтэграваныя якасці выпускнікоў ВНУ, г.зн. вынік навучання”, с.55. | “Тры вялікія класы:<br>1) прадметныя (спецыяльныя) кампетэнцыі, што з’яўляюцца асновай для рэалізацыі прафесійных задач;<br>2) надпрафесійныя (калі-нікалі іх называюць базавымі) кампетэнцыі, неабходныя, каб эфектыўна працаваць у арганізацыі;<br>3) ключавыя кампетэнцыі, якія вызначаюць паспяховую сацыялізацыю кожнага выпускніка”, с.55. | Шалашова, М.М. Комплексная оценка компетентности будущих педагогов / М.М. Шалашова // Педагогика. – 2008. – №7. – С.54–59. |

Репозиторий ВГУ

Репозиторий ВГУ

Адзначым, што ўзроўні ключавых і базавых кампетэнцый прадстаўляюць здольнасць да мабільнасці, камунікацыі і актуалізацыі асобы ў грамадстве, а ўзроўні спецыяльных кампетэнцый характарызуюць сфарміраванасць практычных уменняў спецыяліста пэўнай прафесіі.

Аднак на сучасным этапе развіцця адукацыі ў прафесійнай дзейнасці педагога вылучаюць і іншы склад кампетэнцый. Напрыклад, у кампетэнцыі ў Еўрапейскім праекце Балтыйскіх краін "Вучыцца, каб было чым дзяліцца" (Учиться, чтобы делиться) былі выбраны наступныя складнікі [цыт. па: 2]:

–веды і навыкі (іх адзінства, паколькі веды маюць каштоўнасць, калі яны суправаджаюцца некаторымі навыкамі для рэалізацыі дадзеных ведаў, і наадварот, нічога нельга дасягнуць, маючы вельмі добрыя тэхнічныя навыкі, калі яны не абапіраюцца на трывалыя веды);

–пазіцыя і паводзіны (дадзены складнік дапускае вельмі дакладнае разуменне пэўнай ролі і паводзін у адпаведнасці з гэтай роляй. Роля педагога можа праявіцца толькі тады, калі навучэнцы прымаюць ролю вучня. Іншымі словамі, каб быць педагогам, патрэбна нешта, чаму вучні жадалі б навучыцца ў дадзенага педагога);

–спасціжэнне і разуменне (для ўдзелу ў працэсе неабходна разумець сутнасць працэсу. Каб чымсьці кіраваць наогул, неабходна таксама разумець людзей і іх паводзіны);

–веданне мінулага і прадбачанне будучыні (немагчыма прадбачыць будучыню без ведання мінулага; без прадбачання будучыні не можа праявіцца ніякай адказнасці, бо адказнасць – гэта прыняцце рашэнняў, заснаванае на прагназуемых наступствах. Чалавек павінен прадбачыць наступствы прынятых ім рашэнняў).

Тэхналогія канструявання кампетэнцый, прапанаваная А.В. Хутарскім, змяшчае чатыры этапы: "1) пошук праяў ключавых кампетэнцый у кожным канкрэтным вучэбным прадмеце; 2) пабудаванне іерархічнай надпрадметнай сістэматыкі – "дрэва кампетэнцый" на трох узроўнях: ключавыя, агульнапрадметныя, прадметныя; 3) праектаванне агульнапрадметных адукацыйных кампетэнцый у працэсе навучання; 4) праекцыя сфарміраваных кампетэнцый на ўзровень вучэбных прадметаў і іх адлюстраванне ў вучэбных праграмах, падручніках і методыках" [153].

Увогуле педагог павінен быць здольны прыняць пазіцыю партнёрства ва ўсёй разнастайнасці яе канкрэтных праяў, устаноўку на важнасць прагрэсу, а таксама на надзеленасць людзей (навучэнцаў) паўнамоцтвамі кіравання навучаннем як часткай свайго жыцця.

Калектыў Санкт-Пецярбургскай навуковай школы прапануе наступную структуру кампетэнцый у сферы адукацыі (кваліфікацыя "бакалаўр") [2]:

–параметр "веды" (выкарыстанне сістэматызаваных тэарэтычных і практычных ведаў для праектавання і рэалізацыі педагагічнага працэсу,

Рэпазіторый ВДУ

накіраванага на адукацыю навучэнцаў (выхаванцаў) у наяўным асяроддзі ўстановы адукацыі, для ацэнкі вынікаў дзейнасці навучэнцаў (выхаванцаў); папаўненне прафесійных ведаў праз выкарыстанне арыгінальных крыніц, у тым ліку электронных, з розных галін агульнай і прафесійнай культуры, рэфлексіі практычнага вопыту, правядзенне педагагічнай дыягностыкі і маніторынгу вынікаў педагагічнага працэсу, удзелу ў інавацыйных працэсах; дэманстрацыя крытычнага асэнсавання розных тэорый, канцэпцый, падыходаў да пабудовы педагагічных працэсаў і развіцця адукацыйных асяроддзяў);

–параметр "уменні" (праектаванне педагагічнага працэсу, арыентаванага на рашэнне сучасных задач канкрэтнай адукацыйнай ступені, канкрэтнай установы адукацыі, адпаведнай прадметнай галіны ведаў; рэалізацыя адукацыйных і вучэбных праграм; базавых і электыўных курсаў з выкарыстаннем розных метадаў, формаў, тэхналогій, што адпавядаюць асаблівасцям адукацыйнай ступені, у тымліку і інфармацыйныя тэхналогіі; выкарыстанне розных метадаў ацэньвання адукацыйных дасягненняў, якія адпавядаюць асаблівасцям ступені адукацыі, наяўныя магчымасці асяроддзя ўстановы адукацыі для забеспячэння якасці адукацыі; ацэньванне ўласных адукацыйных дасягненняў і праблем, вызначэнне патрэбнасцей у далейшай адукацыі);

–параметр "сацыяльная кампетэнтнасць" (арыентаванне ў сучаснай сацыяльна-культурнай сітуацыі, з выкарыстаннем некаторых яе магчымасцей для забеспячэння якасці адукацыі; уключэнне ва ўзаемадзеянне з сацыяльнымі партнёрамі, зацікаўленымі ў якасці адукацыі; стварэнне ўмоў для праяў суб'ектамі педагагічнага працэсу сацыяльных ініцыятыў на ўзроўні ўстановы адукацыі; арганізацыя згуртаванняў навучэнцаў (выхаванцаў) з настаўнікамі (выхаваццелямі) для авалодання імі вопытам узаемадзеяння пры рашэнні пэўных задач (вучэбных, сацыяльных, бытавых і інш.); адказнасць за вынікі ўласных дзеянняў і дзеянняў выхаванцаў і навучэнцаў);

–параметр "камунікатыўная кампетэнтнасць" (бесканфліктныя зносіныз рознымі суб'ектамі педагагічнага працэсу; прад'яўленне (дэманстраванне) розных узораў зносін; уключэнне ў сумесную дзейнасць з калегамі, што працуюцьу камандзе; валоданне прафесійнымі асновамі моўнай камунікацыі; выкарыстаннерозных сродкаў камунікацыі з калегамі; арганізацыя супрацоўніцтва навучэнцаў (выхаванцаў); стварэнне ўмоў для матывацыі навучэнцаў (выхаванцаў) да актыўнай дзейнасці, самастойнай дзейнасці, самаацэньвання і ўзаемаацэньвання);

–параметр "інфарматыўная кампетэнтнасць" (аналіз інфармацыі з розных пунктаў гледжання, вылучэнне ў ёй галоўнага, структураванне, ацэньванне, прадстаўленне ў даступным для іншых выглядзе; выкарыстанне магчымасці інфармацыйных тэхналогій у педагагічным працэсе для рашэння задач канкрэтнай адукацыйнай ступені, канкрэтнай

установы адукацыі, адпаведнай прадметнай галіны ведаў; магчымасці інфармацыйных тэхналогій у самаадукацыйнай дзейнасці; магчымасці інфармацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі, рэгіёна, краіны для вырашэння педагагічных задач; распрацоўка элементаў вучэбна-метадычнага комплексу для канкрэтнай адукацыйнай ступені на электронных носьбітах).

Так, у абагуленым выглядзе кампетэнтнасць спецыяліста ўяўляе сабой сукупнасць здольнасцей, якасцей і ўласцівасцей асобы, неабходных для паспяховай прафесійнай дзейнасці ў пэўнай сферы.Згодна з думкай Н.Ю. Кліменкі, "крытэрыем прафесійнай кампетэнтнасці служаць грамадская значнасць вынікаў працы спецыяліста, яго аўтарытэт, сацыяльна-працоўны статус у пэўнай галіне ведаў (дзейнасці)".

У ВНУ будучы спецыяліст атрымлівае асновы прафесійнай кампетэнтнасці:

– як сукупнасці ведаў і ўменняў, што вызначаюць выніковасць працы;
– як аб'ёму навыкаў выканання задачы;
– як камбінацыі асобасных якасцей і ўласцівасцей;
– як комплексу ведаў і прафесійна значных асобасных якасцей;
– як вектара прафесіяналізацыі;
– як адзінства тэарэтычнай і практычнай гатоўнасці да працы;
– як здольнасці ажыццяўляць складаныя культураадпаведныя віды дзеянняў.

Па выніках аналізу падыходаў да разумення паняцця "кампетэнтнасць" і вывучэння яе сутнасці мы ў кантэксце нашага даследавання пад прафесійнай кампетэнтнасцю спецыяліста сацыяльнай сферы разумеем інтэгратыўную якасць спецыяліста, што складваецца ў працэсе навучання і развіваецца ў ходзе прафесійнай дзейнасці; дадзеная якасць утворана сістэмай ключавых, агульных і спецыяльных кампетэнцый, якія прадстаўляюць сукупнасць прафесійна значных якасцей і забяспечваюць паспяховую рэалізацыю прафесійнай дзейнасці.

Прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста як складанае інтэгратыўнае ўтварэнне ўключае шэраг кампанентаў:

–аксіялагічны, прадстаўлены агульначалавечымі каштоўнасцямі, якія выбіраюцца, абмяркоўваюцца, крытычна ацэньваюцца і становяцца складаемымі духоўнага свету асобы;

–культуралагічны, што адлюстроўвае разнастайныя культурныя галіны, у якіх адбываецца жыццядзейнасць чалавека (акадэмічная, аздараўленчая, крэатыўная); агульнакультурныя здольнасці, неабходныя ў прафесійнай дзейнасці; каштоўнасці і традыцыі нацыянальнай культуры і дзеянні па іх захаванні, адраджэнні і ўзнаўленні;

–маральна-этычны, што разумеем як станаўленне грамадзянскай пазіцыі і назапашванне вопыту: пражыванне і перажыванне эмацыянальна насычаных сітуацый; гуманныя паводзіны; арганізацыя акцый



Репозиторий ВГУ

міласэрнасці; клопат пра блізкіх; талерантнасць у адносінах да іншых людзей; адэкватная самаацэнка.

Прафесійныя веды і ўменні, што ў сукупнасці ўтвараюць усеагульныя кампетэнцыі, фарміруемыя ў ВНУ, непасрэдна вызначаюцца ментальнасцю прадстаўніка пэўнага народа, народнасці, этнічнай групы. Як справядліва адзначаюць А.А. Баўэр і У.П. Барысенкаў, "у кожнай асобнай дзяржаве захоўваецца свая мясцовая спецыфіка сацыяльнай работы і педагогікі, якая прадыктавана палітычным, эканамічным, гістарычным і культурным развіццём" [12, с. 105]. У сучасным свеце неабходна прызнаць прынцып павагі і ўліку нацыянальнай і мясцовай спецыфікі і адмовіцца ад імкнення ўніфікаваць метады і прынцыпы сацыяльнай работы і педагогікі. Але гэта не азначае непрыняцця вопыту, традыцый іншых народаў-суседаў: "У сацыяльнай рабоце і педагогіцы неабходна не разуменне чужых традыцый і культур, а выпрацоўка такога падыходу, пры якім гэтым традыцыям даецца права на існаванне пры захаванні магчымасці збліжэння з іншымі культурамі"[12, с. 107]. Такі герменеўтычны дыялог стварае асаблівыя даверлівыя ўмовы і перадумовы для зносін. Кожны ўдзельнік дыялогуўпэўнены, што суразмоўца будзе імкнуцца яго зразумець і дасць яму магчымасць растлумачыць асаблівасці нацыянальных традыцый і культуры. Ментальнасць беларусаў падразумявае талерантныя адносіны да іншых народаў і іншых культур, дэманструе павагу да нацыянальных, рэлігійных, культурных асаблівасцей прадстаўнікоў розных дыяспар. Усё гэта характарызуе сацыяльнае асяроддзе, асаблівасцю якога з'яўляецца поліэтнічнасць. Аднак даследчык Т.В. Паштарова прапануе не разглядаць поліэтнічнае асяроддзе як "плавільны кацёл", у якім усе этнасы "пераплаўляюцца" ў адзін[131, с.35]. Чалавек у большасці выпадкаў не толькі захоўвае прыхільнасць да роднай культуры, але і можа захоўваць у сабе прыналежнасць да некалькіх культур.

Даследчык В.І. Байдэнка прапануе ў якасці асноўнага напрамку ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў па сацыяльнай рабоце абраць фарміраванне сацыяльных кампетэнцый – "гатоўнасці і здольнасці фарміравацца і жыць у сацыяльным узаемадзеянні і дасягнення згоды з іншымі людзьмі" [11, с. 12]. Тыпалогія сацыяльных кампетэнцый уключае станаўленне асноўных сацыяльных кампетэнтнасцей:

–кампетэнтнасць сацыяльнага ўзаемадзеяння (з грамадствам, калектывам, сям'ёй, сябрамі, партнёрамі; канфлікты і іх пагашэнне, супрацоўніцтва, талерантнасць, павага і прыняцце іншага чалавека (раса, нацыянальнасць, рэлігія, статус, роля, пол), сацыяльная мабільнасць; вопыт і гатоўнасць узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, супрацоўнічаць у групе, знаходзіць адэкватныя розным сітуацыям рашэнні; адносіны да сацыяльнага ўзаемадзеяння як да каштоўнасці, здольнасць рэгуляцыі інтэрперсанальнага ўзаемадзеяння);



Рэпазіторый ВДУ

–кампетэнтнасць у стасунках (вусныя, пісьмовыя стасункі, дыялог, маналог, параджэнне і ўспрыняцце тэксту; веданне і захаванне традыцый, рытуалу, этыкету; дзелавая перапіска; справаводства, бізнес-мова; іншамоўныя стасункі; камунікатыўныя задачы, узроўні ўздзеяння на рэцыпіента; вопыт і гатоўнасць да стасункаў у розных камунікатыўных сітуацыях: перажыванне задавальнення ад стасункаў як каштоўнасці; уменне пачынаць, накіроўваць, кантраляваць камунікатыўны працэс);

–кампетэнтнасць грамадзянскасці (веданне і захаванне правоў і абавязкаў грамадзяніна; свабода і адказнасць, упэўненасць у сабе, уласная годнасць, грамадзянскі абавязак); веданне і гордасць за сімвалы дзяржавы (герб, сцяг, гімн); вопыт і гатоўнасць праяўлення грамадзянскасці і актыўнай пазіцыі ў жыцці, адносіны да статусу грамадзяніна як каштоўнасці, упраўленне паводзінаміпры вызначэнні статусна-пазіцыйных атрыбутаў);

–кампетэнтнасць здароўезберажэння (веданне і захаванне нормаў здаровага ладу жыцця, веданне небяспечнасці курэння, алкагалізму, наркаманіі, СНІДу; веданне і захаванне правілаў асабістай гігіены, ужытку; фізічная культура чалавека, свабода і адказнасць у выбары ладу жыцця; вопыт і гатоўнасць рэалізацыі дадзеных ведаў у жыцці і прафесійнай дзейнасці, прыняцце здароўезберажэння як каштоўнасці, рэгуляванне псіхасаматычнай і эмацыянальнай праяў стану здароўя);

–кампетэнтнасць інфармацыйна-тэхналагічная (прыём, перапрацоўка, выдача інфармацыі; пераўтварэнне інфармацыі (чытанне, канспектаванне), мультымедыйныя тэхналогіі, камп’ютарная граматнасць; валоданне электроннай поштай, інтэрнэт-тэхналогіяй; работа з бібліятэчнымі каталогамі; вопыт і гатоўнасць працаваць з інфармацыйным патокам у вуснай і пісьмовай, друкаванай і электроннай формах; прыняцце каштоўнасці віртуальнага свету; гатоўнасць і здольнасць да разумнага абмежавання выкарыстання інфармацыйных тэхналогій) [74, с. 75–76].

Р.В. Аўчарова прапануе падчас прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаўу ВНУ фарміраваць у студэнтаў усеагульныя кампетэнцыі, паколькі яны валодаюць транзітыўнымі ўласцівасцямі ў адносінах да розных сітуацый, а зусім не канкрэтныя веды, уменні, навыкі, якія звужаюць прыкладную накіраванасць прафесійнай дзейнасці [114, с. 33]. Гэта зможа забяспечыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы, канкурэнтаздольных на рынку працы, стане важнейшай задачай вышэйшай школы. Тым больш, што значнае павелічэнне аб’ёму і істотнае ўскладненне структуры навуковай інфармацыі, далейшае нарастанне тэмпаў развіцця навукі і тэхнікі, узмацненне патрабавання сацыяльнай і прафесійнай мабільнасці, заканамернае павелічэнне долі інтэлектуальнага фактару ў любым відзе працы прадвызначаюцьу межах атрымання вышэйшай адукацыі фарміраванне ўсеагульных кампетэнцый.



Рэпазіторый ВГУ

Фарміраванне ўсеагульных кампетэнцый прадугледжвае навучанне значным спосабам мыслення (тэарэтычнаму, дыялектычнаму, лагічнаму), развіццё творчых здольнасцей (уменне прымяняць засвоеныя веды ў любых сітуацыях, уключаючы самастойную пастаноўку задачы, атаксама пошук новых спосабаў вырашэння задач), павышэнне прафесійнага майстэрства (свабоднае ажыццяўленне патрабуемай дзейнасці ў стандартных і нестандартных сітуацыях).

У сваю чаргу, усеагульныя кампетэнцыі, што фарміруюцца падчас навучання ў ВНУ, прадстаўляюць сукупнасць прафесійных ведаў і прафесійных уменняў.

*Прафесійныя веды* будучага спецыяліста сацыяльнай сферы, згодна з трактоўкай Р.В. Аўчаровай, ёсць звесткі з агульнапрафесійных, профільных і спецыяльных дысцыплін, якія складаюць сутнасць прафесіі і вызначаны дзяржаўным стандартам [114, с. 38].У структуры прафесійных ведаў магчыма вылучыць: тэарэтыка-метадалагічныя прафесійныя веды (напрыклад, веды аб заканамернасцях выхавання, навучання і развіцця асобы на ўсіх стадыях антагенезу, уплыў асяроддзя на працэс сацыялізацыі асобы); метадычныя прафесійныя веды (веданне асноў методыкі, форм, метадаў, тэхналогій сацыяльна-педагагічнай і сацыяльнай работы з рознымі катэгорыямі насельніцтва, у розных сферах мікраасяроддзя, у розных сацыяльных інстытутах; веданне практычных асноў прагназавання, праектавання, мадэлявання сацыяльнай дзейнасці); прыкладныя прафесійныя веды (напрыклад, веданне спосабаў, прыёмаў, відаў сацыяльнай дапамогі дзецям, падапечным, якія маюць асаблівыя праблемы).

*Прафесійныя ўменні* будучага спецыяліста сацыяльнай сферы як здольнасць спецыяліста прымяняць атрыманыя прафесійныя веды ў практыцы ўласнай дзейнасці. Агульныя прафесійныя ўменні Р.В. Аўчарова прапаноўвае згрупаваць наступным чынам: гнастычныя (пошук, успрыняцце і адбор інфармацыі); праекціровачныя (пастаноўка мэт і задач, прагназаванне); канструктыўныя (падбор і спалучэнне зместу, метадаў і сродкаў); арганізатарскія (стварэнне ўмоў, стымулюючых мэтанакіраваныя і прыродаадпаведныя змены навучэнцаў, выхаванцаў і г.д.); камунікатыўныя (кантактнасць, зносіны, узаемаадносіны); ацэначныя (успрыняцце і крытычны аналіз дзеянняў суб'ектаў педагагічнага працэсу); рэфлексіўныя (самааналіз уласнай асобы, дзейнасці і зносін) [114, с. 40].

На думку вышэйзгаданых аўтараў, прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста сацыяльнай сферы павінна арганічна спалучацца з этнакультурнай кампетэнтнасцю як уласцівасцю асобы, якая выражаецца ў наяўнасці сукупнасці аб'ектыўных уяўленняў і ведаў пра тую ці іншую культуру і рэалізуецца праз уменні, навыкі і мадэлі паводзін, адпаведныя міжэтнічнаму ўзаемаразуменню і ўзаемадзеянню.

Рэпазіторый ВГУ

Такім чынам, намі вызначаны сутнасць і змест прафесійнай кампетэнтнасці спецыяліста сацыяльнай сферы. Усеагульныя кампетэнцыі, што фарміруюцца ў будучага спецыяліста сацыяльнай сферы ў межах навучання ў вышэйшай навучальнай установе, прадвызначаючы прафесійную кампетэнтнасць спецыяліста, уплываюць і на яго асобаснае развіццё, бо замацаванне вышэйзгаданых кампетэнцый будзе ажыццяўляцца не толькі ў вучэбнай дзейнасці і пры праходжанні практык, але і ў студэнцкім асяроддзі, у сям'і, у асяроддзі сяброў, у соцыуме. Дадзеныя кампетэнцыі носяць поліэтнічны характар, а паспяховая дзейнасць спецыяліста сацыяльнай сферы вызначаецца ўзроўнем этнакультурнай кампетэнтнасці, якая таксама фарміруецца ў ВНУ.

Праблематыка даследавання патрабуе дэталёвага разгляду сутнасці паняцця "этнапедагогіка".

Упершыню тэрмін"этнапедагогіка" як "спецыяльная галіна педагагічнай навукі, асноўным аб'ектам вывучэння якой з'яўляецца народная педагогіка" вызначыў расійскі вучоны Г.Н. Волкаў у працы "Этнапедагогіка"(1974)[28, с. 7].

Педагагічны слоўнік пад рэдакцыяй У.І.Загвязінскага і А.Ф. Закіравай удакладняе вышэйзгаданы сэнс паняцця "этнапедагогіка". Этнапедагогікаразглядаецца як навука, "прадметам вывучэння якой з'яўляецца народная педагогіка, заканамернасці станаўлення і развіцця традыцыйных культур выхавання розных этнасаў, што склаліся пад уздзеяннем сацыяльных, эканамічных і іншых фактараў, а таксама спосабы іх адлюстравання і функцыянавання ў сучасных выхаваўчых сістэмах" [122, с. 311].

На наш погляд, сутнасць тэрміна "этнапедагогіка" непасрэдна звязана з народнай педагогікай, дадзеныя катэгорыі суадносяцца як агульнае і прыватнае, паколькі шэраг даследчыкаў этнапедагогікі вызначаюць яе як навуку аб "народнай педагогіцы.Узаемадзеянне паняццяў "этнапедагогіка" і "народная педагогіка", а ў светапоглядзе некаторых вучоных і атаясамліванне іх вымагае дэталізацыі паняційна-катэгарыяльнага апарату этнапедагогікі, а менавіта вызначэннягісторыка-метадалагічнага падыходу да паняцця "народная педагогіка".

Адным з першых, хто акрэсліў у сваёй навуковай працы "Народная педагогіка", выдадзенай у Іркуцку ў 1926 годзе, сутнасць паняцця "народная педагогіка", быў рускі даследчык Г.С. Вінаградаў. Ён разумеў гэта паняцце як "сукупнасць і ўзаемадзеянне народных уяўленняў, поглядаў на жыццё, на выхаванне і навучанне новых пакаленняў, мэты і задачы выхавання і навучання іх, сродкі і шляхі ўздзеяння на новыя пакаленні" [26, с. 7]. Г.С. Вінаградаў прадставіў народную педагогіку як адзінства педагагічных уяўленняў і ведаў народа з яго педагагічна-выхаваўчай практыкай.

Рэпазіторый ВДУ

У гэтым накірунку працаваў І.Я. Паздзееў, дзякуючы навуковым намаганням якога ў 1929 годзе выйшла з друку падобнаедаследаванне па народнай педагогіцы – “Народная педагогіка ўдмуртаў”. Народную педагогіку аўтар трактуе як “традыцыйную педагагічную думку і традыцыйнае выхаванне пэўнай этнічнай супольнасці” [127, с. 68].

Я.І. Ханбікаў у “Педагагічнай энцыклапедыі”прапануе разглядаць народную педагогіку як “сферу эмпірычных педагагічных ведаў і вопыту народных мас” [148, с. 12], г.зн. у сукупнасці педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі.

Большасць сучасных даследчыкаў народнай педагогікі характарызуюць народную педагогіку як сукупнасць і ўзаемазалежнасць ідэй, поглядаў, меркаванняў, перакананняў, а таксама выхаваўчых уменняў і навыкаў па праблеме выхавання дзяцей, адлюстраваных у народнай творчасці.

А.Л. Хрыстава вызначае паняцце “народная педагогіка” на некалькіх узроўнях:

1) як духоўны феномен, што ўласцівы свядомасці народных мас (эмпірычныя веды, звесткі, ідэалы, ідэі, погляды, уяўленні, устаноўкі выхавання і г.д.);

2) як педагагічную практыку розных народаў;

3) як адзінства педагагічнай думкі і педагагічнай дзейнасці народных мас;

4) як навуку аб народным выхаванні [152, с. 103]. Падобнае вызначэнне дазваляе паказаць цесную ўзаемасувязь педагагічнай думкі народа з практычнымі аспектамі выхавання.

Адна з нешматлікіх спроб пазбегнуць атаясамлівання гэтых паняццяў належыць расійскаму даследчыку Г.А. Камаровай, якая спрабуе даць вызначэнне “этнапедагогікі як навукі, што раскрывае заканамернасці працэсу сацыялізацыі асобы, і акцэнтуе сваю ўвагу на этнічнай спецыфіцы гэтага працэсу ў розных грамадствах і культурах” [65, с. 212]. Пад “народнай педагогікай”, згодна з даследчыцкай пазіцыяй вучонага, неабходна “разумець навуку аб народным выхаванні маладога пакалення” [65, с. 212]. Аўтар імкнецца падкрэсліць паняцце “этнапедагогіка” як больш шырокае, што вывучае ўсю “сістэму сацыялізацыі” асобы, у параўнанні з паняццем “народная педагогіка” – пэўнай састаўной часткай дадзенай сістэмы.

Айчынны даследчык беларускай народнай педагогікі Г.П. Арлова вызначае “народную педагогіку” як “сукупнасць і ўзаемазалежнасць уяўленняў, поглядаў, меркаванняў, перакананняў, ідэй, навыкаў і прыёмаў у галіне выхавання, адлюстраваных у народнай творчасці” [7,с. 7].

У.М. Конан – беларускі філосаф, вядомы спецыяліст па этнічнай культуры і фальклору беларусаў пры вывучэнні ўзаемасувязі паняццяў “этнапедагогіка” і “этнічная культура”, вызначае, што яны “ахопліваюць

Репозиторий ВГУ

лад жыцця этнасу на пэўных гістарычных этапах, аўтэнтычную народную творчасць, што выявілася ў міфалогіі, абрадах, фальклоры” [68, с. 7]. Вучоны сцвярджае, што ў працэсе шматвяковага развіцця адбывалася “селекцыя найлепшых узораў народнай культуры, якія набывалі сэнс ідэалаў людской жыццядзейнасці і паводзінаў у грамадстве” [68, с. 8–9], што ў сваю чаргу забяспечыла ўсёй класічнай этнічнай культуры, зафіксаванай у XIX–XXстагоддзях, статус эфектыўнага сродку выхаваўчай і навучальнай дзейнасці. Ён робіць акцэнт на гістарызме этнічнай культуры і яе інтэгральнай часткі – народнай педагогікі, бо “народная культура не паддаецца прынятай у культуралогіі, літаратуразнаўстве і іншых галінах гуманітарнай навукі атрыбутацыі … і храналагічнай перыядызацыі” [68, с. 9].

Значыць, на думку У.М. Конана, які сцвярджае ў этнакультурным даследаванні, што асэнсаванне каштоўнасцей народнай педагогікі як “цэласнай сістэмы выхавання пачалося ў канцы XIX стагоддзя і цесна звязана з беларускім нацыянальным адраджэннем” [68, с. 6], этнічная педагогіка стала народнай педагогікай пры сістэматызаваным вывучэнні і фіксацыі адзінак этнічнай культуры.

Такім чынам, пры вылучэнні навукова-метадалагічнага падыходу да размежавання паняццяў “народная педагогіка” і “этнапедагогіка”, зыходзячы з нацыянальна-гістарычнага кантэксту, улічваючы вышэйзгаданыя падыходы і меркаванні вучоных, мы лічым справядлівым вызначаць народную педагогіку як бесперапынны працэс стварэння, удасканалення і перадачы ў спадчыну педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі народа, занатаваных у яго народнай творчасці.Зыходзячы з полікультурнага аспекту вызначэння, этнапедагогіка выступае ў якасці навукі, што аб’ядноўвае і ўніверсалізуе міжэтнічныя грамадскія каштоўнасці і ідэалы, прынцыпы і заканамернасці, вывучае і сістэматызуе народна-педагагічныя сродкіі метады выхавання падрастаючага пакалення, вызначае і абагульняе сістэму сямейнага і грамадскага выхавання (згодна з іх разнавіднасцямі – працоўным, фізічным, маральным, эстэтычным, рэлігійным), паколькі прадметам яе вывучэння выступае народная педагогіка.

Аналіз намі педагагічнай спадчыны беларускіх асветнікаў розных гістарычных перыядаў і беларускай народнай педагогікі, у якой сістэматызаваны, абагульнены этнаграфія і фальклор беларусаў і знайшлі сваё выяўленне педагагічныя ідэі народа,дазволіў нам выявіць і сістэматызаваць наступныя грамадска значныя ідэі:

–аб выхаванні здаровага пакалення на аснове гістарычнай пераемнасці;

–аб неабходнасці гарманізацыі жыццёвых сіл арганізма чалавека з акаляючай рэчаіснасцю (грамадствам, прыродай) і самім сабой;

–аб ролі працы як фактару фізічнага і маральнага ўдасканалення чалавека;

–аб каштоўнасці роднага слова для здароўя чалавека;

–аб народнай культуры фізічнага, псіхічнага і духоўнага здароўя людзей пры ўзвядзенні ў культ прыгажосці, маці і дзіцяці, любові, старасці і, адначасова, сталасці, цнатлівасці, сям'і і інш.;

–служэння грамадству, сям'і і нацыі, якая замацоўвае ўстаноўку на сацыяльную каштоўнасць жыцця і здароўя чалавека.

Дадзеныя грамадска значныя ідэіне толькі абумовілі пэўныя прыярытэты ў сямейным і грамадскім выхаванні дзяцей і моладзі і паўплывалі на вызначэнне і фарміраванне актуальнай сістэмы грамадскіх каштоўнасцей, але і паспрыялі стварэнню і актуалізацыі агульнанароднага ідэалу, згодна з якім фарміравалася стройная сістэма сямейнага і грамадскага выхавання дзяцей і моладзі.

Упедагогіцы кожнага народа падрастаючае пакаленневыхоўваеццазгодна са створаным ідэалам. Таму сярод шматлікіх скарбаў народнай педагагічнай мудрасці адно з асноўных месцаў займае ідэя ўдасканальвання чалавечай асобы. Без ідэалу немагчыма існаванне цэласнасці асобы, трываласці яе ўнутранага свету. Ідэал неабходны як крытэрый для самапрызнання, самавызначэння, ацэнкі сябе і іншых людзей, як сродак для стварэння ўпарадкаванасці ў жыццядзейнасці, прадвызначэння стратэгічнай задачы жыцця чалавека.

Расійскі філосаф М.Ф. Калашнікаў разглядае ідэал у якасці "спецыфічнай формы адлюстравання супярэчнасцей рэчаіснасці ў грамадскай і індывідуальнай свядомасці, выражанай у сістэме ўяўленняў пра тэндэнцыі змянення якога-небудзь аб'екта, якая ўключае дасканалы вобраз жадаемага як умоўна-канчатковую мэту аб'екта, прамежкавыя ідэалы-мэты, а таксама ўяўленні пра шляхі і сродкі іх дасягнення" [54, с. 68–69]. Пры ўсведамленні ідэалу асобай узнікаюць, як доказпрактычнай значнасці гэтага паняцця, наступныя супярэчнасці, пры пераадоленні якіх асоба набывае рысы дасканалага чалавека: "паміж рэальным, дадзеным у быцці носьбіта ідэалу і адлюстраваным у яго свядомасці, і належным, гэта значыць, дасканалым вобразам жадаемага; паміж суб'ектыўным ва ўяўленнях носьбіта ідэалу пра шляхі дасягнення дасканалага вобразу жадаемага і аб'ектыўным, гістарычна заканамерным у гэтым; паміж індывідуальным, што выступае як з'ява, і агульным – яго сутнасцю" [54, с. 69].

Надзвычай важнай у народнай педагагічнай думцы з'яўляецца ідэя дасканалага чалавека. У ёй ствараецца своеасаблівы ідэал, што змясціў у сабе ўсе неабходныя і лепшыя рысы чалавека, як быўпатрэбен грамадству, а таксама ўвабраў у сябе мэту, канчатковыя задачы выхавання і самавыхавання асобы. Згодна з даследаваннем "Ідэальнае і ідэал" рускага філосафа Э.В. Ільянкова, ідэал у якасці ўсеагульнай формы мэтанакіраванай дзейнасці "выступае ва ўсіх сферах грамадскага жыцця – сацыяльнай,

палітычнай, маральнай, эстэтычнай і г.д.” [49, с. 204]. У сваю чаргу, ідэальнае ўспрымаецца чалавекам як “суб’ектыўны вобраз аб’ектыўнай рэальнасці, г.зн. адлюстраванне знешняга свету ў формах дзейнасці чалавека, у формах яго свядомасці і волі” [49, с. 214].

Праблемам вызначэння сутнасці і зместу народнага выхавання, а таксама пастаноўкам мэты традыцыйнага выхавання падрастаючага пакалення прысвяцілі свае даследаванні айчынныя гісторыкі педагогікі і этнапедагогі. Сучасны беларускі вучоны Г.П. Арлова першаасновай беларускай народнай педагогікі лічыць культ працы. Гісторыка-педагагічны аналіз справядліва пацвярджае, што выхаванню працалюбства нашы продкі надавалі першачарговую ўвагу, у тым выпадку, калі яно служыла высокім маральна-этычным мэтам і мела грамадскую накіраванасць. Гэтак жа розум і фізічная моц набывалі грамадска значную каштоўнасць толькі пры ўмове выкарыстання іх у інтарэсах людской супольнасці і ў барацьбе са злом. Калі яны выходзілі за межы маральнасці, то ўяўлялі сур’ёзную небяспеку [7]. Таму высновы, да якіх прыйшлі Г.П. Арлова і В.У. Чэчат, паказваюць, што ядром беларускай народнай педагогікі з’яўляецца паняцце дабра, якое ў якасці ўсеагульнага народнага паняцця выступала падмуркам гармоніі маральнай і фізічнай прыроды чалавека [7, с. 12–13], [157, с. 71–73].

Вызначэнне мэты выхавання асобы – галоўнае звяно кожнай педагагічнай сістэмы, у тым ліку і народна-педагагічнай. Спецыфічнасць народна-выхаваўчай дзейнасці, на думку даследчыка гісторыі педагогікі Беларусі В.С.Болбаса, заключаецца ў тым, што яна не “адасабляецца ў спецыяльна арганізаваны працэс і што многія палажэнні народнай педагогікі ў несфармуляваным выглядзе ўтрымліваюцца ў розных элементах духоўнай культуры” [19, с. 44–45].

У народна-педагагічным ідэале, у тым ліку і беларускага народа, адлюстроўваюцца менталітэт і нацыянальная псіхалогія народа, якія маюць непасрэдную залежнасць ад умоў быцця і адпаведнага выхавання. Пры гэтым важную ролю выконваюць прыродна-геаграфічныя і геапалітычныя фактары, а таксама асаблівасці гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця народа, якія, у сваю чаргу, знаходзяцца пад уплывам выхаваўчай мэты.

Э.С. Дубянецкі – айчынны гісторык – спрабуе вызначыць адметныя рысы нацыянальнага беларускага характару праз прызму этнагенезу беларусаў, прыродна-геаграфічных асаблівасцей Беларусі, геапалітычных умоў. На думку даследчыка, у этнагенезе беларусаў значную ролю адыграў “так званы балцкі субстрат” [39, с. 30], ад якога ў скарбонку нацыянальных рыс трапілі стрыманасць і вытрымка, і ўплыў славянскіх плямёнаў, у прыватнасці ўкраінцаў, што вызначыў фарміраванне тыповых рыс беларускага нацыянальнага характару: “памяркоўнасць, гасціннасць, а таксама пэўная нерашучасць, недастатковыя актыўнасць і энергічнасць” [39, с. 30–31]. Прыродна-геаграфічны фактар, накладваючы “значны адбітак



Рэпазітарый ВДУ

на спецыфіку гаспадарчай дзейнасці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў” [39, с. 31], абумовіў станаўленне іх нацыянальнага характару: “жыхарам раўнінных тэрыторый, як правіла, уласцівы спакойны, разважлівы характар. … беларуская прырода пазбаўлена рэзкіх пераходаў ад аднаго рэльефу да другога … што ў рэшце рэшт прадвызначыла фарміраванне чалавека з такім жа "акруглым", ураўнаважаным характарам. Таму ў адрозненне ад многіх горскіх народаў беларусы менш энергічныя, больш спакойныя і разважлівыя” [39,с. 31]. У той жа час моцная біяэнергетыка беларускіх лясоў, а таксама апрацоўка беларусамі лясных тэрыторый пад палі для вырошчвання ўраджаю сфарміравалі “знакамітую жыццястойкасць, вынослівасць, цягавітасць беларусаў”. Пры высвятленні ўмоў развіцця нацыянальнага характару беларусаў неабходна ўлічваць геапалітычны фактар – Беларусь “знаходзіцца на своеасаблівым скрыжаванні ўсіх шляхоў паміж чатырма бакамі свету” [39, с. 32] і таму з’яўляецца жаданай тэрыторыяй для іншаземных захопніцкіх памкненняў – гэта заўжды вымушала беларусаў весці зацятую, перманентную барацьбу за абарону сваёй тэрыторыі, чалавечай годнасці, незалежнасці, у якой паступова выпрацоўваліся надзвычайная вынослівасць, мужнасць і цярплівасць.

А. Мельнікаў – беларускі філосаф – сцвярджае, што на фарміраванне нацыянальнай псіхалогіі, формай выяўлення якой з’яўляецца нацыянальны характар ці ментальнасць, моцна ўздзейнічаюць гістарычнае развіццё народа, асаблівасці гаспадарчага ўкладу, грамадскага жыцця, геаграфічнага асяроддзя, прыродных умоў, рэлігій, міжнацыянальныя кантакты з этнічнымі супольнасцямі і іншыя фактары.У выніку гэтага “ўтвараецца тое непаўторнае сацыяльна-прыроднае асяроддзе, якое і вызначае своеасаблівасць нацыянальнай псіхікі любога народа” [86, с. 102].

Нацыянальная псіхалогія беларускага народа і яго менталітэт таксама вызначылі адметныя рысы народна-педагагічнага ідэалу, якімі з’яўляюцца справядлівасць, калектывізм (як вынік абшчыннага быцця); стрыманасць, асцярожнасць, нешматслоўнасць (склаліся ў працэсе цяжкага паднявольнага жыцця, спусташальных войнаў); прастадушнасць, міралюбівасць, памяркоўнасць, надзвычайная талерантнасць (звязаны з адсутнасцю міжнацыянальнай варожасці і наяўнасцю верацярпімасці да прадстаўнікоў розных рэлігійных канфесій, а таксама арыентацыяй на агульнасацыяльныя каштоўнасці). Дадзеныя рысы як ментальныя якасці беларускага народа адлюстраваліся ў яго вуснай народнай творчасці, у працы, паводзінах, грамадстве, культуры і г.д.

Захаванне ў пакаленнях народна-педагагічнага ідэалу адбываецца, на думку В.С. Болбаса, “дзякуючы трансляцыі з пакалення ў пакаленне найбольш стабільных маральна-духоўных каштоўнасцей і ментальных якасцей адпаведнага соцыуму, а таксама ўзбагачэнню іх агульначалавечымі каштоўнасцямі цывілізацый, бо ідэал выконвае важную

менталеўтваральную функцыю і садзейнічае не толькі захаванню, але і карэкцыі і пераўтварэнню каштоўнасных жыццёвых арыенціраў” [19, с. 45].

У ходзе гістарычнага развіцця Беларусі пад уздзеяннем асаблівасцей лёсу, менталітэту і рэгіёна пражывання складваліся свае ўяўленні пра “дасканалага чалавека” як ідэал для падрастаючага пакалення. Да нашага часу з глыбіні вякоў дайшлі найкаштоўнейшыя звесткі пра асноўныя накірункі станаўлення і развіцця грамадскага ідэалу асобы на ўсіх этапах шматвяковай гісторыі Беларусі, што знайшло сваё выяўленне ў працах нацыянальных асветнікаў, пісьменнікаў і вучоных (табліца 1.2). Сукупны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы, што выкрастылізаваўся напрыканцы XIX – пачатку XX стагоддзя, уключаў у сябе найбольш адметныя рысы: працавітасць, гуманнасць, любоў да Радзімы, дабрыню, чэснасць і праўдзівасць, сумленнасць, павагу да людзей, гонар і ўласную годнасць, фізічную моц і вытрымку, упэўненасць, справядлівасць.

Табліца 1.2 – Нацыянальны ідэал асобы ў працах беларускіх навукоўцаў, асветнікаў, педагогаў

| № п/п | Асветнік, гістарычны перыяд | Рысы ідэальнага чалавека | Цытата | Крыніца |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Ф.Скарына (да 1490 – каля 1551), беларускі першадрукар і асветнік эпохі Рэнесансу | незалежнасць і самастойнасць мыслення, інтэлект і добрапрыстойнасць,<br><br>гуманнасць | аб самастойнасці мыслення: “Пак ли ты ся любить разумети логику – она же учить з доводом разознати правду и кривду…” [138, с. 46];<br>аб інтэлекце і добрапрыстойнасці: “…без мудрасці і без добрых звычаяў немагчыма праведна жыць людзям сумесна на зямлі…” [5, с. 50];<br>гуманнасць: “Закон прироженый в том наболей соблюдаем бываеть: то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хотети от иных…”.<br>Прадмова да кнігі “Юдзіф” [138, с. 110]. | Скарына Ф. Прадмовы і пасляслоўі. – Мінск: “Навука і тэхніка”,1969. – 239 с. – С.14, 93 [138].<br>Антология педагогической мысли Белорусской ССР/ сост. Э.К. Дорошевич [и др.]. – М.: Педагогика, 1986. – 468с. – С.70, 72 [5]. |
| 2. | М.Гусоўскі 1470(?) – 1533(?)), паэт-гуманіст і асветнік | адукаванасць і маральна-этычная дасканаласць | “Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела, пра што сведчаць як грэкі, так і рымляне. Іх магутнасць квітнела найбольш тады, як расцвіталі навукі” | Гусоўскі М. Песня пра зубра на лац., бел., рус.мовах. – Мінск: “Маст. літ.”, 1980. – 192 |

Репозиторий ВГУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | эпохі Рэнесансу | | [34, с. 53]. | с. – С.52, 53. |

*Працяг табліцы 1.2*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3. | С. Будны (каля 1530 – 1593), вучоны і педагог эпохі Рэнесансу | усебаковае развіццё, таленавітасць, патрыятызм | “Справедлива ибо мысль есть, чтобы ваши княжеские милости изволили любить язык того народа, в котором [наши] давние предки и… отцы ваших княжеских милостей славно ответственные должности исполняют…” [5, с. 70]. | Антология педагогической мысли Белорусской ССР/ сост. Э.К. Дорошевич [и др.]. – М.: Педагогика, 1986. – 468с. – С.70, 72. |
| 4. | А.Волан (1530 – 1610), палітычны дзеяч, філосаф эпохі Рэнесансу | “гарманічнае спалучэнне ўсіх дабрачыннасцей і бездакорных нораваў” | “…у кожным чалавеку, які паходзіць са знакамітага роду, павінна быць гарманічнае спалучэнне ўсіх дабрачыннасцей і бездакорных нораваў” [27, с. 46]. | Волан Андрэй. Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці// Спадчына. – 1991. – №6. – С. 95–104. |
| 5. | Л.Залускі (1604 – 1676), філосаф, выкладчык Віленскага ўніверсітэта перыяду Рэчы Паспалітай | “дзейная здольнасць да дабра, увасобленая ў інтэлекце” | “Людзьмі мы нараджаемся, добрымі ж становімся дзякуючы спазнанню дабрачыннасці і практыкаванню ў ёй: як той моцны чалавек становіцца атлетам, хто часцей удзельнічае ў барацьбе, так і дадзеныя ад прыроды ўласцівасці дабрачыннасці ўсё больш выяўляюцца ў пастаянным удаскнальванні іх” [120, с. 98]. “…імкненне знайсці ісціну ўласціва прыродзе чалавека, калі кожны чалавек ад прыроды валодае розумам” [120, с. 98]. | Памятники философской мысли Белоруссии XVII – I половины XVIII в./ В.В.Дубровский [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 319 с. – С.94, 98. |
| 6. | К.Нарбут (1738–1807), грамадскі дзеяч і філосаф другой паловы XVIII ст. | гарманічнае спалучэнне эмацыянальнага і лагічнага, фізічнага і разумовага развіцця | “той, хто падпарадкоўваецца якому-небудзь моцнаму пачуццю, не можа карыстацца сваім розумам у пошуках ісціны. … Ад стану цела ўзмацняецца фантазія ці ўяўленне; з іх дапамогай прадметы змешваюцца неверагодным чынам і ствараюцца самыя розныя ўяўленні” [120, с. 299, 301]. | Памятники философской мысли Белоруссии XVII – I половины XVIII в./ В.В.Дубровский [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 319 с. – С.299, 301, 305. |
| 7. | Ф. Бохвіц (1779–1856), вучоны эпохі Асветы | памяць, уяўленне, аналітычнае мысленне, усебакова развітыя здольнасці | “Выхаванне павінна фарміраваць маладых людзей для таго, каб у будучым яны сталі грамадзянамі, здольнымі да розных відаў дзейнасці, да якіх у будучыні яны будуць заклікаваны ў адпаведнасці са | Антология педагогической мысли Белорусской ССР/ сост. Э.К. Дорошевич [и др.]. – М.: Педагогика, 1986. – 468с. – С.170. |

Рэпазіторый ВДУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | сваімі дадзенымі ад прыроды здольнасцямі або па збегу абставін” [5, с. 170]. | |

*Заканчэнне табліцы 1.2*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 8. | К.Каліноўскі (1838–1864), асветнік, паэт, публіцыст, рэвалюцыянер XIX ст. | грамадзянскасць, адукаванасць, усебаковае развіццё, гуманістычныя прынцыпы, праўдзівасць, гатоўнасць да барацьбы за высокія гуманістычныя ідэалы | “Нямаш, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку. Тагды ён толька магчыме жыці ў багацтве, па праўдзе, тагды ён толька… заслужыць неба, калі збагаціць наукай розум, разаўе сэрца…” [55, с. 46]. “Мы сягодня ўсе ўжэ ведаем, што чалавек вольны, калі мае кусок сваёй зямлі,… ідзе бараніці сваёго краю тагды толька, калі які непрыяцель надыдзе, – калі робіць усенька, што спадабае і што не крыўдзіць бліжняга і хвалы Боскай…” [55, с. 31]. | Каліноўскі К. За нашу вольнасць. Творы, дакументы/ уклад. Г.Кісялёў. – Мінск: “Бел.кнігазбор”, 1999. – 464 с. – С. 27, 31, 46. |

Гістарычны аналіз вышэйзгаданых якасцей нацыянальнага ідэалу сведчыць, што на працягу стагоддзяў уяўленні беларусаў аб “ідэальным чалавеку” ўзбагачаліся ўсё новымі і новымі гранямі, якія знаходзіліся ў суаднесенасці з фарміраваннем менталітэту беларусаў. На перыяд канца XIX – пачатку XX ст., дзякуючы гістарычным, геапалітычным, прыродна-геаграфічным умовам Беларусі, а таксама асаблівасцям развіцця нацыянальнай псіхалогіі беларусаў, а гэта значыць і менталітэту народа, склаліся спрыяльныя перадумовы для пачатку фарміравання беларускай нацыі з уласцівымі для яе нацыянальна вызначанымі рысамі характару. Айчынныя асветнікі ўтой час у сваіх творах паказвалі іх значнасць для беларускага народа.

Ф. Багушэвіч (1840–1900) – прадстаўнік грамадскай думкі Беларусі, ідэолаг нацыянальнага адраджэння, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры – вылучаў праблему мовы як асноўную праблему нацыянальнага жыцця, вызначаючы яе найважнейшай формай выяўлення духоўнасці народа (“язык ёсць адзежа душы”), асноўнай прыкметай нацыі: “Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю…, а затым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”. Беларусь – там, “дзе наша мова жывець” [9, с. 17]. Асноўнай якасцю беларуса асветнік лічыў яго глыбокі патрыятызм, разумеючы пад апошнім глыбока інтымнае адчуванне арганічнай духоўнай еднасці са сваім народам і ўнутраную характарыстыку сапраўднага чалавека: “Каб за край быў умёрці гатоў, каб не прагнуў айчызны чужых” [8, с. 78].

Рэпазіторый БДУ

Цётка (Алаіза Пашкевіч) (1876–1916), паэтка і асветніца другой паловы XIX – пачатку XX ст., вызначае ў якасці ідэальных “скарбы душы”: любоў “да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы” [156,с. 179], гуманізм як “вялікае мілаванне чалавека – слабога, пакрыўджанага” [156, с. 179], бо “бедны той, хто апрача грошы, апрача багацця, каторае пры першым няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных – скарбаў душы. Такі скарб ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее” [156, с. 179]. Адукаванасць, любоў да роднай мовы і патрыятызм у адносінах да малой радзімы – гэта, на думку А.С. Пашкевіч, якасці, уласцівыя беларусам: “Моладзь вясковая! Няпраўда: ты не закарэлая, не цёмная. Здароўем ад цябе і радасцю лунае. Цікава ты пазіраеш на свет: шмат чаго хацела б ведаць, пазнаць, зразумець. Не хватае табе толькі навукі: навукі свабоднай, навукі зразумелай, навукі ў тваёй роднай беларускай мове, каторая табе паказала б, раз’ясніла б, хто ты такая, беларуская моладзь, да якога ты належыш народа і краю. … А ты сама, беларуская моладзь, прыгатуй сваё сэрца, душу і рукі да працы для роднага народа” (са “Звароту да беларускай моладзі”) [156, с. 177–178].

Я. Колас (1882–1956) – народны пісьменнік, настаўнік – у аснову сваіх педагагічных поглядаў паклаў ідэю народнасці, галоўнымі рысамі якой лічыў магутныя сілы беларускага народа, любоў да сваёй мовы і радзімы. Выкарыстоўваючы багатыя сродкі народнай педагогікі, у сваіх творах (“Казкі жыцця”, “Сымон-музыка”, “Новая зямля” і інш.) аўтар не абыходзіць і паказу самога беларуса, якому ўласцівы жыццялюбства, працавітасць, мудрасць, ветлівасць, гасціннасць [64].

І.А.Сербаў (1871–1943), асветнік канца XIX – пачатку XXст., даследчык нацыянальнага характару беларусаў, адзначае перш-наперш іх працавітасць: “Каля трэціх петухоў яны ўжо на нагах і застаюцца на рабоце да позняга вечара… Жанчыны ў працавітасці не ўступаюць мужчынам” [5, с. 234].

Беларускі гісторык і народазнаўца XIX стагоддзя Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867–1934) лічыў, што вызначальным кампанентам і прыметай-характарыстыкай этнічнай супольнасці беларусаў была самабытная духоўная культура, асновай якой з’яўляецца вусная народная творчасць: “Народная наша творчасць складае наша вялікае багацце, якім беларусы могуць ганарыцца, якое павінны падтрымліваць і захоўваць” [38, с. 8]. Адметнасць гістарычнага развіцця беларускай нацыі, этнаграфічныя адрозненні ад суседніх народнасцей па складзе свайго развіцця, паняццяў і схільнасцей, устойлівыя асаблівасці духоўнай культуры абумовілі ўсталяванне ў прадстаўнікоў нашага народа такіх рыс і якасцей, якія сталі характэрнымі спачатку для беларускага этнасу, а потым вызначальнымі для беларускай нацыі. Іх сукупнасць – “неацэнны скарб этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці нашых супляменнікаў” [38, с. 9].



Рэпозиторий ВГУ

Сучасны даследчык народнай педагогікі беларусаў Г.П. Арлова вылучае маральны і фізічны ідэал народа. У аснову маральнага ідэалу беларускага народа пакладзены: працавітасць, патрыятызм, гуманізм, чэснасць і праўдзівасць, павага да людзей, сумленнасць, дабрыня, гонар і ўласная годнасць [115, с. 16–18]. Фізічны ідэал увабраў у сябе ўяўленні народа пра ідэал абаронцы Айчыны, якому ўласцівы фізічная сіла і вытрымка, працавітасць, патрыятызм, пачуццё ўласнай годнасці, упэўненасць, праўдзівасць, пачуццё справядлівасці [115, с. 15–16].

Але беларускі народ не аддзяляе маральны і фізічны ідэалы, а, наадварот, імкнецца абагульніць, спалучыць іх з асноўнай мэтай – фарміраваннемусебакова развітай асобы, якая ўвабрала ў сябе лепшыя маральныя і фізічныя якасці, – тым больш, што некаторыя з іх уласцівы і маральнаму, і фізічнаму ідэалу.

Маральны і фізічны ідэал ператвараецца ў своеасаблівы кодэкс беларускага народа – сукупнасць патрабаванняў да чалавека, правілаў і норм паводзін, – занатаваны ў розных відах вуснай народнай творчасці. Бо, як адзначае У.М. Конан у сваім даследаванні “Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору”, “стваральнік фальклору – народ сцвярджаў духоўныя каштоўнасці жыцця не павучаннем, а сваім уласным жыццём” [68, с. 179]. Таму беларускі фальклор выступае перш-наперш як сродак выяўлення народных ідэалаў і “адвечнай мары пра вольнае, справядлівае жыццё чалавека ў гарманічным адзінстве з прыродай, з блізкімі і "дальнімі" людзьмі” [68, с. 178].

Такім чынам, звернемся да вывучэння праблемы ўвасаблення ідэалу маральна і фізічна здаровай асобы ў асноўных жанрах беларускага фальклору: казках; міфах і паданнях; прыказках, прымаўках і фразеалагізмах; песнях; анекдотах і жартах.

Беларускі казачны эпас – гэта своеасаблівы выхаваўчы кодэкс народа, у якім пададзены вобраз дасканалага чалавека, раскрыты лепшыя чалавечыя якасці. Народны педагагічны геній занатаваў іх у казках розных жанраў, у залежнасці ад узросту дзяцей. Таму ў абсалютнай сваёй большасці казкі пра жывёл зарыентаваны на дзяцей 6–8-мі гадоў; чарадзейныя – створаны ў асноўным для дзетак ад 6–8-мі да 12–14-гадовага ўзросту; падлеткам і юнацтву з мэтай іх выхавання народ-педагог прысвячае сацыяльна-бытавыя і авантурна-навелістычныя казкі, бо ў дадзеных жанрах казак па-рознаму праяўляецца дыдактычная накіраванасць.

Казкі пра жывёл, як сведчыць назва, змяшчаюць у сабе ў якасці галоўных персанажаў жывёл; побач з імі дзейнічаюць птушкі, расліны, а ў некаторых казках і чалавек. Кожны вобраз дадзенага жанру казак атрымлівае індывідуальную распрацоўку, якая дазваляе дзіцяці ацаніць знешні выгляд, манеру паводзін жывёлы ў казцы, суаднесці з уласнымі ўяўленнямі і вызначыць свае адносіны да кожнага казачнага персанажа.

Рэпазіторый ВДУ

Трэба адзначыць пастаянства характарыстык кожнага вобразу, што папярэджвае блытаніну ў адносінах да канкрэтнага персанажа.

Народ-педагог стварыў казачныя вобразы жывёл такім чынам, каб праз іх паказаць адпаведныя рысы характару чалавека, якія выяўляюцца праз паводзіны і ўчынкі персанажаў з выхаваўчай мэтай – выкрыць заганныя рысы характару, паказаць іх нягоднасць і праславіць станоўчыя, падаць грамадскую каштоўнасць і асабістую значнасць апошніх. У казках дадзенага жанру ўсхваляюцца працавітасць курачкі і каня (“Зернетка”, “Лёгкі хлеб” і інш.), адданасць і вернасць сабакі (“Сабака, воўк, баран, кот і лісіца”, “Сабака і воўк”, “Сабака й грошы” і інш.), смеласць і гатоўнасць прыйсці на дапамогу пеўніка, мышкі, курачкі (“Зайкіна хатка”), мудрасць і разважлівасць коціка (“Коцік і пеўнік”, “Кот-лавун”, “Як кот і сабака дружбу з ваўком вадзілі”)– такім чынам падаюцца дзіцяці значныя рысы характару чалавека: смеласць і рашучасць, добразычлівасць, праўдзівасць, мудрасць, працавітасць.

Героі чарадзейных казак – асілкі – людзі мужныя і справядлівыя, незвычайнай сілы і здольнасцей, змагары супраць розных варожых народу сіл, увасобленых у вобразах шматгаловага змея Паганага Цмока, Кашчэя і інш. Вобраз героя ўвасабляе ў сабе народныя ўяўленні пра справядлівасць, дабрыню, сапраўдную прыгажосць; у ім спалучаюцца ўсе лепшыя якасці чалавека, дзякуючы чаму вобраз героя становіцца выражэннем народнага ідэалу. Так, у вобразах герояў занатаваны высокія чалавечыя ідэалы – дабрыня, гуманізм, справядлівасць. Менавіта дадзеныя якасці з’яўляюцца асновай усіх станоўчых рыс характару чалавека. Гэтая думка знаходзіць сваё адлюстраванне ў казачным змесце: Іван Царэвіч дзеліцца з убогім чалавекам апошнім кавалкам хлеба; паміраючы з голаду, шкадуе жывёл – не забівае іх; Іванька-дурань за апошнія грошы выкупляе сабаку і ката, вызваляе журава з пасткі і г.д.

Відавочна, што падрастаючае пакаленне праз чарадзейныя казкі атрымлівае ўяўленне аб маральным і фізічным ідэале народа, які, на думку беларусаў, павінен змяшчаць у сабе наступныя якасці: праўдзівасць, павагу да родных і старэйшых, пачуццё сапраўднай чалавечай годнасці і прыгажосці ва ўзаемаадносінах з людзьмі. Дасканалы чалавек фізічна моцны, бясстрашны, справядлівы, здольны ўступіць у адкрытую барацьбу з сіламі зла. Менавіта таму героямі большасці казак з’яўляюцца асілкі. Знаёмячыся са зместам казак, чытач заўважае, што героі-асілкі дужыя не толькі фізічна, але і маральна (“Івашка-Мядзвежае вушка”, “Іван Сучкін Сын залатыя гузікі”, “Кацігарошак”). І ў гэтым адна з галоўных педагагічных ідэй народа: фізічнай моцай, здароўем ён надзяляе для таго, каб герой мог працаваць, змагацца з ворагамі, са злом і гвалтам – у імя людскога шчасця. Фізічную сілу маюць і варожыя людзям казачныя персанажы (Паганы Цмок, Цуда-Юда), аднак з-за сваёй маральнай

Рэпазіторый ВДПУ

недасканаласці, з-за таго, што ўвасабляюць зло і насілле, самыя горшыя маральныя заганы, яны ў казках заўсёды церпяць крах. Іх перамагаюць сілы дабра і справядлівасці. Таму, на нашу думку, чарадзейныя казкі аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення ўжо хаця б тым, што садзейнічаюць фарміраванню правільнага ўяўлення аб ідэале чалавека.

Сацыяльна-бытавыя казкі па сваім змесце надзвычай разнародныя. Яны ўключаюць у сябе казкі пра разбойнікаў і махляроў, пра мудрае адгадванне загадак, пра перамогу кемлівага селяніна над чарцямі, папом, панам і г.д. Крытыка сацыяльнага ладу, устанаўленне правоў і маралі чалавека-працаўніка абумоўліваюць асаблівасці іх зместу.

Народ падае ў сацыяльна-бытавых казках вобраз працаўніка-земляроба альбо рамесніка, які ведае сваю справу і цэніць яе. Выхаваўчая мэта беларускага народа – далучыць падрастаючае пакаленне і моладзь да ідэалу чалавека-працаўніка, паказаць не толькі яго фізічную моц, якая неабходна для працы на зямлі і самаабароны (“Мужык і цар”, “Пану навука” і інш.), але і маральную прыгажосць: дабрыню, уменне спачуваць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу, пачуццё справядлівасці, кемлівасць (“Кацярына”, “Як мужык гусь дзяліў”, “Мужык і цар”, “Стары бацька” і г.д.).

Народ-педагог даводзіць да свядомасці падрастаючага пакалення, што патрэбна жыць са сваёй працы, быць у згодзе з іншымі людзьмі, праяўляць узаемадапамогу і чэснасць, тады жыццё будзе шчаслівым (“Ад крадзенага не пасыцееш”, “Скарб”, “Жораваў кашалёк”, “Чорт і баба” і інш.). Падаючы ў казках дадзенага жанру вобразы паноў, папоў, народ асуджае іх адмоўныя рысы характару: невуцтва, прагнасць, дурасць, ляноту, – узвышаючы тым самым ідэал працаўніка. Народ-педагог спецыяльна ставіць дадзеныя персанажы ў камічныя сітуацыі, якія да такой ступені разыходзяцца з цвярозым розумам, што становяцца фантастычнымі: поп такі прагны, што згодны, каб яго работнік адразу снедаў, абедаў і вячэраў, альбо, нягледзячы на шчодрыя падарункі, імкнецца адабраць у людзей усё, што яны маюць (“Папова зайздрасць не пайшла ў карысць”, “Пахаванне казла” і г.д.); дурная пані адпускае ў госці свінню з парасятамі (“Мужык і пан”); паны, нягледзячы на сваё багацце, усё хочуць выцягнуць з народа, але замест багацця атрымоўваюць кухталі (“Пану навука”, “Мужык і ксёндз”).

Такім чынам, адной з асноўных педагагічных ідэй беларускага казачнага эпасу з’яўляецца данясенне да юнага чытача вобразу дасканалага ў маральных і фізічных адносінах чалавека, прычым рысы маральнага і фізічнага ідэалу чалавека-працаўніка ці змагара за Радзіму і інтарэсы народа не супрацьпастаўлены, а ўзаемаабумоўлены і ўзаемадапаўняюцца, што робіць чалавека дасканалым усебакова.

<u>Беларускія народныя міфы і паданні</u>, якія прыйшлі да нас з далёкай мінуўшчыны і ўключаюць рэшткі паганскіх вераванняў усходніх славян,

Рэпазіторый ВДУ

таксама далучаюць падрастаючае пакаленне да маральнага і фізічнага ідэалу асобы. Шмат вякоў таму нашы продкі не маглі растлумачыць з'явы прыроды, розныя стыхіі, таму пачалі замацоўваць іх за дзеяннямі багоў, якіх неабходна было задобрыць і паднашэннем, і справай, каб папярэдзіць разгулы прыроднай стыхіі. Багі падзяляліся на станоўчых і адмоўных, яны лічыліся такімі з-за тых якасцей, якімі валодалі. Тады як станоўчага бажаства (да іх ліку можна аднесці Белуна, Дамавіка, Талаку, Сыценя, Дзявою і інш.) можна было не баяцца, трэба было толькі не ўводзіць яго ў гнеў, выконваючы ўсё, як трэба, з адмоўным (Вадзянік, Ваўкалак, Ліхаманка, Мара, Халера і інш.) лепш было зусім “не мець справы”, бо іх рэакцыяй на сустрэчу з чалавекам была ці хвароба апошняга, ці страта маёмасці або яе часткі, ці, наогул, смерць. Шэраг станоўчых багоў непасрэдна спрыяў працавітасці і гаспадарлівасці людзей. Напрыклад, Бялун – галоўны бог, бацька неба – добры і творыць усім дабро, з'яўляецца своеасаблівым заступнікам жней, нават дапамагае іх рабоце; Дамавік – “чалавекападобная істота”, якая жыве побач з чалавекам і, такім чынам, уважліва сочыць, каб ён добра вёў гаспадарку, каб усе рэчы былі на сваім месцы, каб у хаце былі спакой і згода, у адваротным выпадку ён перашкаджае свайму гаспадару, знарок знішчаючы гаспадарку; Сыцень – бог восені – клапоціцца пра парадак на палях і ў агародах, калі гаспадар – ашчадны чалавек (збірае ўвесь вырашчаны ўраджай, пакідаючы агарод ці поле чыстым), бажаство дарує яму на будучы год добры ўраджай.

Некаторыя адмоўныя багі “прымушалі” людзей жыць па-хрысціянску: у дабрыні і сумленнасці. Напрыклад, калі чалавек быў пры жыцці помслівым, жорсткім, зайздрослівым, ён станавіўся Ваўкалакам – пачварай, якая праследуе сваіх “крыўдзіцеляў” і смокча ў іх кроў. Мара ці Марна падчас сну чалавека нападае на яго і душыць, але праследуе яна не ўсіх людзей, а толькі тых, хто ўчыніў якое-небудзь злачынства або жыве несумленна. Ёсць і станоўчая істота, якая прымушае чалавека быць добрым і з павагай адносіцца да іншых людзей, – гэта Дабрахочы (“імя” бога складаецца са слоў “дабро” і “хацець”). Гэтая істота карае людзей залішне гордых, непачцівых, насылаючы на іх хваробы, якія часам прыводзяць за сабой смерць.

Дзявоя – багіня цнатлівасці – апякае дзяўчыну, пакуль тая не выйдзе замуж. Апека гэтай багіні лічыцца за вышэйшую ўзнагароду, гэты факт сведчыць аб значнасці дзявочай чысціні для беларускага народа.

Міфы беларусаў сведчаць аб значнасці фізічнага здароўя для народа, якое непасрэдна залежыць ад чыстай, якасна прыгатаванай стравы (трэба сказаць, што, на жаль, наш народ аб гэтым не вельмі клапаціўся), у адваротным выпадку немінучы “прыход” у дадзеную сям'ю Ліхаманкі альбо Халеры.

Такім чынам, беларускія народныя міфы і легенды не толькі распавядаюць аб значнасці ідэальных рыс характару: працавітасці і ашчаднасці,



Репозиторий ВГУ

дабрыні і павагі да людзей, сумленнасці, – але і прымушаюць чалавека ў жыцці кіравацца імі, інакш яго чакае кара.

Народна-педагагічны ідэал, як і яго асобныя рысы, адлюстраваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў, пры дапамозе якой адбывалася выхаваўчае ўздзеянне на асобу іў якой увасоблены правілы, патрабаванні грамадскага кодэксу, адаптаваныя пад узровень разумення выхаванцаў. У прыватнасці, усе пытанні, звязаныя з жыццядзейнасцю чалавека, яго фізічным развіццём і выхаваннем, мелі выключнае значэнне для беларускага народа, таму ён імкнуўся непасрэдна ўключыць іх у свой педагагічны арсенал, якім з'яўляюцца прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы – жывы голас народа, які выражае калектыўную думку, народную ацэнку жыцця. Асноўная іх уласцівасць – мудрасць, дасціпнасць, трапнасць, актуальнасць у выяўленні канчатковых задач выхавання і самавыхавання, яны б'юць *"не ў брыво, а ў вока"*, іншымі словамі, прымушаюць чалавека задумацца над сваімі ўчынкамі.

Не з'яўляюцца выключэннем дадзеныя віды фальклору ў паданні рыс характару дасканалага чалавека, прычым прыказкі і прымаўкі фіксуюць у асноўным ідэальныя рысы, у той час як фразеалагічныя адзінкі змяшчаюць у сабе пераважна рысы характару, супрацьлеглыя ідэальным, падкрэсліваючы пры дапамозе своеасаблівай антытэзы, якая нараджаецца ў свядомасці чалавека, значнасць станоўчых якасцей асобы ў адносінах да іншых, да сябе, да працы.

Маральнае і фізічнае сталенне асобы вызначаецца перш за ўсё праз адносіны да працы: *"Дзе быць, там трэба рабіць", "Добра працуеш – павагу маеш", "Дзе рукі і ахвота, там вялікая работа", "Дзе справа, там і слава", "Душу і сэрца ў работу ўкладзі, кожнай секундай у працы даражы"*. Фізічнае здароўе і дабрабыт чалавека непасрэдна звязаны з працай: *"Для здаровага чалавека праца лепшы доктар", "Праца здароўя не адбірае", "Не на адну хваробу праца лепшы доктар", "Без працы не будзеш есці калачы", "Вясенні дзень год корміць"*.У адносінах да стараннага і руплівага чалавека народ заўсёды зазначае, што той працуе *"з аганьком", "з душой"* ці *"з поўнай аддачай"*. Пра гультаяватага кажуць:*"абівае бакі", "сачка давіць", "вераб'ям дулі паказвае"* або *"яму раніцай росна, у поўдзень млосна, а ўвечары камары кусаюць"*, – падаючы гэтыя выразы непахвальным, асуджальным тонам. Характарызуючы працавітасць канкрэтнага чалавека наогул, а не падчас выканання ім асобнай справы, народ-педагог кажа пра спрытнага ды жвавага – *"адарві ды падай"* або *"праворны ўсюды паспее"*, пра нічога не вартага работніка *"адарві ды кінь"* або *"гультайства горш за хваробу"*. Улічваючы, што працавітасць – неад'емная рыса беларускага народа, якая спрыяе яго маральнаму і фізічнаму загартаванню, ён павучае маладое пакаленне, што неабходна навучыцца працаваць, каб *"есці свой хлеб"*, здабываючы яго *"сваім гарбом"* ці *"сваім мазалём"*, бо ў гэтым мэта жыцця чалавека, а не



Рэпазіторый ВДУ

ў тым, каб жыць без пэўнай справы –*“капціць неба”* ці *“смуродзіць свет”.*На думку народа-педагога, праца з’яўляецца асновай для станаўлення галоўных рыс характару дасканалага чалавека: *“Працаваць не любіш, чалавекам не будзеш”.*

Любоў да Радзімы –адна з абавязковых маральных якасцей народа. Станоўчыя адносіны да Радзімы закладваюцца яшчэ ў дзяцінстве, а фарміруюцца і шліфуюцца на працягу ўсяго жыцця чалавека: *“Дораг той куток, дзе рэзалі пупок”, “Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы”, “У сваім краі, як у раі”, “Дайду да свайго роду, хоць праз воду”.* Таму чалавек у небяспечны для Радзімы час імкнецца прыкласці ўсе свае сілы і намаганні, каб абараніць родную старонку – *“становіцца гарой”* ці *“становіцца сцяной”*, прымаючы за пастулат наступныя словы: *“З роднай зямлі памры – не сыходзь”, “Усякая птушка сваё гняздо бароніць”, “За родны край галаву аддай”.* Пачуццё радзімы – адно з самых моцных – уласціва ўсім. Таму, страціўшы радзіму, сувязь з ёю, чалавек пакутуе ўсё жыццё: *“Хто страціў радзіму, той плача ўсё жыццё”, “Лепей у сваіх людзях з голаду памерці, чым на чужыне золата збіраць”, “Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне”, “З роднага боку і варона мілая”, “На чужой старане і вясна не красна”.*

Маральна здароваму чалавеку ўласціва гуманнасць як “усвядомленая, устойлівая … якасць асобы”, згодна з даследаваннямі айчыннага педагога К.В. Гаўрылавец. У штодзённых узаемаадносінах людзей дадзеная якасць звязана з чалавечнасцю – народная мудрасць павучае: *“Не цані чалавека па твары, а цані па душы”, “Добрая слава даражэйшая за багацце”, “Каб добра з людзьмі жыць, не трэба каменя за пазухай насіць”, “Чаго сабе не хочаш, таго і другому не зыч”, “Трэба з людзьмі па-людску жыць”*; сумленнасцю – кожны чалавек павінен *“мець Бога ў сэрцы”* ці *быць “з чыстым сумленнем”, “з чыстай душой”.* Пра чалавека нахабнага, які страціў сумленне і сорам, звычайна казалі: *“І пад белай кашуляй бывае душа брудная”* або *“ў сабакі вачэй пазычыў”.* Калі ж ён не адстойваў справядлівасць ці знарок утойваў ад аднавяскоўцаў праўду, народ у адзін голас зазначаў, што гэта *“воўк у авечай скуры”* або *“двухаблічны янус”*; не надта хітры і каварны чалавек, які не прымаў удзелу ў грамадскіх справах, меў *“хату з краю”* або была яго *“справа старана”*, заслугоўваў наступнай народнай ацэнкі ўласных дзеянняў: *“Сядзіць ціха, а думае ліха”, “Да сэрца ліпне, а ў кішэнь паглядае”.*

У паняцце маральнага ідэалу народ укладвае, акрамя вышэйназваных, наступныя якасці:

–чэснасць і праўдзівасць: *“На праўдзе свет стаіць”, “Хлеб-соль еш, а праўду рэж”, “Праўда наверх выйдзе”, “Умей праўду сказаць, а любі праўду паслухаць”.* Ухваляючы дадзеныя рысы характару, народ-педагог рэзка асуджае нядобрасумленнасць, хітрасць, ману: *“Лепш хай праўда спаліць, чым ліха пахваліць”.* У адносінах да людзей, якіх падманваюць,

Репозиторий ВГУ

казалі:*“абуваць у лапці”, “вадзіць за нос”, “абводзіць вакол пальца”,*– называючы чалавека, які імі карыстаецца, *“падшыты лісіцай”, “мякка сцеле”, “на вуснах мёд, а ў сэрцы лёд”*. На думку народа, не трэба маніць і таіцца, праўду патрэбна гаварыць *“адкрытым тэкстам”, “у адкрытую”* ці *“вочы ў вочы”*, бо калі-небудзь *“Усё тайнае стане яўным”*;

–павага да людзей: *“Шануй людзей, то і цябе пашануюць”, “Лепш паважаць, чым зневажаць”*. Гэтая якасць дасканалага чалавека перарасла ў народны пастулат – “залатое правіла” маральнасці, якое вучыць людзей адносіцца да іншых такім чынам, як яны хочуць, каб адносіліся да іх саміх: *“Як паклічаш, так і адгукнецца”, “Пажыві для людзей, пажывуць і для цябе”*, – прычым кіравацца патрэбна адной з біблейскіх запаведзяў, што вучыць больш за ўсё шанаваць бацькоў і пажылых людзей і знайшла сваё ўвасабленне ў прымаўках: *“Бацькоў любі, старых паважай”, “Шануй бацьку з маткаю: другіх не знойдзеш”*. Згодна з парадамі, якія занатаваны ў фраземах, нельга іншых людзей *“абліваць гразззю”*, бо *“за доўгі язык не пахваляць”* – плёткі могуць абярнуцца супраць іх аўтара і пашкодзіць яго аўтарытэт у грамадстве. Наадварот, неабходна выконваць наступныя парады: *“памінаць добрым словам людзей”, “мець вока”* (г.зн. прыхільна, з павагай адносіцца да каго-небудзь), тады і людзі будуць шчыра, паважліва адносіцца ў адказ, праяўляючы *“пачуццё локця”* (г.зн. падтрымку), – таму, на думку народа, *“Лепш недагаварыць, чым перагаварыць”, “Слухай многа, а гавары мала”, “Гаварыць – гавары, ды меру знай”*;

–дабрыня: *“Добрага добра і ўспамінаюць”, “Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе”, “Добраму чалавечку добра і ў запечку”, “Лепей на свет не радзіцца, як ліхім чалавекам быць”*. Народ верыць, што добры чалавек, калі з ім пагаварыць або запрасіць у госці, заўсёды прыносіць удачу: *“Хто добрага чалавека мінае, той шчасця не мае”, “Добры чалавек, параіўшы, не шкадуе”*. Дабрыня паўстае як характэрная рыса беларускага народа, таму пра скупога чалавека гавораць: *“Каб мог, зямлю б еў”, “Ён цябе прадасць і грошы пры табе палічыць”, “За капейку бацьку роднага прадасць”*, у яго *“зімой снегу не выпрасіш”* ці *“снегу леташняга не дапросішся”*; пра ўпартага і наравістага кажуць: *“мае мух у носе”*,– адзываючыся неадабральна і асуджаючы дадзеныя рысы, якія замяшчаюць дабрыню, бо чалавек, якому яна ўласціва, –*“шырокая натура”*, адкрыты і шчодры, ён дзейнічае *“ад шчырага сэрца”, “ад усёй душы”*, г.зн. з усёй шчырасцю, адкрыта, непрытворна;

–гонар і пачуццё ўласнай годнасці: *“Чэсць даражэй за грошы”, “Беражы адзенне знову, а чэсць змоладу”*. Каштоўнасцю з’яўляецца і дзявочы гонар, ад якога залежыць далейшы лёс дзяўчыны: *“Чэсць дзявочае шчасце беражэ”*. Ухваляючы пачуццё ўласнай годнасці, народ пагардліва адзываецца пра слабавольнага, бесхарактарнага чалавека – *“мокрая курыца”, “абсевак у полі”, “малая сошка”, “адстаўной казы*



Рэпазіторый ВДУ

*барабанщчык", "ні Богу свечка ні чорту качарга"*. Асоба з пачуццём чалавечай і асабістай годнасці з'яўляецца, па народных уяўленнях, *"важнай птушкай"* ці *"птушкай высокага палёту"*, якая *"ведае сабе цану", "трымае хвост трубой"* і не залежыць ні ад каго – *"сам сабе гаспадар"* ці *"сам сабе галава"*.

Народ-педагог занатоўвае таксама ва ўстойлівых выразах і словазлучэннях рысы дасканалага ў фізічных адносінах чалавека, некаторыя з якіх аналагічныя рысам маральнага ідэалу і разгледжаны намі вышэй: працавітасць, патрыятызм, праўдзівасць, пачуццё ўласнай годнасці.

У першую чаргу, гэта асоба павінна валодаць здароўем, якое з'яўляецца больш каштоўным, чым багацце: *"Здароўе даражэй за грошы", "Здаровы багатаму варты", "Не прасі ў Бога багацце – прасі здароўе"*. На думку беларускага народа, на здароўі адмоўным чынам адбіваецца злоўжыванне спіртнымі напоямі і табакакурэннем: *"Хто курыць, таго да пекла тураць, а хто нюхае, той сам да пекла трухае", "Хто курыць, за тым чорт шкурыць", "Гарэлка весяліць, ды ад яе галава баліць", "Хваробу сабе купіў за свае грошы", "Хто не п'е, той доўга жыве"*, – таму не варта *"закладваць за каўнер", "залiваць вочы", "закiдаць за гальштук"*, ужываючы гарэлку, якую асуджальна называюць *"чортава зелле", "малако ад шалёнай каровы"* або *"зладзейка з наклейкай"*, бо яна не толькі адбірае здароўе і скарачае жыццё чалавека, але і парушае яго ўзаемаадносіны ў сям'і, грамадстве, спрыяе дэградацыі асобы і адмоўным чынам адбіваецца на выхаванні дзяцей.

Па-другое, дасканалы чалавек фізічна моцны: *"кроў з малаком"* ці *"кроў гарыць у жылах"*, – характарызуючы якога, народ зазначае: *"Дзе стан, там і сіла", "У здаровым целе і дух здаровы"*, – пасмейваючыся з людзей, у якіх не хапае сіл, здольнасцей: *"жыдкі лыткі", "сопляй пераб'еш"* або *"пораху не хапае"*.

Фізічная моц павінна спалучацца са смеласцю і ўпэўненасцю ва ўласнай сіле, якую грамада праслаўляе ў крылатых выразах: *"не з палахлівага дзясятка"* (у адносінах да смелага чалавека), *"на хаду падноскі адрывае"* (у значэнні – спрытны ў сваіх учынках), – асуджае, разам з тым, залішне пакорлівага, рахманага чалавека: *"хоць вяроўкі ві", "хоць ты да раны кладзі"* ці *"хоць у вуха кладзі"*.

Сілу і моц трэніруе вытрымка, якая спрыяе захаванню самавалодання, стрымліванню сваіх пачуццяў, каб апошнія не перашкаджалі цвярозай ацэнцы рэчаіснасці. Таму дасканалай асобе неабходна *"трымаць сябе ў руках", "валодаць сабой", "трымаць нервы ў кулаку"*.

Беларускі народны песенны фальклор спрыяе выхаванню і фарміраванню асобы ў комплексе: акрамя эстэтычнага ўздзеяння на чалавека, беларускія народныя песні, частушкі, прыпеўкі спрыяюць умацаванню здароўя (у тэкстах пададзены станоўчая яго ацэнка, значнасць



Репозиторий ВГУ

у жыцці чалавека, акрамя таго, падчас выканання песні, пераважна на свежым паветры, развіваецца голас, умацоўваюцца і трэніруюцца лёгкія: чым больш такіх “трэніровак”, тым больш здаровым становіцца чалавек), развіццю працавітасці, якая становіцца асновай для фарміравання рыс характару дасканалага чалавека, а значыць і маральнасці.

Песня суправаджае чалавека на працягу ўсяго яго жыцця: песня знамянуе яго нараджэнне, з песняй ён гадуецца, працуе, адпачывае, абараняе сваю Радзіму ад ворагаў, песня суправаджае яго ў апошні шлях. Спяваючы або слухаючы песню, чалавек забывае пра гора і крыўду, спарней працуе, весялей адпачывае, павучае падрастаючае пакаленне, укладваючы ў яе выхаваўчы змест. Усведамляючы цесную сувязь песень з жыццём чалавека і моцнае іх уздзеянне на яго свядомасць і пачуцці, народ-педагог стварае рознаўзроставыя песні, якія закліканы эстэтычна, маральна і фізічна выхоўваць падрастаючае пакаленне: калыханкі, пястушкі і пацешкі разлічаны на перыяд дзяцінства чалавека; уласна песні – для падлеткавага і юнацкага ўзросту, апошнія з’яўляюцца агульнымі і для іх бацькоў, дзядоў і бабуль.

Калыханкі адносяцца да паэзіі ранняга ўзросту. Гэты жанр песень унікальны з этычнага, эстэтычнага і педагагічнага пункту гледжання: прыгажосць і дабро ў іх выступаюць у адзінстве; калыханкі песцяць, заспакойваюць немаўля, прыносячы яму радасць; у іх занатаваны лепшыя парывы душы маці, самая пяшчотная паэзія і мелодыя, якія дзіця ўспрымае з першых дзён свайго жыцця. Калыханка – найвялікшая заваёва народнай педагогікі, яна непарыўна звязана з практыкай выхавання немаўляці, дзе ў пяшчотнай і меладычнай форме маці апавядае свайму дзіцяці пра галоўныя каштоўнасці чалавека: дабрыню, якая занатавана ў словах калыханкі, як клопат пра бліжняга; працавітасць – калыханкі расказваюць дзіцяці пра шэраг працоўных дзеянняў, адразу тлумачаць, з якой мэтай яны выконваюцца.

Пястушкі і пацешкі – “кароткія вершаваныя прыпевы, якімі суправаджаюць рухі дзіцяці падчас пеставання”. Яны абавязкова павінны суправаджацца лёгкімі цялеснымі крананнямі, якія агучваюцца песеннымі пажаданнямі дабра. У пястушках улічваюцца асноўныя моманты фізічнага развіцця дзіцяці: рост, зрокавая і тактыльная арыентацыя і перамяшчэнне ў прасторы, уключаючы ўменне цвёрда стаяць на ножках і першыя крокі.

“Пястушкі паступова пераходзяць у песенькі-пацешкі, якія суправаджаюць гульні дзіцяці з пальцамі, ручкамі, ножкамі. У гэтых гульнях ужо часта прысутнічае і педагагічнае – павучанне працавітасці, дабрыні, прыязнасці”. Народ асуджае гультая незалежна ад канкрэтнага ўзросту і лічыць, што псіхалагічная падрыхтоўка да дзейнасці павінна пачынацца з моманту абуджэння свядомасці ў дзіцячым узросце. Таму пацешкі з мэтай

Рэпазіторый ВДУ

усведамлення дзіцём значнасці працыпаказваюць, што ўзнагарода чакае толькі таго, хто працуе, а гультай нічога не атрымлівае. Гэтая заканамернасць прасочваецца ў агульнавядомай “Сароцы…”.

Падлеткі і юнакі маюць самы багаты песенны рэпертуар. Дзяўчаты звычайна складаюць і спяваюць лепшыя свае песніз рознай жанравай, музычнай, пачуццёвай, эстэтычнай і педагагічнай афарбоўкай. Звычайна гэта лірычныя песні, уякіх змешчаны думкі, пачуцці і мары дзяўчыны, яе падзяка маці, бацьку, сваякам, радзіме, роднаму дому. Гэтыя песні чуюць дзеці, якіх не могуць пакінуць раўнадушнымі мелодыка і словы песні, а таксама пачуцці дзяўчыны, з якімі яна іх выконвае.

Яшчэ больш насычанымі і шматлікімі з боку жанравай характарыстыкі з'яўляюцца песні дарослых мужчын і жанчын, песні бацькоў. Гэтыя песні цесна звязаны з жыццём народа, таму сярод іх пераважаюць абрадавыя і рытуальныя. Іх змест выконвае педагагічную функцыю, паказваючы значнасць некаторых якасцей, якія змяшчае ў сабе народны ідэал: працавітасці, патрыятызму, павагі да людзей, дабрыні, гонару і ўласнай годнасці.

Працавітасць – адназасноўныхрысхарактарудасканалагачалавека – знайшласваёадлюстраваннеўпесняхабрадавайпаэзіі: купальскіх, веснавых, восеньскіх, вясельнагаабраду. Перш чым сватацца да дзяўчыны, хлопец павінен быў пераканацца, што яна працавітая: “Купалья! Каціўся туман па сенажаці. Купалья!”, “Штоб табе, Васілік, да Бог даў”, ”Досіць каліне, досіць маліне…”:

“Купалья! Каціўся туман па сенажаці. Купалья!”  
*…Думаў малойчык дзевачку браці.*  
*Купіў ён сярпок – ці ўмее жаці?*

“Штоб табе, Васілік, да Бог даў”  
*… – Я яе відзеў на гарэ,*  
*Жала яна жыта густае.*  
*Зялёныя лугі я касіў*  
*Ды за жоначку прыгласіў.*

“Досіць каліне, досіць маліне…”:  
*…Цябе, Анечка, цябе моладу*  
*Суседзі абгаворваюць.*  
*Ні тонка прала, ні звонка ткала,*  
*Коратка парэзала.*

Гультаяватая дзяўчына нават магла застацца векавухай, бо вясковай жанчыне немагчыма без працы жыць і расціць дзяцей.



Рэпазіторый ВДУ

Многія песні вясельнага абраду праслаўляюць адно з самых моцных пачуццяў чалавека – патрыятычнае. Змест дадзеных песень распавядае пра цяжкае жыццё на чужыне і пра імкненні вярнуцца на радзіму да блізкіх людзей: “Ой, жураўка, жураўка…”, “Сулавейка маленькі…”:

“Ой, жураўка, жураўка…”
*…На чужбіне гора жыць.*
*Не дай Божа паміраць –*
*Няма й каму пахаваць.*

“Сулавейка маленькі…”
*…Не задавай жалю мне –*
*Я на чужой старане.*
*Я й на чужой старане*
*Без братачкі, без сястры.*
*Самі слёзы коцяцца,*
*Мне к радзіне хочацца.*

Павага да людзей з’яўляецца адной з галоўных якасцей чалавека ва ўзаемаадносінах з іншымі. У першую чаргу гэта датычыцца дзяўчат, якія павінны валодаць дабрынёй і паважліва адносіцца да іншых. Пры адсутнасці дадзеных рыс характару яны маглі не разлічваць на дапамогу іншых людзей або на добры шлюб: “Каліна! Ды за гарою, за даліною, каліна!”, “Ішоў Госпад лесам-борам…”:

“Каліна! Ды за гарою, за даліною, каліна!”
*…Ды там дзевачкі лён палолі.*
*Ды там ехалі два двараніна,*
*Яны сказалі: “Бог у помач!”*
*Бяднейшая адказала, багатырачка прамаўчала.*
*Ехалі назад, бяднейшаю забралі, багатырачку аставілі.*

“Ішоў Госпад лесам-борам…”
*… – Ох, ты, дзеўка, падай вады –*
*Богу ручкі-ножкі памыць.*
*Дзеўка Бога не й узнала,*
*Богу брудна адказала:*
*–Мая ж вада нячыстая:*
*Дрэвам-лісцям западала…*

Паважлівыя адносіны мужа да жонкі – асноўная ўмова сямейнага дабрабыту: “Маладзенькі малойчык…”:



Репозиторий ВГУ

*…Умееш дзевачку браці – умей яе шанаваці,*
*З вадою пераймаці.*
*…Ды ня бі яе дубцам, накажы яе слоўцам.*

Неабходнай праявай маральнасці беларускі народ лічыць пачуццё гонару і ўласнай годнасці. У паняцце мужчынскага гонару народ уключае працавітасць, гаспадарлівасць, уменне пераадольваць цяжкасці, абараняць свой род, сям'ю, родную зямлю ад ворага, быць узорным мужам, бацькам. Вельмі рана народ пачынае клапаціцца пра дзявочы гонар, які заключаецца ў тым, каб трымаць сябе строга, быць працавітай, добрай гаспадыняй, маці, выхавальніцай сваіх дзяцей. Асабліва гэтае патрабаванне датычыцца маладой дзяўчыны, якая павінна берагчы сваю чэсць і цнатлівасць: "Чэрвоная калінушка…", "Дзяўчына па гаю хадзіла":

"Чэрвоная калінушка…"
*…Ох ты, мамка, не журбуйся,*
*Мне вяночак не гатуйся.*
*Я страціла свой вяночак*
*Праз свой дурны разумочак.*

"Дзяўчына па гаю хадзіла"
*Дзяўчына па гаю хадзіла,*
*Малада ў гаю заблудзіла.*
*…*
*Ажно то быў хлопец маладзенькі.*
*– Дзяўчына, ўчыні сваю волю, –*
*Выведу з гаю на дарогу!*
*– Лепш буду ўсю ночку блудзіці,*
*Чым хлопцу волю ўчыніці!*

Відавочна, што народ-педагог паказвае значнасць асобных рыс характару дасканалага чалавека ў розных відах вуснай народнай творчасці. Не сталі выключэннем і песні. Недарэмна ў многіх абрадавых песнях беларускі народ звяртае ўвагу на неабходнасць уважлівага выбару сваёй другой паловы. Хлопец выбіраў сабе ў жонкі працавітую, чэсную і добрую дзяўчыну ("Каліна! Ды за гарою, за далінаю, каліна!", "Купалья! Каціўся туман па сенажаці, купалья!", "Штоб табе, Васілік, да Бог даў" і інш.). А дзяўчына марыла пра статнага, працавітага мужа, якому б не былі ўласцівы дрэнныя звычкі ("Чаго ты, малойчык, прыехаў?", "Як казалі, так і ёсць…", "І маладзенька дзевачка…", "Мая мамачка – пераборачка…" і інш.).Песню, такім чынам, можна з поўным правам аднесці да камбінаваных сродкаў



Репозиторий ВГУ

народнай педагогікі, якая дапамагае маладому пакаленню ўсвядоміць ідэал асобы.

Адным са сродкаў народнай педагогікі, як казкі, прыказкі і прымаўкі, песні, з’яўляюцца анекдоты і жарты, якія цесна звязаны з бытам беларусаў, бо ў іх, на думку А. Пельтуара, “усё жыццёвае і праўдзівае, (яны) не адхіляюцца ад рэчаіснасці”. Сіла анекдота – у яго сатырычнай накіраванасці, таму выхаваўчая мэта дадзенага народна-педагагічнага сродку прыхавана ў яго падтэксце і вынікае з усяго яго зместу. “Асноўная ж мэта анекдота, – як піша У.М. Сідзельнікаў, – крытыка адмоўнага ў жыцці”. Беларускія народныя анекдоты і жарты, як і іншыя народна-педагагічныя сродкі, даносяцьу выхаваўчым аспекце асаблівасці рыс дасканалага чалавека да маладога пакалення праз высмейванне адмоўных, заганных рыс альбо ўчынкаў.

Працавітасць – адна з неад’емных якасцей дасканалага чалавека. Менавіта таму беларускі народ ухваляе працавітасць у жартах і анекдотах, асуджаючы і высмейваючы гультайства: “Два лайдакі”, “Бацькавы штаны кароткія”:

“Два лайдакі”
*–Ты што робіш?*
*–Нічога.*
*–А ты што?*
*–Яму дапамагаю.*

“Бацькавы штаны кароткія”
*–Чаму ты не арэш?*
*–Бо малы.*
*–А чаму штаны кароткія?*
*–Бо бацькавы.*

У аснову ідэалу беларускі народ укладвае чэснасць, праўдзівасць, сумленнасць, высмейваючы ў жартах і анекдотах хлуслівасць, перабольшванне рэальных фактаў, пахвальбу, прагнасць да грошай: “Паміж разнікоў”, “Без злосці”, “Хто злодзей?”:

“Паміж разнікоў”
*–Учора быў вельмі добры кірмаш!*
*–А што ты купіў?*
*–Свінню. Але ж свіння, свіння! Чуць не такая, як я!*

“Без злосці”
*Слуга. Не злуйцеся, паночку, але я ўжо два месяцы ад вас пенсіі не браў…*
*Пан. Нічога, нічога, я не злуюся і далей злавацца не буду.*

“Хто злодзей?”



Репозиторий ВГУ

*Жнуць жнеі жыта. Ідзе чалавек.*
*–Памагай Бог усім, – кажа ён, – апроч злодзея!*
*Устае адна жнея.*
*–А ліха тваёй мацеры чалавек! – кажа яна. – А ці ты бачыў, як я крала.*

Гуманнасць – адна са значных якасцей маральнага ідэалу, звязаная з "залатым правілам" маральнасці, таксама мае месца ў беларускіх народных жартах і анекдотах, напрыклад, у анекдоце "Адзін другому не верыць":

*Прыйшоў вяровачнік да аптэкара купіць аршэніку.*
*–Не дам, – кажа аптэкар, – атруціцца можна.*
*Праз колькі дзён прыходзіць аптэкар да гэтага самага чалавека купіць вяровак.*
*–Не дам, – кажа ён, – павесіцца можаш.*

"Залатое правіла" маральнасці прадугледжвае паважлівыя адносіны да бацькоў і старэйшых людзей. Разглядаемыя намі жанравыя адзінкі даводзяць да свядомасці падрастаючага пакалення, што трэба з павагай адносіцца да бацькоў. Гэта дасягаецца праз падачу абсурднасці варожых і непаважлівых адносін, напрыклад, жарт з адмоўным падтэкстам "Гутарка маладых суседак":

*Кажа адна маладзіца да другой:*

*–Отяк табе добра, што твой свёкар умёр, а я свайго ніяк не збуду. Спяку хлеб, то ўжэ, здаецца, так высушу, што сама мала зубоў не паламлю ў скарынках, а ён, знаеш, сяструнько, накрышыць у місу, налье стравою, распарыць і напрэцца, як воўк, хоць зубоў не мае.*

*Тая ёй адказывае:*

*–І сёстро, то ты не так рабі: ты пячы хлеб, каб анно цеста абудзілася – няхай ён будзе, як гліна, зусім мяккі, бо і я свайго гэтакім спосабам збыла, а ад твайго ён яшчэ здароўшы будзе і даўжэй жыціме.*

*От якія нявесткі-дабрадзейкі!*

Ухваляюць жарты і анекдоты здаровы лад жыцця, які непасрэдна ўплывае на фізічнае і маральнае здароўе чалавека, асуджаючы такую загану нашага грамадства, як цяга да ўжывання спіртных напояў, напрыклад, анекдот "Як леў":

"Як леў"

– *Як я выглядаю? – пытаўся ў свайго сябры п'яны, рукі ў бок пад- пёршы.*



Репозиторий ВГУ

– *Як леў, – кажа той.*
– *А дзе ж ты бачыў льва?*
– *А во, чуеш, як хрукае ў хляве?*
– *Гэта ж свіння!*
– *Вось жа і ты так выглядаеш! – адказаў сябра.*

"Чырвоны нос"

*Дзядзька. Еш, мой каток, больш хлеба, тады будзеш здаравейшы і тварок будзе чырвоны.*

*Пляменнік. Дзядзя, пэўна, многа еў хлеба, бо нос маеш чырвоны, як бурачок.*

Такім чынам, беларускі народ праз фальклор, які прадстаўлены казкамі, міфамі і легендамі, прыказкамі, прымаўкамі і фразеалагізмамі, песнямі, анекдотамі і жартамі, імкнецца падаць агульнанародны ідэал, апісаць каштоўнасць асобных рыс характару маральна і фізічна здаровага чалавека, што сведчыць аб значнасці іх для беларусаў. Пры гэтым народ вылучае працавітасць, патрыятызм, гуманізм, чэснасць і праўдзівасць, дабрыню, павагу да людзей, сумленнасць, гонар і ўласную годнасць, пачуццё справядлівасці, вытрымку і фізічную моц значнымі рысамі маральнага і фізічнага ідэалу асобы.

Зберагчы і актыўна карыстацца ў выхаваўчай практыцы гістарычнымі здабыткамі духоўнай культуры беларускага народа ёсць галоўная задача сучаснага пакалення беларусаў, бо, па-першае, фарміраванне беларускай нацыі немагчыма без апоры на нацыянальна-гістарычныя здабыткі нашых продкаў; па-другое, беларускі фальклор адлюстроўвае не толькі мінулае, але і будучае, г.зн. тыя каштоўнасці, якія яшчэ павінны рэалізавацца; па-трэцяе, беларускі народ праз вусную народную творчасць сцвярджае ўласны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы як мэту фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы, якую, на нашу думку, трансфармуючы з улікам сучасных выхаваўчых умоў, каштоўнасных арыентацый, ментальных якасцей адпаведнага соцыуму, магчыма ўводзіць у сучасны вучэбна-выхаваўчы працэс, маральна і фізічна аздараўляючы і далучаючыцяперашняе пакаленне да пераемнай духоўнай сувязі са сваімі продкамі.

Відавочна, штонародны ідэал дасканалага чалавека паўстае ўфальклоры,асабліва ў прыказках і прымаўках, у якасці сумарнага, сінтэтычнага ўяўлення пра мэту народнага выхавання і самавыхавання, а таксама пра ўзор чалавека, да якога ў працэсе выхаваўчага ўздзеяння трэба імкнуцца. Фарміраванне дасканалага чалавека – лейтматыў народнага выхавання. Самым пераканаўчым і найбольш яскравым сведчаннем таго, што чалавек ёсць "самае дасканалае і надзвычайнае тварэнне", служыць яго пастаяннае імкненне да дасканаласці, менавіта таму здольнасць да самаўдасканалення з'яўляецца найкаштоўнейшай якасцю, увесь сэнс так званай самарэалізацыі заключаны менавіта ў дадзенай здольнасці. Так,

Рэпазіторый ВДУ

самарэалізацыя спецыяліста сацыяльнай сферы, непасрэдна звязаная з аказаннем сацыяльных паслуг і сацыяльнай дапамогі людзям, павінна быць заснавана на імкненні самаўдасканалення асабістых якасцей, згодна з грамадска значным ідэалам чалавека, а таксама прафесійных здольнасцей, згодна з прафесійным кодэксам і службовай інструкцыяй спецыяліста. Народна-педагагічны ідэал, праверaны гісторыяй, дайшоў праз стагоддзі да нашага часу і з'яўляецца актуальным у сямейным, грамадскім выхаванні, самавыхаванні, можа служыць мэтай пры фарміраванні сацыяльна-асобасных якасцей спецыяліста сацыяльнай сферы. Выхаванне і самавыхаванне з апорай на агульнанародны ідэал асобы будуць вельмі карыснымі для актыўнай прафесійнай дзейнасці і жыццядзейнасці ва ўмовах полікультурнага соцыуму, паколькі ў ідэал асобы закладзена мэта фарміравання асобы, якая імкнецца да разумення іншых культур, паважае ментальнасць і іншыя культурныя рысы іншых прадстаўнікоў соцыуму, умее жыць у згодзе з прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей, рас і веравызнанняў, здольная да актыўнай стваральнай дзейнасці ў сучасным полікультурным і шматнацыянальным асяроддзі.

Этнапедагагічная падрыхтоўка будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да работы ў полікультурным соцыуме вымагае разгляду паняццяў "полікультурнае асяроддзе", "полікультурны соцыум".

Полікультурнае асяроддзе – гэта сацыяльная прастора, у якой адбываецца агульны працэс развіцця грамадства, функцыянавання і развіцця культур ва ўсіх іх праявах. Зараз адбываецца актыўная распрацоўка навукова-тэарэтычных асноў развіцця полікультурнага асяроддзя і полікультурнага выхавання, сутнасць якога заключаецца ў стварэнні ўмоў па фарміраванні ў асобы гатоўнасці да паспяховай жыццядзейнасці ў шматкультурным атачэнні. Л.С.Мілер прадстаўляе полікультурнае асяроддзе як асаблівае інфармацыйнае асяроддзе, што выступае ў якасці сродку перадачы сацыяльнага вопыту ў сферы развіцця прафесійна-педагагічных каштоўнасцей і культуры студэнтаў, якая спрыяе развіццю адаптыўнасці, талерантнасці, шматграннасці асобы. Ш.С. Дземісенава пацвярджае, што дадзеная трактоўка полікультурнага асяроддзя дае магчымасць арыентавацца педагогам вышэйшай школы на ўсебаковае авалоданне студэнтамі культурай уласнага народа як дакладную ўмову інтэграцыі ў іншыя культуры, фарміраванне ўяўленняў аб шматлікасці культур, выхаванне станоўчых адносін да культурных адрозненняў, што спрыяюць прагрэсу чалавецтва, фарміраванню ўменняў і навыкаў эфектыўнага ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі розных культур, выхаванне ў духу міру, цярпімасці, гуманных міжнацыянальных зносін. В.У. Гладкіх даказвае, што полікультурнае асяроддзе ВНУ – гэта духоўна насычаная атмасфера шматпланавых кантактаў; прастора пазітыўнага ўзаемадзеяння індывідаў, груп, якія прадстаўляюць розныя этнасы, культуры і г.д.; узаемадзеянне са шматкультурным кантынгентам, прызваным



Рэпазіторый ВДУ

задаволіць адукацыйныя, сацыяльна-культурныя і адаптыўныя запатрабаванні чалавека.

Мы лічым, што полікультурнае асяроддзе ВНУ можа разглядацца з розных пунктаў гледжання. Калі зыходзіць з магчымасцей рэалізацыі культурна-адукацыйных паслуг, то варта гаварыць пра полікультурнае асяроддзе ВНУ як пра фарміруемую полікультурную (мультыкультурную) прастору (што ўключае працэс і вынік культуратворчасці ўдзельнікаў яе пераўтварэння), якая стварае своеасаблівы фон для шматвектарнага культурнага спажывання студэнтамі і выкладчыкамі, а значыць, для прафесійнага росту будучага спецыяліста, фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці, якая прадугледжвае наяўнасць асобаснай і прафесійнай культуры.

У якасці высновы да разумення полікультурнага асяроддзя ВНУ магчыма таксама мець на ўвазе рэаліі сучаснага свету: патрэбнасць адаптацыі асобы ў полікультурным соцыуме. Глабалізацыя ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавека, у тым ліку і ўсферы адукацыі, міжнародная акадэмічная мабільнасць актуалізавалі патрэбнасць бачання полікультурнага асяроддзя ВНУ як культурастваральнай прасторы, якая, з аднаго боку, забяспечвае ўзаемадзеянне прадстаўнікоў розных этнічных груп,а,з другога боку, дазваляе сфарміраваць талерантныя адносіны да прадстаўнікоў розных этнічных груп і культур і здольнасць адаптацыі да ўмоў жыцця і працы ў зменлівым соцыуме ў адпаведнасці са спецыфікай будучай прафесійнай дзейнасці.

Такім чынам, паняційна-катэгарыяльны апарат праблемы этнапедагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме ўключае ў сябе наступныятэрміны: 1) “прафесійная кампетэнтнасць”–сукупнасць здольнасцей, якасцей і ўласцівасцей асобы, неабходных для паспяховай прафесійнай дзейнасці ў пэўнай сферы – з сістэмай кампетэнцый, важных для станаўлення будучага прафесіянала ў сацыяльнай сферы; 2) “этнапедагогіка” (навука, што аб’ядноўвае і ўніверсалізуе міжэтнічныя грамадскія каштоўнасці і ідэалы, прынцыпы і заканамернасці, вывучае і сістэматызуе народна-педагагічныя сродкі і метады выхавання падрастаючага пакалення, вызначае і абагульняе сістэму сямейнага і грамадскага выхавання, згодна з іх разнавіднасцямі – працоўным, фізічным, маральным, эстэтычным, рэлігійным, паколькі прадметам яе вывучэння выступае народная педагогіка), а таксама яе педагагічны патэнцыял (сродкі і метады, ідэал дасканалай асобы як мэта народнага выхавання); 3) “полікультурнае асяроддзе ВНУ” (фарміруемая полікультурная прастора, якая стварае своеасаблівы фон для шматвектарнага культурнага спажывання студэнтамі і выкладчыкамі і дае магчымасць арыентавацца педагогам вышэйшай школы на ўсебаковае авалоданне студэнтамі культурай уласнага народа як дакладную ўмову інтэграцыі ў іншыя культуры, фарміраванне ўяўленняў аб шматлікасці культур, выхаванне станоўчых адносін да культурных адрозненняў, што спрыяюць прагрэсу чалавецтва, фарміраванню



Рэпазіторый ВДУ

уменняў і навыкаў эфектыўнага ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі розных культур, выхаванне ў духу міру, цярпімасці, гуманных міжнацыянальных зносін); 4) "полікультурны соцыум", які мы разумеем як сацыяльную прастору, дзе адбываецца агульны працэс развіцця грамадства, функцыянавання і культур ва ўсіх іх праявах.

## 1.2. Сучасны стан этнапедагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме

Станаўленне будучага спецыяліста сацыяльнай сферы адбываецца ва ўзаемасувязі з яго асобасным развіццём, на што скіраваны выхаваўчая работа ВНУ, шэраг вучэбных дысцыплін, вучэбная і вытворчая практыкі. Акрамя станаўлення прафесійных уменняў і навыкаў, будучы спецыяліст "шліфуе" ўласныя рысы характару, "праграмуе" комплекс асабістых паводзін, вызначае стыль узаемаадносін з іншымі. Такое асобаснае развіццё адбываецца ў адпаведнасці з ментальнасцю народа, з традыцыямі грамадскага ўзаемадзеяння ў адпаведным соцыуме.

Беларусы, як і любы іншы этнас, "уяўляюць сабой арыгінальны (непаўторны) калектыў людзей, аб'яднаны этнічнай свядомасцю, якая мае псіхолага-генетычную аснову" [136, с. 230]. Этнас узнікае пры ўдзеле прыродна-геаграфічных, геапалітычных фактараў і ўяўляе сабой сістэму, якая складаецца з субэтнасаў і этнаграфічных груп. Прадстаўнікі любога этнасу ўсведамляюць сваю адметнасць у параўнанні з прадстаўнікамі іншых этнічных калектываў, і гэта ўсведамленне выяўляюць у непаўторных паводзінах (г.зн. светаўспрыманні і бачанні сябе, сваёй ролі ў гэтым свеце), у традыцыях і звычаях, і нарэшце, у легендах і паданнях, казках, прыказках і прымаўках, г.зн. у мове, якая ўяўляе сабой адну з праяў этнічнай арыгінальнасці.

Зберагчы і актыўна карыстацца ў выхаваўчай практыцы гістарычнымі здабыткамі духоўнай культуры беларускага народа ёсць галоўная задача сучаснага пакалення беларусаў, бо, па-першае, фарміраванне беларускай нацыі немагчыма без апоры на нацыянальна-гістарычныя здабыткі нашых продкаў; па-другое, беларускі фальклор адлюстроўвае не толькі мінулае, але і будучае, г.зн. тыя каштоўнасці, якія яшчэ павінны рэалізавацца; па-трэцяе, беларускі народ праз вусную народную творчасць сцвярджае ўласны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы як мэту фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы, якую, на нашу думку, трансфармуючы з улікам сучасных выхаваўчых умоў, каштоўнасных арыентацый, ментальных якасцей адпаведнага соцыуму, магчыма ўводзіць у сучасны вучэбна-выхаваўчы працэс, у маральных і фізічных адносінах аздараўляючы цяперашняе пакаленне, далучаючы да пераемнай духоўнай сувязі са сваімі продкамі.

Адной з вучэбных дысцыплін, што выкладаецца будучым спецыялістам сацыяльнай сферы Віцебскага рэгіёна (Віцебскі дзяржаўны

Рэпазіторый ВДУ

ўніверсітэт імя П.М. Машэрава), з’яўляецца этнапедагогіка. Менавіта дадзеная вучэбная дысцыпліна актыўна ўплывае на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Пры выкладанні курса “Этнапедагогіка”, які вядзецца на беларускай мове, улічаны разнастайнасць тэм, практычных і творчых заданняў, магчымасць выбару тэматыкі даследчага праекта. Тэматыка семінарскіх заняткаў цесна звязана з вывучэннем працэсу фарміравання нацыянальна арыентаванай асобы беларуса (педагагічная культура і духоўны прагрэс народа; народны ідэал чалавека як сутнасць народнага выхавання; сродкі этнапедагогікі як шляхі дасягнення народнага ідэалу; увасабленне ідэй беларускай народнай педагогікі ў фальклоры; этнапедагогіка гульні; віды народнага выхавання). Заданні размеркаваны па мэце на вучэбныя (напрыклад, пабудаваць схему ўзаемасувязі этнапедагогікі з іншымі навукамі; раскласіфікаваць метады беларускай народнай педагогікі па пэўнай прыкмеце) і творчыя (напрыклад, скласці сцэнарый свята або віктарыну па народных прыказках і прымаўках, інсцэніраваць беларускую народную казку, анекдот, прыкмету ці павер’е (на выбар)). Студэнты на пачатку вывучэння курса выбіраюць пэўную тэму ўласнага даследчага праекта, звязанага з відамі народнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: працоўным, маральным, фізічным, разумовым, эстэтычным, рэлігійным – і пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў назапашваюць матэрыял для даследавання паступова: спачатку збіраюць фактычны матэрыял, абгрунтоўваючы народны ідэал беларусаў (прыказкі, прымаўкі, казкі, легенды і паданні, песні, жарты і анекдоты, прыкметы і павер’і); затым падбіраюць і апісваюць комплекс сродкаў і метадаў, звязаных з абраным відам выхавання для даследавання; складаюць метадычны матэрыял згодна з праблематыкай даследавання; афармляюць праект і выступаюць з вынікамі даследаванняў.

Такім чынам, студэнты падчас выкладання этнапедагогікі спазнаюць сваю духоўную лучнасць з продкамі, вывучаючы асаблівасці педагагічных ідэй і практыкі беларусаў у выхаванні падрастаючых пакаленняў, далучаючыся праз азнаямленне з народнымі святамі, абрадамі, звычаямі і традыцыямі да пераемнай сувязі паміж пакаленнямі.

Народная педагогіка беларусаў як аб’ект вывучэння этнапедагогікі, створаная выхаваўчай практыкай народа, перадаецца з пакалення ў пакаленне не проста шляхам капіравання метадаў і прыёмаў выхавання, а праз пастаяннае і мэтанакіраванае ўдасканаленне назапашанага вопыту згодна з канкрэтным выхаваўчым асяроддзем, умовамі жыцця і поглядамі асобнай сям’і ды з каштоўнаснымі арыентацыямі грамадства. Беларускія асветнікі на працягу гістарычнага станаўлення беларусаў як нацыі, падкрэсліваючы значнасць народна-педагагічнай спадчыны беларусаў, зрабілі грунтоўны ўклад у распрацоўку, навуковае апісанне, сістэматызацыю сродкаў і метадаў народнай педагогікі. Іх тэарэтыка-метадалагічная і метадычная спадчына з’яўляецца неацэнным скарбам для

Рэпазіторый ВДУ

распрацоўкі сучаснай выхаваўча-педагагічнай сістэмы, а таксама асновай для цяперашніх тэарэтычных даследаванняў па беларускай народнай педагогіцы.

Акрамя вышэйзгаданай дысцыпліны, быў распрацаваны і апрабаваны аўтарскі спецкурс “Валеалогія: этнапедагагічны аспект”, які таксама спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы.

**Мэта** выкладання дысцыпліны – фарміраваць сістэму ведаў і ўменняў па вылучэнні і выкарыстанні валеалагічна значных ідэй беларускай народнай педагогікі; па насычэнні сферы зберажэння здароўя лепшымі валеалагічнымі традыцыямі беларускай народнай педагогікі.

**Задачы** вывучэння дысцыпліны:

1) азнаёміць з тэарэтыка-метадалагічнымі падыходамі да вызначэння асноўных паняццяў і катэгорый валеалогіі з педагагічнага і этнапедагагічнага пункту гледжання;

2) прадставіць этнагенез валеалагічных уяўленняў беларусаў;

3) раскрыць сутнасць і значэнне валеалагічных ідэй у вусна-паэтычнай творчасці беларусаў;

4) падаць гістарычны аспект фарміравання грамадскага здароўя беларускага народа;

5) раскрыць сутнасць, метадычны сэнс народна-педагагічных сродкаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы, а таксама магчымасці іх практычнага выкарыстання;

6) прадставіць працэс фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, пачынаючы з пубертатнага перыяду і заканчваючы ўступленнем асобы ў дарослае жыццё.

У выніку навучання студэнт **павінен ведаць:**

– паняційна-тэрміналагічны апарат курса;
– гісторыю развіцця валеалагічных уяўленняў беларусаў;
– сутнасць валеалагічных ідэй у вуснай народнай творчасці беларусаў;
– гісторыю фарміравання грамадскага здароўя беларускага народа;
– класіфікацыі і метадычны сэнс народна-педагагічных сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы;
– працэс фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ад пубертатнага перыяду да ўступлення яе ў дарослае жыццё;
– фактары ўплыву на маральнае і фізічнае здароўе асобы;

**павінен умець:**

– вылучаць валеалагічныя ідэі ў вусна-паэтычных творах беларусаў і вызначаць іх педагагічны сэнс;
– выкарыстоўваць пэўны спектр народна-педагагічных сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы як для ўмацавання ўласнага здароўя і работы па самаўдасканаленні, так і ў будучай прафесійнай дзейнасці;



Репозиторий ВГУ

– вызначаць фактары ўплыву на здароўе асобы і карэкціраваць іх уплыў;
– аказваць прафесійную кансультацыю па складанні індывідуальных праграм па зберажэнні здароўя і падтрыманні здаровага ладу жыцця асобы.

Вырашэнне цяперашніх праблем станаўлення асобы ў адпаведнасці з агульнанародным ідэалам магчыма пры звяртанні адукацыйных устаноў Беларусі да нацыянальных вытокаў і стратэгічным выкарыстанні выхаваўча-аздараўленчага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі ў планаванні і рэалізацыі выхаваўчага працэсу. Фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы як накірункаў агульнанароднага ідэалу асобы ў сучасных вучэбна-выхаваўчых умовах ВНУ (падчас выкладання курсаў “Этнапедагогіка” і “Валеалогія: этнапедагагічны аспект”) будзе дзейсным пры выкананні наступных, гістарычна абгрунтаваных і нацыянальна вызначаных, умоў: *па-першае*, выбар выхаваўчых арыенціраў павінен ажыццяўляцца згодна са спецыфікай нацыянальнага характару і ментальнасці беларускага народа, а таксама з улікам агульнанароднага маральнага і фізічнага ідэалу, трансфармаванага з улікам сучасных выхаваўчых умоў, каштоўнасных арыентацый, ментальных якасцей адпаведнага соцыуму (бо фарміраванне беларускай нацыі немагчыма без апоры на нацыянальна-гістарычныя здабыткі нашых продкаў, беларускі фальклор як крыніца ведаў пра ідэал маральна і фізічна здаровай асобы адлюстроўвае не толькі мінулае, але і тыя каштоўнасці, якія яшчэ павінны рэалізавацца); *па-другое*, шырокае выкарыстанне сродкаў і метадаў беларускай народнай педагогікі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе навучальных устаноў, сямейным і грамадскім выхаванні (пры спецыяльнай падрыхтоўцы будучых педагогаў; праз метадычнае кансультаванне бацькоў; праз правядзенне тэматычных лекцый для шырокага кола грамадскасці); *па-трэцяе*, планаванне здаровага ладу жыцця сучаснай асобы пры выкарыстанні беларускіх народных традыцый фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы; *па-чацвёртае*,планаванне і фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення ва ўзаемадзеянні (у працы паказаны магчымасці іх спалучэння праз навукова-тэарэтычнае, гісторыка-метадалагічнае абгрунтаванне, у выглядзе табліц і логіка-структурных схем, а таксама пададзены шэраг неабходных сродкаў і шляхоў фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы, якія працяглы час паспяхова выкарыстоўвалі і ўдасканальвалі нашы продкі).

Тэмы, якія вывучаюцца ў межах спецыяльнага курса “Валеалогія: этнапедагагічны аспект”, закранаюць:

1)паняційна-катэгарыяльны апарат (катэгорыі “здароўе”, “маральнае здароўе”, “фізічнае здароўе”, “здаровы лад жыцця” з валеалагічнага, педагагічнага і этнапедагагічнага пункту гледжання.Валеалагічныя ідэі беларускай народнай педагогікі);

Репозиторий ВГУ

2) этнагенез валеалагічных уяўленняў беларусаў (мэта фарміравання здаровай асобы ў беларускай народнай педагогіцы, уплыў нацыянальнага характару беларусаў на валеалагічныя погляды народа, сучасныя даследаванні этнапедагогаў, прысвечаныя праблеме фарміравання асобы ў беларускай народнай педагогіцы, вызначальныя рысы маральна і фізічна здаровай асобы ў беларускай народнай педагогіцы);

3) валеалагічныя ідэі ў вусна-паэтычнай творчасці беларусаў (асноўныя ідэі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобыў беларускай народнай педагогіцы. Увасабленне ідэй працавітасці, гуманізму, патрыятызму, чэснасці і праўдзівасці, павагі да людзей, дабрыні, гонару і пачуцця ўласнай годнасці, фізічнай моцы, смеласці, вытрымкі, кемлівасці, адмоўных адносін да ўжывання спіртных напояў і табакакурэння);

4) фарміраванне грамадскага здароўя беларускага народа: гісторыя і сучаснасць (паняцце "ідэал маральна і фізічна здаровай асобы" ў беларускай грамадскай думцы, яго выяўленне ў фальклоры: казках, міфах і паданнях, прыказках і прымаўках, песнях, анекдотах і жартах, суаднесенасць сучаснага ідэалу і таго, што гістарычна склаўся на працягу стагоддзяў у беларускага народа);

5) народна-педагагічныя сродкі і метады фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы (валеалагічная накіраванасць сродкаў беларускай народнай педагогікі, асноўныя сродкі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя ў беларускай народнай педагогіцы, іх класіфікацыя, метады фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, іх класіфікацыя);

6) антагенез фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы (паслядоўнасць фарміравання маральнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, асноўныя этапы фарміравання фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, узаемадзеянне працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы);

7) індывідуальная праграма здароўя: кампаратыўны падыход (сутнасць і кампаненты індывідуальнай праграмы здароўя, мерапрыемствы па зберажэнні і прымнажэнні асабістага здароўя, вывучэнне ўласных недахопаў і складанне ў сувязі з імі індывідуальнай праграмы здароўя з уключэннем мерапрыемстваў, характэрных для сучаснасці і традыцыйных для народнай педагогікі).

Змест вышэйзгаданых курсаў уключае вывучэнне сродкаў і метадаў беларускай народнай педагогікі. З улікам нацыянальнай адметнасці сродкаў беларускай народнай педагогікі, іх дыдактычнага зместу (на што аказала ўплыў спецыфіка гістарычнага жыцця народа), а таксама даследчыцкага вопыту шэрага этнографаў і педагогаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя намі ўпершыню ў беларускай народнай педагогіцы была

распрацавана класіфікацыя сродкаў фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы (2005). Народна-педагагічныя сродкі мы аб'ядналі ў 2 вялікія блокі: практычны і этнакультурны, апошні з якіх падзяляецца на моўны і традыцыйна-побытавы падблокі.

Да сродкаў *практычнага блока* магчыма аднесці *працу* і *гульню*.

*Праца* – самы старажытны і апрабаваны сродак народнай педагогікі, бо яшчэ на пачатку чалавечай цывілізацыі народнае выхаванне ўзнікла і развівалася як працоўнае. Спрадвеку народ лічыў, што менавіта ў працы і праз працу адбываецца і маральнае сталенне, і фізічнае ўмацаванне і наогул, станаўленне чалавека. Да 18 год дзеці праходзілі школу працоўнага жыцця і, акрамя засваення разнастайных працоўных уменняў, навыкаў і практычнага іх выкарыстання, адначасова развіваліся ў маральных і фізічных адносінах. Маральнае сталенне асобы адбывалася ў калектыве дарослых людзей або аднагодкаў праз фарміраванне волі, адказнасці, пачуцця абавязку, ашчаднасці, акуратнасці, цярпення пры выкананні даручанай справы, а таксама праўдзівасці, рашучасці і іншых станоўчых рыс характару. Фарміраванне фізічнага здароўя асобы адбывалася пад уздзеяннем свежага паветра, пасільных працоўных абавязкаў, якія аднак патрабавалі пастаяннага дзеяння, рухаў, фізічных намаганняў, вытрымкі. Да ліку асноўных задач фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы ў працы і праз працу адносяцца: 1) фарміраванне глыбокай павагі да працы (прыклад дарослых, ухваленне працавітасці і асуджэнне гультайства грамадствам у вуснай народнай творчасці); 2) прывучэнне моладзі да сумеснай, калектыўнай працы (гэта гарантуе ўзаемадапамогу, узаемны клопат і з'яднанне працуючых разам, а таксама прывучае сачыць за тым, як выконваецца праца, і пры неабходнасці вучыць іншых або вучыцца самому); 3) навучыць падрастаючае пакаленне даражыць працоўным часам (падрыхтоўка да працы загадзя, неадкладнае выкананне тэрміновых спраў);
4) фарміраванне фізічнай загартаванасці, але суадносна з узроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі дзяцей; 5) прывіццё працоўных уменняў і навыкаў; 6) фарміраванне асобы дзіцяці праз працу.

Старажытным народна-педагагічным сродкам лічацца *гульні*. Яшчэ ў далёкай мінуўшчыне ў славяніснавалі гульні, звязаныя з земляробствам і жывёлагадоўляй, якія прывівалі дзецям і моладзі адпаведныя працоўныя навыкі і вучылі іх правільна весці гаспадарку. Дадзеную асаблівасць адзначалі беларускія этнографы канца XIX – пачатку XX ст.: "Не можа быць спрэчным тое, што большая частка мясцовых гульняў ёсць перайманне і ўзнаўленне сельскагаспадарчых і хатніх прац дарослых, вольнымі ці нявольнымі сведкамі якіх дзеці становяцца з ранніх год", – што сведчыць аб запатрабаванасці дадзенага віду гульні на працягу стагоддзяў, па-першае, у якасці сродку працоўнага выхавання дзяцей і моладзі, па-другое, як сродку для фарміравання чалавечай асобы. З развіццём грамадства

Рэпазіторый ВДУ

адбываецца павелічэнне гульнёвых жанраў: на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца гульні, звязаныя са святамі і абрадамі (каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні) і не звязаныя з імі (дзіцячыя гульні з выкарыстаннем інвентару ці без яго). Гульні займаюць значнае месца ў жыцці дзіцяці перш за ўсё як асноўная форма іх дзейнасці, раскрываючы магчымасці для развіцця і набыцця жыццёвага вопыту, але ў іх гуляюць таксама моладзь і дарослае насельніцтва. У каляндарных ("Ігрышча", "Жаніцьба Цярэшкі", "Падушачка", "Гусар", "Завіванне і развіванне вянкоў", "Талака" і інш.) і сямейна-абрадавых ("Венік", "Пазнай нявесту", "Цягаць бабу на баране", "Бабіна каша" і г.д.) гульнях удзельнічалі моладзь (або) і дарослае насельніцтва. Каляндарна-абрадавыя гульні і забавы суправаджалі значныя святы, абрады, звязаныя з народным земляробчым календаром (напрыклад, гульня "Гуканне вясны" была характэрна для свята Дабравешчанне). Сямейна-абрадавыя гульні суправаджаюць значныя сямейныя святы: вяселле, хрэсьбіны. У іх удзельнічаюць дарослыя і моладзь, не з'яўляюцца выключэннем і дзеці, якія задзейнічаны альбо як члены гульні, альбо як пасіўныя назіральнікі, што не змяншае выхаваўчага ўплыву на малых. Вясельны, перад- і паслявясельны абрады суправаджае вялікая колькасць гульняў. У час перад- і паслявясельнага абрадаў у форме гульні правяраліся ўмельства, гаспадарлівасць, асабістыя рысы характару жаніха і нявесты: "На заручынах", "Рагатка", "Агледзіны прыданага нявесты", "Праца і абліванне маладых" і інш. Вясельны абрад змяшчае ў сабе значную частку гульняў, у якіх адбываецца надзяленне маладых грашамі, падарункамі (адначасова гучаць добрыя пажаданні): "Дарэнне маладых у маладой", "Дарэнне маладых", "Завіванне".

*Моўны падблок этнакультурнага блока.* Родная мова з'яўляецца адным з найважнейшых спосабаў перадачы жыццёвага вопыту, мудрасці. Выхаваўчы вопыт беларусаў занатаваны ў вуснай народнай творчасці, прадстаўленай казкамі, прыказкамі і прымаўкамі, песнямі, пацешкамі і забаўлянкамі, прыкметамі і павер'ямі, анекдотамі і інш. На працягу многіх стагоддзяў яны былі своеасаблівым падручнікам жыцця, перадавалі ад старэйшага пакалення да малодшага вопыт і веды, жыццёвую мудрасць, этыку, погляды на выхаванне і навучанне дзяцей. Сродкі беларускай народнай педагогікі моўнага падблока змяшчаюць:

–прыказкі і прымаўкі – адны з найбольш дзейных сродкаў народнай педагогікі. Збіральнік і даследчык беларускага фальклору І.І.Насовіч у "Зборніку беларускіх прыказак" (1874) адзначаў іх магутны выхаваўчы патэнцыял: "Можна дакладна сказаць, што яны складаюць для простага народа маральна-практычную філасофію. Беларусы ўсе факты, усе выпадкі чалавечага жыцця, усе ўчынкі, як добрыя, так і благія, і ўсялякае нават меркаванне пра што-небудзь падводзяць пад мерку прыказак сваіх. Старыя людзі прыказкамі даводзяць моладзі страх Господнеў, надзею на Бога і правілы сумленнасці і дабрадзейнасці; навучаюць хатніх быць



Репозиторий ВГУ

паважлівымі да старэйшых, быць асцярожнымі ў словах і болей памяркоўваць, быць беражлівымі і ахайнымі, працавітымі і цярплівымі да блізкіх" [112]. Прыказкі і прымаўкі змяшчаюць педагагічныя ідэі і могуць рабіць выхаваўчы ўплыў, пра што сведчаць яны самі: *"Прымаўкі і прыказкі – мудрай мовы прывязкі", "Без прымаўкі і прыказкі гаворка, што ежа без солі".* Прыказкі і прымаўкі падаюць "рэцэпты" маральнага аздараўлення асобы: *"На свет лепш не радзіцца, чым ліхім чалавекам быць", "Добраму – добрая памяць", "Работу словам не заменіш", "Любі другога, як сябе самога", "Не цані чалавека па твары, а цані па душы", "Абы сумленне чыстае".* Адзінкі дадзенага жанру вуснай народнай творчасці ўтрымліваюць ідэі фарміравання і захавання фізічнага здароўя: *"Здароўе даражэй за ўсё", "Будзь здаровы, як дуб, ды моцны, як зуб", "Здароўе лёгка страціць ды цяжка набыць", "Трымай ногі ў цяпле, а галаву ў холадзе", "У лазню хадзіць – моцным быць", "Хто сам за сябе не дбае, той трасцу мае";*

–песні, у якія ўключаны звод маральных патрабаванняў, выпрацаваных на працягу шматвяковай гісторыі, суправаджаюць чалавека ад нараджэння і да смерці, адлюстроўваючы асноўныя этапы яго жыцця. Н.С.Гілевіч пісаў: "Нарадзіўшыся ў глыбокай старажытнасці, у часы яшчэ дагістарычныя, песні суправаджалі жыццё працоўнага чалавека праз стагоддзі, адлюстроўваючы ў паэтычных вобразах і малюнках яго сацыяльнае паходжанне, яго побыт, мараль і светапогляд на кожным этапе гістарычнага развіцця грамадства. …народныя песні, як і ўся народная паэзія наогул, з'яўляюцца выключна важным сродкам патрыятычнага, сацыяльнага, этычнага і эстэтычнага выхавання моладзі" [31, с. 6–7]. Песня праслаўляе чалавека высокамаральнага і асуджае тых, хто кіруецца ў сваім жыцці памылковымі ідэаламі або паводзіць сябе недастойна. Напрыклад, у творах дадзенага жанру змешчаны ідэі: 1) пра неабходнасць працаваць, каб быць шчаслівым, мець матэрыяльныя выгоды і карыстацца павагай сярод вяскоўцаў ("Стаіць вярба ў канцы сяла", "Купалёнка", "Ці ўсе лугі пакошаны" і інш.); 2) пра паважлівыя адносіны да родных, суседзяў, вяскоўцаў, як патрабуе "залатое правіла маральнасці" ("Ой, выйшла маці", "Ой, дожджык ідзе, раса нападзе", "Што на свеце пачуваецца?" і г.д.); 3) пра абавязковасць захавання чэсці і ўласнай годнасці, асабліва дадзенае патрабаванне датычылася дзяўчыны, бо яе лёс непасрэдна залежаў ад гэтага ("Дзяўчына па гаю хадзіла", "На бітым гасцінцы", "Варшавянка" і інш.); 4) пра любоў да Радзімы і патрыятычныя адносіны да родных мясцін, асабліва калі чалавек доўгі час знаходзіўся на чужыне ("Залётная пташачка", "Ой, у полі вярба", "Хадзіў, блудзіў казак пры даліне" і г.д.) і інш. Народныя песні змяшчаюць таксама ідэі захавання фізічнага здароўя, а для гэтага неабходна падтрымліваць здаровы лад жыцця: у меру працаваць і адпачываць, добра і рацыянальна харчавацца, не ўжываць спіртных напояў ("Дармо, Ясю, ходзіш", "Камары гудуць",



Репозиторий ВГУ

"Ой, белая бярозанька", "У балоце касец сена касіў", "Спіўся казак, спіўся", "Ой, п'яна я, п'яна" і інш.);

–казкі сярод іншых выхаваўчых сродкаў займаюць пачэснае месца. Пацвярджаючы дадзеную думку, даследчык беларускага фальклору пачаткуXX ст. Я.Ф. Карскі пісаў: "Казкі, як і прыказкі, гэта свайго роду народная мудрасць, на якую ён [беларускі селянін] спасылаецца ў сваім жыццёвым абыходжанні; па казках ён нават вучыцца маральнасці" [58, с. 431]. Пад уплывам казачнага эпасу фарміраваліся светапогляд, этычныя ўяўленні беларусаў, што адзначаў даследчык беларускіх народных казак А.К. Сержпутоўскі ў прадмове да зборніка "Сказки и рассказы белорусов-полешуков". На працягу многіх стагоддзяў казкі выкарыстоўваюцца беларусамі ў выхаваўчым плане, больш таго яны ўвабралі ў сябе ўсю педагагічную сістэму беларусаў. Народныя казкі гавораць аб неабходнасці быць працавітым і беражлівым ("Зернетка", "Мікіта Кажамяка", "Ад крадзенага не пасыцееш" і інш.); добрасумленным і паважлівым да людзей ("Бык, парсюк, казёл, гусак і певень", "Іван Сучкін Сын залатыя гузікі", "Жораваў кашалёк", "Стары бацька"); быць сапраўдным патрыётам сваёй бацькаўшчыны – смелым і справядлівым ("Івашка-Мядзвежае вушка", "Кацігарошак", "Іванка-прастачок", "Пану навука" і інш.). Так, беларускі казачны эпас сцвярджае ідэі, якія спрыяюць фарміраванню маральна і фізічна здаровай асобы;

–прыкметы і павер'і яшчэ ў канцы XIX стагоддзя мелі шырокае распаўсюджванне на Беларусі. Строгае выкананне і абмен імі былі звычайнай справай беларусаў, неабходнай умовай спакойнага існавання, аб чым красамоўна сведчыць народная прыказка: *"Без прыкмет ходу нет"*. Прыкметы і павер'і, на думку М.Я. Нікіфароўскага, змяшчаюць у сабе прытчавае павучанне, перадачу ўласнага або чужога назірання. Дадзены народна-педагагічны сродак утрымлівае ідэі і "рэцэпты", якія фарміруюць маральна і фізічна здаровую асобу [111, с. 15]. Напрыклад, беларусы шчыра верылі, што калі назваць дзіця імем славутага або высокамаральнага чалавека, то малому перададуцца яго добрыя якасці; каб члены сям'і, маёмасць, хатняя жывёла былі на добрым наглядзе, нельга было ўводзіць у гнеў "вартаўніка" гаспадаркі – Дамавіка, для гэтага трэба падтрымліваць лад і спакой у сям'і, быць беражлівым і клапатлівым гаспадаром. Неабходна быць пачцівым з іншымі, не паводзіць сябе залішне горда, жыць сумленна – толькі тады можна пазбегнуць розных хвароб, якія, згодна з павер'ем, насылаюць Дабрахочы, Ліхаманка ці Марна. Існавала шмат павер'яў, якія рэгламентавалі паводзіны цяжарнай жанчыны і былі заклікаdebны аказаць дабратворны ўплыў на здароўе, выгляд, характар і лёс будучага дзіцяці: нельга было глядзець на пажар, а калі такое здаралася, нельга было, спалохаўшыся, дакранацца рукамі да свайго цела [у дзіцяці ў адпаведным месцы будзе вогненная пляма]; нельга было біць і штурхаць нагамі хатніх жывёл [на свет з'явіцца вырадак]; нельга шмат есці [плод

Рэпазіторый ВДУ

вырасце вельмі вялікім, і дзіця ўвесь час будзе хацець есці], але бытавала перакананне, што цяжарная жанчына павінна есці ўсё, калі ёсць апетыт, каб будучае дзіця з'явілася на свет фізічна здаровым; нельга маніць, красці, лаяцца, зайздросціць іншым людзям [дзіця вырасце манюкай, злодзеем, грубіянам, зайздроснікам] [111];

–пацешкі і забаўлянкі даюць дзіцяці першыя практычныя навыкі, знаёмяць яго з навакольным жыццём, маральнымі нормамі і паняццямі, адначасова забаўляючы ці суцяшаючы яго. У беларусаў была своеасаблівая школа пешчання. Немаўлятак забаўлялі і адначасова прывучалі да нескладаных гульняў з дапамогай пацешак. Суправаджаючы забаўлянкі паплясквannямі дзіцяці па плечыках, ручках, пагладжваючы яго жывоцік, ручкі і ножкі, малому рабілі своеасаблівую гімнастыку. Акрамя таго кожная пацешка і забаўлянка несла выхаваўчыя магчымасці, інфармацыю дзіцяці пра навакольны свет, пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Напрыклад, забаўлянкі тыпу “Сарока-варона” даносілі да дзіцяці ідэю пра неабходнасць працаваць, а таксама знаёмілі яго з шэрагам працоўных дзеянняў, адначасова маці або іншы апавядальнік перабіралі пальчыкі дзіцяці, пагладжваючы і размінаючы іх, што спрыяла развіццю дробных мышцаў рукі. Пацешка “Кую, кую ножку…” супакойліва ўздзейнічала на дзіця прыемнай мелодыяй, незамыславатым зместам, што распавядаў аб неабходнасці клапаціцца пра блізкіх людзей. Пацешка суправаджалася пагладжваннямі ножак, а затым ціхім пастукваннем пальцам па падэшве – своеасаблівым кропкавым массажам, які беларусы прымянялі інтуітыўна. Так, можна зрабіць вывад, што дадзены сродак народнай педагогікі, разлічаны на маленькіх дзетак, спрыяў фарміраванню іх маральнага і фізічнага здароўя праз павучальны змест і масаж або гімнастыку дзіцяці;

–анекдоты, жарты, як і іншыя народна-педагагічныя сродкі, узніклі ў выніку імкнення народа па-мастацку асэнсаваць асобныя з'явы рэчаіснасці, паводзіны і ўчынкі людзей, высмеяць адмоўнае ў жыцці. Крыніцай для стварэння многіх твораў гэтых жанраў сталі казкі (“Разышлося, як заечае сала”, “Адказы мужыка” і г.д.), прыказкі і прымаўкі (“Шануй старога, як дзіця маленькае”, “Не смейся з чужой бяды, бо з цябе горш насмяюцца” і інш.). Некаторыя казачныя матывы і асобныя эпізоды перапрацоўваліся ў анекдоты, калі яны былі цесна звязаны з рэчаіснасцю і цікавілі грамадскасць. Народ занатаваў у творах дадзенага жанру многія праблемы маральнага выхавання: узаемаадносіны паміж людзьмі (“А кыш на нявестку”, “Паганы язык”, “Не смейся з чужой бяды, бо з цябе горш насмяюцца”); павагу да бацькоў (“Шануй старога, як дзіця маленькае”, “Гутарка маладых суседак”, “Кузьма”); шчырасць і праўдзівасць (“Хто злодзей”, “Разышлося, як заечае сала”, “Мужыкі пры гармаце”), – якія дапамагаюць фарміраванню маральна здаровай асобы. Маюцца ў арсенале беларускага народа і жарты, прысвечаныя прапагандзе здаровага ладу жыцця (“Як леў”, “Чырвоны нос”, “Сон” і г.д.). Такім чынам, можна

Рэпазіторый ВДУ

далучыць анекдоты і жарты да сродкаў беларускай народнай педагогікі, якія спрыяюць фарміраванню маральна і фізічна здаровай асобы.

Відавочна, што сродкі моўнага падблока скіраваны на фарміраванне маральна і фізічна здаровага падрастаючага пакалення, улічваючы яшчэ і той факт, што беларусы надавалі славеснаму ўздзеянню на свядомасць і пачуцці чалавека выключную ролю: *"Куляй пацэліш у аднаго, двух, а словам – у тысячу"*. Дадзеныя сродкі распавядаюць пра лепшыя рысы характару чалавека, нясуць у сабе моцны пазітыўны зарад, які прымушае асобу, што фарміруецца, задумвацца над сваімі дзеяннямі і ў адпаведнасці з грамадскай думкай, занатаванай у народна-педагагічных сродках, будаваць працэс самавыхавання.

Традыцыйна-побытавы падблок этнакультурнага блока складаецца са звычаяў – "спадчыннага стэрэатыпнага спосабу паводзін, рэгулятара адносін паміж людзьмі", згодна з думкай Н.П. Дзенісюк, – і традыцый, пад якімі, паводле ўяўленняў многіх вучоных, разумеецца перадача нормаў, паводзін, поглядаў, густаў, меркаванняў, перакананняў, духоўных каштоўнасцей, нораваў, звычаяў, спосабаў дзейнасці, якія выступаюць як "распрадмечаныя" кампаненты грамадскай свядомасці [37, с. 10]. Неабходна размяжоўваць дадзеныя паняцці, бо традыцыі распаўсюджаны ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і прывіваюць чалавеку агульныя ідэі, даюць пэўную накіраванасць паводзінам у залежнасці ад патрабаванняў грамадства, класа, групы; звычаі ж больш дэталёва, чым традыцыі, рэгламентуюць спосабы рэалізацыі розных грамадскіх адносін, фарміруюць простыя звычкі [37, с. 11–12]. Канчатковай мэтай звычаяў з'яўляецца стварэнне аптымальных умоў і магчымасцей здабывання жыццёвых сродкаў, забеспячэння існавання і захоўвання цэльнасці супольнасці [164, с. 213]. Сістэма традыцый і звычаяў уключае ў сябе такія кампаненты, як святы, абрады, рытуалы і цырымоніі [37, с. 12–13].

Святы – сукупнасць звычаяў і абрадаў, якія выражаюць і замацоўваюць пэўныя погляды, пачуцці, адносіны людзей да прыроды і паміж сабой, якія ўзніклі ў першабытным грамадстве і былі звязаны з каляндарным (напрыклад, Гуканне вясны, Грамніцы) ці земляробчым (Спас, Юр'я, Дажынкі) цыкламі. Святы падзяляюцца на рэлігійныя, сінкрэтычныя і безрэлігійныя. Рэлігійныя святы – царкоўныя, у прыватнасці хрысціянскія (Нараджэнне Хрыстова і інш.). Сінкрэтычнымі святамі (мелі рэлігійныя і безрэлігійныя элементы) былі традыцыйныя каляндарныя народныя святы (Каляды, Масленіца, Купалле). Да безрэлігійнай часткі народных свят належалі шматлікія гульні, асабліва на Каляды, Масленіцу, Купалле [164, с. 455].

Да рэлігійных свят адносіцца Вялікдзень – веснавое свята старажытных славян у гонар сонца, абуджэння прыроды і надыходу "вялікіх дзён" палявых работ; пазней да яго прымеркавана галоўнае хрысціянскае свята – Уваскрэсенне распятага Хрыста).Падрастаючае пакаленне падчас святка-

вання Вялікадня ўпэўнівалася ў добрым стаўленні людзей адзін да аднаго, асабліва сваякоў і суседзяў, у неабходнасці жадання здароўя і дабрабыту іншым, каб таго ж жадалі і табе, а таксама ўсведамляла, што пачатак веснавых сельскагаспадарчых работ – гэта свята для гаспадара, а не прымусовы абавязак, тым больш што ад якасці выканання веснавых спраў залежаў і будучы ўраджай, і дабрабыт у сям'і. Вышэйзгаданыя ўмовы спрыялі фарміраванню маральна здаровай асобы. Падчас святкавання Вялікадня дзеці і моладзь вадзілі веснавыя карагоды, гулялі ў рухомыя гульні, якія спрыялі іх фізічнаму аздараўленню, адначасова з'яўляючыся неабходнай умовай для падрыхтоўкі да сельскагаспадарчых і палявых прац, праверкай сіл і фізічных здольнасцей пасля зімовага адпачынку.

Безрэлігійнаячастка народных свят уключае шматлікія гульні, ігрышчы, праводзімыя падчас значных народных свят (Масленіцы, Купалля і г.д.). Свята Масленіцы, якое адносіцца да разраду *сінкрэтычных*, з'яўляецца старажытным перадвеснавым святам у славянскіх народаў, яно звязана з культам прыроды, з адраджэннем пладаносных сіл зямлі. Народныя ігрышчы, праводзімыя падчас свята, фарміравалі фізічна здаровае падрастаючае пакаленне. Масленічныя абрады і звычаі спрыялі маральнаму аздараўленню асобы: планаванню сваіх паводзін, каб не дапусціць дрэннага абыходжання з людзьмі; фарміраванню гасціннасці (наведванню бабкі-павітухі, сваякоў, суседзяў або запрашэнню іх у госці), каб патомства было здаровым і шчаслівым, каб не звёўся род.

Абрады – сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў, што сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей паміж сабой, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца [164, с. 14]. Яны ўтрымліваюць у сабе элементы песеннага, харэаграфічнага, драматычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Свой пачатак бяруць у першабытным грамадстве, калі людзі імкнуліся заклінаннямі ўздзейнічаць на незразумелыя ім з'явы прыроды. Абрады былі звязаны з гаспадарчай дзейнасцю, бытавымі ўмовамі, грамадскімі адносінамі, таму відавочны іх падзел на земляробчыя, якія ў сувязі з пастаяннай паўторнасцю сельскагаспадарчых работ і прыстасаванасцю іх да пэўных дат або перыядаў прынята называць каляндарнымі (апошнія падзяляюцца на зімовыя – звязаны са святкаваннем Каляд, Масленіцы, Грамніц;вясновыя – Гуканне вясны, Першы выхад у поле; летнія – звязаны са святкаваннем Купалля, Зажынак, Дажынак – і восеньскія – са святкаваннем Спаса, Багача, Пакроваў), і сямейна-бытавыя (вясельныя, радзінныя, пахавальныя). Амаль усе абрады насычаны музыкай, песнямі, танцамі.

Падчас абраду Першай баразны падрастаючае пакаленне цвёрда пераконвалася ў неабходнасці праяўляць стараннасць, ашчаднасць і акуратнасць у сялянскай працоўнай дзейнасці. Абрадавыя дзеянні аб'ядноўвалі членаў сям'і, бо былі скіраваны на ўзмацненне родасных адносін і павагі да бацькі як галоўнага кармільца, прывучалі дзяцей па-гаспадарску



Репозиторий ВГУ

адносіцца да хатняй жывёлы, якая дапамагала ў сялянскай працы. Падрастаючае пакаленне ў дзень Заворвання таксама рыхтавалася да веснавых палявых работ, якія звычайна пачыналіся на наступны дзень. Так, дадзены абрад непасрэдна спрыяў маральнаму і фізічнаму аздараўленню асобы.

Да сямейна-бытавой абраднасці прынята далучаць шматлікія радзінныя абрады. Прааналізуем адзін з абрадаў,што выконваецца бабкай-пупарэзніцай падчас святкавання радзін, які носіць назву абрадуачышчэння. Ён, на думку беларусаў, садзейнічаў таму, што нованароджаны стане паважаным чалавекам у грамадстве, да якога будуць прыслухоўвацца, а таксама, як вырасце, будзе хутка бегаць; дзеці, якія падчас “ачышчэння” з’ядалі кашу, надзяляліся, па народных уяўленнях, здароўем і фізічнай моцай.

Наогул, падрастаючае пакаленне і моладзь, назіраючы або выконваючы радзінныя абрады, пераконваліся ў тым, што трэба жыць у дружбе і згодзе з роднымі, суседзямі, вяскоўцамі, паважаць іх, жадаць здароўя і дабрабыту, каб заручыцца іх падтрымкай і ў момант радасці, і ў момант гора; а таксама ў неабходнасці валодаць фізічнай сілай, вытрымкай, каб разбіць гаршчок з “бабінай кашай” або “цягаць бабку на баране”, перавернутай зуб’ямі ўніз, якую клалі на сані або калёсы, упрагаліся ў іх і вазілі бабку па вёсцы (выконвалі гэты абрад бацька нованароджанага з кумам), а астатнія госці суправаджалі іх і спявалі хвалебныя песні бабцы.

Цырымоніі – сукупнасць сімвалічных дзеянняў [урачыстага характару, якія суправаджаюць важныя падзеі грамадскага і асабістага характару] для правядзення афіцыйнага, урачыстага акта [37, с. 13].

Тэрмін “рытуал” часта выкарыстоўваюць для абазначэння найбольш урачыстых абрадаў, але ён увасабляе не столькі змест, колькі акцэнтуе ўвагу на галоўнай падзеі, выказвае тыя ці іншыя адносіны да яе [164, с. 213].

Традыцыйным рытуалам запрашэння на вяселле, які ўключаў шэраг цырыманіяльных дзеянняў, былі запросіны. Дадзены рытуал спрыяў фарміраванню маральнага і фізічнага здароўя не толькі ўсіх яго ўдзельнікаў (нявесты, жаніха, бацькоў маладых, хлопчыкаў-прасатых, дружкоў і дружак, запрошаных), але і тых, хто назіраў за ім. Перш за ўсё дзеці і моладзь пераконваліся, што неабходна добра адносіцца да людзей: з павагай, удзячнасцю, быць шчырым, чэсным і справядлівым у абыходжанні і са сталымі людзьмі, і з равеснікамі, і з маладзейшымі за сябе, – каб не прыйшлося потым чырванець, просячы прабачэння пры запрашэнні, каб людзі не адвярнуліся, дапамаглі наладзіць вяселле і прыйшлі на яго. Па-другое, разлічваць на замужжа магла толькі працавітая, шчырая, сціплая, але з пачуццём уласнай годнасці, беражлівая, добразычлівая дзяўчына, а на жаніцьбу – і працавіты, надзейны, сур’ёзны, з пачуццём уласнай годнасці, добразычлівы малады чалавек. Аб гэтым юнакі і дзяўчаты павінны былі паклапаціцца загадзя, каб быць упэўненымі, што ў іх будзе добры і дастойны шлюб.

Так, можна пераканацца ў тым, што сродкі этнакультурнага падблока дапамагаюць фарміраванню маральна і фізічна здаровай асобы. Звычаі і святы

Репозиторий ВГУ

спрыяюць лучнасці пакаленняў, аб’ядноўваюць намаганні беларусаў у выхаванні дзяцей і моладзі, прымушаюць падрастаючае пакаленне сачыць за сваімі дзеяннямі, адносінамі да іншых, браць ва ўласны арсенал станоўчыя рысы характару, каб у выніку не наклікаць ганьбу на сябе, сваіх бацькоў, свой род.

Такім чынам, відавочна выключная роля сродкаў беларускай народнай педагогікі ў фарміраванні маральнага і фізічнага здароўя асобы, якая праяўляецца не толькі ў славесным уздзеянні на пачуцці і свядомасць падрастаючага пакалення з боку дарослых і не толькі шляхам далучэння да традыцыйных для беларускага народа звычаяў і свят (падразумяваюцца народна-педагагічныя сродкі этнакультурнага блока), але і ў прывучэнні з маленства да выканання ўсіх этычных правілаў і нормаў, прынятых у грамадстве, і ў мэтанакіраванай штодзённай фізічнай падрыхтоўцы дзяцей і моладзі (сродкамі практычнага блока).

Шматвяковая практыка народнага выхавання не толькі вылучыла аспекты фарміравання чалавечай асобы, але і прапанавала <u>метады</u>, што дапамагалі народу ў дасягненні мэты выхавання. Імі традыцыйна карысталіся беларусы, перадаючы свой вопыт з пакалення ў пакаленне, нягледзячы на тое, што дадзеныя правілы выхавання не былі навукова сфармуляванымі і даследаванымі. Выхавальнікі спачатку гаварылі, тлумачылі, паказвалі, унушалі сваім выхаванцам, затым давалі пасільныя даручэнні, каб замацаваць растлумачанае альбо паказанае, калі дзіця выконвала даручаную справу няякасна, то патрабавалі, каралі адмовай у чым-небудзь альбо фізічна, у адваротным выпадку хвалілі, заахвочвалі і г.д. Абавязковай умовай выхавання была праверка адпаведных якасцей асобы выхаванца, яго ведаў, уменняў і навыкаў з дапамогай розных іспытаў, якія бяруць свой пачатак у першабытным грамадстве.

Зыходзячы з дадзенага вопыту беларускі народ сфармуляваў у прыказках і прымаўках своеасаблівыя “метадычныя” рэкамендацыі, якія б забяспечвалі поспех у прымяненні народна-педагагічных метадаў:

1) выхоўваць змалку *(“Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць”, “Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка”, “Калі тонкага дрэва не сагнеш, то тоўстага не адужаеш”)*;

2) бацькам сур’ёзна адносіцца да справы выхавання ўласных дзяцей *(“Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць”, “Нягоднік не родзіцца, а робіцца”, “Твае дзеці – табе і глядзеці”, “Што ў дзяцінстве выхаваеш, на тое ўстарасці абапрэшся”)*;

3) выхавальніку трэба быць узорам для сваіх выхаванцаў *(“Ад добрага кораня – добры і сучок”, “У добрых бацькоў і дзеці добрыя”, “Маладыя ад старых вучацца”)*;

4) быць шчырым, добразычлівым у адносінах да іншых *(“Як паклічаш, так і адгукнуцца”, “Да чыстай крыніцы сцежка ўтаптана”, “Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае”)*;

5) быць гаспадаром сваіх слоў і дзеянняў *("Добры чалавек параіўшы, не шкадуе", "Умеў памыліцца, умей і паправіцца")*.

Адзін з заснавальнікаўбеларускай народнай педагогікі Г.П. Арлова вылучыла шэраг метадаў выхавання, уласцівых беларусам. Гэта праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, наказ, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, расповед, гутарка, іспыт, спаборніцтва, практыкаванне, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне і ўхваленне, благаславенне, асуджэнне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён [7, с. 18].

У беларускай народнай педагогіцы існуе шэраг умоў, што вызначаюць фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы: 1) натуральныя, прыродныя дадзеныя, асаблівасці арганізма і цэнтральнай нервовай сістэмы асобы; 2) сацыяльныя ўмовы (сям'я, г.зн. пэўны тып узаемаадосін яе членаў, і акружэнне асобы: калегі па працы, сябры, суседзі, вяскоўцы і г.д.); 3) сам суб'ект, што фарміруе сваё здароўе ў мэтанакіраванай дзейнасці шляхам развіцця ўласнай волі і пераадолення шэрага шматлікіх унутраных і знешніх супярэчнасцей.

Улічваючы ўплыў вышэйзгаданых умоў на фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы, а таксама нацыянальна-гістарычную адметнасць дыдактычнага зместу, прапануем класіфікацыю метадаў беларускай народнай педагогікі па прыкмеце выходнай ініцыятывы, што складае тры групы: метады ініцыятывы "акружэнне "Я"", метады ініцыятывы "Я", метады ўзаемнай ініцыятывы (табліца 1.3).

1. Метады ініцыятывы "акружэнне "Я"": прыклад і аўтарытэт, наказ, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, распавед, грамадская думка, заахвочванне і ўхваленне, асуджэнне і ўшчуванне, благаславенне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён.
2. Метады ініцыятывы "Я":назіранне; у залежнасці ад узросту асобы, што фарміруецца, узроўню сфарміраванасці яе валявых якасцей, мэтанакіраванасці, сталасці яе матывацыйнай сферы некаторыя метады ініцыятывы "акружэнне "Я"" могуць пераходзіць у дадзеную групу з часткай словасама-: самаўнушэнне, самаперакананне, самапрывучэнне, самаўшчуванне, самаўхваленне, самаасуджэнне, самапакаранне.
3. Метады ўзаемнай ініцыятывы: гутарка, спаборніцтва, праца, гульня, іспыт, практыкаванне.

Табліца 1.3 – Класіфікацыя народна-педагагічных метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы

| Метады ініцыятывы "акружэнне "Я"" | Метады ініцыятывы "Я" | Метады ўзаемнай ініцыятывы |
|---|---|---|
| прыклад і аўтарытэт<br>тлумачэнне<br>парада | назіранне | гутарка<br>спаборніцтва<br>праца |



Рэпазіторый ВДУ

| | | |
|---|---|---|
| расповед<br>перакананне →<br>прывучэнне→ | самаперакананне<br>самапрывучэнне | гульня<br>іспыт<br>практыкаванне |

*Заканчэнне табліцы 1.3*

| | | |
|---|---|---|
| унушэнне→<br>заахвочванне→<br>ухваленне→<br>ушчуванне→<br>асуджэнне→<br>пакаранне→<br>грамадская думка<br>наказ<br>благаславенне<br>вымова<br>пагроза<br>праклён | самаўнушэнне<br>самазаахвочванне<br>самаўхваленне<br>самаўшчуванне<br>самаасуджэнне<br>самапакаранне | |

**Метады ініцыятывы "акружэнне "Я""** з'яўляюцца своеасаблівым рэгулятарам паводзін і перакананняў асобы, уздзейнічаючы на свядомасць выхаванца. Яны маюць на мэце выпрацаваць у дзіцяці разуменне значэння той якасці, якую яму імкнуцца прывіць; спрыяюць устанаўленню і фарміраванню пэўных маральных паняццяў, перакананняў і пачуццяў дзяцей, а таксама пэўных рыс маральнага і фізічнага ідэалу асобы: працавітасці, дабрыні, чэснасці і праўдзівасці, акуратнасці, беражлівасці, уважлівасці, фізічнай моцы, вытрымкі і інш.

Адным з самых распаўсюджаных метадаў дадзенай групы з'яўляецца расповед як абавязак кожнага дарослага чалавека ў адносінах да дзіцяці. Расповед дарослыя пачынаюць прымяняць у якасці выхаваўчага метаду ледзь не з самага нараджэння дзіцяці: матчына мова, тэмбр яе голасу ў час звяртання да дзіцяці станоўча ўплываюць на немаўля, якое яшчэ не спазнала мовы, але ўжо на дадзеным этапе станоўча рэагуе пры дапамозе ўсмешкі, рухаў, спалучэння гукаў і г.д. Такія ласкавыя звароты маці або іншых членаў сям'і да дзіцяці закліканы адкрыць малому станоўчыя пачуцці, паказаць прыгажосць добрых узаемаадносін паміж людзьмі, адначасова ўмацоўваюць нервовую сістэму немаўляці спакойным ці крыху гарэзлівым тонам падчас расповеду. Слухаючы дарослых, дзіця спазнае акаляючую рэчаіснасць, шматграннасць узаемаадносін, свае гістарычныя карані, знаёміцца з народнай творчасцю, працоўнай дзейнасцю і г.д. Гэта ўплывае на фарміраванне маральных паняццяў, дапамагае развіць маральныя пачуцці дзіцяці і ў выніку выхаваць асноўныя маральныя якасці асобы.

Репозиторий ВГУ

Метадамі, у значнай ступені падобнымі да расповеду, выступаюць перакананне і тлумачэнне. Метад пераканання разлічаны на ўсведамленне выхаванцам сваёй ролі ў грамадстве, на ўменне суадносіць уласныя паводзіны з асабістымі ўстаноўкамі і агульнапрынятымі правіламі. Іншымі словамі, дадзены метад фарміруе свядомага члена грамадства, асобу, прычым яго змест і форма змяняюцца ў залежнасці ад узросту выхаванца: спачатку найбольшую эфектыўнасць маюць вусная народная творчасць, прадстаўленая шматлікімі песнямі, казкамі, прыказкамі і прымаўкамі, прыклад блізкіх людзей (бацькоў, старэйшых братоў і сясцёр); затым народ выкарыстоўвае арсенал больш моцных доказаў – выхоўвае на ўласных жыццёвых (працоўных, баявых) традыцыях, прыкладзе самых паважаных людзей і г.д.

Але рыхтуе дзіця да вышэйзгаданага метаду метад унушэння, які шырока выкарыстоўваецца ў сям'і з самых першых дзён дзіцяці шляхам прамога славеснага ўздзеяння на выхаванца. Унушаемае прымаецца дзіцём на веру, калі выхавацель (бацькі, старэйшыя, равеснікі) карыстаецца аўтарытэтам і пашанай. Часта для самых маленькіх унушэнне ўвасабляецца ў канкрэтныя адзінкі вуснай народнай творчасці: пацешкі, калыханкі, казкі. Затым па меры сталення і інтэлектуальнага росту дзіцяці дадзены метад пераходзіць у метад пераканання.

Прыклад і аўтарытэт не менш каштоўны ў плане фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы метад дадзенай групы. Народ-педагог актыўна карыстаецца ім, спалучаючы з гутаркай, расповедам, унушэннем. Ды і ў асобы, што фарміруецца, абавязкова ёсць прыклад для пераймання, галоўнае, каб ён быў станоўчым. А ў гэтым рашаючую ролю адыгрываюць блізкія людзі, перш-наперш бацькі дзіцяці. Своеасаблівым захавальнікам маральнасці і дабрачыннасці быў самы старэйшы член сям'і (бацька, дзядуля і г.д.), які карыстаўся пашанай і павагай ва ўсіх. Менавіта да яго звярталіся за парадай, ён вырашаў спрэчкі, а таксама, маючы аўтарытэт у дадзенай сям'і і за яе межамі, імкнуўся паводзіць сябе і працаваць так, каб не было сорамна перад аднавяскоўцамі і дамачадцамі. Вышэйзгаданае яскрава пацвярджаюць беларускія народныя прыказкі і прымаўкі: *"Маладыя ад старых вучацца"*, *"Ад добрага таты добрыя парады"*, *"Падсадзі на печ дзядулю – цябе ўнукі падсадзяць"* і іншыя.

У кожнай вёсцы абавязкова былі самыя паважаныя людзі – своеасаблівыя эталоны маральнасці і фізічнай сталасці. З імі раіліся па розных пытаннях, нават па праблемах выхавання дзяцей: *"Бацька не наўчыў, то людзі навучаць"* або *"Людзі навучаць, як жыць на свеце"*, – з іх бралі прыклад, бо гэта былі звычайна адны з самых працавітых і гаспадарлівых людзей вёскі: *"Арцель атаманам красна"*.

Таксама дадзены метад знаходзіць сваё выяўленне ў казачным і былінным эпасе. Падрастаючае пакаленне вучыцца на прыкладах герояў

Репозиторий ВГУ

казак і былін, рэальных гістарычных асоб або пераймае некаторыя рысы іх характару.

Прывучэнне – гэта практыкаванне, якое выконваецца з большай інтэнсіўнасцю. Вобразнасць, нагляднасць і эмацыянальнасць, якая выяўляецца пры паказе ўзору тых ці іншых працоўных дзеянняў, паводзін старэйшымі, найлепшым чынам уплываюць на набыццё пэўных навыкаў і ўменняў, а таксама на выпрацоўку карысных звычак. Пры гэтым выхавацелі (бацькі, родзічы, суседзі, вяскоўцы) кантралююць паводзіны сваіх выхаванцаў, сочаць не толькі за працяканнем працэсу прывучэння, але і за захаваннем апошнімі традыцыйнага для беларусаў спосабу паводзін, бо, як сведчыць народная прыказка,*“Калі сабака змалку прывыкня праз вокны лазіць, дык яго гэткім і воўк з’есць”*. Прывучэнне ў беларускай народнай педагогіцы ажыццяўляецца некалькімі шляхамі, якія адрозніваюцца паміж сабой мерай прымусу: 1) выхавацелі адкрыта ставяць перад выхаванцам задачу засваення пэўных нормаў паводзін, звычайна выкарыстоўваючы аўтарытарны тон *(“Будзь акуратным”, “Выпрацоўвай у сабе ашчаднасць і гаспадарлівасць”* і г.д.); 2) ускосна даводзяць задачу да свядомасці дзіцяці з дапамогай адзінак вуснай народнай творчасці (напрыклад, прыказак: *“Умеў памыліцца, умей паправіцца”, “Хто бацькоў не слухае, той у пальцы дзьмухае”* і інш.). Адной з умоў прымянення метаду прывучэння ў народнай педагогіцы беларусаў выступае яго гуманізацыя, г.зн. максімальнае змяншэнне прымусовага ўздзеяння на выхаванца: для маленькіх дзяцей спалучаючы прывучэнне з гульнёй (падтрымліваючы іх зацікаўленасць); дзецям больш старэйшага ўзросту выхавацелі тлумачылі практычную каштоўнасць ці канчатковы вынік прывучэння да чаго-небудзь; падлеткаў і моладзь звычайна ўводзілі ў курс справы і імкнуліся выкарыстоўваць дадзены метад не прымусам, а адносінамі да іх як да роўных сабе (напрыклад, беларуская народная прымаўка зазначае: *“Разумны бацька і ў сына пытае”,*– разумеючы пад дадзенымі словамі, што стаўленне да сваіх дзяцей як да дарослых падтрымлівае іх зацікаўленасць ва ўдзеле ў сямейных справах, а таксама фарміруе адказнасць за свае дзеянні). Такім чынам, народ-педагог дастаткова ўмела і гуманна падыходзіць да выкарыстання дадзенага метаду, каб больш эфектыўна ўздзейнічаць на падрастаючае пакаленне.

Грамадская думка – бадай адзін з самых дзейных метадаў народнай педагогікі. Чалавек як асоба грамадская заўсёды прыслухоўваецца і ўзгадняе свае дзеянні з меркаваннем людзей, што яго акружаюць, асабліва тых, якія карыстаюцца ў яго павагай і аўтарытэтам. Дадзены метад знаходзіць сваё выяўленне ў народных прыказках і прымаўках, афарызмах і з’яўляецца, з аднаго боку, сродкам духоўнага ўздзеяння на паводзіны чалавека *(“Ідзі з людзьмі – то не згубішся”, “Вучы народ, вучыся і ў народа”)*, з другога – рэгулятар паводзін людзей у грамадзе (*“Ні бача сава, якава сама”, “Калі раіш суседу, то абмазгуй да следу”* і інш.). Безумоўна,



Репозиторий ВГУ

грамадская думка ўплывае на фарміраванне маральна і фізічна здаровай асобы, што яскрава дэманструюць беларускія народныя прыказкі і прымаўкі.

Наступныя метады аб'яднаны стымулюючай накіраванасцю выхаваўчага працэсу, яны вядомы з даўніх часоў, бо сам тэрмін паходзіць ад старажытнагрэчаскага "стымул" – драўляная палка, якой карысталіся для падгону лянівых жывёл. Стымуляванне, як можна пераканацца, – гэта ў нейкай ступені прымушэнне і да дзеяння (метады заахвочвання), і да роздуму, да аналізу сітуацыі, сваіх дзеянняў і т.п. (парада, наказ, метады заахвочвання, метады асуджэння), бо чалавеку, як і жывёле, неабходны пастаянныя стымулы, якія альбо паскараюць (метады заахвочвання), альбо стрымліваюць (метады асуджэння) пэўныя дзеянні. Дадзеная група метадаў дапамагае асобе, што фарміруецца, замацоўваць альбо перайначваць жыццёвыя ўстаноўкі і прынцыпы, адкладзеныя ў свядомасці, бо, на думку народа, набытае дзіцём можна адшліфаваць, пра што красамоўна сведчаць беларускія народныя прыказкі і прымаўкі (напрыклад, *"Разумным дзіця не родзіцца", "Нягоднік не родзіцца, а робіцца", "Благая кампанія і добрага псуе", "Куй жалеза гарачае"* і інш.).

Да групы метадаў заахвочвання адносяцца ўхваленне і заахвочванне, якія даволі часта сустракаюцца ў паўсядзённым жыцці. Народ-педагог выступае за разумнае выкарыстанне метадаў дадзенай групы. Метад ухвалення павінен укладвацца ў агульнапрынятыя ў народзе каноны (не хваліць празмерна, выкарыстоўваць дадзены метад у значных выпадках і не дапускаць ні ў якім разе самаўхвалення: *"Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць", "Хто сам сябе хваліць, няхай пярун таго спаліць"*). Звычайна дадзены метад прымянялі пры выхаванні дзяцей з самага іх маленства, стымулюючы апошніх на добрыя ўчынкі ці засваенне працоўных уменняў (прычым найлепшага выніку дасягала пахвала дзіцяці ў прысутнасці іншых людзей), а са сталеннем выхаванцаў звярталіся да яго параўнальна рэдка. Метад заахвочвання цесна звязаны з метадам ухвалення, бо часам апошні можа выступаць своеасаблівым заахвочваннем для далейшага асобаснага развіцця альбо для фарміравання пэўнай рысы характару. Акрамя слоўнага заахвочвання, да якога адносяцца падзяка, пахвала (што выступаюць у якасці маральнай ацэнкі ўчынкаў выхаванца), распаўсюджана сярод беларусаў і матэрыяльнае заахвочванне (прадастаўленне права выкарыстоўваць тыя ці іншыя рэчы і распараджацца імі, асабліва ў працоўным выхаванні, дарэнне падарункаў і г.д.). Але і ў дадзеным выпадку неабходна пачуццё меры, бо злоўжыванне гэтым метадам прыводзіць да супрацьлеглага выніку. Такім чынам, метады заахвочвання служаць своеасаблівым стымулам пры фарміраванні пэўных рыс характару, што спрыяе маральнаму і фізічнаму аздараўленню асобы.

Метады асуджэння ў народнай педагогіцы беларусаў уключаюць у сябе ушчуванне, вымову і асуджэнне. Народ дастаткова ўважліва ставіцца да ўжывання дадзеных метадаў, аб чым сведчыць беларуская прыказка:



Рэпазіторый ВДУ

*“Хваляць – заткні вуха, крытыкуюць – слухай”.* Да іх звычайна звяртаюцца, калі выхаванец упершыню зрабіў нешта благое, што разыходзіцца з агульнапрынятымі правіламі і канонамі. У такім выпадку выхавацель слоўна выказвае ўласнае неадабрэнне, крытыкуе дзеянні і ўчынкі сваіх выхаванцаў з пазіцый агульнапрынятай маралі. Часцей за ўсё з дадзеных метадаў выкарыстоўвалі асуджэнне, таму ў беларускай народнай педагогіцы сфарміравалася пэўная паслядоўнасць прыёмаў асуджэння, якія падпарадкоўваліся месту, узросту і правілам прыстойнасці. Напрыклад, у гасцях ці пры іншых людзях выкарыстоўваліся асуджальныя погляды і жэсты, слоўнае асуджэнне лічылася найбольш эфектыўным у сямейнай атмасферы альбо сам-насам з дзіцём. Беларускі народ захаваў шматлікую колькасць прыказак і прымавак, што асуджаюць пэўныя чалавечыя заганы (напрыклад, гультайства: *“Яму раніцой росна, днём млосна, а ўвечары камары кусаюць”, “За сном і спачыць няма калі”* і г.д.). Ужыванне дадзеных метадаў было дастатковым, каб выхаванец выправіў свае паводзіны, але, на жаль, бывалі выпадкі, калі падрастаючае пакаленне працягвала паводзіць сябе, як і раней, тады пры іх выхаванні выкарыстоўваліся пакаранне, пагроза і праклён.

Пакаранне – гэта такі метад народнай педагогікі, які можа прадухіляць альбо замаруджваць непажаданыя ўчынкі, выклікаць пачуццё віны і жаданне выхаванца выправіцца. У народзе існуе некалькі відаў пакарання, што звязаны з даручэннем дадатковых абавязкаў, з выпраўленнем зробленага не так, як патрэбна, са змяншэннем пэўных правоў, з выражэннем маральнага асуджэння. Але традыцыйна пад словам “пакаранне” народ разумее фізічнае ўздзеянне на выхаванца. На мэтазгоднасць ужывання фізічнага пакарання існуе некалькі рознапалярных пунктаў гледжання: адны лічаць, што яно жыццёва неабходнае для правільнага выхавання дзіцяці *(“Гадуй хлапца, ды не шкадуй дубца”, “Калі тонкага дрэва не сагнеш, то тоўстага не адужаеш”)*, другія ўпэўнены, што дадзены від пакарання не прыносіць карысці, а наадварот, прыніжае годнасць дзіцяці *(“Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумнеюць”, “Ласкавае слова лепш за дубіну”)*.

Пагроза цесна звязана з пакараннем, бо яна з’яўляецца своеасаблівым папярэджаннем да выкарыстання апошняга і заклікана засцерагчы выхаванца ад дрэннага ўчынку, а значыць і ад пакарання.

Праклён – выхаваўчы метад, да якога дастаткова рэдка звяртаюцца беларусы, бо яго ўжываюць толькі ў тым выпадку, калі іншыя метады асуджэння не дзейнічаюць на выхаванца. Праклёнам выказваецца найбольшае раздражненне і злосць (напрыклад, *“Каб цябе пярун спаліў”, “Бадай цябе качкі стапталі”* [з беларускіх народных казак]) і, як выключэнне, – поўная адмова ад далейшых зносін альбо адрачэнне.



Репозиторий ВГУ

Такім чынам, метады асуджэння выступаюць своеасаблівым рэгулятарам і карэктарам паводзін, перакананняў выхаванца, што, безумоўна, уплывае на яго маральнае і фізічнае аздараўленне.

Наказ і благаславенне таксама магчыма аднесці да метадаў стымулявання, бо яны нясуць у сабе пэўнае настаўленне, павучанне, просьбу, пажаданне дабра і інш. Дадзеныя метады цесна ўзаемазвязаны паміж сабой: наказ – гэта своеасаблівае настаўленне, якое звычайна даецца ў асабліва памятныя моманты (пачатак самастойнага жыццявыхаванца, праводзіны яго ў далёкую дарогу альбо пры адчуванні выхавацелем сваёй смерці і г.д.); благаславенне ж – гэта наказ у дарогу альбо пажаданне поспехаў у нейкай справе (шлюб, нараджэнне дзіцяці [прычым благаслаўляюць і апошняга, зычаць яму доўгага жыцця, здароўя і шчаслівай долі] і г.д.). Выхаванец прыслухоўваўся да волі выхавацеля, выражанай у дадзеных метадах стымулявання, і лічыў за абавязак выканаць яе, каб, знаходзячыся ўдалечыні ад свайго роду, не страціцьуласнай годнасці. Своеасаблівыя ўзоры наказаў і благаславенняў магчыма знайсці ў тэкстах рэкруцкіх і шлюбных песень, напрыклад, бацька благаслаўляе сваю дачку на шлюб, а маці дае наказ сыну, адпраўляючы яго на вайну.

Дадзеныя метады народнага выхавання ўздзейнічаюць на свядомасць выхаванца: на яго погляды, пачуцці, самаацэнку, – і прадугледжваюць пэўны тып паводзін; таму магчыма сцвярджаць значнасць метадаў наказу і благаславення ў фарміраванні маральнага і фізічнага здароўя асобы.

Парада з'яўляецца яшчэ адным з метадаў стымулявання, які ўжываецца ў паўсядзённым жыцці дастаткова часта, бо, як сведчаць беларускія народныя прыказкі і прымаўкі,*"Парады патрэбны і мудраму", "Адна галава добра, а дзве – лепш"* і інш. (прычым менавіта ў дадзеных жанрах фальклору ўвасоблена шматлікая колькасць парад, напрыклад, *"Упярод не лезь, ззаду не аставайся, сярэдзіны трымайся", "Старое памятай, а жыві новым"* і г.д.). Выхаванцы звычайна звярталіся да сваіх настаўнікаў (да бацькоў, да паважаных і вопытных людзей) пры вырашэнні складанага пытання ці пэўнай жыццёвай сітуацыі, – і выхавацелі – людзі сталыя і вопытныя – дапамагалі карыснай парадай, якая забяспечвала іх падапечным поспех у справах *("Ад добрага таты добрыя парады", "Добры чалавек, параіўшы, не шкадуе")*. Таму дадзены метад таксама адыгрывае вызначальную ролю ў станаўленні маральна і фізічна здаровай асобы.

**Метады ініцыятывы "Я"** спрыяюць з'яўленню і станаўленню ў выхаванца адказных адносін да сябе, усведамленню сябе як асобы, фарміраванню ўласнага маральнага і фізічнага здароўя, бо пэўны тып паводзін асобы заснаваны на яго ўласных перакананнях, якія ўзнікаюць і замацоўваюцца пад уплывам метадаў ініцыятывы "акружэнне "Я"".

Рэпазіторый ВДУ

Назіранне – уласна метад дадзенай групы, у значнай ступені звязаны з групай метадаў узаемнай ініцыятывы. Перш чым даручаць дзіцяці практычнае заданне, народ-педагог даваў магчымасць яму паназіраць за выкананнем адпаведнай працы вопытнымі людзьмі. З мэтай больш свядомага назірання вучня за працай дарослых паралельна з выкананнем дзеяння апошнія давалі яму карысныя парады і дзяліліся ўласным вопытам. Назіраючы, дзіця атрымлівала неабходны жыццёвы вопыт, які спрыяў фарміраванню яго маральнай свядомасці, а значыць і маральнага здароўя. Дзіця ўсведамляла тэхніку выканання працоўных аперацый, паводзіны і звычкі працуючых, што потым часткова пераносілася на дзейнасць вучня і спрыяла фарміраванню яго фізічнага здароўя. Ды і наогул, чалавек фарміраваўся, назіраючы за навакольным светам, за прыроднымі зьмяненнямі, таму назапашаны каштоўны народны вопыт па рэалізацыі дадзенага метаду, які знайшоў сваё выяўленне ў розных жанрах фальклору – песнях (гэта датычыцца песень розных жанраў: любоўных і рэкруцкіх, што вучаць быць пільнымі і ўважлівымі да іншых, песень, звязаных з працоўнай дзейнасцю чалавека, якія дадаткова тлумачаць этапы і нюансы працоўных аперацый), танцах (што непасрэдна перадаюць працоўныя дзеянні), прыказках і прымаўках (напрыклад, назіраючы за паводзінамі людзей, народ-педагог зазначае: *“Хто цярплівы, той шчаслівы”* ці *“Зычлівага чалавека ў няшчасці пазнаюць”*), загадках, святах, звычаях і г.д.

Метады самаўнушэння, самаперакanання, самапрывучэння, самаўшчування, самаўхвалення, самаасуджэння, самапакарання ідэнтычныя па змесце аналагічным метадам ініцыятывы “акружэнне "Я"” (без часткі слова сама-), яны накіраваны на самаўдасканаленне асобы. Таму не лічым неабходным падаваць яшчэ раз іх метадычнае апісанне.

**Метады ўзаемнай ініцыятывы** спрыяюць фарміраванню свядомасці асобы і ўстанаўленню пэўнага тыпу яе паводзін у грамадстве. Дадзеная група метадаў амаль цалкам заснавана на практычнай дзейнасці выхаванца, якая з’яўляецца яго ініцыятывай або якой патрэбна кіраваць.

Асноўнымі патрабаваннямі да выхавацеля ў вядзенні гутаркі выступаюць: яго ўменне своечасова вызначаць прадмет размовы, паведамляць у час гутаркі невядомую суразмоўцу інфармацыю з захапленнем і зацікаўленасцю. Гутарка патрабуе больш актыўнага і свядомага ўдзелу выхаванца: здольнасці аналізаваць, рабіць высновы, абагульняць атрыманыя звесткі, – што выпрацоўвае яго ўстойлівы светапогляд і маральныя перакананні. Размовы з блазнамі (дзецьмі да 7-гадовага ўзросту) патрабуюць ад дарослага асаблівых умоў: спрошчанай падачы матэрыялу, які найбольш зразумелы дзецям дадзенага ўзроставага перыяду, з абавязковым выкарыстаннем слоў дзіцячай лексікі для ліквідацыі ўзроставай перашкоды (апошняя можа зменшыць



Репозиторий ВГУ

даверлівыя адносіны дзіцяці да суразмоўцы). Але нельга пераходзіць дарасламу да выкарыстання пераважнай большасці "дзіцячых" слоў, бо маленькі выхаванец бачыць у вас перш за ўсё эксперта, які больш ведае і можа адказаць на ўсе яго пытанні. Тон дарослага павінен быць спакойным і пераканаўчым незалежна ад пытання дзіцяці. Таму нездарма ў скарбонцы беларускага народа існуюць прыказкі і прымаўкі, што пацвярджаюць вышэйзгаданае: *"Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка"*. Калі дзеці дасягалі 7-гадовага ўзросту, іх выхавацелі па-іншаму будавалі размову: яна ўжо ўключала сваю <u>*завязку*</u>(каб зацікавіць выхаванца ў тэме размовы); <u>*кульмінацыйны момант*</u> (падчас яго звычайна прыводзіліся прыклады з жыцця, гісторыі павучальнага зместу, якія павінны былі пераканаць дзяцей у правільнасці пазіцыі суразмоўцы, а таксама схіліць іх да таго тыпу паводзін, які прадугледжаны грамадствам); <u>*развязку*</u> (выхаванец звычайна выказваў сваю канчатковую думку наконт прадмета размовы і вырашаў, як яму паводзіць сябе надалей). Падчас гутаркі выхавацелі выкарыстоўвалі вусную народную творчасць, выпадкі са свайго жыцця ці жыцця блізкіх людзей, што прадстаўляла каштоўны матэрыял для разгляду пытанняў маральнага выхавання, для выпрацоўкі ў выхаванцаў рыс агульнанароднага ідэалу.

Так, народныя выхавацелі з дапамогай пераканаўчых, правільна пабудаваных этычных размоў уздзейнічалі на свядомасць сваіх выхаванцаў, выклікаючы ў іх маральныя пачуцці, што спрыяла фарміраванню маральнага здароўя выхаванцаў.

Адным з самых важных метадаў узаемнай ініцыятывы з'яўляецца <u>практыкаванне</u>, бо яно ў большай ступені, чым іншыя метады групы, уключае дапамогу і падтрымку народнага выхавацеля, таму памылковыя погляды і дзеянні асобы, што фарміруецца, могуць быць заўважаны і тэрмінова выпраўлены, а станоўчыя – выпрацаваны дзякуючы неаднаразовым паўтарэнням, што спрыяюць фарміраванню карысных звычак *("Адзін добры вопыт важней сямі мудрых павучанняў")*. Так, пад <u>практыкаваннем</u> разумеецца стварэнне для выхаванцаў умоў, што дазваляюць ім, свядома паўтараючы пэўныя дзеянні, дасягнуць грамадска значных вынікаў, папоўніць кола сваіх ведаў, уменняў і навыкаў. Вынікам практыкаванняў з'яўляюцца навыкі і звычкі – устойлівыя якасці асобы *("Капля па каплі і камень ламае")*. Эфектыўнасць дадзенага метаду залежыць ад шэрага ўмоў: 1)сістэмы практыкаванняў, 2) іх зместу і аб'ёму, 3) даступнасці і пасільнасці практыкаванняў, 4) кантролю і карэкцыі, 5) частаты выканання. Беларуская народная педагогіка строга выконвае дадзеныя ўмовы, улічваючы ўзроставыя асаблівасці і пол выхаванцаў. Напрыклад, маленькіх дзетак практыкавалі ў тым, як правільна паводзіць сябе за сталом, у прысутнасці іншых людзей, як ажыццяўляць нескладаныя

Рэпазіторый ВДУ

дзеянні па самаабслугоўванні, выконваць даручэнні бацькоў *(“Хто бацькоў не слухае, той у пальцы дзьмухае”)*; дзяўчаты-падлеткі на аснове вышэйзгаданых звычак практыкаваліся ў кулінарнай справе, працавалі ў грамадзе, прыслухоўваліся да меркаванняў старэйшых і больш вопытных людзей, засвойвалі пэўныя віды сельскагаспадарчых спраў: дзяўчаты ўдзельнічалі ў жніве, праполцы град, хлопцы – у падрыхтоўцы глебы да пасеву, заворванні і г.д. Неаднаразовае выкананне дзецьмі і моладдзю паўсядзённых альбо сезонных сельскагаспадарчых спраў спрыяла выпрацоўцы акуратнасці ў выкананні, уважлівасці, беражлівасці і інш., што ўплывала на фарміраванне маральнага здароўя асобы, а таксама выпрацоўцы пэўнага рэжыму працы і адпачынку – адной з умоў фарміравання фізічнага здароўя.

<u>Праца</u> ў беларускай народнай педагогіцы з’яўляецца не толькі сродкам, але і метадам фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы, пра што яскрава сведчаць беларускія прыказкі і прымаўкі: *“Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш”, “Праца робіць чалавека разумным”, “Добра працуеш – павагу маеш”, “Праца чалавека трымае і ўздымае, а гультайства псуе”, “Не на адну хваробу праца лепшы доктар”, “Праца здароўя не адбірае”*. Дзякуючы працы асоба, што фарміруецца, набывае такія каштоўныя рысы характару, як беражлівасць, цярпенне, акуратнасць, рашучасць, праўдзівасць, пільнасць, адказнасць за даручаную справу або яе вынікі, прычым праца ў калектыве спрыяе развіццю такіх якасцей, як дабрыня, павага, сумленнасць, гонар і ўласная годнасць, што з’яўляюцца асновай маральнага станаўлення выхаванца; фізічнае аздараўленне асобы адбываецца за кошт укладання ў працу фізічных намаганняў, волі, стойкасці, што ўплываюць на фарміраванне фізічнай моцы, пачуцця справядлівасці, волі, стойкасці характару, якія, у сваю чаргу, здзяйсняюць прафілактыку рэспіраторных захворванняў (маецца на ўвазе праца на адкрытым паветры).

<u>Гульня</u> таксама з’яўляецца і сродкам, і метадам фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы. Гульня як адна з прыродных патрэбнасцей чалавека мае для гэтага велізарныя магчымасці, бо яна спрыяе пераймванню гуляючымі культурнага вопыту папярэдніх пакаленняў, а гэта значыць духоўнай лучнасці паміж пакаленнямі беларусаў. Гульня стварае спрыяльныя ўмовы для раскрыцця здольнасцей, для шчырых сяброўскіх узаемаадносін, для праяўлення і пераймання станоўчых і адмоўных схільнасцей дзяцей, таму яна абавязкова патрабуе нагляду і, калі патрэбна, умяшальніцтва дарослых, каб дрэнныя схільнасці і звычкі не сталі рысамі характару асобы. Падчас гульні фарміруюцца такія маральныя якасці, як дабрыня, павага да іншых, акуратнасць, стараннасць, уважлівасць, справядлівасць, чэснасць і праўдзівасць, што з’яўляюцца стрыжнёвымі для беларускага народа. Гульні таксама спрыяюць фарміраванню фізічнага здароўя падрастаючага пакалення праз набыццё і



Репозиторий ВГУ

развіццё: фізічных характарыстык (спрыту, каардынацыі дзеянняў, назіральнасці, вокамеру і інш.); патрыятызму, фізічнай моцы, вытрымкі, справядлівасці. Дадзены метад народнай педагогікі з'яўляўся таксама своеасаблівай прафілактыкай прастудных і рэспіраторных захворванняў, г.зн. адным са спосабаў загартавання арганізма дзяцей.

На нашу думку, да метадаў дадзенай групы магчыма таксама аднесці і спаборніцтва, бо зацвярджэнне чалавека ў грамадстве з'яўляецца натуральнай патрэбнасцю, якая рэалізуецца праз спаборніцтва з іншымі (у працы, у майстэрстве, у мастацтве і г.д.). Падрастаючае пакаленне ў большай ступені імкнецца да спаборніцтва, да прыярытэту, да набыцця і ўтрымання першынства ў чым-небудзь, бо вынікі спаборніцтва на доўгі час вызначаюць і замацоўваюць набыты такім спосабам статус чалавека ў грамадстве. Таму магчыма праз спаборніцтва выхоўваць неабходныя асобе, якая фарміруецца, якасці і рысы характару, што і было ўласціва беларускаму народу. Дарослыя заўсёды імкнуліся арганізаваць спаборніцтва і кантраляваць яго ход, устанаўліваць або сачыць за правіламі, паводзінамі ўдзельнікаў і г.д. Звычайна дадзеная роля ўскладвалася на плечы старых і вопытных людзей, што мелі павагу сярод дзяцей і моладзі. Умяшальніцтва такіх “назіральнікаў” у спаборніцтва было звязана з узростам выхаванцаў. Напрыклад, дзецям да 8–9 год неабходна было растлумачыць правілы, сачыць, каб малыя спаборніцтве паміж сабой у чымсьці сапраўды значным (на хуткасць, на спрытнасць, на чэснасць і г.д.), дапамагчы дастойна ўзнагародзіць пераможцу; за падлеткамі арганізоўвалася больш пасіўнае назіранне, бо ў іх ужо звычайна быў назапашаны дастаткова багаты вопыт у спаборніцтве (удзел дарослых быў накіраваны на змяншэнне жорсткіх умоў спаборніцтва); моладзь арганізоўвала і праводзіла дадзены від зацвярджэння ў грамадстве самастойна.

Падчас народных свят таксама ладзіліся спаборніцтвы на праверку фізічных магчымасцей звычайна сярод юнакоў, напрыклад, падчас Масленіцы: аб'язджанне маладых коней і валоў, узбіранне на гладкі слуп; дзяўчаты ў спаборніцтве правяралі сваё майстэрства вышываць, ткаць, жаць жыта, вязаць снапы і г.д. Правільна арганізаванае спаборніцтва найлепшым чынам спрыяла фарміраванню гарманічнай у маральных і фізічных адносінах асобы, бо разам з развіццём фізічных магчымасцей чалавека (хуткасці, вытрымкі, моцы і г.д.) фарміраваліся і неабходныя кожнаму рысы характару, такія як чэснасць, справядлівасць, уважлівасць і павага да іншых, імкненне дапамагчы і іншыя.

Метад падвядзення вынікаў – іспыт – адыгрывае асаблівую ролю ў народнай педагогіцы беларусаў, бо менавіта ён завяршае кожны канкрэтны этап фарміравання асобы, да таго ж гэта абавязковая ўмова амаль усіх відаў працоўнай дзейнасці чалавека. Беларускі народ на працягу

Рэпазіторый ВДУ

стагоддзяў выпрацаваў шматлікія арганізацыйныя формы падвядзення вынікаў, напрыклад, вынікі працы агучваліся на многіх працоўных святах, вынікі фізічнай моцы і загартаванасці – на спартыўных спаборніцтвах; вынікі маральнага сталення асобы – у гасцях, падчас свят і абрадаў і г.д.

Ад нараджэння і да дасягнення паўналецця чалавек праходзіў розныя этапы іспытаў, звязаных з праверкай ступені дасканаласці выхаванцаў кожнай узроставай групы: іспыт немаўлят уключаў уменне распазнаваць галасы маці і бацькі, рэагаваць на святло, музыку, поўзаць і хадзіць; іспыт маленькіх – уменне самастойна апранацца і распранацца, выконваць нескладаныя хатнія абавязкі, даглядаць немаўлят пры адсутнасці дарослых; іспыт падлеткаў – уменне правільна паводзіць сябе ў грамадстве, старанна выконваць розныя працоўныя аперацыі па гаспадарцы і ў полі; іспыт моладзі – уменне дасканала выконваць любую працу ў залежнасці ад полу, усюды захоўваць правілы прыстойнасці, павагі і гасціннасці. Народ-педагог выкарыстоўваў розныя прыёмы па арганізацыі іспытаў: для праверкі фізічных магчымасцей – гульню, спаборніцтва альбо даручэнні, якія патрабавалі прымянення, вытрымкі, смеласці і моцы; для праверкі працоўных магчымасцей далучалі да грамадскіх сельска-гаспадарчых або іншых спраў; маральныя якасці асобы выяўляліся праз штодзённыя падзеі альбо арганізацыю святочных мерапрыемстваў. Прамежкавыя іспыты непазбежна рыхтавалі выхаванцаў да выніковага іспыту, які быў асобным для юнакоў (у якасці земляроба, жывёлавода, рамесніка і, нарэшце, будучага мужа; прычым народ лічыў дастатковымі ўменне хлопца быць гаспадарлівым, працавітым і ўмелым, каб пачынаць сямейнае жыццё, аб чым сведчыць беларуская народная прыказка *“Калі хлопіц калок зачэша, дык мае права жаніцца”*) і для дзяўчат (як хатняй гаспадыні, народнай майстрыні, жняі і будучай жонкі). Асабліва сур’ёзна адносіўся народ-педагог да іспытаў моладзі на гатоўнасць да сямейнага жыцця, бо, на яго думку, сям’я, што складвалася пасля папярэдніх іспытаў жаніха і нявесты на ўзаемаразуменне, узаемную падтрымку, працавітасць, гарантавала трывалыя сямейныя адносіны, а таксама добры эмацыянальны і псіхалагічны клімат для выхавання дзяцей, што з’яўлялася важнай умовай фарміравання маральна і фізічна здаровага патомства. Так, магчыма лічыць метады падвядзення вынікаў рашаючымі ў фарміраванні свядомасці выхаванца (прамежкавыя іспыты) і ўстанаўлення спосабу паводзін, суадноснага з канонамі, прынятымі ў грамадстве (прамежкавыя і выніковыя іспыты). Дадзеныя факты сведчаць пра станоўчы ўплыў дадзенага метаду на фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы.

Такім чынам, відавочна, што метады народнай педагогікі ўплываюць на фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы, уздзейнічаючы на



Репозиторий ВГУ

яго погляды, меркаванні, пачуцці, самаацэнку, а гэта значыць, і на яго свядомасць і паводзіны. Народна-педагагічныя сродкі і метады маюць непасрэдную ўзаемасувязь паміж сабой і эфектыўна спалучаюцца ў фарміраванні маральнага і фізічнага здароўя асобы, што магчыма выкарыстаць і ў сучаснай сістэме выхавання падрастаючага пакалення.

Падчас выкладання вучэбнага курса па этнапедагогіцы і спецыяльнага курса "Валеалогія: этнапедагагічны аспект" будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы вывучаюць працэс фарміравання маральна і фізічна дасканалай асобы ў беларускай народнай педагогіцы.

Фарміраванне маральна дасканалай асобы – паслядоўны шматступенны працэс, які складаецца з шэрага этапаў, распрацаваных намі на аснове этапаў маральнага выхавання школьнікаў, прапанаваных вядомымі рускімі педагогамі: Б.Ц. Ліхачовым і Л.І.Рувінскім. Кампаненты маральнасці Л.І.Рувінскага, размешчаныя па ўскладненні, уключаюць "маральныя веды; маральны ўзор; маральную ацэнку" [137, с. 117].

Сістэма маральнага выхавання школьнікаў Б.Ц. Ліхачова складаецца з наступных кампанентаў, пабудаваных у структурным парадку: 1. Маральная свядомасць: а)маральныя ўяўленні; б)маральныя паняцці; в)маральныя пачуцці, перажыванні. 2. Маральнае мысленне. 3. Маральная воля. 4. Маральныя паводзіны. 5. Маральныя навыкі і звычкі [81, с. 264–267].

На аснове прапанаваных вышэй структур маральнага выхавання асобы, а таксама традыцыйных форм выхавання маральнасці асобы ў беларускай народнай педагогіцы магчыма вылучыць кампаненты фарміравання маральнага здароўя асобы, размешчаныя ў строгай паслядоўнасці:

1. Маральная свядомасць.
2. Маральнае мысленне.
3. Маральныя паводзіны.
4. Маральная воля, якая прысутнічае ва ўсіх з вышэйзгаданых кампанентаў (табліца1.4).

<u>**Маральная свядомасць**</u> – адлюстраванне ў свядомасці чалавека прынцыпаў маральнасці, г.зн. нормаў паводзін, што рэгулююць адносіны людзей адзін да аднаго і ў цэлым да грамадства. Яна, маральная свядомасць, у сваю чаргу, складаецца з некалькіх паслядоўных і звязаных падэтапаў, першым з якіх з'яўляюцца першасныя **маральныя ўяўленні**.

<u>Уяўленні</u> – пачуццёвы вобраз прадметаў і з'яў рэчаіснасці, якія раней уздзейнічалі на органы пачуццяў. У працэсе пазнання ўяўленнівыступаюць пераходнай прыступкай ад успрыняцця да мыслення [121, с. 485]. Яны маюць уласцівасць узбагачацца і інтэгравацца ў **маральныя**



Рэпазіторый ВДУ

**паняцці**, якія з’яўляюцца другой прыступкай у фарміраванні маральнай свядомасці.

Репозиторий ВГУ

Табліца 1.4 – Структурныя кампаненты фарміравання маральнага здароўя асобы

| № п/п | Назва кампанента | Структурныя ўключэнні | Маральная воля |
|---|---|---|---|
| 1. | Маральная свядомасць | – маральныя ўяўленні; ←<br>– маральныя паняцці; ←<br>– маральныя пачуцці; ←<br>– маральная ацэнка. ← | |
| 2. | Маральнае мысленне ← | | |
| 3. | Маральныя паводзіны | – маральныя ўчынкі-дзеянні ← | |

Паняцці – форма навуковых ведаў, якія характарызуюць аб’ектыўна істотнае ў рэчах і з’явах і замацоўваюцца спецыяльнымі тэрмінамі ці абазначэннямі [81, с. 155]. **Маральнае паняцце** – паняцце, у якім адлюстроўваюцца істотныя бакі маральных адносін, г.зн. адносіны чалавека да іншых людзей і да грамадства [81, с. 150].

Трэцім структурным кампанентам з’яўляюцца **маральныя пачуцці.**

Пачуцці – устойлівыя адносіны чалавека да таго, што ён спазнае, робіць, да іншых людзей, да сябе, якія становяцца часта рысамі асобы. Пачуцці адлюстроўваюць цэласныя адносіны чалавека да акаляючай рэчаіснасці, да таго, што ён адчувае, і праяўляюцца ў ім у форме працяглага перажывання (пачуцця шчасця, любові, пачуцця камічнага, пачуцця гумару, пачуцця іроніі, насмешкі, трагічнага, разгубленасці, раскаяння, страху, крыўды, віны, пагарды, рэўнасці, нянавісці, пачуцця прагі помсты і г.д.) [121, с. 69].

Пачуцці, у сваю чаргу, складаюцца з **эмоцый**– непасрэдных, часовых перажыванняў, звязаных з задавальненнем ці незадавальненнем актуальных патрэбнасцей (пры знаходжанні ў актыўным стане) або з магчымасці іх задавальнення ці незадавальнення. Пры задавальненні ці пры высокай імавернасці задавальнення патрэбнасці ўзнікаюць **станоўчыя эмоцыі** і, наадварот, пры незадавальненні актуальнай патрэбнасці ці пры нізкай імавернасці яе задавальнення –**адмоўныя эмоцыі** [121, с. 67].

**Маральнае пачуццё** – гэта пастаяннае маральнае адчуванне, рэальныя маральныя адносіны і ўзаемадзеянні. Нормы маралі, на думку Б.Ц.Ліхачова, пераўтвараюцца ў суб’ектыўную маральнасць толькі дзякуючы іх пачуццёваму асваенню школьнікам [81, с. 265–266].

Репозиторий ВГУ

На нашу думку, каб працэс фарміравання маральнай свядомасці быў больш поўным і асэнсаваным, а маральныя пачуцці не знікалі стыхійна і безвынікова, для асобы, што фарміруецца, неабходна **маральная ацэнка**, якая з’яўляецца чацвёртым і заключным падэтапам. **Маральная ацэнка** раскрывае ўнутраны механізм пераходу знешняга пачуцця ва ўнутранае. У выніку прадметна-працэсуальнае дзеянне пераходзіць у асобасную, суб’ектыўную якасць, уласцівасць чалавека. Такім чынам, вынік “праходжання” асобай, якая маральна фарміруецца, пералічаных чатырох падэтапаў і ёсць з’яўленне маральнага ідэалу, ідэальных уяўленняў пра паводзіны чалавека, яго адносіны да жыцця і імкненне дзейнічаць аналагічным чынам.

Наступным этапам фарміравання маральнага здароўя асобы з’яўляецца **маральнае мысленне.** Яно з’яўляецца псіхічным працэсам, дзякуючы якому чалавек пазнае прадметы ці з’явы рэчаіснасці ў іх істотных уласцівасцях, прыкметах, раскрывае сувязі і адносіны, што існуюць у іх і паміж імі [121, с. 36]. Маральнае мысленне прагнастычнае, што дазваляе прадугледзець загадзя вынікі дзеянняў і паводзін асобы, дае магчымасць планаваць асобе маральную дзейнасць, адносіны да іншых людзей.

Канчатковым этапам, які завяршае працэс фарміравання маральнага здароўя асобы, выступаюць**маральныя паводзіны**, абумоўленыя маральнымі нормамі і прынцыпамі, што рэгулююць адносіны ў грамадстве [121, с. 128]. Паводзінамі звычайна называюць сацыяльна абумоўленую дзейнасць, прадметам якой з’яўляюцца іншыя людзі ці ўзаемаадносіны з імі [121, с. 61]. У сваю чаргу,дзейнасць – гэта актыўнае ўзаемадзеянне чалавека з навакольным асяроддзем, дасягненне пастаўленай мэты, якая ўзнікла ў асобе ў выніку з’яўлення пэўнай патрэбнасці [121, с. 60].

Маральныя паводзіны чалавека складваюцца з паслядоўных **маральных учынкаў-дзеянняў**, якія ўспрымаюцца і ўсведамляюцца самім дзеючым суб’ектам як грамадскі акт, як праяўленне маральных адносін гэтага чалавека да іншых людзей. Намаганні ж волі (маральная воля як этап сістэмы маральнага выхавання, згодна з класіфікацыяй Б.Ц. Ліхачова) асоба прыкладае, на нашу думку, на кожным з вышэйзгаданых этапаў структуры, таму што “воля – гэта свядомае рэгуляванне чалавекам сваіх паводзін і дзейнасці, выяўленае ва ўменні пераадольваць унутраныя і знешнія цяжкасці пры выкананні мэтанакіраваных дзеянняў і ўчынкаў” [81, с. 55], а праяўленне свядомасці адбываецца на ўсіх этапах фарміравання маральнага здароўя асобы.

Адным з асноўных маральных паняццяў, сімвалізуючых сабой “дабро”, з’яўляецца павага да людзей, добрыя адносіны да іх: прыказкі і прымаўкі *“Шануй людзей, то і цябе пашануюць”, “Любі другога, як сябе самога”, “Зробіш людзям дабро – і табе адгодзяць”, “Старэйшых і ў пекле шануюць”* і інш. Неад’емная рыса характару беларуса –павага да бацькоў, бо яна не толькі спрыяе фарміраванню высокамаральнага чалавека, але і забяспечвае пераемную сувязь паміж пакаленнямі (*“Хто*



Рэпазіторый ВДУ

*бацькоў шануе, той неба гатуе", "Шануй бацьку з маткай: другіх не знойдзеш", "Бацькоў любі, старых паважай", "Хто бацьку шануе, той дзецям добрую долю гатуе", "Пасадзі на печ дзядулю, цябе ўнукі пасадзяць"* і інш.). Дадзеная якасць праяўлялася не толькі ў добрых адносінах дзяцей да сваіх бацькоў, але і ў паслухмянасці, у прыслухоўванні да парад апошніх: *"Хто бацькоў не слухае, той у пальцы дзьмухае", "Бацькоў слухаць – гора не знаць", "Маладыя ад старых вучацца", "Ад добрага таты – добрыя парады", "Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае"*. Дадзеная якасць фарміруецца і ўмацоўваецца ў калектыўнай дзейнасці, бо падчас працы старэйшае пакаленне – больш мудрае і разважлівае, з пэўным багажом жыццёвага вопыту – уздзейнічала на падрастаючае пакаленне шляхам размоў, павучальных расказаў, легенд, паданняў, прыкмет, падаючы ўласны прыклад узаемаадносін з іншымі членамі працоўнага калектыву, робячы слушныя парады і заўвагі і г.д.

Антыподам "павагі да людзей, да бацькоў" з'яўляліся непаважлівыя адносіны да іншых, якія асацыіраваліся ў выхаванцаў з паняццем "зло". Устанаўленню паняцця-антыпода ў свядомасці асобы як адмоўнага спрыяла грамадская думка, занатаваная ў прыказках і прымаўках (*"Калі робіш дрэннае для людзей, то робіш дрэннае для сябе", "Як ты к людзям, так і людзі к табе", "Што ў кацёл крыкнеш, тое ён і адкажа"*, яны сведчаць пра своеасаблівы "эфект бумеранга" – добрыя або дрэнныя твае дзеянні да іншых да цябе вернуцца, хочаш ты таго ці не; *"Сохні тая рука, што на бацьку падымаецца", "Хай таму дзіцятку язык адваліцца, калі на людзях бацьку няславіць"* – народ-педагог выкарыстоўвае такі праклён, каб давесці да выхаванца ўсю абсурднасць падобных дзеянняў, прабудзіць сумленне і выклікаць сорам).

З паняццем "дабро" выхаванец асацыіраваў і такое маральнае паняцце, як сумленнасць. Народ-педагог, уздзейнічаючы на свядомасць асобы, сцвярджаў пры дапамозе фальклору, што гэта адна з найважнейшых якасцей чалавека: *"Абы сумленне чыстае", "Ад людзей схаваешся, ад сумлення – не", "Сораму ў кішэню не схаваеш", "Рукі пабрудзіш – вадою адмыеш, душу пабрудзіш – і мылам не адмыеш", "Хоць кашуля чорная, абы сумленне чыстае"*. Дадзеную рысу характару народ разумее: 1) як нясквапнасць і незайздрослівасць да чужога дабра і імкнецца данесці да дзіцяці прыкрасць і негатыўныя наступствы праяўлення сквапнасці, злосці і зайздрасці да рэчаў або прадметаў гаспадаркі іншых людзей пры дапамозе прыказак (*"Хто сумленне мае, той чужое не хапае", "Раз украў – навек сабе славу замараў", "Твар белы, а душа чорная", "Хоча чалавек прапасці – пачынае красці", "Колькі злодзей не круці – ад суда не ўйці"*); 2) як неабходнасць трымаць дадзенае слова, што пацвярджаюць народныя прыказкі і прымаўкі: *"Той усягда праў, хто паабяцаў і даў", "Работу словам не заменіш", "Слова сказаў – тапаром адсек"*.

Блізкім да паняцця "сумленнасць" з'яўляюцца маральныя паняцці "чэснасць" і "праўдзівасць", якія выхаванец таксама адносіць да разраду



Репозиторий ВГУ

становучых. Гэтаму спрыяе народна-педагагічная мудрасць, занатаваная ў прыказках і прымаўках (*“Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае”, “Праўдаю найдалей дойдзеш”, “На праўдзе свет стаіць”, “Праўда і з дна мора вынесецца”, “Праўду не закапаеш”, “Лепш хай праўда спаліць, чым ліха пахваліць”, “Праўда грубая, ды людзям любая”*). Народ-педагог, а разам з ім і дзіця, супрацьпастаўляе вышэйадзначаным паняццям “хлусню”, якую з поўным правам адносіць да маральнага паняцця “зло”, што яскрава даказваюць прыказкі і прымаўкі (*“На абмане далёка не ўедзеш”, “Раз салгаў – у другі раз не павераць”, “Лгарства (хлусня) як аліва – выйдзе наверх”*).

Маральнае паняцце “працавітасць” адносіцца да аднаго з неад’емных, характэрных для беларускага народа, бо працоўная дзейнасць як мага лепей падае лад жыцця народа. Галоўным мерылам маральнасці чалавека ў народнай педагогіцы з’яўляюцца яго адносіны да працы, аб чым яскрава сведчаць беларускія народныя прыказкі і прымаўкі: *“Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш”, “Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож”*. Народ-педагог спрыяў фарміраванню дадзенага паняцця ў свядомасці падрастаючага пакалення, павучаючы, што праца: 1) выратоўвае чалавека ад голаду (*“Хто дбае, той і мае”, “Праца чалавека корміць, а лянота псуе”, “Без мазаля на руках не будзеш мець хлеба ў зубах”, “Горка часам праца, ды хлеб з яе салодкі”, “Не зямля родзіць, а работа”* і інш.); 2) дапамагае заваяваць павагу іншых (*“Добра працуеш – павагу маеш”, “Якая справа, такая і слава”, “Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму слава, хто ў справе стойкі”, “Ніякая праца не прыніжае чалавека”, “Па рабоце і плата”, “Хто сам дбае, таму Бог дапамагае”*); 3) спрыяе спазнанню шчасця (*“Хочаш быць шчаслівы, не будзь лянівы”, “Хто работаю не даражыць, той не будзе шчасліва жыць”, “Без працы не будзе шчасця”*); 4) дапамагае ўсведамленню маральных прынцыпаў і нормаў (*“Дзе ні жыві, а працаваць трэба”, “Ад работы ўцякаць – дабра не ведаць”, “І нож іржавее, калі ім не працаваць”, “Для чалавека работа – найлепшы лекар”, “Не на адну хваробу праца – найлепшыя лекі”* і інш.). Для беларускай сям’і традыцыйным было строгае размеркаванне абавязкаў паміж усімі яе членамі з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей, гэта фарміравала адказнасць у дзяцей за даручаную справу і яе вынікі, а таксама спрыяла ўсведамленню імі сябе як неад’емнай часткі сям’і, як сталых працаўнікоў.

Замацоўвае стаўленне да працы як неабходнага элемента жыцця чалавека грамадская думка, што асуджае “ляноту” або “дармаедства”. Гэта яскрава паказваюць беларускія народныя прыказкі і прымаўкі (*“Лень жуе чалавека, як іржа жалеза”, “Гультай горш калекі”, “Гультайства горш за хваробу”, “Языком малоць – не дровы калоць”, “Гультаю ды няўмецы ўсё часу не хапае”, “За сном і спачыць няма калі”, “Каб выбіць ляноту – даць работу да сёмага*

*поту", "Не гаспадыня, што на ніўцы краскі, а пад акном крапіва", "Яму раніцой росна, у поўдзень млосна, а ўвечары камары кусаюць").*

Адной з асноўных характэрных рыс беларускага народа з'яўляецца гасціннасць. Дадзенае маральнае паняцце адносіцца да разраду станоўчых, аб чым сведчыць фальклор (*"Бліжняга суседа саджай на кут", "Для дарагога госця і вароты насцеж", "Прымі падарожнага – сам будзеш у дарозе", "Госць у дом, Бог у дом", "Дарагі не абед, а прывет", "Дзе любяць – не часці, дзе не любяць – не ідзі"*. Дадзеныя фальклорныя адзінкі занатоўваюць у свядомасці дзіцяці неабходнасць праяўляць гасціннасць да родзічаў, знаёмых, вяскоўцаў, каб і да яго таксама адносіліся прыязна і ветліва, патрэбу прымаць падарожнага на начлег, каб і сам не застаўся ноччу без даху над галавой. Асабліва ветліва і сардэчна людзі сустракалі, частавалі і прывечвалі на ноч жабракоў, бо лічылася, па-першае, што гэта Божыя пасланцы ці нават сам Бог, пераапранутыя ў жабрацкае адзенне; па-другое, што гэты ўчынак Бог залічыць, каб забраць душу памерлага на нябёсы.

Маральнае паняцце "смеласць" таксама суадносіцца з паняццем "дабро" ў свядомасці падрастаючага пакалення. Гэтаму спрыяюць народна-педагагічныя прыказкі і прымаўкі: *"Смелага страх не возьме і вораг не паб'е", "Ад смелага смерць бяжыць", "Адвага гарады бярэ", "Смелы і разумны жывуць два жыцці", "Хто смелы, той і ўмелы", "Адважны не баіцца няпраўды", "Будзь смелы не языком, а дзелам", "На смелага сабака брэша, а баязлівага кусае"* і інш. Маральнае паняцце "смеласць" адбіваецца ў свядомасці выхаванцаў таксама дзякуючы назіранню за старэйшымі людзьмі, за членамі сваёй сям'і, у прыватнасці, хлопчыкі вучыліся смеласці ў бацькоў, якія адстойвалі правы сваіх родных, абаранялі апошніх ад злых людзей і ворагаў, прымалі смелыя рашэнні, што дапамагалі захаваць дабрабыт сямейства і інш., дзяўчынкі – ад маці, якія праяўлялі смеласць у абароне сваіх дзяцей ад злых людзей, ад жорсткасці і дэспатызму і г.д.

Супрацьпастаўлялася маральнаму паняццю "смеласць" паняцце "баязлівасць", якое людзі заўсёды лічылі ганебным і, адпаведна, адносілі,дзякуючы прыказкам і прымаўкам, да вытворнага паняцця "зло"*("Ад баязні мала прыязні", "У страха вочы вялікія", "Зайцу і жабін скок страшны", "Баязліваму і свой цень страшны").*

"Смеласць" цесна звязана яшчэ з адным маральным паняццем – "патрыятызм", бо праяўленне любові да Радзімы часам патрабуе наяўнасці смеласці ў абароне Айчыны ад ворагаў *("За родны край галаву аддай", "Усякая птушка сваё гняздо бароніць")*, смеласці і вытрымкі не спакусіцца на дабрабыт у чужым краі, заставацца на Радзіме *("З роднай зямлі памры – не сыходзь", "У сваім краі, як у раі", "Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы", "Лепей у сваіх людзях з голаду памерці, чым на чужыне золата збіраць", "На чужой старане і вясна не красна")*. Народ-педагог высока ацэньвае дадзеную якасць, што даносіць да

падрастаючага пакалення праз прыказкі і прымаўкі *(“Дайду да свайго роду, хоць праз воду”, “Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка”, “Дзе сасна ні стаіць, а ўсё свайму бору шуміць”, “Родная зямелька, як зморанаму пасцелька”, “З роднага боку і варона мілая”)*.

Таксама ў выхаванцаў фарміруюцца такія маральныя паняцці, як “гонар” і “ўласная годнасць”, дзякуючы традыцыйным для беларусаў клапатлівым і беражлівым адносінам да сваіх дзяцей, што ўключалі адмову або частковую адмову (у выключных выпадках) ад фізічных пакаранняў; павагу да асобы, што развіваецца і фарміруецца; прыслухоўванне да меркаванняў дзіцяці і г.д. З маленства бацькі імкнуліся давесці да свядомасці малога, што ён непарыўная частка сям’і: яму з ранняга ўзросту адводзілі месца за агульным сталом; яго далучалі да калектыўнай працы (дзіця атрымлівала, як і іншыя члены яго сям’і, пэўныя абавязкі, суадносна са сваімузростам); прыцягвалі да абмеркавання надзённых праблем, звязаных з вядзеннем хатняй гаспадаркі, з паводзінамі і ўчынкамі астатніх. Дзякуючы такім дзеянням дарослых у адносінах да малых апошнія рана ўсведамлялі правы і абавязкі, разумелі, што павінны стаць у будучым надзейнай апорай сваіх бацькоў, а таксама пачыналі свядома будаваць уласны лад жыцця, які звычайна не адрозніваўся ад ладу жыцця сям’і. Пачуццё ўласнай годнасці дапамагала дзіцяці лепш асвоіцца, знайсці сваё месца ў грамадстве і асэнсаваць уласнае прызначэнне ў жыцці, а таксама вучыла яго ўзгадняць свае паводзіны з грамадскай думкай, зафіксаванай у маральным кодэксе беларускага народа і прадстаўленай прыказкамі і прымаўкамі *(“З работай дружыць будзеш – гонар і славу здабудзеш”, “Каб у пашане быць, трэба працу любіць”, “Каб цябе людзі хвалілі, не шкадуй у рабоце сілы”, “Чужымі поспехамі не ганарыся, сам за справу бярыся”)*. Паняцце “гонар” таксама дастаткова значнае ў жыцці беларуса, аб чым сведчаць народныя прыказкі і прымаўкі: *“Кожны свой гонар мае”, “Гонар даражэй за грошы”, “Беражы адзенне зනову, а чэсць змоладу”*. Дзеці спазнавалі гэта паняцце не толькі дзякуючы грамадскай думцы, але і назіраючы за ўзаемаадносінамі членаў сям’і, вяскоўцаў. Звычайна бацькі падавалі сваім сынам прыклад узаемаадносін з іншымі з прымяненнем дадзенай якасці, вялі з імі размовы на гэты конт, але ні ў якім разе не асуджалі іншых у прысутнасці малых; маці прывівалі дадзеную рысу характару сваім дочкам, часткова ўласным прыкладам паводзін, часткова размовамі і тлумачэннямі аб значнасці строгіх паводзін у грамадстве, цнатлівасці ў жыцці і лёсе дзяўчыны, прыводзячы прыклады вуснай народнай творчасці: прыказкі і прымаўкі *“Чэсць дзявочае шчасце беражэ”, “Чым кабета стражэй, тым яна даражэй і прыгажэй”*. Народ-педагог рэкамендуе разам з фарміраваннем дадзенай якасці выхоўваць і сціпласць, аб чым сведчаць прыказкі і прымаўкі *(“Не хваліся сам, хай людзі пахваляць”, “Як аб табе чуюць, так аб табе і мяркуюць”, “Добры*

*тавар сам сябе хваліць", "Хваляць – заткні вуха, крытыкуюць – слухай", "Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць").*

Пачынаючы з падлеткавага ўзросту да далейшага ўсведамлення вышэйзгаданых маральных паняццяў дадавалася азнаямленне з паняццямі "сяброўства" і "таварыскасць", якія лічыліся тоеснымі. Усведамленню паняццяў "дружба" і "таварыскасць" як неабходных якасцей у жыцці асобнага чалавека садзейнічала грамадская думка *("Адзін у полі не воін", "Адной рукой і вузла не завяжаш", "І кашу ў сябрыне добра есці", "Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбай", "Чалавек без друга, што яда без солі", "Дрэва ціснецца да дрэва, а чалавек да чалавека")* і грамадства ў цэлым *("Дружба мацней каменных сцен", "Гуртам і ў бядзе лягчэй", "Дзе дружна, там хлебна", "Згода будуе, нязгода руйнуе", "Дружныя ластаўкі і ката заклююць", "Грамада – вялікі чалавек").* Народ-педагог перасцерагае падрастаючае пакаленне ад так званага "ілжэсяброўства", што праяўляецца ў перыяд цяжкасцей і выпрабаванняў *("Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыйдзе кругам", "Хто ў бядзе не быў, той сапраўдных прыяцеляў не знае", "Не той друг, што мёдам мажа, а той, што праўду ў вочы скажа", "Калі ўсё добра, то і чужы пашкадуе, а як прыйдзе бяда, то, бывае, і свой адрачэцца")*, паказваючы, што сапраўдны сябра заўсёды ў цяжкую гадзіну падтрымае, дапаможа *("Сам загінь, а друга з бяды выбаві", "Блізкіх людзей бяда яшчэ больш зблiжае", "Для сябра і сарочку з сябе скіне").*

Падлеткавы ўзрост даволі рэзка мяняе погляды асобы, што фарміруецца, на ўласнае жыццё і ўзаемаадносіны ў грамадстве, якія праяўляюцца ў пошуку свайго "Я", апрабаванні сябе ў розных відах грамадскай дзейнасці. Дадзеныя абставіны фарміруюць у падлетка пачуццё справядлівасці не толькі ў адносінах да сябе (адэкватная ацэнка сваіх здольнасцей, рыс характару, паводзін), але і ў адносінах да іншых людзей (падчас зносін, калектыўнай дзейнасці і т.п.). Пачынае фарміравацца гэта пачуццё ў дзіцяці пад уплывам сям'і, дарослыя члены якой пры дапамозе размоў, тлумачэння, грамадскай думкі, агучанай бацькамі, даводзяць да свядомасці малога паняцце "справядлівасць". Прыклад старэйшых у праяўленні дадзенага пачуцця, справядлівыя адносіны да паводзін і ўчынкаў падлетка з боку паважаных людзей, бацькоў з'яўляюцца адным з галоўных стымулаў для фарміравання пачуцця справядлівасці ў падлетка. Калектыўная працоўная дзейнасць, а менавіта размеркаванне абавязкаў згодна з узростам і наяўным працоўным вопытам, назіранне падлетка за адносінамі да справы іншых членаў працоўнага калектыву, аднолькавыя патрабаванні да вынікаў дзейнасці ўсіх працуючых, гульня з агульнымі для ўсіх удзельнікаў правіламі, размеркаваннем наяўных роляў таксама спрыялі фарміраванню пачуцця справядлівасці ў падлеткаў і юнацтва.

Пачуцці сяброўства, таварыскасці і калектывізму пачынаюць фарміравацца ў выхаванца пад уплывам сям'і (бацькі ўласным прыкладам,



Рэпазіторый ВДУ

тлумачэннямі, размовамі, унушэннем даводзілі да свядомасці дзіцяці неабходнасць праяўлення дадзеных пачуццяў у адносінах да іншых; старэйшыя браты і сёстры ажыццяўлялі гэта ўласным прыкладам у адносінах да дзіцяці), таварышаў па працоўнай дзейнасці або гульні (сярод іх у асобы дзякуючы агульнай справе, агульнасці інтарэсаў, супадаючых поглядаў на тую або іншую з'яву рэчаіснасці з'яўляюцца сябры), а таксама цікавасці і дапытлівасці самога падлетка, які назірае за ўзаемаадносінамі членаў сваёй сям'і, іншых людзей; практыкуецца ў праяўленні дадзеных пачуццяў, што ўплывае на ўстанаўленне вопыту ў праяўленні пачуццяў дружбы і таварыскасці. Далейшае фарміраванне пачуццяў сяброўства, таварыскасці і калектывізму адбываецца згодна з "прыродай" падлетка, якая патрабуе прызнання яго як асобы, рэалізацыі яго творчага патэнцыялу і проста зносін з дарослымі людзьмі, з аднагодкамі – членамі ўласнай кампаніі, часовых працоўных калектываў або ўдзельнікаў гульняў і спаборніцтваў. Грамадская думка, што ўхваляе праяўленне дадзеных пачуццяў у адносінах да іншых людзей, занатаваная ў шматлікіх фальклорных адзінках, даводзіць да свядомасці падлеткаў, што падобныя пачуцці дапамагаюць узаемаадносінам у калектыве, у грамадстве, робяць жыццё і дзейнасць поўнымі і насычанымі і дазваляюць падлетку адчуваць сябе паўнацэнным членам грамадства *("Добры чалавек заўсёды знойдзе добрых сяброў", "Сапраўдная дружба крапчэй каменных сцен"* і інш.).

Характэрным для падлетка, а таксама юнакоў і дзяўчат з'яўляецца ўсведамленне пачуцця сумлення, якое выконвае ролю ўнутранага суддзі. Развіццё пачуцця сумлення мае вялікае значэнне для рэгуляцыі ўласных паводзін, а таксама ладу жыцця асобы, што фарміруецца як у адносінах да іншых людзей *("Хто сумленне мае, той чужога не хапае", "Хоць кашуля чорная, але сумленне чыстае")*, так і да сябе самога *("Абы сумленне чыстае", "Ад людзей схаваешся, ад сумлення – не")*. У юнацкім узросце адбываецца далейшае ўсведамленне маральных пачуццяў. Дзякуючы актыўнай працоўнай і іншых відаў дзейнасці юнакоў і дзяўчат фарміруюцца канчаткова ўсе віды маральных пачуццяў, а разам з тым і такое вядучае маральнае пачуццё, як каханне. Узнікненне дадзенага пачуцця азначае, што юнак або дзяўчына сталі дарослымі і могуць пачынаць самастойнае ад бацькоў жыццё. Адным з самых галоўных маральных пачуццяў яго неабходна лічыць таму, што: 1) яно ўзрастае на базе пачуцця любові да маці, якое ўзнікае яшчэ ў маленстве, затым любові да іншых членаў сям'і (грамадская думка "клапацілася" пра наяўнасць у дзіцяці дадзенай якасці, асуджаючы негатыўныя адносіны да маці і бацькі: *"Хай таму дзіцятку язык адваліцца, хто бацьку і маці няславіць", "Хай адсохне тая рука, што на бацьку падымаецца"* і г.д.); 2) пачуццё кахання ўзбагачае не толькі каханага чалавека, але і таго, хто кахае (дзякуючы гэтай асаблівасці ў закаханых узнікае жаданне маральнага самаўдасканалення, здзяйснення станоўчых учынкаў для свайго каханага

Репозиторий ВГУ

ці каханай, а таксама грамадска значных учынкаў – усё гэта спрыяе фарміраванню пачуццёвай сферы асобы, а таксама яе маральнай свядомасці і маральных паводзін); 3) нават нераздзеленае каханне прыносіць таму, хто яго спазнае, пачуццё шчасця і радасці; 4) спазнанне дадзенага пачуцця ў сямейным жыцці маладых пазітыўна ўплывае на мікраклімат сям'і, а значыць, ствараецца спрыяльная атмасфера для ўзрошчвання і выхавання дзяцей, бо і на іх распаўсюджваюцца "элементы" дадзенага пачуцця – і на аснове пачуцця кахання да мужа ці жонкі развіваюцца бацькоўская любоў і пяшчота да ўласных дзяцей.

З падлеткавага ўзроставага перыяду пачынаецца актыўнае і сістэматычнае самавыхаванне, што непасрэдна ўплывае на ўзровень самаацэнкі падлетка. Пачатак актыўнага самавыхавання асобы падлетка часцей за ўсё звязаны з уздзеяннем калектыву: шукаючы прызнання сябе як асобы, сваіх дзеянняў у грамадстве, ён сур'ёзна прыслухоўваецца да меркаванняў і парад членаў калектыву, падлеткавай групы або паважаных людзей. Імкненне да лідарства вымушае падлетка выпрацоўваць у сабе пэўныя якасці і рысы характару, якіх яму не хапае, згодна з меркаваннем калектыву, або вынішчаць адмоўныя ці шкодныя для дасягнення пастаўленай мэты рысы, што таксама ўзгоднена з калектыўнай думкай. У "барацьбе" за лідарства неабходна адэкватная і самастойная ацэнка сваіх здольнасцей, маральнасці і г.д., што яшчэ не ў поўнай меры ўласціва падлетку з-за значнага ўплыву на яго самаацэнку грамадскай думкі. Народна-педагагічныя сродкі і метады як мага лепей дапамагалі ўсвядоміць падлетку ўзровень развіцця ўласных магчымасцей і набыць пэўны статус у падлеткавай групе. Але дарослыя члены калектыву ведалі ранімасць падлетка, таму імкнуліся як мага больш карэктна рабіць свае заўвагі і даваць ацэнку яго асобы. Іншая сітуацыя, калі падлетак з'яўляецца ізгоем у дадзенай групе: ён даволі хутка аналізуе хібы ў развіцці ўласнага "Я", што ўплывае на яго маральную самаацэнку, і па прычыне імкнення скласці аб сабе ў іншых лепшае ўражанне пачынае мэтанакіраваную, свядомую працу над сабой. Для падлеткавага ўзросту характэрным з'яўляецца разбурэнне прамалінейнай фармальнай сувязі паміж учынкамі і якасцямі характару. На змену прыходзіць усведамленне адваротнага: канкрэтны ўчынак не азначае засваення пэўнай рысы, якасці – гэта прыводзіць да пэўнага адрыву ў свядомасці чалавека яго ўнутранага свету ад непасрэдных практычных паводзін. Самаацэнка ўсё яшчэ недастаткова аб'ектыўная і носіць кансерватыўны характар. Гэта азначае, што ўплыў меркаванняў і грамадскай думкі на свядомасць падлетка прымушае апошняга карэкціраваць сваю асобу, удасканальваць ці нават мяняць жыццёвыя пазіцыі і накіраванні, – гэта ў некаторай ступені прыводзіць да расчаравання ў самавыхаванні, але і да набыцця пэўнага жыццёвага вопыту і мудрасці, што не можа не ўплываць станоўча на ўзровень



Рэпазіторый ВДУ

фарміравання самаацэнкі падлетка, якi пераходзіць у больш сталы ўзроставы перыяд – юнацкі.

Свядомасць юнака, а значыць і яго самаацэнка, фарміруецца згодна з новым грамадскім статусам – статусам дарослага чалавека, сталай асобы,для якой, па меркаванні народа-педагога, характэрны: пэўная жыццёвая пазіцыя (сваё бачанне і меркаванне наконт той ці іншай падзеі), згодна з назапашаным у папярэдніх узроставых перыядах жыццёвым вопытам; фарміраванне жыццёвых ідэалаў, кіруючыся якімі, асоба праводзіць мэтанакіраванае самавыхаванне (звычайна многія з жыццёвых ідэалаў юнак чэрпаў з агульнанароднага ідэалу дасканалай асобы, дзякуючы ўласнаму жыццёваму вопыту, грамадскай думцы, звычаям і традыцыям, у тым ліку і выхаваўчым, што пранізвалі жыццё вясковай сям'і); палажэнне, якое займае ў сям'і юнак як дарослы (што звязана з актыўным уключэннем юнака з боку бацькоў і старэйшых у сямейны савет па рашэнні розных надзённых праблем, з пашырэннем кола працоўных абавязкаў і магчымасцю поўнасцю замяніць бацьку ці маці ў выкананні працоўных дзеянняў, з дазволаму гэтым перыядзе ўступаць у шлюб, бо ў народзе лічылася, што юнак і дзяўчына і ў маральных, і ў працоўных, і ў фізічных адносінах здольныя стварыць уласную сям'ю і выхоўваць дзяцей).

У параўнанні з перыядам блазноцтва падлеткавы і юнацкі адрозніваюцца большай самастойнасцю ў меркаваннях, дзеяннях і пэўнай незалежнасцю ад маральных поглядаў іншых людзей (але не насуперак грамадскай думцы і без разбурэння народных канонаў маральнасці), што адбіваецца і на асаблівасцях маральнага мыслення. Калі блазны плануюць свае паводзіны і асобныя ўчынкі згодна з прыкладнымі меркаваннем і рэакцыяй на іх дарослых членаў сям'і, то падлеткі абстрагуюць, выбіраючы пэўны стыль паводзін, ад рэакцыі і аналагічнага тыпу паводзін сяброў або найбольш папулярных членаў групы, а юнакі і дзяўчаты, наогул, імкнуцца будаваць з дапамогай маральнага мыслення такія ўчынкі і стыль паводзін, што не разыходзіліся б з іх уласнымі маральнымі ўяўленнямі і перакананнямі, кіруючыся пры выбары пэўнага тыпу паводзін магчымасцю спазнання маральных пачуццяў задавальнення, радасці і г.д. Так, відавочна, што галоўную ролю ў фарміраванні маральнага мыслення адыгрывае высокі ўзровень сфарміраванасці маральнай свядомасці, у прыватнасці маральных уяўленняў, маральных паняццяў, маральных пачуццяў і маральнай ацэнкі і самаацэнкі.

Падлеткавы перыяд характарызуецца фарміраваннем маральных паводзін згодна з ліквідаваннем унутраных супярэчнасцей, што з'яўляюцца вынікам назапашаных на дадзены момант маральных уяўленняў і паняццяў і ўсведамленнем сябе як паўнацэннай асобы. Унутраныя супярэчнасці (названыя так таму, што абодва элементы: зараджэнне і вырашэнне – разгортваюцца і дзейнічаюць у свядомасці



Репозиторий ВГУ

чалавека) узнікаюць з-за нераўнамернага развіцця асобных бакоў ці ўласцівасцей асобы. Напрыклад, маральныя ўяўленні і паняцці засвойваюцца асобай, што фарміруецца, хутчэй, чым развіваецца ці перабудоўваецца яе маральная свядомасць. Яшчэ больш марудна засвойваюцца і замацоўваюцца звычкі і манеры маральных паводзін. Вось чаму нярэдка ўзнікаюць супярэчнасці паміж новымі маральнымі ўяўленнямі і паняццямі і маральнымі перакананнямі асобы, паміж маральнай свядомасцю і паводзінамі, паміж жаданнем асобы і яе магчымасцямі, паміж патрэбнасцямі і маральнымі абавязкамі, вырашыць што магчыма шляхам падцягвання неразвітых бакоў асобы да ўзроўню ўласных прэтэнзій. Дадзеныя супярэчнасці пераадольваюццаў працэсе самавыхавання пры справядлівай маральнай ацэнцы сваіх перакананняў, паводзін і т.п.; праз станоўчы ўплыў з боку блізкіх людзей, сяброў, членаў працоўнага калектыву на фарміраванне маральнага мыслення і маральных паводзін, бо падлетак звычайна давярае меркаванням сваіх сяброў і найбольш паважаных людзей наконт ацэнкі яго ўчынкаў і паводзін. Фарміраванне маральнай свядомасці і маральных паводзін адбываецца ў дзейнасці, таму неабходна падкрэсліць вялікую ролю зносін падлетка з членамі працоўнага калектыву ў пераадоленні вышэйназваных унутраных супярэчнасцей асобы падлетка: 1) адэкватная ацэнка асобнымі людзьмі і калектывам у цэлым розных бакоў працоўнай дзейнасці і маральных паводзін асобы, узроўню сфарміраванасці яго асобы спрыяе больш глыбокаму ўсведамленню супярэчнасцей; 2) патрабаванні членаў калектыву ў строгім выкананні элементаў працоўнай дзейнасці, сваіх абавязкаў, а таксама ў здзяйсненні маральнага самаўдасканалення асобы падлетка, выпраўленні негатыўных маральных учынкаў і г.д. ствараюць спрыяльныя ўмовы для станоўчага вырашэння супярэчнасцей.

Значны ўплыў тут аказвае грамадства ў асобе бацькоў, сяброў і членаў працоўнага калектыву на фарміраванне пэўнага маральнага дзеяння на кожным з яго этапаў. На першым неабходна ўзнікненне стымулу – уздзеянне на свядомасць блазна або падлетка звонку: грамадскай думкі, прыкладу і аўтарытэту або выпадковае ўздзеянне (станоўчае ці адмоўнае); другі этап прадугледжвае з'яўленне матыву – унутранага падахвочвання, што фарміруецца на аснове ўсведамлення і прыняцця стымулу; выбар формы паводзін ажыццяўляецца на трэцім этапе фарміравання маральнага дзеяння, калі складваецца ўласцівасць асобы праз матыў і знойдзеную адэкватную форму паводзін (на што ўплываюць меркаванні, тлумачэнні, расповеды блізкіх людзей, гутаркі з імі); на чацвёртым этапе матыў рэалізуецца ў маральных паводзінах, якія пераходзяць у маральную звычку (толькі рэальная практычная сітуацыя маральных паводзін можа замацаваць і зрабіць набыткам асобы пэўнае маральнае дзеянне, а рэакцыя іншых людзей, іх слоўная ацэнка дадзенага дзеяння, прымяненне метадаў заахвочвання і асуджэння, грамадскай думкі пераконваюць асобу ў



Репозиторий ВГУ

неабходнасці або замацавання маральнага дзеяння ў звычку, або адмовы ад яго. У выпадку калі асоба пад уздзеяннем меркавання акружаючых вырашае замацоўваць пэўнае маральнае дзеянне ў звычку, яна замацоўвае яго неаднаразовымі паўтарэннямі і даводзіць да звыклага); пяты этап падразумявае пераўтварэнне звыклай формы паводзін ва ўласцівасць асобы, калі аднародныя звычкі аб'ядноўваюцца і дадзеная маральная форма паводзін спрацоўвае ў любой сітуацыі. Так, асноўным рэгулятарам маральных паводзін падлетка з'яўляюцца іншыя людзі, іх меркаванні і маральная ацэнка яго ўчынкаў і дзеянняў, хоць і сам падлетак свядома кантралюе фарміраванне пэўнага стылю паводзін, папаўняючы яго тымі маральнымі дзеяннямі, што яму імпануюць, і ліквідуючы адваротныя, што магчыма ўзніклі стыхійна, пад уплывам нечага прыкладу і г.д.

Фарміраванне маральных паводзін у юнацкім узросце вызначаецца якасна новым этапам. Гэта звязана з высокім узроўнем сфарміраванасці маральнай свядомасці і маральнага мыслення, што накладвае свой адбітак і на фарміраванне маральных паводзін, з развіццём жыццёвых ідэалаў і пэўнай жыццёвай пазіцыі, а таксама абумоўлівае строга матываваныя і абгрунтаваныя паводзіны. Да ўступлення асобай у дадзены ўзроставы перыяд на працягу папярэдніх звычайна ў арсенале маральных паводзін назапашваецца дастатковая колькасць маральных звычак, свядома сфарміраваных асобай у выніку пераадолення знешніх і ўнутраных маральных супярэчнасцей. Маральныя паводзіны юнака характарызуюцца свядомасцю і падпарадкаванасцю ўласнаму маральнаму ідэалу (які складаецца з абагульненых уяўленняў пра ўзоры маральных паводзін). Шматлікая колькасць абрадавых дзеянняў была прысвечана праверцы падрыхтаванасці маладых людзей да будучага сямейнага жыцця і выхавання дзяцей: узроўню іх маральнасці, што, безумоўна, перадавалася наступным пакаленням (*"Па татку дзіцятка", "Якая матка, такое і дзіцятка", "Яблык ад яблыні недалёка коціцца"* і інш.) і спрыялаўстанаўленню ладу і згоды паміж мужам і жонкай (правяралася наяўнасць пэўных маральных якасцей: для хлопца – працавітасць, гаспадарлівасць, смеласць, павага да іншых, праўдзівасць, сумленнасць, пачуццё ўласнай годнасці і г.д.; для дзяўчыны – працавітасць, дабрыня, спагада, павага да іншых людзей, праўдзівасць, вернаць і інш.). На правядзенне дадзеных "ініцыяцый" або іх элементаў былі скіраваны многія народныя сінкрэтычныя і безрэлігійныя святы, прысвечаныя Калядам, Масленіцы, Купаллю, а таксама вясельны абрад.

Шэраг народна-педагагічных метадаў быў прысвечаны мэце фарміравання маральных паводзін у юнацкім перыядзе: метады ўзаемнай ініцыятывы (праца, гульня, практыкаванне) спрыялі ўстанаўленню статусу асобы, што фарміруецца, у калектыве, у грамадстве праз ажыццяўленне ў працоўнай ці гульнёвай дзейнасці і праяўленне ў маральных паводзінах асабістых маральных рыс характару, грамадская думка як метад



Рэпазіторый ВДУ

ініцыятывы “акружэнне "Я"” агучвала неабходныя маральныя якасці і пэўны стыль маральных паводзін; метады ініцыятывы “акружэнне "Я"” кантралявалі ход фарміравання маральных дзеянняў і звычак, заахвочваючы асобу развіваць станоўчыя маральныя дзеянні і ўмацоўваць іх у звычкі і стрымліваць праз асуджэнне негатыўныя праяўленні асобы юнака; у дадзеным узросце шырока прымяняліся метады спаборніцтва (вынікі якога спрыялі зацвярджэнню асобы ў грамадстве на дастаткова доўгі час) і іспыту (своеасаблівыя праверкі сфарміраванасці маральнага здароўя асобы – прамежкавыя, іх вынік паказваў, у якім рэчышчы неабходна накіроўваць маральнае выхаванне і самавыхаванне, самаўдасканаленне асобы, і выніковы, які падаваў або станоўчы, або пасрэдны вынік сфарміраванасці маральнага здароўя асобы).

Падлеткавы і юнацкі ўзрост патрабуе фарміравання валявога пабуджэння, згодна з пачуццямі абавязку і адказнасці, узнікненне якіх звязана з прыродай псіхікі людзей дадзеных узроставых груп. Праяўленне такіх пачуццяў азнамяноўвае барацьбу матываў, намаганні над сабой, патрабуе разгорнутага ўнутранага плана дзеяння, якое дазваляе інтэлектуальна і эмацыянальна ўявіць сабе магчымыя вынікі. Відавочна, што фарміраванне дадзеных пачуццяў адбывалася ў грамадскай дзейнасці праз выкананне падлеткамі і юнакамі пэўных працоўных абавязкаў, што дазвалялі сфарміраваць вышэйназваныя пачуцці і праз зносіны з іншымі людзьмі, таму і фарміраванне маральнай волі ў дадзеных узроставых перыядах адбывалася таксама пад уплывам іншых. Грамадства арганізоўвала спаборніцтвы, іспыты, дзе правярала ўзровень сфарміраванасці валявых якасцей, бо ад іх выніку залежалі павага падлетка ці юнака іншымі людзьмі, адносіны да яго як да сталай асобы, займанне ім пачэснага месца ў грамадстве (дадзеныя метады ажыццяўляліся не толькі як нейкія фізічныя практыкаванні, але і як працоўныя для падлеткаў, юнакоў і дзяўчат).

Нягледзячы на некаторы знешні ўплыў на развіццё маральнай волі ў падлеткавым і юнацкім узростах, асоба, што фарміруецца, у большай меры, чым блазны, скарыстоўваеў кожнай канкрэтнай сітуацыі выбар пэўнага праяўлення маральнай волі. Гэта звязана з развіццём унутранай свабоды – дзейнічаннем згодна з унутранымі перакананнямі, з прынятай ідэяй, і ні ў якім разе ні пры якіх абставінах не здраджваць сваім перакананням. Вышэйшае праяўленне ўнутранай свабоды прыходзілася на перыяд юнацтва, калі асоба атрымоўвала доўгачаканую свабоду выбару, свабоду дзеянняў, свабоду меркаванняў і ўрэшце свабоду волевыяўлення. У падлеткавым перыядзе дадзены элемент маральнай волі толькі пачынаў развівацца і ўмацоўвацца, бо асоба яшчэ была звязана з калектыўным меркаваннем, маральнымі ўяўленнямі групы і імкнулася паводзіць сябе згодна з маральнымі поглядамі членаў групы, сяброў і іншых людзей. Юнацкаму ўзросту, акрамя вышэйзгаданага, была ўласціва яшчэ і інтэнсіўная работа па маральным самаўдасканаленні асобы, што знаходзіла

сваё выяўленне ў сфарміраванасці маральна-валявых рыс, якія ў сукупнасці складалі цэласны валявы працэс: 1) рыс, што выражаюць змест волі (ідэйная і маральная накіраванасць); 2) рыс, у якіх замацаваны стымулюючы бок валявога працэсу (мэтанакіраванасць, ініцыятыўнасць, настойлівасць, рашучасць); 3) рыс, што адлюстроўваюць стрымліванне дадзенага працэсу (вытрымка, самавалоданне). Найбольш эфектыўна маральна-валявыя рысы асоба развівала ў грамадскай дзейнасці праз стваральную працу, захоўваючы традыцыі і звычаі беларускага народа.

***Працэс фарміравання фізічнага здароўя*** асобы адрозніваецца ад працэсу фарміравання маральнага здароўя: фізічнае здароўе ў адрозненне ад маральнага даецца дзіцяці з нараджэннем (з улікам спадчыннасці), таму фізічнае здароўе неабходна падтрымліваць і ўмацоўваць, у той час калі маральнае фарміраваць практычна “з нуля”. Фарміраванне фізічнага здароўя асобы такім чынам павінна пачынацца з моманту нараджэння дзіцяці. На думку Ю.Ф. Зманоўскага, каб выхаваць фізічна здаровае дзіця, неабходна з самага ранняга дзяцінства навучыць яго весці здаровы лад жыцця, асноўнымі кампанентамі якога з’яўляюцца: “рацыянальны рэжым, сістэматычныя фізкультурныя заняткі; выкарыстанне эфектыўнай сістэмы загартавання; правільнае харчаванне; спрыяльная псіхалагічная абстаноўка ў сям’і” [43, с. 60]. А.К. Атаеў лічыць у сваім даследаванні, што галоўная задача сям’і складаецца з устанаўлення сістэмы фізічнага выхавання дзяцей – пэўнага ўкладу і быту сям’і, які спрыяе вырашэнню наступных задач: 1)вырасціць здаровых дзяцей; 2) навучыць іх захаванню ўласнага здароўя [8, с. 159]. А ў сям’і магчыма наладзіць, на погляд вучонага, вырашэнне наступных задач, падпарадкаваных фарміраванню фізічнага здароўя дзяцей: 1) павышэнне працаздольнасці дзіцячага арганізма, што дасягаецца сістэматычнымі фізічнымі трэніроўкамі; 2) загартаванне; 3) усебаковае фізічнае развіццё, што дасягаецца праз устанаўленне і выкананне рэжыму працы і адпачынку; 4) развіццё ў дзяцей устоўлівых і дасканалых, жыццёва неабходных рухальных якасцей: моцы, хуткасці, гнуткасці, спрыту, вытрымкі – праз сістэматычныя і мэтанакіраваныя фізічныя практыкаванні, працоўную дзейнасць; 5) узбраенне малых тэарэтычнымі звесткамі па пытаннях фізічнай культуры (гігіены, сну, харчавання, загартавання); 6)выхаванне ў дзяцей устойлівай цікавасці да сістэматычных заняткаў фізічнай культурай; 7) фарміраванне ў падлеткаў і юнакоў навыкаў і ўменняў па арганізацыі і правядзенні заняткаў з малодшымі [8, с. 159–161].

Так, відавочна, што на працэс фарміравання фізічнага здароўя асобы аказваюць уплыў ***наступныя сацыяльныя ўмовы і сродкі***: спадчыннасць, індывідуальныя асаблівасці арганізма (нязменлівыя сацыяльныя ўмовы, якія не залежаць ад намаганняў асобы, што фарміруецца);рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку, аздараўленчая фізкультура, актыўны адпачынак, загартаванне, гігіена быту і асабістая, рацыянальнае харчаванне, станоўчая накіраванасць на непрыняцце альбо адмову ад

шкодных звычак (зменлівыя сродкі, што непасрэдна залежаць ад чалавека, ад таго ладу жыцця, якога ён прытрымліваецца) (малюнак 1.1). Такім чынам, працэс фарміравання фізічнага здароўя асобы пачынаецца ў сям’і і з сям’і (апошняе датычыцца здаровага ладу жыцця сям’і і пэўнага генафонду, г.зн. спадчыннасці). Клопат пра фізічнае здароўе нашчадкаў пачынаўся задоўга да іх нараджэння, нават і да стварэння сям’і. Дзяўчаты, хлопцы (часта з дапамогай бацькоў) прыглядаліся да патэнцыяльных жаніхоў і нявест, ацэньваючы перш-наперш іх здароўе. Добрай жонкай у беларусаў лічылася здаровая і мажная дзяўчына, бо, па-першае, на яедолю звычайна выпадала шмат фізічнай працы, звязанай з захаваннем гігіены жылля і асабістай гігіены дзяцей (мыццё бялізны, захаванне чысціні хаты, купанне дзяцей у лазні і г.д.), з харчаваннем (вырошчванне гародніны, збажыны, утрыманне хатняй гаспадаркі, гатаванне ежы і інш.); па-другое, беларуская вясковая сям’я характарызавалася сваёй шматдзетнасцю. Абавязковым патрабаваннем да дзяўчыны павінна быць захаванне цнатлівасці да шлюбу, магчыма, у першую чаргу, каб захаваць сваё здароўе і нарадзіць здаровае патомства, затым жа – з мэтай фарміравання ўласнага маральнага здароўя (калі выяўляліся факты падману, нявесту і ўвесь яе род ганьбавалі: прапускалі праз смаленыя вароты, надзявалі нявесце, яе маці, хроснай маці на шыю хамуты, пускалі пеўня і г.д.). Таму дзяўчаты імкнуліся захаваць сваю чысціню да першай шлюбнай ночы. На думку народа, добрым мужам мог стаць фізічна здаровы і моцны хлопец, бо яму належала стаць кармільцам вялікай сям’і і гаспадаром на зямлі і ў доме. Ён павінен быць без дрэнных звычак чалавекам(для захавання генафонду і падтрымання здаровага ладу жыцця сям’і, бо з бацькі – главы сям’і – звычайна бралі прыклад яго сыны), што не страціў уласнай чысціні (хоць да гэтага факта адносіліся не так катэгарычна, як у адносінах да дзяўчыны, але калі сын не захаваў цнатлівасці, адмаўляўся садзіцца на“дзяжу” – своеасаблівы рытуал на “праверку” чысціні, то нярэдка бацькіадмаўлялі яму ў благаславенні на шлюб).

Так, бацькі загадзя клапаціліся пра здаровае патомства, ацэньваючы свайго выбранніка ці выбранніцу з боку фізічных магчымасцей (часта маладыя за падобнага роду парадай звярталіся да бацькоў або прыслухоўваліся да грамадскай думкі). Цяжарная жанчына і яе сям’я прытрымлівалася шэрага няпісаных прыкмет і павер’яў, якія забяспечвалі дабратворны ўплыў на здароўе, выгляд і характар дзіцяці ва ўлонні маці і пры нараджэнні, а жанчыне “гарантавалі” нескладаныя роды, што сведчыла аб клопаце маці пра стан фізічнага і маральнага здароўясвайго будучага дзіцяці. Многія са звычаяў і абрадаўмелі рацыянальнае зерне, іх значнасць пацвярджаецца нават сучаснаймедыцынскай навукай. Больш за тое, сучасныя жанчыны, выношваючы дзіця, прытрымліваюцца гэтых жа правілаў, што ўзніклі і замацаваліся ў быце беларусаў стагоддзі назад; напрыклад: 1) нельга было падымаць і насіць цяжарнай вялікія грузы,



Рэпазіторый ВДУ

сцягваць моцна спадніцу, шмат есці (плод вырасце вельмі вялікім і дзіця ніколі не будзе сытым), але будучая маці павінна была есці ўсё, калі на тое быў апетыт, каб дзіця з'явілася на свет здаровенькім; 2) у час працы неабходна было падвязваць жывот ручніком або хусткай (зараз для гэтай мэты прызначаны бандаж), асцерагацца ўдараў у жывот, больш рухацца, быць на свежым паветры, а менш спаць. Некаторыя забароны былі звязаны з нейкай непрадказальнай, магічнай сілай, напрыклад, у выпадку перапуду цяжарнай, якая глядзела на пажар, дзіця магло нарадзіцца з чырвонай (вогненнай) плямай у тым месцы, да якога на ўласным целе дакранулася будучая маці. Таксама цяжарнай жанчыне забаранялася прысутнічаць на пахаванні, каб дзіця не захварэла якой-небудзь цяжкай хваробай або не "атрымала" жоўты хваравіты колер твару. На самай справе, сучаснай медыцынскай і псіхалагічнай навукамі даказаны той факт, што моцныя эмоцыі, перажыванні маці праз яе гармоны перадаюцца будучаму дзіцяці, "прымушаючы" апошняга моцна хвалявацца – менавіта таму ў плода прылівае кроў да месца дакранання, становячыся тромбам, які можа рассмактацца з цягам часу, а можа і застацца з чалавекам на ўсё яго жыццё, або змяняецца колер твару падчас захворвання малога з-за сапраўды моцнага "перажывання".

Некаторыя радзінныя звычаі і абрады былі звязаны з бескарыснымі прымхамі і забабонамі беларускага народа, але цяжарная жанчына, верачы ў іх, імкнулася строга выконваць дадзеныя "прадпісанні паганскіх вераванняў" (напрыклад, не пераступаць праз сякеру, каб у дзіцяці не было пры нараджэнні рассечанай, "заечай" губы; не тушыць галавешку, што выграбла з печы, каб у дзіцяці не было працяглай хваробы страўніка, і інш.). Але ў час цяжарнасці жонкі рэгламентаваліся і паводзіны мужа, што, па меркаванні народа, забяспечвала паспяховы зыход родаў і нараджэнне здаровага дзіцяці. Мужчыне забаранялася нецэнзурна размаўляць, разбураць птушыныя гнёзды, каб дзіця нарадзілася жывым, а жонка добра адчувала сябе пасля родаў і хутчэй паправілася, ды і такія павер'і рыхтавалі мужчыну да ролі бацькі – узору фізічна і маральна здаровай асобы для сваіх дзяцей.

Падчас прыняцця родаў – складанага моманту ў жыцці жанчыны і дзіцяці – народ перш за ўсё клапаціўся пра іх здароўе. З гэтай мэтай будучую маці ў час родаў ізалявалі ад астатніх членаў сям'і звычайна ў вытапленай лазні, дзе было ўсё неабходнае для паспяховага нараджэння дзіцяці. Разам з парадзіхай знаходзіліся бабка-павітуха, якая непасрэдна прымала роды, і бабка-пупарэзніца, што перавязвала нованароджанаму пупавіну, упершыню яго купала і затым у далейшым станавілася яго "хроснай" бабкай. Каб малое вырасла працавітым і здаровым, пупавіну перараззалі на працоўных інструментах (для хлопчыкаў – на нажы, малатку, сякеры; для дзяўчынак – на верацяне, кручках, нажніцах) або на прадмеце, што сімвалізаваў моц або трываласць (для хлопчыкаў – на дубовай кары, камені, хлебе і інш.; для

Репозиторий ВГУ

дзяўчынак – на нітках, касцяным грэбні і г.д.), больш таго, каб хлопчык быў дужым і здаровым, часта пупавіну перабівалі камянямі [75, с. 32].

Репозиторий ВГУ




Малюнак 1.1– Сродкі фарміравання фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы

З нараджэннем дзіцяці бацькі, перш за ўсё маці (да той пары, пакуль над дзіцём не выконвалі абрад першага пострыгу, ён знаходзіўся пад выхаваўчым уздзеяннем маці), пачыналі клапаціцца пра захаванне яго фізічнага здароўя, што з’яўлялася адным з найбольш важных накірункаў ранняга выхавання дзіцяці.

***Загартаванне*** – гэта комплексная сістэма аздараўленчых уздзеянняў, накіраваных на дасягненне ўстойлівасці, неўспрыняцця арганізма да шкодных для здароўя метэаралагічных і іншых фактараў. Такая ўстойлівасць можа быць дасягнута толькі ў выніку сістэматычнай трэніроўкі і пастаяннага ўдасканалення механізмаў адаптацыі [43, с. 38]. Загартаванне арганізма дзіцяці пачыналася ледзь не з першых хвілін жыцця праз першае ў яго жыцці купанне, якое ажыццяўлялася з мэтай гігіенічнага ачышчэння дзіцяці (у ваду часта дадаваліся асвячоныя ў царкве лекавыя травы: рамонак, чыстацел, мята, чарада, што спрыялі, згодна з даследаванымі іх фармакалагічнымі ўласцівасцямі, лепшаму, беражліваму ачышчэнню і ўвільгатненню скуры нованароджанага, не выклікаючы яе раздражнення), а таксама служылі ў якасці надзейнага сродку ад сурокаў. Першыя шэсць тыдняў жыцця дзеля захавання здароўя

Репозиторий ВГУ

немаўляці, а таксама яго загартавання праз ваду маці купала яго ў той лазні, дзе нарадзіла, астатнім членам сям'і забаранялася карыстацца дадзенай лазняй. Па меры росту і сталення немаўляці купанне і мыццё ў лазні станавіліся больш усвядомленымі і прыносілі малому шчырае захапленне, што праяўлялася ў плёсканні па вадзе ручкамі і ножкамі, гульнях і смеху. Прыкладна з двух- ці трохгадовага ўзросту дзіцяці бацькі, што бралі яго раз на тыдзень у лазню, пачыналі прывучаць малога да парання венікам, што спрыяла ўмацаванню здароўя малога, абнаўленню адмерлага эпітэлію, вывядзенню праз пот з арганізма шлакаў і іншых шкодных рэчываў, разрадцы нервовай сістэмы, "гімнастыцы" ўнутраных органаў і сістэмы кровазвароту, трэніроўцы дыхання і павелічэнню жыццёвага аб'ёму лёгкіх, а таксама з'яўлялася (асабліва ў халодныя перыяды года) бадай адзіным гігіенічным сродкам па доглядзе за целам і валасамі дзіцяці. Старэйшыя дзеці, пачынаючы з блазнюковага перыяду, разам з дарослымі чаргавалі паранне з купаннем у вадаёме недалёка ад лазні ці ў зімовы час абціранне снегам. Вышэйназваную працэдуру магчыма аднесці да актыўнага загартавання. Купанне дзяцей і дарослых у вадаёме таксама адносіцца да актыўнага загартавання, якое пачыналася з сярэдзіны ці канца мая, калі вада ў рэках больш-менш праграваласе (у азёрах і закрытых вадаёмах тэмпература вады была значна большай) і працягвалася да свята Іллі, бо, згодна з народным календаром, пачынаючы з дадзенага дня, які прыпадае на пачатак жніўня, вада ў вадаёмах ужо ахалоджваецца (*"Прыйшоў Ілля, укінуў два пуды льда"*, згодна з народнымі назіраннямі), таму бацькі забаранялі дзецям купацца, баючыся, каб у тых не звяло ад халоднай вады рукі і ногі, бо здараліся па гэтай прычыне нават смяротныя выпадкі. У гарачую пару дзеці па некалькі гадзін праводзілі ў вадзе, выходзячы на бераг толькі абсушыцца на сонцы і перавесці дух.

Акрамя загартавання вадой, дзеці ажыццяўлялі загартаванне паветрам і сонцам. Пачынаючы з 4–5-гадовага ўзросту малыя шмат часу бавілі ў рухомых гульнях на свежым паветры: вясной, калі глеба падсыхала, усё лета і цёплую частку восені малыя наладжвалі калектыўныя гульні, звязаныя з пэўнымі абрадамі падчас народных свят (Вялікадня, Свята першай баразны, Купалля, Дажынак і інш.), дзіцячыя гульні з інвентаром ("Гарадкі", "Свіння", "Класы" і г.д.) ці без яго ("Жмуркі", "Даганялкі", "Краскі", "Барада" і інш.). Падлеткі і юнакі амаль увесь светлавы дзень займаліся працоўнай дзейнасцю (гульні і ігрышчы адбываліся ў зімовы перыяд ці падчас свят або вечарамі, калі моладзь звычайна адпачывала ад дзённых клопатаў і спраў), якая ўключала шэраг спраў па хатняй гаспадарцы і сезонныя палявыя работы, што ажыццяўляліся таксама на свежым паветры і ў любое надвор'е. Дадзеныя абставіны ды лекавае ўздзеянне сонечных промняў спрыялі ўзмацненню супраціўляльнай дзейнасці арганізма да розных прастудных і інфекцыйных захворванняў рэспіраторнага характару, а таксама агульнаму загартаванню арганізма. Зімовымі марознымі днямі вясковыя дзеці таксама не сядзелі дома: будаўніцтва снежных крэпасцей, катанне на лыжах, санках, каньках умацоўвалі арганізм дзіцяці, спрыялі павелічэнню жыццёвага аб'ёму лёгкіх,



Рэпазіторый ВДУ

добраму самаадчуванню, бадзёрасці, арганізм выпрацоўваў надзейны шчыт ад вірусаў, бактэрый, і, як вынік, дзіця, што актыўна бавіла час на свежым паветры ў любое надвор'е, менш хварэла, адрознівалася ад сваіх аднагодкаў, што больш знаходзіліся дома, бадзёрасцю і працаздольнасцю.

***Рэжым дня*** адыгрывае немалаважную ролю ў фарміраванні фізічнага здароўя асобы. Ён звязаны з сутачнымі і сезоннымі біярытмамі. На думку Ю.Ф. Зманоўскага, парушэнне, нават нязначнае, дынамікі біярытмаў прыводзіць да пэўнай ступені адхілення ў стане здароўя (ад невялікіх да значных). Сезонныя захворванні дзяцей, звязаныя з паслабленнем імунітэту, у першую чаргу абумоўлены парушэннем рытму. Прадухіліць наступствы хваробы магчыма пры дапамозе неспецыфічнай прафілактыкі, што складаецца з фізічных практыкаванняў і эфектыўнага загартавання [43, с. 8,10]. Таму, каб не парушаць раўнавагі паміж пэўным сутачным рэжымам і здароўем дзіцяці, бацькам неабходна захоўваць яго "дынамічны стэрэатып" (стабільнасць і разам з тым дынамічнасць), напрыклад, абавязкова выконваць у пэўны час наступныя элементы рэжыму: прабуджэнне і засыпанне, харчаванне, прагулкі.

Рэжым дня кожнага чалавека павінен у ідэале складацца, згодна з меркаваннем Б.М. Чумакова, з наступных элементаў: дзейнасці (розных яе відаў, што выконваюццаў пэўны час); рацыянальнага чаргавання працы і адпачынку; рэгулярнага харчавання (не менш за тры разы на дзень у адзін і той жа час); заняткаў мэтанакіраванай рухальнай нагрузкай; знаходжання на свежым паветры (не менш за2–3 гадзіныў дзень); строгага захавання гігіены сну (не менш за 8 гадзін у суткі, начны сон у адзін і той жа час) [159, с. 42]. Уклад сям'і і строгі распарадак працоўнага дня спрыялі ўстанаўленню адпаведнага сутачнага і сезоннага рэжыму дня (з раннім уставаннем, строгім распарадкам харчавання), чаргаваннем працы і адпачынку дзяцей блазнавага, падлеткавага і юнацкага ўзростаў.Пасля працоўнага летняга ці вясенняга дня падлеткі і моладзь актыўна адпачывалі вечарамі, праводзячы час у "дарослых" гульнях, вечарынах з песнямі, карагодамі, танцамі; дзяўчаты звычайна зімовымі вечарамі збіраліся на "супрадкі" – своеасаблівыя пасядзелкі за вязаннем, прадзеннем воўны, вышыўкай, з размовамі і песнямі; святы давалі магчымасць моладзі адпачыць ад працоўных сезонных клопатаў (напрыклад, восенню, калі палеткі былі падрыхтаваны да зімы, пачыналася "шлюбная пара" і іншыя святы). У святочныя дні моладзь і дарослыя адпачывалі, весяліліся, выконвалі пэўныя абрадавыя і цырыманіяльныя дзеянні,дзеці таксама ўдзельнічалі ў пэўных абрадавых гульнях, гарэзілі. Так, дзеці ад чатырох- да шасці-васьмі год у залежнасці ад традыцыйна ўстаноўленага рэжыму працы і адпачынку дарослых у сям'і паступова фарміравалі ўласны, згодна з выконваемымі хатнімі абавязкамі (напрыклад, пастушкі былі занятыя ўвесь дзень, таму і адпачываць ім прыходзілася ў час працы, а тыя з блазнюкоў, хто дапамагаў маці ці бацьку ў хатніх справах, былі часткова занятыя і таму мелі больш часу для гульняў і адпачынку), згодна з сезоннымі зменамі (зімой і позняй восенню было значна менш працы, чым летам і вясной, таму на восеньскі і зімовы час прыпадала



Репозиторий ВГУ

большая колькасць значных свят і інш.), згодна з матэрыяльным становішчам сям'і (заможныя бацькі імкнуліся не займаць уласных дзяцей больш цяжкай і працяглай у часе працай, пастушкоўствам, напрыклад, а наймалі для дадзенай работы дзяцей ці дарослых з бедных сем'яў) і колькасцю ў ёй дзяцей (у вялікіх сем'ях больш складаная праца ўскладвалася на плечы старэйшых дзяцей, а ў малодшых было больш часу для дзіцячых забаў і гульняў). З іншага боку строга ўстаноўлены рэжым працы і адпачынку, які складаўся з пэўных працоўных абавязкаў у сям'і, у грамадстве (дзіцячыя арцелі выпасалі хатнюю птушку і жывёлу, "хадзілі ў начное", калектыўна збіралі ў лесе грыбы, ягады і інш.), з дзіцячых гульняў і ўдзелуў абрадах і святах беларусаў, спрыяў пачатку працэсу фізічнага ўдасканалення блазнаў.

Наступнай і адной з найважнейшых умоў фарміравання фізічнага здароўя асобы з'яўляюцца ***аздараўленчая фізкультура і актыўны адпачынак***. Агульнавядома, што фізічная культура адыгрывае выключную ролю ва ўмацаванні здароўя чалавека. Згодна з даследаваннем А.Г. Сухарава, дадзенаму выніку спрыяюць: 1) павышэнне неспецыфічнай устойлівасці арганізма да ўздзеяння неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя, а значыць зніжэнне ўзроўню захворвання; 2) стымуляванне працэсу росту і гарманічнага развіцця, што станоўча адбіваецца на ўдасканаленні вядучых сістэм арганізма; 3) удасканаленне рэакцый тэрмарэгуляцыі і загартавання арганізма; 4) своечасовае фарміраванне рухальнага аналізатара, што спрыяе павышэнню фізічнай працаздольнасці; 5) павышэнне тонусу кары галаўнога мозга і стварэнне станоўчых эмоцый, што ўмацоўваюць і ахоўваюць псіхічнае здароўе [141, с. 87].

Здаровае дзіця немагчыма ўявіць сабе нерухомым, бо рухі неабходны для развіцця і ўмацавання яго фізіялагічных сістэм, а галоўнае, для нармальнага функцыянавання арганізма. Для падлеткаў і юнакоў адным з самых любімых спаборніцтваў была хадзьба на хадулях, што ўяўлялі сабой дзве высокія палкі, да якіх на вышыні каля метра прыбіваліся цуркі – ступені для ног. Яна патрабавала шматлікіх трэніровак, якія спрыялі развіццю фізічнай моцы, спрыту, каардынацыі рухаў, а таксама валявых намаганняў. Другім такім спаборніцтвам была барацьба ("боркі", "да крыжа") – імкненне даказаць сваю фізічную сілу, спрыт, – якая была падобна на сучасную вольную барацьбу: праціўнікі спрабавалі паваліць адзін другога на зямлю, і перамагаў той, хто пры гэтым трымаў праціўніка за раскінутыя ў бакі рукі. Значнай фізічнай сілы і вытрымкі патрабавала гульня "ў зацэп", калі двое гуляючых, седзячы насупраць, счэплівалі сярэднія фалангі сагнутых пальцаў і цягнулі кожны ў свой бок да таго часу, пакуль пераможца першым разагне палец праціўніка.У юнакоў і дзяўчат важнае месца займалі танцы, прычым неабходна было танцаваць шмат розных па жанры і рухах танцаў ("Мікіту", "Лявоніху", "Бульбу", польку, кадрылю, падэспань, казака, цыганачку і многія іншыя), каб не праслыць у моладзевым акружэнні няўклюдам. Моладзь звычайна танцавала цэлы вечар без адпачынку, што патрабавала пэўнай фізічнай вытрымкі, умельства, спрыту, каардынацыі рухаў, зграбнасці і г.д.



Рэпазіторый ВГУ

Дадзены від фізічнага "практыкавання" спрыяў развіццю дыхальнай, сардэчна-сасудзістай сістэм, вестыбулярнага апарату, а таксама з'яўлялася важным сродкам умацавання і захавання здароўя падрастаючага пакалення. Менавіта дзякуючы насычанасці жыцця стваральнай працай, а таксама шматлікімі рухомымі гульнямі і спаборніцтвамі, што ў большасці сваёй выконваліся на адкрытай прасторы (на вуліцы, на лузе, на полі, на рацэ), адбывалася ўмацаванне і захаванне фізічнага здароўя, выпрацоўваўся трывалы імунітэт супраць рэспіраторных захворванняў; не існавала такога вядомага ў наш час паняцця, як гіпадынамія, падрастаючае пакаленне не пакутавала на атлусценне, а нарошчвала мышачную масу.

***<u>Рацыянальнае харчаванне</u>*** – адна з асноўных умоў развіцця здаровага арганізма, што з'яўляецца адной з важных умоў фарміравання і падтрымання фізічнага здароўя чалавека. Калі б усе людзі правільна і рацыянальна харчаваліся, то не хварэлі б на цукровы дыябет, ішэмічную хваробу сэрца, гіпертанію, хваробы, звязаныя з парушэннем абмену рэчываў у арганізме (нездаровае атлусценне, цукровы дыябет і інш.), а таксама хваробамі стрававальнай сістэмы: язвамі страўніка і дванаццаціперснай кішкі, калітамі, энтэракалітамі і г.д. Вышэйзгаданыя наступствы няправільнага, незбалансаванага харчавання звязаны таксама з маларухомым ладам жыцця, дэфіцытам фізічных нагрузак, што не забяспечвае нармальную работу арганізма. Таму магчыма сфармуляваць адно з асноўных правілаў рацыянальнага харчавання – энергетычная каштоўнасць з'едзенага не павінна перавышаць энергазатраты арганізма, згодна з даследаваннем Ю.Ф. Змаcоўскага [44, с. 23–24].

Трэба заўважыць, што беларускі народ не цікавіўся энергетычнай каштоўнасцю харчовых прадуктаў, аднак у харчаванні быў умераным. Гэтаму было некалькі прычын: 1) чалавек, што наеўся, не мог добра фізічна працаваць, бо яго арганізм патрабаваў адпачынку для эфектыўнага ператтраўлівання вялікай колькасці з'едзенага харчу; 2) у вялікай сям'і гаспадыні звычайна ставілі посуд са стравай у цэнтры стала, і ўся сям'я ела з яго па чарзе (за парадкам і чарговасцю сачыў бацька, часценька караючы надта хітрых дзяцей пляскаваннем лыжкай па руцэ або лбе), гэта спрыяла заспакойванню голаду, а не наяданню пад завязку ці да адвалу. Ды і вялікія фізічныя нагрузкі, звязаныя з цяжкай сялянскай працай на полі і на падвор'і, забіралі значную колькасць энергіі, вылучанай з харчам. Другім правілам рацыянальнасці ў харчаванні з'яўляецца збалансаванасць нутрыентаў (харчовых рэчываў), што дасягаецца аптымальнымі адносінамі бялкоў, тлушчу і вугляводаў у прыкладных суадносінах 1:1:4 і спалучэннем незамяняльных кампанентаў (амінакіслот, вітамінаў і г.д.) [44, с. 25].Летам дзеці ўжывалі ў вялікай колькасці свежую гародніну (капусту, буракі, агуркі, моркву, бручку, цыбулю і г.д.), садавіну (яблыкі, грушы, слівы, вішні), лясныя ягады (чарніцы, суніцы, маліну, журавіны, ажыну), чым папаўнялі арганізм рознымі вітамінамі, мікра- і макраэлементамі, на якія былі багатыя клятчатка і сок пладоў і ягад раслін або караняплодаў.

Рэпазіторый ВГУ

Адзіным значным недахопам рацыянальнага харчавання з’яўлялася не штодзённае ўжыванне мяса або рыбных прадуктаў у адвараным альбо тушаным ці смажаным выглядзе, што было звязана з нізкім матэрыяльным становішчам сям’і, а таксама з правядзеннем двух гадавых пастоў (мяса елі ў зімовы час, бо яно ўзімку лепш захоўвалася, але толькі пасля Нараджэння Хрыстова, калі пасля заканчэння посту дазвалялася ўжываць мясныя і рыбныя стравы). У сувязі з гэтым назіраўся недахоп жывёльнага бялку ў арганізме чалавека, які ўдзельнічае ў рэакцыі злучэння малекул ДНК з незамяняльнымі амінакіслотамі,што не лепшым чынам адбівалася на здароўі чалавека: зніжэнне агульнага імунітэту, нервовыя расстройствы, узнікненне хвароб на генетычным узроўні і г.д.Так, усё вышэйзгаданае, за выключэннем апошняга фактару, сведчыць, што ў харчаванні дзяцей у некаторай ступені прысутнічала збалансаванасць бялкоў, тлушчу і вугляводаў, вітамінаў і мінералаў, неабходная для нармальнага росту і развіцця дзіцячага арганізма, хоць сялянкі і не клапаціліся пра гэта, асноўнай іх задачай было накарміць сям’ю, каб ніхто не заставаўся галодным.

Стол дарослых членаў сям’і, куды ўваходзілі і дзеці з трох-чатырохгадовага ўзросту, адрозніваўся ад рацыёну харчавання “анёлкаў” меншай разнастайнасцю, але строгая чарговасць ужывання страў давала харчаванню беларускіх сем’яў збалансаванасць, спрыяла падтрыманню апетыту ў час ежы, а таксама служыла добраму пераатраўліванню харчовых прадуктаў. Так, спачатку ўсе, хто знаходзіўся за сталом, пачыналі ежу з лустачкі хлеба, пасыпанага соллю, што служыла своеасаблівай закускай, якая ўзбуджала апетыт, затым члены сям’і прыступалі да першых страў (бялёных супоў, баршчоў, “бацвіння”), якія ўзмацнялі дзеянне закускі за кошт раствармых рэчываў, што знаходзяцца ў булёне і служаць узбуджэнню сакраторнай дзейнасці стрававальных залоз; потым ужываліся непасрэдныя стравы як асноўная крыніца харчовых рэчываў, іх асартымент быў самым разнастайным і па колькасці і па ўтрыманні неабходных арганізму рэчываў (напрыклад, стравы з бульбы: бульба ў мундзірах, камы ці тоўчаная, праснакі, дранікі, бабка, бульбяныя клёцкі; з мясных страў: кілбасы, смажанае сала і мяса, салёнае сала, адваранае, печанае, тушанае мяса, верашчака (рабрынкі, кавалкі кілбас і падсмажанае сала, якія варыліся ў мучной падліўцы); з закусак да гарніру: свежыя гуркі, рэдзька, радыс, зялёныя пукі цыбулі або салёныя гуркі, капуста, салёныя грыбы і г.д., бывала, да бульбы дадавалі па кубачку малака ці сыраквашы або прапаноўвалі яе мачаць у смятану ці жараныя шкваркі; з рыбных страў калі-нікалі прысутнічала свежазлоўленая вараная ці смажаная рыба або купленая салёная камса (ількі); гарнірам служылі і кашы з ячнай, грэцкай, прасяной і іншых круп; падаваліся, асабліва ў нядзелю, да стала аладкі ці бліны. Асноўныя стравы запівалі кісялём з ягад ці з яблыкаў, кампотам, малаком, сыраквашай, што спрыяла размягчэнню ў страўніку ежы, а значыць, яе больш хуткаму пераатраўліванню.Правілы паводзін за сталом у беларусаў патрабавалі есці павольна, старанна пераажоўваючы ежу. З аднаго боку, гэта пазбаўляла ад небяспекі падавіцца ёю, з другога,

Репозиторий ВГУ

вядома,што насычэнне наступае праз 20–30 хвілін пасля яды, а таму пры хуткім спажыванні страў трэба было гатаваць больш, што было накладна, асабліва ў вялікай сям'і. Главою за сталом быў бацька, ён адразаў і раздаваў лусты хлеба, дазваляў есці (пасля малітвы), сачыў за парадкам за сталом, маці падавала на стол стравы, але ніхто не пачынаў іх есці, пакуль яна не сядзе есці сама, а таксама дзяліла на ўсіх мясныя стравы, што былі ў сялянскай сям'і сапраўдным далікатэсам. Харчаванне ў строга адведзеныя часы дня спрыяла аптымальнай выпрацоўцы страўнікавага соку, што багаты ферментамі, здольнымі пераправаўліваць ежу.Такім чынам, асноўнымі ўмовамі рацыянальнага харчавання ў беларускай сям'і былі: 1) строгі рэжым спажывання ежы; 2) захаванне паслядоўнасці ў спажыванні пэўных страў; 3) праяўленне культуры харчавання і пэўных правілаў паводзін за сталом. Усё вышэйадзначанае і правілы рацыянальнага харчавання спрыялі фарміраванню фізічна здаровай, без парушэнняў і хвароб стрававальнай сістэмы, моцнай асобы.

Да ***<u>гігіены быту</u>*** адносяцца ***гігіена жылля*** і ***асабістая гігіена*** кожнага. Гігіена жылля падразумявае клопат пра чысціню пакояў, захаванне хатніх рэчаў у парадку і чысціні. Беларускаму народу ўласціва ахайнасць: дзетак змалку прывучалі захоўваць чысціню і парадак у доме, складваць пасля гульняў свае цацкі, рэчы і іншыя прадметы ва ўстаноўленыя для гэтага месцы пакоя, вучылі выкананню хатніх спраў, звязаных з прыбіраннем пакояў, мыццём посуду і інш. Абавязкам дзяўчынак была дапамога маці ў мыцці, адбельванні і прасаванні адзення, коўдраў, прасцін, маці імкнулася ўтрымліваць дом у чысціні і ахайнасці, далучала да гэтай справы дачок (нават калі сям'я не лічылася заможнай, гаспадыня імкнулася надаць пакоям дома прыстойны выгляд: часта мыла падлогу; не менш за два разы на год (перад вялікімі рэлігійнымі святамі) мыла і чысціла вокны і шыбы, мыла і прасавала фіранкі; кожная рэч у доме мела сваё месца; ложкі, на якіх спала сям'я, засцілаліся коўдрамі, звычайна вытканымі самой гаспадыняй, падушкі таксама пакрываліся накідкамі, зробленымі сваімі рукамі; драўляныя сталы, лаўкі, не пакрытыя лакам, звычайна раз у год (перад Нараджэннем Хрыстовым) гаспадыня мыла цёплай вадой і скабліла нажом; печ своечасова бялілі, завешвалі ляжанку шырмачкамі са шчыльнага матэрыялу (на ляжанцы звычайна зімой грэліся дзеці і састарэлыя бабуля і дзядуля); адзенне сям'я захоўвала ў драўляных куфэрках, што былі ўпрыгожаны мастацкімі роспісамі ці арнаментам; рэчы сям'і, яе адзенне гаспадыня мыла і адбельвала (беларусам не характэрны неахайныя адносіны да свайго адзення і нашэнне забруджаных рэчаў), па традыцыі, ходзячы разам з іншымі жанчынамі, пачынаючы з ранняй вясны і да позняй восені, на вадаём мыць, г.зн. адбіваць “пранікам” – драўляным прыстасаваннем у выглядзе вялізнага бруска з хвалістай структурай з аднаго боку і вытачанай ручкай для зручнага ўтрымання ў руцэ, яна змочвала адзенне ў вадзе, затым націрала мылам ці пячным попелам (для адбельвання), складвала рэчы на драўляную паверхню (мосцік) і біла па іх “пранікам”, затым паласкала ў вадзе і пры неабходнасці паўтарала

Репозиторий ВГУ

працэдуру, прасавала адзенне “качалкай”. Хатні посуд жанчыны таксама захоўвалі ў чысціні: мылі яго, затым спаласквалі вадой, лыжкі і міскі да таго ж выціралі [111, с. 49]. Так, беларуская жанчына імкнулася падтрымліваць уласнае жыллё ў парадку і чысціні, у чым ёй дапамагалі іншыя члены сям’і: састарэлая бабуля, што была ўжо няздольная на цяжкую сялянскую працу, дочкі, што часам замянялі маці ў дадзенай справе, і іншыя члены сям’і хаця б тым, што трымалі свае рэчы ў парадку і прыбіралі за сабой. Асабліва перад вялікімі святамі ўся сям’я старанна мыла, чысціла і прыбірала ўласнае жыллё.

Асабістая гігіена кожнага члена сям’і ўключае падтрыманне чысціні цела, зубоў і ротавай поласці, адзення і абутку. Асабістую гігіену маленькіх дзетак да 6–7-мі год праводзіла маці. Да двух-трохгадовага ўзросту купала некалькі разоў на тыдзень, па дасягненні дадзенага ўзросту і надалей – раз у тыдзень брала разам з сабой у лазню, дзе мыла і парыла малых, прывучала да мыцця рук перад ядой (часта нават перад тым, як пасадзіць малых за стол, бацька або маці правяралі чысціню рук сваіх малых дзяцей, каб дадзеная гігіенічная працэдура ўвайшла ў звычку апошніх). З 6–7-гадовага ўзросту хлопчыкі наведвалі лазню разам з бацькам, дзяўчынкі – з маці раз на тыдзень. Улетку дзеці і дарослыя часта купаліся і мыліся ў вадаёме, што, таксама як і мыццё ў лазні, садзейнічала ўтрыманню цела і валасоў у чысціні. Пазногці своечасова стрыглі, маці самі рабілі дадзеную працэдуру сваім маленькім дзецям, а немаўляткам да года нават абкусвалі пазногці, баючыся параніць далікатную скуру нажніцамі ў выніку рэзкага руху малога. Гігіена ротавай поласці і зубоў ажыццяўлялася наступным чынам: каб зубы былі белыя, іх націралі тоўчанымі вугольчыкамі або попелам (зубны налёт адсарбіраваўся дзякуючы порыстай структуры вугольчыкаў і іх усмоктваючай здольнасці), у стравы дадавалі свежую цыбулю і часнок ці проста жавалі іх, каб ачысціць поласць рота ад шкодных бактэрый, а зубы засцерагчы ад карыесу, пры крываточывасці дзёснаў да хворага месца прыкладвалі ліст трыпутніку ці алоэ (для выдалення інфекцыйных рэчываў і нарыву і для хуткага іх загойвання). За чысцінёй адзення сям’і сачыла маці, своечасова мыючы бялізну. Ды і самі дзеці былі прывучаны да ахайнасці ў адзенні і бялізне, сачылі за яе чысцінёй, своечасова мылі і прасавалі або дапамагалі ў гэтым маці. Так, магчыма сцвярджаць, што ўзровень асабістай гігіены быў здавальняючым, улічваючы ўмовы жыцця і час, у які жылі людзі.

Апошнім з разглядаемых намі сродкаў фарміравання фізічнага здароўя асобы з’яўляецца ***<u>становўчая накіраванасць на непрынянцце ці адмову ад шкодных звычак</u>***. Дадзены кампанент – адзін з найважнейшых у фарміраванні здаровага ладу жыцця не толькі дарослых, але і моладзі. Не сакрэт, што ў наш час ужо падлеткі, а то і дзеці меншага ўзросту ўпершыню ўжываюць спіртныя напоі і цыгарэты, спрабуюць наркотык. Малады арганізм дастаткова хутка прывыкае да ўздзеяння шкодных рэчываў, і, як вынік, у дзіцяці ўзнікае залежнасць, цяга да абавязковага выкарыстання іх як мага часцей. Прычынамі звяртання дзяцей і падлеткаў

Репозиторий ВГУ

да алкаголю, табакакурэння і наркатычных рэчываў становяцца неспрыяльная атмасфера ў сям'і, сваркі паміж бацькамі, неразуменне бацькамі сваіх дзяцей; нездаровы лад жыцця сям'і: ужыванне алкаголю, табакакурэнне бацькі або бацькі і маці; знаходжанне падлетка ў дрэннай кампаніі і яго нізкая маральная культура; прапаганда па тэлебачанні і іншых сродках масавай інфармацыі ўжывання спіртных напояў і табакакурэння праз іх рэкламаванне, а таксама іншыя фактары.

Беларускі народ імкнуўся выхаваць у падрастаючага пакалення трывалы "імунітэт" да ўжывання алкаголю праз асуджэнне грамадскай думкай дадзенай заганы. Народныя прыказкі і прымаўкі паказваюць негатыўныя наступствы ад уздзеяння спіртных напояў на арганізм чалавека: *"Гарэлка – не вада, як уп'ешся, дык бяда"*, *"Без чаркі няма хваробы і сваркі"*, *"Гарэлка весяліць, ды ад яе галава баліць"*, *"Піў, як мог, а цяпер ні рук, ні ног"*, *"Ад водкі век кароткі"*, *"Дзе чарка, там і сварка"* і інш., – параўноўваючы п'яніцу з самагубцам (*"Хто гарэлку любіць, той сам сябе губіць"*, *"П'янства да дабра не даводзіць"*, *"П'яніца за гарэлку чорту душу аддаў"*, *"П'янства – чалавеку паганства"* і г.д.) і паказваючы яго маральную і разумовую дэградацыю (*"Ад гарэлкі будзе розум мелкі"*, *"П'яны і дурны – родныя браты"*, *"Хто п'яніцу палюбіць – жыццё сабе пагубіць"* і інш.). Народны песенны фальклор асуджае п'янства як сацыяльнае зло, ад якога пакутуюць родныя і блізкія людзі. Менавіта з-за вышэйзгаданых наступстваў п'янства, што пададзены ў прыкладах, дзяўчат папярэджвалі не ўступаць у шлюб з "любіцелямі выпіць".Беларускія народныя жарты і анекдоты, таксама як і песні, як прыказкі і прымаўкі, асуджаюць дадзеную загану, высмейваючы п'яніцу і яго знешні выгляд ("Як леў", "Чырвоны нос").Больш за тое, суседзі нешчаслівай сям'і, дзе бацька, а то і маці ўжывалі спіртныя напоі, асуджалі іх, прыкладалі намаганні, уздзейнічаючы на свядомасць і сумленне такіх бацькоў унушэннем, размовамі пра неабходнасць вярнуцца да нармальнага жыцця дзеля шчасця і дабрабыту ўласных дзяцей, а таксама дзеля іх правільнага выхавання, бо, як вядома, "*калі гаспадар п'е – гарыць паўдома, а калі яшчэ і гаспадыня – гарыць увесь дом*". Калі ж бацькі не прыслухоўваліся да парад суседзяў і іншых вяскоўцаў, якія вялі здаровы лад жыцця, то апошнія бралі дзяцей такіх бацькоў пад сваё выхаваўчае ўздзеянне, імкнучыся прывіць ім негатыўныя адносіны да п'янства, утрымаць гэтых дзяцей ад ужывання спіртных напояў, якія бачылі штодзённае п'янства ў сваёй сям'і. Традыцыі сямейнага "антыалкагольнага" выхавання прадугледжваюць пэўныя правілы паводзін падрастаючага пакалення ў грамадскіх месцах: па-першае, недапушчэнне ўжывання дзецьмі і моладдзю алкаголю да той пары, пакуль яны не ўступяць у дарослае жыццё, г.зн. з дасягненнем 18-ці год ("шлюбнага" ўзросту), прычым дзяўчаты ў разлік не браліся, бо будучыя жонкі і маці павінны быць абсалютна здаровымі, каб нараджаць фізічна і псіхічна здаровых дзяцей, без разумовых адхіленняў; па-другое, са з'яўленнем у грамадскім месцы (у карчме, у каго-небудзь дома) п'яніц, што сваімі

Репозиторий ВГУ

паводзінамі абражвалі акружаючых, моладзь не мела права там знаходзіцца, па гэтай прычыне пераходзіла ў іншы дом, дзе жылі дастойныя гаспадары; па-трэцяе, у беларусаў існавала культура ўжывання спіртных напояў падчас застолляў ці сямейных свят, якая на першае месца выносіла не выпіўку, а весялосць, радасць сяброўскай сустрэчы (што даказваюць наступныя прыказкі: *“Піццё – смяццё, але дарага пасядзёнка”, “Не дарага піва п’яна, а дарага пасядзенейка”* – або шэраг “піцейных” абрадаў і звычаяў падчас вялікіх свят, напрыклад, у час вяселля – аднаго з самых значных сямейных свят – існаваў звычай, калі маладыя падношвалі чарку гарэлкі ўсім гасцям у парадку сядзення за сталом па кругу, выказваючы такім чынам сваю ім павагу і ўдзячнасць, гэта спрыяла атрыманню зараду бадзёрасці, весялосці, людзі не напіваліся да страты памяці і не гублялі кантроль над сабой).

Да табакакурэння ў дарослым асяроддзі беларускі народ адносіўся паблажліва, нават абыякава, бо не асуджаў на фальклорных прыкладах дадзеную загану. Намі выяўлена толькі некалькі беларускіх прыказак з усяго жанравага багацця вуснай народнай творчасці, якія асуджаюць курэнне: *“Хто курыць, таго чорт да пекла турыць, а хто нюхае, той сам да пекла трухае”, “Хто курыць, за тым чорт шкурыць”*. На наш погляд, дадзеныя адносіны да табакакурэння звязаны з невыражэннем наступстваў сацыяльнага плана пры курэнні цыгарэт ці нюхання табакі (медыцынская неадукаванасць у дадзенай сферы не дазваляла беларускаму народу ўявіць, што курэнне – такое ж, як і п’янства, сацыяльнае зло, бо курэннем чалавек наносіць непапраўную шкоду не толькі свайму арганізму, але і ўласнай сям’і, члены якой становяцца пасіўнымі курыльшчыкамі), у адрозненне ад алкагалізму, які прыводзіць да страты кантролю над сабой, маральнай і фізічнай дэградацыі асобы, калі чалавек становіцца небяспечным для акружаючых з-за неадэкватнасці сваіх учынкаў і дзеянняў.

Магчыма сцвярджаць, што, дзякуючы непрымірымым і негатыўным адносінам беларускага народа да ўжывання спіртных напояў, тагачаснае грамадства характарызавалася большай устойлівасцю да дадзенай шкоднай звычкі, г.зн. вяло здаровы лад жыцця, які спрыяў фізічнаму здароўю падрастаючага пакалення і дарослых.

Працэсы фарміравання фізічнага і маральнага здароўя асобы ў беларускай народнай выхаваўчай практыцы заўсёды былі ўзаемаабумоўленымі, што дасягалася праз іх агульную мэту: маральна і фізічна здаровая асоба, – агульныя сродкі і метады пры дасягненні вышэйзгаданай мэты, і ўзаемадзейнымі, бо фарміраванне маральнага здароўя дзіцяці адбывалася ў працэсе фарміравання фізічнага здароўя: падчас харчавання, актыўнага адпачынку і працоўнай дзейнасці, выканання асабістай і бытавой гігіены, – што непасрэдна спрыяла выхаванню акуратнасці, ашчаднасці, стараннасці, працавітасці – неад’емных якасцей маральна здаровай асобы. Фарміраванне фізічнага здароўя мела месца пры станаўленні ў дзіцяці маральных уяўленняў і паняццяў, маральных пачуццяў, маральнай ацэнкі дзеянняў, учынкаў,



Репозиторий ВГУ

перакананняў і спосабу паводзін у грамадстве, уласных здольнасцей, маральнага мыслення, маральных паводзін, маральнай волі, якія з'яўляліся асноўнымі кампанентамі фарміравання маральнага здароўя асобы. Гэта спрыяла выхаванню лепшых якасцей фізічна здаровай асобы – гуманнасці, справядлівасці, патрыятызму, свядомасці ў прымяненні фізічнай моцы ў карысных для грамадства або сям'і мэтах: імкнення дапамагчы таму, хто слабейшы або маладзейшы за цябе, каму неабходна твая дапамога.

У сучасных умовах, калі маральнае і фізічнае выхаванне асобы адбываецца адасоблена, выхавацелі і настаўнікі, куратары і выкладчыкі устаноў сярэдняйспецыяльнай і вышэйшай адукацыі, плануючы і арганізуючы працэс выхавання дзяцей, падлеткаў, юнакоў і дзяўчат, могуць выкарыстаць вынікі нашага даследавання. Яно не толькі даказвае мэтазгоднасць і эфектыўнасць пабудовы ва ўзаемасувязі і ўзаемадзеянні працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, але і паказвае магчымасці іх спалучэння (праз навукова-тэарэтычнае, гісторыка-метадалагічнае абгрунтаванне, наглядна праз табліцы і логіка-структурныя схемы), а таксама для дасягнення выхаваўчай мэты падае шэраг неабходных сродкаў і шляхоў фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы, здольнай жыць у суладдзі з прыродай, асяроддзем і людзьмі. Дадзеныя сродкі і шляхі працяглы час паспяхова выкарыстоўвалі і ўдасканальвалі нашы продкі.

Такім чынам, прааналізуем узаемадзеянне працэсаў станаўлення маральнага і фізічнага здароўя асобы, дзе зыходным выступае працэс фарміравання маральнага здароўя асобы, што складаецца з маральнай свядомасці (маральных уяўленняў і паняццяў, маральных пачуццяў, маральнай ацэнкі), маральнага мыслення, маральных паводзін і маральнай волі, якая вызначае эфектыўнасць астатніх кампанентаў фарміравання маральнага здароўя асобы (табліца1.5).

Табліца 1.5 – Уплыў працэсу фарміравання маральнага здароўя асобы на фарміраванне яе фізічнага здароўя

| Фарміраванне маральнага здароўя асобы | Фарміраванне фізічнага здароўя асобы |
|---|---|
| **Фарміраванне маральнай свядомасці:**<br>▪ **фарміраванне маральных уяўленняў і паняццяў** – пра “дабро” і “зло” ► | ►Фарміраванне ўяўленняў і паняццяў пра станоўчыя фізічныя ўласцівасці (смеласць, рашучасць, працавітасць, патрыятызм, уласная годнасць, сяброўства, тавары-скасць і інш.) і адмоўныя (здрадніцтва, лянота, палахлівасць, зазнайства, ганарыстасць): |

Рэпазіторый ВДУ

| | |
|---|---|
| | *“Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш”, “Праца чалавека корміць, а лянота псуе”, “На смелага сабака брэша, абаязлівага кусае”, “Будзьсмелы не языком, а дзелам”, “Адвага гарады бярэ”, “Адважны не баіцца няпраўды”, “Лепей у сваіх людзях з голаду памерці, чым на чужыне золата збіраць”, “З роднай зямлі, памры – не сыходзь”, “Каб у пашане быць, трэба працу любіць”, “Згода будуе, нязгода руйнуе”, “Адной рукой вузла не завяжаш”* і г.д. Вышэйзгаданыя якасці спрыяюць фарміраванню фізічнага здароўя праз уплыў на наступныя сродкі: загартаванне, рацыянальнае харчаванне, рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку, гігіена асабістая і гігіена быту, становучая накіраванасць на непрыняцце шкодных звычак і адмову ад іх. |
| ▪ **фарміраванне маральных ► пачуццяў:** справядлівасці, таварыскасці, сяброўства, калектывізму, сумлення | ►У якасці ўнутранага суддзі спрыяюць адбору пэўнага тыпу ўчынкаў, якія ў сукупнасці вызначаюць адпаведны, з фізічнага пункту гледжання, стыль паводзін. Дадзены стыль паводзін характэрны для такіх сродкаў фарміравання фізічнага здароўя асобы, як загартаванне, аздараўленчая фізкультура, рацыянальнае харчаванне, рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку, гігіена асабістая і гігіена быту, становучая накіраванасць на непрыняцце шкодных звычак і адмову ад іх. |

Репозиторий ВГУ

| | |
|---|---|
| ▪ **фарміраванне маральнай ацэнкі** ►праз параўнанне і ацэньванне сябе з іншымі, праз улік меркаванняў аб сабе і сваіх учынках з боку іншых (сям'і, сяброў, калектыву, суседзяў, вяскоўцаў і інш.), што ўплывае на адэкватную самаацэнку | ►дадзеныя дзеянні здзяйсняе асоба, што фарміруецца, і ў дачыненні да ўласных фізічных якасцей, здольнасцей, учынкаў, распарадку дня, што затым шліфуюцца і ўдасканальваюцца праз сродкі фарміравання фізічнага здароўя асобы: загартаванне, аздараўленчую фізкультуру, рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку, гігіену асабістую і быту, станоўчую накіраванасць на непрыняцце шкодных звычак і адмову ад іх |
| **Фарміраванне маральнага мыслення** ► дазваляе загадзя прадугледзець і спланаваць вынікі ўласных маральных учынкаў, дзеянняў, маральных паводзін | ►абдумваюцца будучыя ўчынкі, стыль паводзін з фізічных характа-рыстык, намячаюцца тактыка і стратэгія ўласнага ладу жыцця |
| **Фарміраванне маральных** ► **паводзін,** што адбываецца ў гульні, працоўнай дзейнасці, зносінах і г.д., характарызуецца абавязковай наяўнасцю маральнага ўзору, які ўключае ў сябе канкрэтныя, устойлівыя акты паводзін і іх ацэнку, а таксама веды пра іх мэту і сэнс | ►дадзеныя віды дзейнасці маюць месца і пра фарміраванні фізічнага здароўя асобы, бо гульня і праца з'яў-ляюцца агульнымі для даследуемых працэсаў сродкамі і метадамі; без зносін, наогул, немагчыма фарміраванне асобы. Наяўнасць узору паво-дзін характэрна і для працэсу фарміравання фізічнага здароўя асобы, гэта абумоўлена вопытам зносін, дзейнас-ці, сацыяльным акружэннем, якія ха-рактарызуюць фізічныя якасці і здо-льнасці асобы, што выхоўваецца. Узор паводзін аказвае ўплыў на сродкі фарміравання фізічнага здароўя асобы: загартаванне, аздараўленчую фізкультуру, рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку, гігіену асабістую і гігіену быту,станоўчую накіраванасць на непрыняцце шкод-ных звычак і адмовуад іх |

*Заканчэнне табліцы 1.5*

| | |
|---|---|
| **Фарміраванне маральнай волі** ► адкрывае моцныя і слабыя бакі характару асобы, штофарміруецца, прымушаючы яе ставіць перад сабой канкрэтныя мэты маральнага самаўдасканалення і выконваць шэраг маральных дзеянняў для іх дасягнення | ►уплывае на фарміраванне моцных рыс фізічнага здароўя асобы, што вырашаецца праз загартаванне, аздараўленчую фізкультуру, рацыянальнае харчаванне, рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку, гігіену асабістую і гігіену быту, станоўчую накіраванасць на непрыняцце шкодных звычак і адмову ад іх |

Размесцім у табліцы 1.6 аналіз уздзеяння фарміравання фізічнага здароўя асобы (у выглядзе наступных кампанентаў-сродкаў: загартавання, рацыянальнага харчавання, рацыянальнага рэжыму дня, гігіены асабістай і гігіены быту, станоўчай накіраванасці на непрыняцце шкодных звычак і адмову ад іх) на працэс фарміравання маральнага здароўя асобы, дзе зыходным выступае працэс фарміравання фізічнага здароўя асобы.

Табліца 1.6 – Уплыў працэсу фарміравання фізічнага здароўя асобы на фарміраванне яе маральнага здароўя

| Фарміраванне фізічнага здароўя асобы (сродкі) | Фарміраванне маральнага здароўя асобы |
|---|---|
| **Загартаванне** – ►комплексная сістэма аздараў-ленчых уздзеянняў, накіраваных на дасягненне ўстойлівасці (неўспрыняцця) арганізма да шкодных для здароўя метэа-ралагічных і іншых фактараў | ►фарміраванне маральнай свядомасці – праз фарміраванне пры “загартаванні” такіх рыс характару, як рашучасць, цярплівасць, упартасць, уласная годнасць і г.д.;фарміраванне маральных паводзін – у рухомых калектыўных гульнях на свежым паветры, падчас працоўнай дзейнасці; фарміраванне маральнай волі – адбываецца разам з фарміраваннем волі да неабходнасці выканання абавязковых працэдур загартавання |
| **Рацыянальнае харчаванне** ► Пэўны звод правілаў сталавання:<br>– слухацца бацьку–главу сям’і;<br>– ашчадна адносіцца да хлеба;<br>– паважаць прысутных за сталом;<br>– захоўваць ахайнасць і чысціню | ►фарміраванне маральнай свядомасці, маральных паводзін, маральнай волі – праз выкананне патрабаванняў агульнасямейнага сталавання |

Рэпазіторый ВДУ

*Заканчэнне табліцы 1.6*

| | |
|---|---|
| **Рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку,** што складаецца з дзейнасці (розных яе відаў, выконваемых у пэўны час), рацыянальнага чаргавання працы і адпачынку, рэгулярнага харчавання, мэтанакіраванай рухальнай нагрузкі, а таксама са знаходжання на свежым паветры, строгага захавання гігіены сну ► | ► фарміраванне маральнай свядомасці – праз усведамленне маральных паняццяў ашчаднасці, акуратнасці, абавязковасці, уласнай годнасці і інш.;фарміраванне маральнага мыслення – праз навучанне планаванню загадзя ўласных паводзін, учынкаў і г.д.;фарміраванне маральных паводзін – у час гульні, працоўнай дзейнасці, строгага выканання элементаў рэжыму дня; фарміраванне маральнай волі –у час выканання абавязковых элементаў рэжыму дня |
| **Гігіена быту, уласная гігіена:** ► – гігіена жылля падразумявае клопат пра чысціню пакояў, захаванне хатніх рэчаў у парадку і чысціні; – асабістая гігіена кожнага ўключае падтрыманне чысціні цела, валасоў, зубоў і ротавай поласці, догляд за адзеннем і абуткам | ► фарміраванне маральнай свядомасці – маральных паняццяў аб чысціні, ахайнасці, акуратнасці і інш., маральных пачуццяў задавальнення або незадавальнення пры выкананні працоўнай дзейнасці, скіраванай на падтрыманне гігіены быту і ўласнай гігіены; фарміраванне маральных паводзін – праз замацаванне пэўных працоўных дзеянняў або дзеянняў па самаабслугоўванні ў звычкі; фарміраванне маральнай волі – звязана з неабходнасцю выканання абавязковых працэдур гігіены |
| **Аздараўленчая фізкультура і актыўны адпачынак,** ► якія павышаюць устойлівасць арганізма да ўздзеяння неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя, стымулююць працэс росту і гарманічнага развіцця асобы і г.д. | ► фарміраванне маральнай свядомасці – праз усведамленне маральных паняццяў ашчаднасці, акуратнасці, абавязковасці, уласнай годнасці і інш.;фарміраванне маральных паводзін і маральнай волі адбываецца ў час гульні, працоўнай дзейнасці, спаборніцтваў, іспытаў |
| **Станоўчая накіраванасць на непрыняцце шкодных звычак альбо адмову ад іх** ► –адзін з найважнейшых кампанентаў у фарміраванні здаровага ладу жыцця | ► фарміраванне ў маральнай свядомасці адмоўных адносін да шкодных звычак;фарміраванне маральных паводзін накіравана на падтрыманне здаровага ладу жыцця; фарміраванне маральнай волі звязана з устойлівасцю да неўжывання спіртных напояў |

Як паказала наша даследаванне, працэсы фарміравання фізічнага і маральнага здароўя ў беларускай народнай выхаваўчай практыцы заўсёды былі непарыўнымі: 1) фарміраванне маральнага здароўя дзіцяці адбывалася і ў працоўнай дзейнасці, і ў гульнях – своеасаблівым актыўным адпачынку, – што з'яўляліся элементамі рэжыму дня; і падчас харчавання (акрамя правілаў этыкету, якія павінны былі засвоіць малыя, ім прывіваліся павага да бацькі – кармільца сям'і, да маці, якая захоўвала сямейны ачаг, да хлеба як найвышэйшай каштоўнасці, зробленай працоўнымі рукамі); гігіена асабістая і бытавая спрыялі фарміраванню акуратнасці, ашчаднасці, стараннасці, працавітасці, што з'яўляюцца неад'емнымі якасцямі маральна здаровай асобы; 2) фарміраванне фізічнага здароўя мела месца пры фарміраванні ў дзіцяці маральных уяўленняў пра смеласць / баязлівасць, патрыятызм / здрадніцтва, справядлівасць / несправядлівасць,фізічную моц / немач і г.д.; маральных пачуццяў пра справядлівасць, таварыскасць і калектывізм; ацэнкі дзеянняў і ўчынкаў іншых людзей і ўласных здольнасцей, перакананняў і спосабаў паводзін у грамадстве; маральных паводзін, якія павінны характарызавацца сваёй гуманнасцю, справядлівасцю, патрыятычнасцю, прымяненнем фізічнай моцы ў карысных для грамадства або сям'і мэтах: імкнення дапамагчы таму, хто слабейшы або маладзейшы за цябе, каму неабходна твая дапамога. Акрамя таго, узаемасувязь паміж маральным і фізічным здароўем адбывалася праз дасягненне агульнай мэты –выхаванне маральна і фізічна здаровай асобы праз выкарыстанне пры гэтым агульнага спектра народна-педагагічных сродкаў і метадаў.

Такім чынам, этнапедагагічная падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльнай сферыз'яўляецца актуальнай, паколькі падчас выкладання курса "Этнапедагогіка" і спецыяльнага курса "Валеалогія: этнапедагагічны аспект" адбываецца мэтанакіраваная работа па фарміраванні этнакультурнай талерантнасці.Вышэйзгаданыя вучэбныя курсы паслужаць арганізацыі і правядзенню больш эфектыўнай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі па выхаванні культурна-талерантнай асобы, здольнай да арганізацыі паспяховай міжкультурнай камунікацыі на аснове сродкаў і метадаў народнай педагогікі. Студэнты падчас выкладання дадзеных курсаў спазнаюць сваю духоўную лучнасць з продкамі, вывучаючы асаблівасці педагагічных ідэй і практыкі беларусаў у выхаванні падрастаючых пакаленняў, далучаючыся праз азнаямленне з народнымі святамі, абрадамі, звычаямі і традыцыямі да пераемнай сувязі паміж пакаленнямі, выбудоўваючы ўласную праграму па маральна-этычным выхаванні, па захаванні здароўя, а таксама фарміруючы этнапедагагічную кампетэнтнасць.

Рэпазіторый ВДУ

# ГЛАВА 2

## МАДЭЛЯВАННЕ ЭТНАПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ Ў ПОЛІКУЛЬТУРНЫМ СОЦЫУМЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### 2.1. Рэгіянальныя асаблівасці падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы ў кантэксце прынцыпу полікультурнасці(на прыкладзеВіцебскага рэгіёна)

На сённяшнім этапе развіцця грамадства надзвычай важнае значэнне набывае працэс стварэння спрыяльных умоў адукацыі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы з улікам полікультурнай прасторы свайго рэгіёна. Зварот да разгляду полікультурнага асяроддзя ВНУ у кантэксце фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў з акцэнтам на рэгіянальную спецыфіку становіцца ў разрад прыярытэтных накірункаў развіцця сучаснай адукацыі. Аднак, нягледзячы на пэўныя дасягненні ў дадзеным аспекце прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, у вырашэнні гэтай праблемы маецца шэраг аб’ектыўных супярэчнасцей: паміж сацыяльным і дзяржаўным заказам на самаразвіццё, творчую і прафесійную самарэалізацыю выпускнікоў ВНУ і недастатковай распрацаванасцю канцэптуальных асноў станаўлення будучага спецыяліста для работы ва ўмовах полікультурнага соцыуму, а таксама несістэмнай практыкай стварэння неабходных і дастатковых умоў для індывідуалізацыі працэсу прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў з улікам іх этнічнай або нацыянальнай прыналежнасці; паміж патрабаваннем гарманічнага развіцця кампанентаў полікультурнага асяроддзя, у якім функцыянуе складанаарганізаваная сістэма ВНУ, і фрагментарным, падчас стыхійным, падыходам даяго стварэння ў рэгіёне альбо, наогул, падтрымка працэсаў глабалізацыі; паміж актуальнасцю праблемы ацэнкі якасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы для работы ў полікультурнай прасторы рэгіёна і адсутнасцю яе навуковай, метадычнай і дыягнастычнай распрацаванасці.

Ва ўмовах полікультурнай прасторы і сучаснага стану сацыяльна-культурнай, сацыяльна-педагагічнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, што характарызуюцца сацыяльнай ізаляцыяй, маргіналізаванасцю і недастатковай адаптаванасцю пэўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва да новых сацыяльна-культурных каштоўнасцей, узнікае вострая патрэба падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы, здольных не толькі прафесійна вырашаць многія сацыяльныя праблемы прадстаўнікоў розных этнічных груп і народаў, але і паспяхова камунікаваць і знаходзіць агульную мову з імі. Этнічнасць будучага спецыяліста сацыяльнай сферы, што развівалася ва ўмовах пэўнай сацыяльна-культурнай прасторы, у



Рэпазіторый ВДУ

сямейным і грамадскім выхаванні, праходзіла сваё станаўленне падчас атрымання асобай прафесійнай адукацыі ва ўзаемадзеянні паміж студэнтамі – прадстаўнікамі розных этнічных груп, носьбітамі пэўных сацыяльна-культурных каштоўнасцей і ідэалаў, у выхаваўчай рабоце факультэта, падчас вучэбных і вытворчых практык, а таксама валанцёрскай дзейнасці, становіцца значным прафесійным інструментам у міжкультурнай камунікацыі.

Мэта нашага эмпірычнага даследавання заключаецца ў вызначэнні ступені этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, якія навучаюцца па спецыяльнасцях “Сацыяльная педагогіка” і “Сацыяльная работа (сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць)”. Гэта ў перспектыве дазволіць вызначыць магчымасці фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы для паспяховай прафесійнай дзейнасці ў полікультурнай прасторы рэгіёна. Намі быў распрацаваны тэст-апытальнік ступені этнічнасці асобы для экспрэс-дыягностыкі прыналежнасці асобы да свайго народа або этнічнай групы. Ён прадстаўляе сабой аднамерную шкалу, што складаецца з 20 пытанняў, якія адносяцца да розных сфер: успрыняцце сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы або народа; наяўнасць пераемнай сувязі паміж пакаленнямі сваякоў; веданне этнапедагагічных сродкаў выхавання і ступень авалодання імі. Магчымы дыяпазон тэставага бала – ад 0 да 40 балаў: сума ад 0 да 15 балаў вызначае нізкую ступень этнічнасці асобы; ад 16 да 29 балаў паказвае сярэднюю ступень этнічнасці асобы; сума ад 30 да 40 балаў характэрна для высокай ступені этнічнасці асобы.

Паняцце “этнічнасць” і яго асэнсаванне пачалося ў 60-я гады XX стагоддзя ў перыяд узмацнення руху этнічных меншасцей за свае правы ў прамыслова развітых краінах. Тэарэтычнае асэнсаванне дадзенага тэрміна ў навуковых працах прывяло да ўзнікнення наступных падыходаў у разуменні этнічнасці: эсэнцыялісцкі – прадугледжвае этнічную ідэнтыфікацыю асобы, заснаваную на глыбокіх сувязях з пэўнай этнічнай групай або культурай (Ю.У. Брамлей, Н. Глейзер, Л.М. Гумілёў, Э. Сапір); інструменталісцкі – паказвае пэўную мабілізацыю і станаўленне этнічнасці як унутры групы, так і па-за яе межамі (Д.Л. Гаравіц); канструктывісцкі – разглядае этнічнасць у сістэме сацыяльных дыспазіцый, на розных узроўнях і кантэкстуальнай накіраванасці (Ф. Барт, І. Валерстайн). Вышэйзгаданыя падыходы да разумення этнічнасці не з’яўляюцца ўзаемавыключальнымі, таму мы аб’ядналі іхі вылучылі агульныя інтэграцыйныя рысы. Гэта дазволіла прапанаваць свой абагульнены падыход да разумення тэрміна “этнічнасць” і яго зместавых характарыстык. Этнічнасць асобыпаказвае яе прыналежнасць да пэўнай этнічнай групы або супольнасці праз сукупнасць наступных характарыстык: успрыняцце сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы і



Репозиторий ВГУ

ўсведамленне сваёй адметнасці; наяўнасць пераемнай сувязі паміж пакаленнямі сваякоў, што з'яўляецца асновай для развіцця этнічнасці; уяўленні аб радзіме, духоўных каштоўнасцях, ідэалах і іх рэтрансляцыі праз веданне і выкарыстанне этнапедагагічных сродкаў выхавання.

У экспрэс-дыягностыцы ступені этнічнасці прымалі ўдзел 120 студэнтаў з першага па выпускны курс ва ўзросце 17–24 гадоў, з якіх 107 дзяўчат і 13 юнакоў, што навучаюцца вочна па спецыяльнасцях "Сацыяльная педагогіка" і "Сацыяльная работа (сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць)" ва ўстанове адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Адносна наяўнасці пераемнай сувязі паміж пакаленнямі ў сямействах выпускнікоў варта адзначыць, што для пераважнай большасці студэнтаў ўласны радавод завяршаецца пакаленнем бабуль і дзядуль – вынікі даследавання паказалі, што свой радавод складалі і добра ведаюць 23% студэнтаў, ведаюць часткова, толькі да пакалення сваіх бабуль і дзядуль, 72% будучых спецыялістаў, не цікавіліся ім 4% студэнтаў (малюнак 2.2). Да меркавання старэйшага пакалення, сваіх бабуль і дзядуль прыслухоўваюцца 32% рэспандэнтаў, бо ў старэйшага пакалення вялікі жыццёвы вопыт, часткова прыслухоўваюцца 62% студэнтаў выпускнога курса, таму што час і жыццё змяніліся за апошнія некалькі дзясяткаў гадоў, 6% рэспандэнтаў не прыслухоўваюцца, бо погляды пажылых людзей устарэлі (малюнак 2.3).




Малюнак 2.2 –Веданне будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы ўласнага радаводу

Рэпазіторый ВДУ




Малюнак 2.3 –Прыслухоўванне будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы да меркавання сваіх бабуль і дзядуль

Так, магчыма канстатаваць, што толькі каля трэці рэспандэнтаў добра ведаюць свой радавод і паважліва ставяцца да багатага жыццёвага вопыту і меркавання старэйшага пакалення як транслятараў ведаў, звычаяў і традыцый пэўнай этнічнай групы, як носьбітаў аўтэнтычных сродкаў і метадаў выхавання. Аднак для пераважнай большасці студэнтаў іх радавод завяршаецца пакаленнем бабуль і дзядуль, якіх яны асабіста памятаюць або з якімі кантактуюць.

Для падтрымання міжпакаленнай і роднаснай сувязі адыгрываюць важную ролю рэгулярнае наведванне гасцей і гатоўнасць іх прымаць: 53% рэспандэнтаў любяць прымаць гасцей; 41% студэнтаў прымаюць гасцей, калі ёсць вольны час; 6% студэнтаў не любяць прымаць гасцей, бо яны перашкаджаюць (малюнак 2.4). Таксама вынікі даследавання выявілі, што маюць бабуль і дзядуль 84% студэнтаў, аднак не ўсе іх рэгулярна наведваюць: 66% рэспандэнтаў указалі, што прыязджаюць да бабуль і дзядуль часта – у выходныя дні або падчас вакацый і ў летні час, рэдка наведваюць 19% студэнтаў – адзін-два разы на год, не наведваюць 12% студэнтаў (большасць з іх сцвярджаюць, што іх бабулі і дзядулі памерлі) (малюнак 2.5). Маюць сясцёр і братоў 77% студэнтаў, аднак часта падтрымліваюць з імі зносіны 60% рэспандэнтаў, рэдка – 17% апрошаных студэнтаў. Відавочна, што паміж пакаленнямі сваякоў не ва ўсіх сем’ях рэспандэнтаў атрымліваецца ўдалая камунікацыя: каля паловы рэспандэнтаў або гатовыя прымаць гасцей, калі ёсць вольны час, або зусім не гатовыя іх прымаць; да бабуль і дзядуль каля трэці студэнтаў прыязджаюць даволі рэдка або зусім не наведваюць; каля чвэрці апытаных студэнтаў, якія маюць братоў ці сясцёр, рэдка падтрымліваюць з імі зносіны.

Рэпазіторый ВГУ




Малюнак 2.4 – Гатоўнасць будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы прымаць гасцей




Малюнак 2.5 – Наведванне будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы сваіх бабуль і дзядуль

Гістарычна склалася, што значным сродкам падтрымання міжпакаленнай сувязі з'яўляецца сумесная працоўная дзейнасць, а таксама сумесная сямейная абраднасць. Вынікі апытання дакладна гэта прадэманстравалі на прыкладзепершага: рэгулярна дапамагаюць сваім бабулям і дзядулям па гаспадарцы, у агародзе або па доме 59% студэнтаў; час ад часу дапамагаюць па доме 24% рэспандэнтаў; не ажыццяўляюць такую

Репозиторий ВГУ

дапамогу 17% студэнтаў, зазначаючы, што іх бабулі і дзядулі ўжо памерлі (малюнак 2.6). А вось сямейная абраднасць не аб'ядноўвае чацвёртую частку апытаных студэнтаў: рэлігійныя памкненні і каштоўнасці сваёй сям'і падтрымліваюць 75% студэнтаў (з іх 37% адзначаюць у сям'і асноўныя рэлігійныя святы, 38% рэспандэнтаў удзельнічаюць часткова, сцвярджаючы, што ў іх сям'і прытрымліваюцца толькі асобных рэлігійных рытуалаў і абрадаў); у астатніх 25% рэспандэнтаў у сям'і гэта не прынята.

Напрыклад, адносна такой характарыстыкі этнічнасці, як наяўнасць пераемнай сувязі паміж пакаленнямі сваякоў, вынікі даследавання наступныя: 35% рэспандэнтаў маюць высокі ўзровень; 56% – сярэдні; 9% – нізкі.




Малюнак 2.6 – Сумесная працоўная дзейнасць будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы са сваімі бабулямі і дзядулямі

Пра ўспрыняцце сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы або народа можна сказаць наступнае:

–лічаць сябе прадстаўнікамі беларускай нацыі 89% рэспандэнтаў, аднак з іх абралі апытальнік, складзены на беларускай мове, толькі 20% студэнтаў, адносна астатніх 11% рэспандэнтаў рускімі сябе лічаць 3% рэспандэнтаў, немцамі – 1%, славянамі – 3%, не змаглі вызначыцца са сваёй нацыянальнасцю 4% студэнтаў, магчыма па прычыне рознай нацыянальнай прыналежнасці бацькоў;

–адносна зносін у соцыуме на роднай мове станоўча выказаліся 46% рэспандэнтаў, падтрымліваюць ідэю зносін на роднай мове, але толькі ў сваім асяродку, 25% студэнтаў, адмоўна выказаліся 29% рэспандэнтаў (малюнак 2.7);

–адносна думак пра змену грамадзянства адмоўна выказаліся 19% студэнтаў-выпускнікоў, бо жадаюць жыць і працаваць на радзіме, 33% рэспандэнтаў хацелі б паехаць жыць і працаваць за мяжу, 48% студэнтаў наведвалі такія думкі, аднак яны пакуль не збіраюцца іх рэалізоўваць;

–лічаць сябе носьбітамі і захавальнікамі сямейных традыцый 55% студэнтаў, не ўпэўнены ў гэтым 37% рэспандэнтаў, не з'яўляюцца такімі 8% студэнтаў;



Репозиторий ВГУ

– 41% студэнтаў зазначаюць, што ў іх выхаванні часта прымяняліся сродкі і метады народнай педагогікі, 27% апытаных студэнтаў адзначаюць, што прымяняліся сродкі і метады народнай педагогікі толькі бабулямі ідзядулямі падчас гасцявання ў іх, 32% рэспандэнтаў указалі, што сродкі і метады народнай педагогікі ў іх выхаванні не прымяняліся, паколькі ў гэтым не было патрэбы (малюнак 2.8);




Малюнак 2.7 – Адносіны будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да ажыццяўлення зносін у соцыуме на роднай мове




Малюнак 2.8 – Адносіны будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да ажыццяўлення зносін у соцыуме на роднай мове



Репозиторий ВГУ

–адносна жанраў вуснай народнай творчасці, якія чулі будучыя спецыялісты сацыяльнай сферыў выкананні бабуль і дзядуль, 59% рэспандэнтаў адзначаюць, што гэта былі казкі, жарты, песні, 26% апытаных студэнтаў чулі прыказкі і прымаўкі, 15% студэнтаў не давялося пачуць твораў фальклору ў выкананні сваіх бабуль і дзядуль;

– праяўляюць інтарэс да звычаяў і традыцый і рэалізуюць іх у сваёй жыццядзейнасці 23% студэнтаў, цікавяцца толькі тымі, якія шануюць і захоўваюць іх родныя, 64% рэспандэнтаў, лічаць гэта ўстарэлым 13% будучых спецыялістаўсацыяльнай сферы (малюнак 2.9);




Малюнак 2.9 – Праяўленне цікавасці да звычаяў і традыцый з боку будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы

– гатовыя да выхавання ўласных дзяцей у адпаведнасці з традыцыямі і звычаямі свайго народа 27% студэнтаў, частковую гатоўнасць дэманструюць 55% рэспандэнтаў, не лічаць гэта неабходным 18% студэнтаў (малюнак 2.10).

Так, адносна ўспрыняцця сябе ў якасці прадстаўніка пэўнай этнічнай групы або народа (у нашым выпадку, у пераважнай большасці, – беларусаў, бо іх удзельнічала ў апытанні 89%) варта адзначыць, што ў даволі значным для развіцця этнічнасці “моўным пытанні” крыху больш за чвэрць будучых спецыялістаў не падтрымліваюць ідэю зносін на роднай мове, другая чвэрць апытаных студэнтаў гатовыя мець зносіны на роднай мове, але толькі ў сваім асяроддзі. Магчыма, уздзейнічаюць працэсы

Рэпазіторый ВДУ

глабалізацыі, паколькі пытанне тэрытарыяльнай прыналежнасці, адносін да Радзімы таксама паказала даволі нечаканыя вынікі: трэць апытаных студэнтаў хацела б паехаць жыць і працаваць за мяжу; каля паловы студэнтаў такія думкі наведвалі, але рэалізоўваць іх яны пакуль не збіраюцца. Значны ўплыў на развіццё этнічнасці апытаных студэнтаў аказвалі іх сем'і, а таксама бабулі і дзядулі: больш за палову рэспандэнтаў назвалі сябе носьбітамі і захавальнікамі сямейных традыцый; большасць рэспандэнтаў праяўляе зацікаўленасць у тых звычаях і традыцыях, якія захоўваюць і выкарыстоўваюць у жыццядзейнасці іх родныя (у адносінах да іх прымяняліся сродкі і метады народнай педагогікі), і хаця б часткова, але гатовы да выхавання ўласных дзяцей у адпаведнасці з традыцыямі і звычаямі свайго народа. Узровень развіцця дадзенай характарыстыкі этнічнасці ў будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы наступны: 27% рэспандэнтаў маюць высокі ўзровень; 56% – сярэдні; 17% – нізкі.




Малюнак 2.10 – Дэманстрацыя гатоўнасці з боку будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да выхавання ўласных дзяцей у адпаведнасці са звычаямі і традыцыямі свайго народа

Асноўнымі рысамі беларуса спрадвечна лічацца працавітасць, добразычлівасць і павага да іншых, гасціннасць. Створаныя і апрабаваныя на працягу многіх стагоддзяў этнапедагагічныя сродкі выхавання былі накіраваны на выпрацоўку вышэйзгаданых рыс. Адной з мэт апытальніка з'яўляецца выяўленне ведаў пра этнапедагагічныя сродкі і ступені авалодання імі.

Варта адзначыць, што пераважная большасць студэнтаў, якія прымалі ўдзел у анкетаванні, пражывае ў горадзе або гарадскім пасёлку (83%) і толькі



Репозиторий ВГУ

17% – у сельскай мясцовасці. Гэта можа аказваць пэўны ўплыў на развіццё этнічнасці студэнтаў, паколькі гарадскі соцыум не зусім спрыяе яе развіццю па прычыне лакалізацыі і адасобленасці гарадскіх сем’яў, адсутнасці сродкаў развіцця этнічнасці, празмернай занятасці сучаснага пакалення гараджан. Дадзеную сацыяльна-культурную асаблівасць горада, па нашым меркаванні, можа значна паправіць гасцяванне ўнукаў падчас летніх вакацый у сваіх бабуль і дзядуль у сельскай мясцовасці. Таму мы спыталі студэнтаў, ці маюць яны бабуль і дзядуль, якія пражываюць у сельскай мясцовасці. Вынікі апытання паказалі, што ў 56% рэспандэнтаў ёсць бабулі і дзядулі, якія пражываюць у вёсцы, у 31% студэнтаў бабулі і дзядулі пражываюць у горадзе або гарадскім пасёлку, у 13% студэнтаў бабулі і дзядулі ўжо памерлі.

Лічаць працавітасць адной з неад’емных рыс свайго характару 24% будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, таму што любяць працаваць, часткова пагаджаюцца з гэтым 65% рэспандэнтаў, зазначаючы, што на любімую справу не заўсёды знаходзіцца час, адмоўна выказваюцца 11% студэнтаў.

Адносна навучання рамяству, якім валодаюць бабулі або дзядулі, 32% апытаных студэнтаў адзначылі вопыт валодання рамяством бабулі або дзядулі, 24% студэнтаў указалі, што толькі назіралі, як іх бабулі і дзядулі ствараюць вырабы сваімі рукамі, але ў дадзенай дзейнасці не ўдзельнічалі, 44% студэнтаў бабулі і дзядулі не вучылі рамяству. Наогул, 85% студэнтаў выхоўваліся сваімі бабулямі і дзядулямі праз сродкі вуснай народнай творчасці, 56% рэспандэнтаў выхоўваліся, назіраючы за рамяством, якім валодала старэйшае пакаленне, або калі вучыліся яму (малюнак 2.11).




Малюнак 2.11 – Наяўнасць у будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы вопыту валодання рамяством бабуль і дзядуль

Репозиторий ВГУ

Адной з якасцей беларусаў спрадвечна лічыцца добразычлівасць не толькі ў адносінах да блізкіх людзей і пажылых, а і да ўсіх без выключэння. Вынікі апытання паказалі, што заўсёды праяўляюць добразычлівасць у адносінах да людзей, што побач, 56% рэспандэнтаў, адказваюць добразычлівасцю толькі на станоўчыя да сябе адносіны 39% студэнтаў, 5% студэнтаў зазначылі, што не валодаюць дадзенай якасцю. Падчас атрымання прафесійных ведаў у сценах ВНУ студэнты спецыяльнасцей “Сацыяльная педагогіка” і “Сацыяльная работа” вывучаюць курс “Этнапедагогіка”, які дае тэарэтычныя веды і практычнае ўяўленне пра народна-педагагічныя сродкі і метады выхавання і іх практычнае выкарыстанне. У выніку апытання намі было вызначана, што ведаюць народна-педагагічныя сродкі і метады 37% будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, ведаюць часткова – 56% студэнтаў, не ведаюць – 7% рэспандэнтаў, гэта значыць, што пэўныя ўяўленні аб выхаваўчым патэнцыяле этнапедагогікі мае пераважная большасць апытаных студэнтаў (малюнак 2.12).




Малюнак 2.12 – Наяўнасць у будучых спецыялістаў ведаў народна-педагагічных сродкаў і метадаў выхавання

Адносна такой характарыстыкі этнічнасці, як веданне народна-педагагічных сродкаў і ступень авалодання імі, вынікі даследавання наступныя: 20% рэспандэнтаў маюць высокі ўзровень; 64% – сярэдні; 16% – нізкі.

Значыць, параўнальна-супастаўляльны аналіз вынікаў дыягнаставання этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў кантэксце асноўных характарыстык паказвае, што найбольш яскрава на высокім узроўні (трэць апытаных студэнтаў) праявілася характарыстыка, звязаная з успрыняццем сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы або народа, а найменш выразна (пятая частка апытаных студэнтаў) характарыстыка, звязаная з веданнем этнапедагагічных сродкаў выхавання і са ступенню авалодання імі. Большасць будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, якія ўдзельнічалі ў апытанні, выявілі сярэдні ўзровень наяўнасці характарыстык уласнай этнічнасці (малюнак 2.13).

Репозиторий ВГУ




Малюнак 2.13 – Вынікі дыягнаставання этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў кантэксце асноўных характарыстык

У абагульненым выглядзе вынікі дыягнаставанняўзроўнюэтнічнасці студэнтаў, што навучаюцца па спецыяльнасцях “Сацыяльная педагогіка” і “Сацыяльная работа”, наступныя: нізкі ўзровень этнічнасці назіраецца ў 9% рэспандэнтаў (6% – у будучых сацыяльных педагогаў, 3% – у будучых спецыялістаў па сацыяльнай рабоце), сярэдні – у 62% (па 31% адпаведна), высокі – у 30% рэспандэнтаў (19% – у будучых сацыяльных педагогаў, 11% – у будучых спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) (малюнак 2.14).




Малюнак 2.14 – Вынікі дыягнаставання этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, якія навучаюцца па спецыяльнасцях “Сацыяльная педагогіка” і “Сацыяльная работа”

Адносіны будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да базавых этнапедагагічных каштоўнасцей як аднаго з кампанентаў паспяховага сацыяльнага ўзаемадзеяння выступаюць як мэта нашай дыягностыкі.

Асоба любога чалавека прадстаўляе сабой сукупнасць тых сацыяльных якасцей, якія сфарміраваліся і развіваліся ў пэўным сацыяльным асяроддзі пры міжасабовым узаемадзеянні. Вопыт міжасабовага ўзаемадзеяння "складваецца спачатку ва ўмовах мікрасоцыуму асобы, да якога адносяцца члены сям'і, сваякі, а затым шліфуецца, дзякуючы сацыяльнаму ўзаемадзеянню з іншымі людзьмі – сябрамі, знаёмымі, спецыялістамі розных сфер" [42, с. 314]. Безумоўна, сацыяльнае ўзаемадзеянне, пад якім мы разумеем ўстойлівую сістэму ўзаемаабумоўленых сацыяльных дзеянняў, звязаных цыклічнай прычыннай залежнасцю, пры якой дзеянні аднаго суб'екта – актара – з'яўляюцца адначасова прычынай або вынікам дзеянняў у адказ другіх суб'ектаў – рэцыпіентаў, а дакладней сказаць, вопыт сацыяльнага ўзаемадзеяння, аказвае ўплыў на фарміраванне стылю паводзін, на жыццядзейнасць асобы, а таксама на выбар ёю напрамку прафесійнай дзейнасці.

Часцей за ўсё асобы з паспяховым вопытам сацыяльнага ўзаемадзеяння выбіраюць сярод магчымых прафесіі, звязаныя з сацыяльнай сферай, паколькі прафесійная дзейнасць спецыялістаў сацыяльнай сферы непасрэдна звязана з аказаннем сацыяльна значных паслуг, кліентурнай дзейнасцю, а значыць, з пастаяннай камунікацыяй, кантактаваннем з прадстаўнікамі розных дэмаграфічных, сацыяльных, сацыяльна-эканамічных груп. Кліентамі спецыялістаў сацыяльнай сферы могуць быць прадстаўнікі розных этнічных груп не толькі з ліку грамадзян, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі або маюць від на жыхарства, але і бежанцаў або вымушаных перасяленцаў.

Асаблівасць пабудовы сацыяльнага ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі іншых этнічных груп у многім звязана з этнапедагагічнымі каштоўнасцямі пэўных этнічных груп, адносіны да якіх фарміраваліся на працягу шэрага стагоддзяў у міжпакаленным узаемадзеянні і прывіваліся асобе ва ўмовах мікрасоцыуму. Аб'ектыўна існуюць этнапедагагічныя каштоўнасці, актуальныя для любога народа, этнасу або этнічнай групы. У прыватнасці, да іх ліку адносяцца працавітасць, любоў да Радзімы, дабрыня і спагада, чэснасць і праўдзівасць, гасціннасць, павага да роднай мовы, гонар за сваю сям'ю, павага да продкаў і шанаванне свайго роду, значнасць меркавання прадстаўнікоў сацыяльнага асяроддзя асобы. Характар адносін спецыялістаў сацыяльнай сферы да згаданых этнапедагагічных каштоўнасцей і ступень абапірання на іх у прафесійнай дзейнасці, на наш погляд, будуць істотна абумоўліваць паспяховасць сацыяльнага ўзаемадзеяння з кліентамі.

З мэтай вывучэння характару адносін будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да этнапедагагічных каштоўнасцей намі быў

Репозиторий ВГУ

распрацаваны аўтарскі дыягнастычны інструментарый і арганізавана даследаванне сярод студэнтаў факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава з першага па выпускны курс, якія навучаюцца вочна па спецыяльнасцях “Сацыяльная педагогіка” і “Сацыяльная работа”, у колькасці 112 чалавек. Падчас даследавання студэнты самастойна вызначалі ў балах (па пяцібальнай шкале) адносіны да кожнага з 20-ці выказванняў, якія звязаны з базавымі этнапедагагічнымі каштоўнасцямі, у трох накірунках: наколькі гэта характэрна для іх; наколькі ўласціва іх сацыяльнаму акружэнню; наколькі неабходным стане для будучых пакаленняў. Дыягностыка адпавядае асноўным патрабаванням, носіць ананімны і канфідэнцыяльны характар. Варта адзначыць, што асаблівасць вынікаў вышэйзгаданай дыягностыкі з дадзенымі студэнтамі звязана з наяўнасцю ў плане іх прафесійнай падрыхтоўкі дысцыпліны “Этнапедагогіка” з шэрага дысцыплін ВНУ.

Этнапедагагічная каштоўнасць “гонар за сваю сям’ю” з’яўляецца адной з самых высока ацэньваемых студэнтамі – у сярэднім 4,4 бала: самыя высокія паказчыкі ў першага і выпускнога курсаў – па 4,6 бала; затым у другога і трэцяга курсаў – па 4,3 і 4,2 бала адпаведна. Гонар за сваю сям’ю, павагу да сваіх бацькоў і дзядоў і імкненне падтрымліваць яе аўтарытэт сваімі ўчынкамі як амаль заўсёды характэрныя для сябе і амаль ва ўсіх выпадках неабходныя для будучых пакаленняў дэманструюць будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы – па 4,8 бала, аднак у меншай ступені сустракаемыя ў іх сацыяльным асяроддзі – у сярэднім 3,8 бала (малюнак 2.15).




Малюнак 2.15 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “гонар за сваю сям’ю”

Рэпазіторый ВГУ

Адносіны да этнапедагагічнай каштоўнасці "гасціннасць" будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы выражаюцьяк даволі пазітыўныя – у сярэднім 4,1 бала: выпускнікі – 4,2 бала, студэнты трэцяга курса – 4 бала, першакурснікі і другакурснікі – па 4,1 бала. Гасціннасць як уласцівую амаль ва ўсіх выпадках ім якасць падкрэсліваюць рэспандэнты – 4,5 бала, мяркуюць пра яе як амаль заўсёды неабходную будучым пакаленням – 4,6 бала, аднак паказваюць, што ў іх соцыуме дадзеная этнапедагагічная каштоўнасць праяўляецца час ад часу – 3,4 бала (малюнак 2.16).




Малюнак 2.16 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці "гасціннасць"

Да этнапедагагічнай каштоўнасці "працавітасць" будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы адносяцца даволі прыязна (ацанілі ў сярэднім у 4 балы), паколькі прывучаны да яе бацькамі і бачаць у стваральнай працы магчымасці для самарэалізацыі: сярэдні бал выпускнікоў – 4,4 – з'яўляецца самым высокім; студэнты першага і трэцяга курса ацанілі ў 4 бала; а другакурснікі – у 3,7 бала. У цэлым рэспандэнты ўказалі, што працавітасць характэрна для іх, ацаніўшы яе ў 4,4 бала, будзе амаль заўсёды неабходна будучым пакаленням (сярэдняя ацэнка – 4,5 бала), але толькі час ад часу характэрна для іх цяперашняга сацыяльнага акружэння (у сярэднім – 3,5 бала) (малюнак 2.17).

Да этнапедагагічнай каштоўнасці "дабрыня і спагада" будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы ставяцца амаль прыязна, паколькі дэманструюць станоўчыя адносіны да іншых людзей і гатоўнасць прыйсці



Репозиторий ВГУ

ім на дапамогу, ацаніўшы адносіны да яе ў сярэднім у 3,9 бала: выпускнікі (хутчэй за ўсё таму, што сфарміравалі важнейшыя прафесійныя кампетэнцыі ў большай ступені, чым прадстаўнікі малодшых курсаў) указалі, што дадзеная каштоўнасць амаль заўсёды характэрна ім – 4,1 бала; першакурснікі, якія свядома выбіралі будучую прафесійную дзейнасць, таксама салідарныя са студэнтамі выпускнога курса – 4 балы; для студэнтаў другога і трэцяга курсаў дадзеная каштоўнасць характэрна крыху ў меншай ступені, чым амаль заўсёды, – сярэдні бал склаў 3,8 і 3,9 адпаведна. У цэлым рэспандэнты ацанілі дабрыню і спагаду як рысу ўласнага характару ў 4,4 бала, прадставілі як практычна заўсёды неабходную для будучых пакаленняў – 4,5 бала, але калі-нікалі характэрную для іх сацыяльнага акружэння – 3 балы (малюнак 2.18).




Малюнак 2.17 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “працавітасць”




Малюнак 2.18 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “дабрыня і спагада”

Рэпазіторый ВДУ

Чэснасць і праўдзівасць як этнапедагагічную каштоўнасць будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы ацанілі ў сярэднім у 3,8 бала, што паказвае няўстойлівыя да яе адносіны: у большай ступені, чым прадстаўнікі іншых курсаў, прыязныя адносіны да дадзенай этнакаштоўнасці дэманструюць выпускнікі – 4 балы, затым – першакурснікі (3,9 бала), студэнты другога і трэцяга курсаў паказваюць няўстойлівыя адносіны да чэснасці і праўдзівасці – па 3,6 і 3,7 бала адпаведна. У цэлым рэспандэнты ацэньваюць дадзеныя якасці як амаль поўнасцю характэрныя для іх і аддаюць перавагу праўдзе – у сярэднім 4,3 бала, як амаль заўсёды неабходныя будучым пакаленням – 4,5 бала, але як далёка не заўсёды сустракаемыя ў іх сацыяльным акружэнні – 2,8 бала (малюнак 2.19).




Малюнак 2.19 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “чэснасць і праўдзівасць”

Любоў да Радзімы (у тым ліку і да малой радзімы) была ацэнена будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы ў сярэднім у 3,7 бала, што паказвае іх пераменлівыя адносіны да этнакаштоўнасці: сярэдні бал першакурснікаў – 4 – з’яўляецца самым высокім; студэнты трэцяга і чацвёртага курсаў ацанілі ў 3,6 бала; а другакурснікі – у 3,8 бала. Аднак у адносінах да сябе рэспандэнты ўказалі, паставіўшы ў сярэднім 4 балы, што любоў да Радзімы амаль заўсёды характэрна ім, што яна будзе амаль заўсёды неабходна будучым пакаленням (сярэдняя ацэнка – 4 балы), аднак іх сацыяльнае асяроддзе калі-нікалі выражае любоў да Радзімы і прыязна адносіцца да бацькоўскага дому (сярэдняя ацэнка – 3,3 бала) (малюнак 2.20).

Этнапедагагічная каштоўнасць “павага да продкаў і шанаванне свайго роду” час ад часу характэрна для будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, паколькі ацэнена ў сярэднім у 3,6 бала: амаль заўсёды характэрная для студэнтаў выпускнога курса – 4,1 бала; крыху ў меншай ступені для першакурснікаў – 3,9 бала; калі-нікалі характэрная для студэнтаў



Рэпазіторый ВДУ

другога і трэцяга курсаў – па 3,6 і 3,7 бала. Шанаванне сямейных традыцый, дэманстраванне цікавасці да звычаяў і традыцый свайго народа, а таксама гатоўнасць перадаваць сямейныя традыцыі сваім дзецям як якасць амаль заўсёды характэрную для студэнтаў, як практычна заўсёды неабходную будучым пакаленням дэманструюць будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы – у сярэднім 4,1 і 4,3 бала адпаведна, аднак зазначаюць, што іх сацыяльнаму асяроддзю толькі час ад часу ўласціва дадзеная этнапедагагічная каштоўнасць – 3,1 бала (малюнак 2.21).




Малюнак 2.20 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “любоў да Радзімы”




Малюнак 2.21 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “павага да продкаў і шанаванне свайго роду”

Рэпазiторый ВГУ

Значнасць меркавання прадстаўнікоў сацыяльнага асяроддзя асобы як этнапедагагічная каштоўнасць час ад часу характэрна для рэспандэнтаў – у сярэднім ацэнена ў 3,4 бала: студэнты выпускнога курса паказалі, што для іх характэрна ўказаная этнапедагагічная каштоўнасць крыху радзей, чым амаль заўсёды, – 3,9 бала; для першакурснікаў часам характэрна, часам не характэрна – 3,6 бала; для студэнтаў другога і трэцяга курсаў характэрна яшчэ радзей, чым першакурснікаў, – па 3,3 бала. Будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы, як і іх сацыяльнае акружэнне, толькі час ад часу прытрымліваюцца заснаваных на даверы ўзаемаадносін у соцыуме, а таксама ацэньваюць грамадскае жыццё як больш значнае, чым асабістыя інтарэсы, – сярэдняя ацэнка ў 3,6 бала і 3 балы адпаведна, аднак паказваюць, што дадзеная этнапедагагічная каштоўнасць будзе амаль заўсёды неабходна будучым пакаленням – 4 балы (малюнак 2.22).




Малюнак 2.22 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “значнасць меркавання прадстаўнікоў сацыяльнага асяроддзя асобы”

Этнапедагагічная каштоўнасць “павага да роднай мовы” больш рэдка, чым калі-нікалі, характэрна для будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы – у сярэднім 2,9 бала: для выпускнікоў і першакурснікаў характэрна час ад часу (3,2 і 3,1 бала адпаведна); для студэнтаў другога і трэцяга курсаў характэрна дастаткова рэдка – па 2,7 і 2,8 бала адпаведна. Павага да роднай мовы як складнік нацыянальнага выхавання і як сродак паўсядзённай камунікацыі характэрна для саміх студэнтаў калі-нікалі – у сярэднім 3 балы, студэнты ацэнкамі не паказваюць неабходнасць захавання і дэманстрацыі для будучых пакаленняў павагі да роднай мовы – 3,7 бала. Даволі рэдка дадзеная этнакаштоўнасць праяўляецца ў сацыяльным асяроддзі студэнтаў (сярэдняя ацэнка 2,3 бала) (малюнак 2.23).

Рэпазіторый ВГУ




Малюнак 2.23 – Вынікі ацэнкі будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы этнапедагагічнай каштоўнасці “павага да роднай мовы”

Так, сярод этнапедагагічных каштоўнасцей найбольш прымальнымі для будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы з’яўляюцца “гонар за сваю сям’ю” (сярэдняя ацэнка 4,4 бала), “гасціннасць” (4,1 бала); “працавітасць” (4 бала). Дадзеныя этнапедагагічныя каштоўнасці, найбольш характэрныя для ментальнасці беларускага народа, звязаны з сямейным мікрасоцыумам студэнтаў, культывуюцца ў сем’ях і перадаюцца ў пакаленнях, акрамя таго, будучыя спецыялісты ў сілу спецыфікі сваёй прафесійнай дзейнасці даволі высока ацэньваюць патэнцыял і моц сям’і як мікрасацыяльнай, мікраэканамічнай ячэйкі сучаснага грамадства, што накладвае адбітак на іх асобасныя якасці. Аднак трэба адзначыць, што сацыяльнае акружэнне студэнтаў толькі час ад часу ацэньвае дадзеныя этнапедагагічныя каштоўнасці як значныя і неабходныя ў сучаснай жыццядзейнасці. На наш погляд, гэтыя вынікі могуць быць звязаны з высокай ацэнкай сучаснымі студэнтамі незалежнасці ад мікрасацыяльнага асяродку і пэўнай геаграфічнай адарванасцю іх ад сям’і бацькоў падчас навучання ў ВНУ. “Павагу да роднай мовы” будучыя спецыялісты ацэньваюць як даволі рэдка неабходную этнапедагагічную каштоўнасць (сярэдняя ацэнка 2,9 бала), паколькі яна нячаста актуалізуецца ў іх сацыяльным асяроддзі (2,3 бала). Па нашым меркаванні, дадзеныя вынікі звязаны з афіцыйным двухмоўем на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, таму ў пераважнай большасці сем’яў, дзе бацькі даволі слаба валодаюць роднай мовай, паколькі не маюць у сваёй жыццядзейнасці магчымасці ўжывання роднай мовы або саромеюцца гэтага ваўрбаністычным грамадстве, дзецям таксама “культывуюцца” адносіны да роднай мовы як патрэбнай толькі на занятках па роднай мове ва ўстановах адукацыі. У сваю чаргу дзеці – сучасныя

Рэпазіторый ВГУ

студэнты – фарміруюць устойлівы светапогляд, што і пакаленню іх дзяцей родная мова будзе патрэбна толькі час ад часу (3,7 бала). “Значнасць меркавання прадстаўнікоў сацыяльнага асяроддзя асобы” як этнапедагагічная каштоўнасць таксама ацэнена будучымі спецыялістамі як патрэбная час ад часу (3,4 бала). Варта адзначыць, што ў традыцыйнай педагогіцы беларусаў грамадская думка была няпісаным, але вельмі строгім зводам народных законаў, згодна з якім людзі арганізоўвалі ўласную жыццядзейнасць, карэкціравалі свае паводзіны, дзеянні і адносіны да рэчаіснасці ў тагачасным грамадстве, а таксама выхоўвалі ўласных дзяцей. У цяперашні час, калі адчуваецца пэўная сацыяльна-эканамічная стратыфікацыя насельніцтва і пануе моц капіталу і матэрыяльных каштоўнасцей, дадзеная этнапедагагічная каштоўнасць становіцца неактуальнай. Аднак спецыфіка будучай прафесійнай дзейнасці студэнтаў і вывучэнне дысцыпліны “Этнапедагогіка” вымагаюць ацэньваць дадзеную этнапедагагічную каштоўнасць як амаль заўсёды неабходную будучым пакаленням (сярэдняя ацэнка – 4 балы). Астатнія этнапедагагічныя каштоўнасці (дабрыня і спагада, чэснасць і праўдзівасць, любоў да Радзімы, павага да продкаў і шанаванне свайго роду) ацэнены будучымі спецыялістамі сацыяльнай сферы як неабходныя крыху часцей, чым час ад часу, гэта значыць, што ацэнкі вагаюцца ад 3,9 да 3,6 бала.

Намі з мэтай агульнай ацэнкі наяўнасці базавых этнапедагагічных каштоўнасцей у жыццядзейнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы і апоры на іх у будучай прафесійнай дзейнасці і сямейным выхаванні былі распрацаваны і разлічаны тры ўзроўні: высокі (33–45 балаў); сярэдні (21–32 балы); нізкі (9–20 балаў). Абапіраючыся на выстаўленыя самімі студэнтамі ацэнкі этнапедагагічных каштоўнасцей, мы падлічылі іх суму і суаднеслі з узроўнямі. Вынікі агульнай ацэнкі сярод будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы аказаліся наступныя:

–высокі ўзровень – рэспандэнты добра ведаюць змест этнапедагагічных каштоўнасцей, арганізуюць свае паводзіны і жыццядзейнасць згодна з імі, выражаюць гатоўнасць абапірацца на іх у прафесійнай дзейнасці і культываваць у сямейным выхаванні – характэрныя 79-ці студэнтам са 112-ці, што складае 70%. З іх усе студэнты выпускнога курса (100%) паказалі высокі ўзровень пры ацэнцы наяўнасці базавых этнапедагагічных каштоўнасцей у жыццядзейнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы і апоры на іх у будучай прафесійнай дзейнасці і сямейным выхаванні, затым у рэйтынгу знаходзяцца першакурснікі – 79%, студэнты трэцяга курса – 68%, другакурснікі – 59% студэнтаў;

–сярэдні ўзровень – рэспандэнты ведаюць змест толькі тых этнапедагагічных каштоўнасцей, якія актуальныя ў сем’ях іх бацькоў, арганізуюць, але не заўсёды, свае паводзіны і жыццядзейнасць згодна з імі, выражаюць гатоўнасць абапірацца толькі на асобныя



Рэпазіторый ВДУ

этнапедагагічныя каштоўнасці ў сваёй прафесійнай дзейнасці і культываваць іх у сямейным выхаванні – характэрны астатнім 33-м студэнтам, што складае 30% ад агульнай колькасці рэспандэнтаў, у склад якіх уваходзяць другакурснікі (41%), студэнты трэцяга курса (32%) і першакурснікі (21% студэнтаў);

–нізкі ўзровень – рэспандэнты не ведаюць зместу этнапедагагічных каштоўнасцей, і, адпаведна, не выражаюць імкнення арганізоўваць уласную жыццядзейнасць і прафесійную дзейнасць згодна з імі, а таксама не бачаць неабходнасці культываваць іх у сямейным выхаванні – не характэрны для студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў даследаванні.

Такім чынам, вынікі праведзенага даследавання паказалі, што значная большасць будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (70%) на высокім узроўні ведаюць змест этнапедагагічных каштоўнасцей, арганізуюць свае паводзіны і жыццядзейнасць згодна з імі, выражаюць гатоўнасць абапірацца на іх у прафесійнай дзейнасці і культываваць у сямейным выхаванні, астатнія рэспандэнты (30%) валодаюць ведамі пра этнапедагагічныя каштоўнасці і абапіраюцца на іх у жыццядзейнасці на сярэднім узроўні. На наш погляд, дадзены дастаткова добры агульны вынік звязаны не толькі са свядомым выбарам студэнтамі сваёй будучай прафесіі, але і з вынікамі вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці на факультэце (студэнты, якія вучацца па спецыяльнасцях “Сацыяльная работа” і “Сацыяльная педагогіка”, актыўна ўдзельнічаюць у дабрачынных акцыях міласэрнасці, ладзяць канцэрты і святы для дзетак з дзіцячага дома, спецыяльнага сада, для пажылых людзей, якія з’яўляюцца кліентамі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, уваходзяць у склад створанага на факультэце актыўнага і ініцыятыўнага валанцёрскага клуба “Свет”). Акрамя таго, шэраг этнапедагагічных каштоўнасцей быў знаёмы студэнтам яшчэ да залічэння ў ВНУ, паколькі з’яўляўся асновай сямейнага выхавання іх бацькоў і часткай сямейных традыцый, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне, а ў сценах Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта будучыя спецыялісты атрымалі праз вывучэнне дысцыпліны “Этнапедагогіка” веды аб саміх каштоўнасцях, іх змесце і выхаваўчым патэнцыяле і ўсвядомілі метадычныя асновы іх культывавання ў сямейным выхаванні і прафесійнай дзейнасці.

## 2.2. Навукова абгрунтаваная мадэль этнапедагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным соцыуме

Неабходным пры ажыццяўленні навукова-педагагічнага мадэлявання з’яўляецца выхад на пэўныя дыягнастычныя параметры.



Репозиторий ВГУ

Зыходзячы з аналізу існуючых азначэнняў, мы разумеем дыягностыку як распазнаванне стану аб'екта шляхам канкрэтных, хуткіх рэгістрацый яго істотных параметраў з наступнымі суадносінамі дадзенага аб'екта да пэўнай дыягнастычнай катэгорыі з мэтай прагнозу паводзін аб'екта і прыняцця канкрэтных мер уздзеяння на гэтыя паводзіны даследчыкам. Да асноўных функцый дыягнаставання варта аднесці наступныя:

– канстатуючая (атрыманне інфармацыі аб узроўні прафесійнай гатоўнасці студэнтаў: кампетэнтнаснай, камунікатыўнай, псіхалагічнай, этнапедагагічнай);

– прагнастычная (вызначэнне патэнцыяльных прафесійных магчымасцей і цяжкасцей кожнага са студэнтаў-выпускнікоў у сувязі з іх прафесійным станаўленнем);

– ацэначная (нагляднае прадстаўленне выніковасці педагагічнага працэсу, выкарыстання розных метадаў і сродкаў педагагічнай дзейнасці, узаемадзеяння студэнта ва ўмовах макра- і мікрасоцыуму).

Выніковасць дыягнаставання знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад дакладнасці і абгрунтаванасці абраных параметраў, а таксама ад наяўнасці якасных паказчыкаў (валіднасць, дакладнасць, надзейнасць, рэпрэзентатыўнасць).

Параметры дыягнаставання будуць непасрэдна звязаны са спецыфікай дзейнасці рэспандэнтаў, сярод якіх і будзе арганізавана даследаванне. Нашымі рэспандэнтамі з'яўляюцца студэнты – будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы, якія ў сценах ВНУ атрымліваюць асновы прафесійнай кампетэнтнасці як сукупнасці ведаў і ўменняў, што вызначаюць выніковасць працы; як аб'ёму навыкаў выканання задачы; як камбінацыі асобасных якасцей і ўласцівасцей; як комплексу ведаў і прафесійна значных якасцей асобы; як вектара прафесіяналізацыі; як адзінства тэарэтычнай і практычнай гатоўнасці да працы; як здольнасці ажыццяўляць міжкультурную камунікацыю ў адпаведнасці са спецыфікай прафесійнай дзейнасці.

Аднак, нягледзячы на відавочныя дасягненні ў дадзенай сферы, у вырашэнні праблемы дыягнаставання маецца шэраг аб'ектыўных супярэчнасцей:

– паміж новымі патрабаваннямі да маладога спецыяліста як актыўнага і ініцыятыўнага ўдзельніка вытворчага працэсу, таго, хто ўмее працаваць у камандзе, і традыцыйнымі падыходамі да прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста;

– паміж актуальнасцю праблемы ацэнкі якасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў і яе недастатковай навуковай і метадычнай распрацаванасцю;

– паміж неабходнасцю цэласнай ацэнкі ўзроўню падрыхтаванасці да прафесійнай дзейнасці будучага спецыяліста сацыяльнай сферы і адсутнасцю адпаведных дыягностык.

Репозиторий ВГУ

Менавіта таму ў нашым выпадку лагічна і навукова абгрунтаваным будзе выхад на наступныя значныя параметры дыягнаставання ўзроўню падрыхтаванасці студэнта да будучай прафесійнай дзейнасці:

–прафесійная кампетэнтнасць – якадпаведнасць узроўню і зместу базавых кампетэнцый студэнта-выпускніка базавым кампетэнцыям спецыяліста па сацыяльнай рабоце;

–камунікатыўная кампетэнтнасць – як сукупнасць кампетэнцый, звязаных з працэсам зносін людзей, якія ўключаюць у сябе ўменне слухаць і разумець чалавека, усталёўваць з ім добрыя асабістыя і дзелавыя ўзаемаадносіны, аказваць на яго ўплыў;

–этнапедагагічная падрыхтаванасць – як адлюстраванне станоўчага этнасацыяльнага вопыту сям'і студэнта, яго ментальнасці, а таксама дастатковы ўзровень карысных у прафесіі этнапедагагічных ведаў для міжкультурных і міжэтнічных стасункаў.

Прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста па сацыяльнай рабоце як складанае інтэгратыўнае ўтварэнне ўключае шэраг кампанентаў: аксіялагічны, прадстаўлены агульначалавечымі каштоўнасцямі, якія абіраюцца, абмяркоўваюцца, крытычна ацэньваюцца і становяцца складнікамі духоўнага свету чалавека; культуралагічны, які адлюстроўвае разнастайныя культурныя сферы, у якіх адбываецца жыццядзейнасць чалавека (акадэмічная, аздараўленчая, крэатыўная); агульнакультурныя здольнасці, неабходныя ў прафесійнай дзейнасці; каштоўнасці і традыцыі нацыянальнай культуры і дзеянні па іх захаванні, адраджэнні, рэтрансляцыі; маральна-этычны, што разумеецца як станаўленне грамадзянскай пазіцыі і назапашванне вопыту: перажыванні і пражыванні эмацыянальна насычаных сітуацый; гуманных паводзін; арганізацыя акцый міласэрнасці; клопат пра блізкіх; памяркоўнасць да іншых людзей; адэкватная самаацэнка.

Камунікатыўная кампетэнтнасць як адзін з асноўных параметраў дыягнаставання разглядаецца ў кантэксце ацэнкі асноўных бакоў камунікацыі: абмену інфармацыяй, узаемадзеяння і ўзаемаразумення. Спецыяліст па сацыяльнай рабоце пастаянна вядзе зносіны з кліентамі: наведвальнікамі, прасіцелямі, заступнікамі, г.зн. адной з самых галоўных асаблівасцей прафесійнай дзейнасці спецыяліста з'яўляецца кліентурная дзейнасць. Крызісная сітуацыя кліента, з якой мае справу спецыяліст, абумоўлівае пэўную ступень напружанасці ў зносінах з кліентам, што прад'яўляе строгія патрабаванні да камунікатыўных навыкаў спецыяліста, якія можна аб'яднаць паняццем “камунікатыўная кампетэнтнасць”. Ад ступені развіцця дадзенай якасці шмат у чым будзе залежаць эфектыўнасць узаемадзеяння з кліентам.

Этнапедагагічная падрыхтаванасць студэнта-выпускніка да будучай прафесіі як адзін з параметраў дыягнаставання з'яўляецца інтэгратыўным

Рэпазіторый ВДУ

утварэннем, якое, па-першае, падкрэслівае грамадскую, этнасацыяльную прыналежнасць студэнта да пэўнага народа, народнасці або нацыі (ментальнасць студэнта), па-другое, паказвае актыўны ўплыў на асяроддзе студэнта, уклад жыцця, на якасныя характарыстыкі яго як будучага спецыяліста (этнасацыяльны вопыт сям'і і асяроддзя студэнта, яго самога), па-трэцяе, падразумявае наяўнасць рэштакавага ўзроўню этнапедагагічных ведаў, значных у будучай прафесійнай дзейнасці.

Прадстаўленыя параметры дыягнаставання (прафесійна-педагагічная кампетэнтнасць, камунікатыўная кампетэнтнасць, этнапедагагічная падрыхтаванасць) і іх змест могуць з'явіцца асновай для стварэння і апрабацыі адпаведнай дыягностыкі, здольнай не толькі правесці комплексную ацэнку ўзроўню падрыхтаванасці выпускніка ВНУ да будучай прафесійнай дзейнасці, але і намеціць шляхі самаўдасканалення будучым спецыялістам асобасных і прафесійных якасцей, якія маюць патрэбу ў развіцці і давядзенні да аптымальнага ўзроўню. Вынікам далейшага даследавання заяўленай праблемы могуць стаць навукова абгрунтаваная і метадычна падмацаваная мадэль рэалізацыі індывідуальнай траекторыі станаўлення будучага спецыяліста ў полікультурным асяроддзі ВНУ ва ўмовах беларуска-рускага памежжа; праграма павышэння псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці асоб, якія дэманструюць гатоўнасць да ўзаемадзеяння ў прафесійнай міжкультурнай прасторы; методыка выяўлення прафесіянальных магчымасцей будучага спецыяліста сацыяльнай сферы з пункту гледжання этна-псіхолага-педагагічнага аспекту і прынцыпу полікультурнасці; методыка дыягнаставання ўзроўню падрыхтаванасці студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці ў полікультурным асяроддзі; навуковае і метадычнае забеспячэнне рэалізацыі індывідуальнай траекторыі прафесійнага станаўлення будучага спецыяліста ў полікультурным асяроддзі ВНУ з улікам рэгіянальнай спецыфікі.

Усё вышэйзгаданае абумоўлівае пераўтварэнне сацыяльнага асяроддзя, характэрнай асаблівасцю якога з'яўляецца поліэтнічнасць. Так, прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста сацыяльнай сферы павінна арганічна спалучацца з этнакультурнай кампетэнтнасцю як уласцівасцю асобы, якая выражаецца ў наяўнасці сукупнасці аб'ектыўных уяўленняў і ведаў пра пэўную культуру і рэалізуецца праз кампетэнцыі (прафесійныя і сацыяльна-асобасныя), а таксама мадэлі паводзін, адпаведныя міжэтнічнаму ўзаемаразуменню і ўзаемадзеянню.

Сучасныя пераўтварэнні ў сусветнай прасторы карэнным чынам змянілі структуру еўрапейскага грамадства ў накірунку яго дэмакратызацыі, этнічнай талерантнасці і полікультурнасці. Вынікі дадзеных пераўтварэнняў закранулі таксама і сацыяльную прастору Рэспублікі Беларусь. Гэтыя абставіны прывялі да неабходнасці актывізацыі

Рэпазіторый ВДУ

нацыянальнай самасвядомасці прадстаўнікоў этнічных груп, народаў у новых сацыяльна-культурных умовах, вызначылі мэтазгоднасць і патрэбу ў распрацоўцы сістэмы каштоўнасцей, сэнсу і прызначэння полікультурнай адукацыі.

Ва ўмовах полікультурнай прасторы і сучаснага стану сацыяльна-культурнай, сацыяльна-педагагічнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, што характарызуюцца сацыяльнай ізаляцыяй, маргіналізаванасцю і недастатковай адаптаванасцю пэўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва да новых сацыяльна-культурных каштоўнасцей, узнікае вострая патрэба падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы, здольных не толькі прафесійна вырашаць многія сацыяльныя праблемы прадстаўнікоў розных этнічных груп і народаў, але і паспяхова камунікаваць і знаходзіць агульную мову з імі.

Сучасная сацыяльная прастора Рэспублікі Беларусь і яе рэгіёнаў уяўляе сабой адмысловы полікультурны соцыум, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі розных этнічных груп і народаў, этналінгвістычных, этнасацыяльных і канфесійных супольнасцей, гарадской і сельскай субкультур, розных сацыяльна-эканамічных слаёў насельніцтва.

Паняцце "соцыум", паводле "Сацыялагічнага энцыклапедычнага слоўніка", – гэта "ўстойлівая сацыяльная супольнасць, што характарызуецца адзінствам умоў жыццядзейнасці людзей у пэўных істотных адносінах і ў адпаведнасці з гэтым адзінствам культуры" [139, с. 336]. Магчымым з'яўляецца прадстаўленне соцыуму як сацыяльна-тэрытарыяльнай супольнасці, што характарызуецца сукупнасцю сацыяльных, эканамічных, палітычных сувязей, узаемаадносін паміж людзьмі, а таксама выступае ў якасці самастойнай арганізацыі жыццядзейнасці. Паняцце "полікультурны соцыум" разглядаецца намі як пэўная геаграфічна вызначаная сацыяльная прастора, у якой супольна пражываюць і ажыццяўляюць камунікацыю прадстаўнікі рознай этналінгвістычнай, рэлігійнай і сацыяльна-эканамічнай прыналежнасці. Мы звяртаем увагу на той факт, што ва ўмовах полікультурнага соцыуму зносіны паміж людзьмі як носьбітамі этнакультурных звычаяў і традыцый адбываюцца, перш за ўсё, на аснове дыялогу культур – сукупнасці непасрэдных адносін, сувязей, што складваюцца паміж прадстаўнікамі розных культур на асобасным і этнічным узроўнях. Асобасны ўзровень дыялогу культур звязаны з фарміраваннем або трансфармацыяй асобы пад уздзеяннем "знешніх" у адносінах да яго звыклага культурнага асяроддзя, культурных традыцый. Этнічны ўзровень дыялогу культур характарызуецца зносінамі паміж рознымі лакальнымі сацыяльнымі супольнасцямі пэўнага полікультурнага соцыуму.

Культурная разнастайнасць сучаснай нацыі павялічваецца, і народы, этнічныя групы, што ў яе ўваходзяць, імкнуцца знайсці і выкарыстоўваць прававыя, палітычныя, этнапедагагічныя сродкі для захавання і развіцця ўласнай цэласнасці і культурнай унікальнасці, бо кожны народ, кожная з этнічных груп вызначаецца пэўнымі спецыфічнымі характарыстыкамі, асаблівай самасвядомасцю. Таму для паспяховага функцыянавання ва ўмовах полікультурнага асяроддзя неабходнай умовай з'яўляецца спазнанне яго этнакультурнага складу і спецыфікі для эфектыўных зносін у межах дыялогу культур, а ў нашым выпадку і эфектыўнай прафесійнай дзейнасці спецыялістаў сацыяльнай сферы.

Так, этнапедагагічнае мадэляванне прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў падразумявае не толькі ўлік спецыфічнага адукацыйнага кантынуума пэўнай вышэйшай навучальнай установы, але і полікультурнай прасторы, арыентаванай на супрацоўніцтва розных культур, іх дыялог, развіццё талерантнасці, асабістай ініцыятывы і добразычлівасці ва ўзаемаадносінах.

Ментальнасць беларусаў прадугледжвае талерантныя адносіны да іншых народаў і культур, дэманструе павагу да нацыянальных, рэлігійных, культурных асаблівасцей прадстаўнікоў розных дыяспар. Усё гэта абумоўлівае пераўтварэнне сацыяльнага асяроддзя, характэрнай асаблівасцю якогаз'яўляецца поліэтнічнасць. Так, прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста сацыяльнай сферы павінна арганічна спалучацца з этнакультурнай кампетэнтнасцю як уласцівасцю асобы, што выяўляецца ў наяўнасці сукупнасці аб'ектыўных уяўленняў і ведаў аб пэўнай культуры і рэалізуецца праз кампетэнцыі (прафесійныя і сацыяльна-асобасныя), а таксама мадэлі паводзінаў, адпаведнайміжэтнічнаму ўзаемаразуменню і ўзаемадзеянню.

Таму неабходным ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы будзе стварэнне арганізацыйна-педагагічных умоў, якія паспрыяюць развіццю прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы для работы ў полікультурнымсоцыуме:

1) фарміраванне змястоўна-інфармацыйнага забеспячэння індывідуалізацыі прафесійнага станаўлення будучага спецыяліста з улікам яго ментальнасці (прыналежнасці да пэўнай нацыянальнасці, народнасці або этнічнай групы) і этнарэгіянальных асаблівасцей (улік памежжа, спецыфікі нацыянальнасцей і этнічных груп, прадстаўнікі якіх пражываюць на дадзенай тэрыторыі), з улікам прынцыпу полікультурнасці (уменне падпарадкоўвацца пад ментальныя асаблівасці спажыўцоў паслуг), сацыяльнага заказу і патрабаванняў стандарту ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльнай сферы, асаблівасцей інфармацыйнага і тэхналагічнага развіцця адукацыйнага асяроддзя;


Рэпазіторый ВДУ

2) улік канкрэтна-гістарычнай і сацыяльна-педагагічнай сітуацыі грамадскага развіцця рэгёна і магчымасцей яго сацыяльнага асяроддзя, нацыянальных, рэгіянальных і гістарычных асаблівасцяў ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці ў сацыяльнай сферы;

3) далучэнне студэнтаў да разнастайнай дзейнасці, якая прадугледжвае развіццё камунікатыўных навыкаў у полікультурным соцыуме, з мэтай фарміравання іх прафесійных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый;

4) забеспячэнне рэалізацыі індывідуальнага прафесійнага станаўлення будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў працэсе сацыяльна-культурнай і творчай дзейнасці, падчас навучальных і вытворчых практык, падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ з улікам іх ментальнасці, творчых і навуковых інтарэсаў;

5) аптымізацыя рэалізацыі прафесійнага станаўлення будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ў полікультурным асяроддзі ВНУ на ўзроўні распрацоўкі і рэалізацыі канцэпцый, рэгіянальных і міжнародных праграм і праектаў.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі агульнымі мэтамі падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы з’яўляюцца:

–фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай, практыка-арыентаванай кампетэнтнасці, што дазваляе спалучаць акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці;

–фарміраванне прафесійных кампетэнцый, што дазваляюць з улікам спецыфікі будучай прафесійнай дзейнасці эфектыўна вырашаць задачы арганізацыі сацыяльна-педагагічнай работы ва ўстановах адукацыі, сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ва ўстановах сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва [114].

Згодна з пастаўленымі мэтамі ў адукацыйным стандарце маюцца дакладныя патрабаванні да кампетэнцый будучага спецыяліста: акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных. Падчас фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці падразумяваюцца набыццё, развіццё і спалучэнне вышэйзгаданых кампетэнцый, што адбываецца падчас вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці, падчас праходжання студэнтам практык і ўдзелу ў мерапрыемствах, акцыях. Многія акадэмічныя і сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі на момант паступлення абітурыента ў ВНУ ужо сфарміраваны, таму прымальнай сітуацыяй будзе шліфаванне ўказаных кампетэнцый у студэнцкім асяроддзі, ва ўмовах гарадскога соцыуму (асабліва дадзеная акалічнасць датычыцца студэнтаў – ураджэнцаў сельскай мясцовасці), ва ўмовах полікультурнай студэнцкай супольнасці (рэаліі міжнароднай акадэмічнай мабільнасці).



Рэпазіторый ВДУ

Пры распрацоўцы этнапедагагічнай мадэлі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы для работы ў полікультурнымсоцыуме мы абапіраліся на кампетэнтнасны, аксіялагічны, пазіцыйны, дзейнасны, гуманітарны і асобасна арыентаваны падыходы.

Намі вызначаны структурна-функцыянальныя асновы этнапедагагічнай мадэлі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы для работы ў полікультурнымсоцыуме. Да структурных кампанентаў мы адносім мэту, змест, умовы, спосабы працэсу падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы да прафесійнай дзейнасці ва ўмовах ВНУ і сродкі рэалізацыі. Функцыянальнымі кампанентамі этнапедагагічнай мадэлі з'яўляюцца планаванне, арганізацыя, матывацыя, кантроль, камунікацыя. Апошнія кампаненты адлюстроўваюць педагагічны працэс у дзеянні, змене, з вызначэннем логікі яго развіцця.

Функцыянальныя блокі этнапедагагічнай мадэлі наступныя:

–прагнастычна-мэтавы – уключаеў сябе мэту (фарміраваць прафесійна-камунікатыўную і этнапедагагічную кампетэнтнасць у студэнтаў ВНУ – будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы), падыходы і прынцыпы;

–зместавы – адлюстроўвае структуру прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, аснову якой у кантэксце аксіялагічнага і гуманістычнага падыходаў складаюць тры сферы: спазнання, дзеяння і перажывання, што рэалізуюцца ў чатырох накірунках (да соцыуму, да групы, да іншай асобы, да сябе).

Фарміраванне ўсіх кампанентаў прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці ў будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, будучых педагогаў магчыма толькі ва ўзаемадзеянні.Адзінкамі работы выкладчыка і студэнта з'яўляюцца розныя сітуацыі ва ўсёй прадметнай і сацыяльнай неадназначнасці [25, с. 60–61].

У арганізацыйна-метадычны блок мадэлі ўваходзяць этапы фарміравання прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці ў студэнтаў–будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы, педагагічныя ўмовы і спосабы, што спрыяюць больш эфектыўнай арганізацыі працэсу фарміравання шэрага каштоўных у прафесійнай дзейнасці якасцей у студэнтаў ВНУ.

Прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасцю студэнт зможа авалодаць толькі ў тым выпадку, калі пройдзе праз адаптацыйны, стваральны, кантрольны, карэктавальны і замацавальна-выніковы этапы.

Репозиторий ВГУ

На адаптацыйным этапе адбываецца маніторынг прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці. Тут жа намячаюцца спосабы і метады, якія больш за ўсё падыходзяць па выніках дыягностыкі для арганізацыі прадуктыўнай работы ў канкрэтнай групе. Фарміравальны этап з'яўляецца самым асноўным, паколькі тут адбываецца фарміраванне якасці па выбраным шляху на адаптацыйным этапе. Кантрольны этап дазваляе ажыццявіць праверку, наколькі эфектыўна прайшло фарміраванне прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці ў студэнтаў. У выпадку нездавальняльных вынікаў фарміравання якасці будучыя спецыялісты сацыяльнай сферы праходзяць карэктавальны этап. Аднак карэктавальны этап па сутнасці з'яўляецца факультатыўным: калі якасць сфарміравана, студэнты пераходзяць на замацавальна-выніковы этап фарміравання прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці, дзе яно шліфуецца і набывае завершанасць.

Спецыяльная арганізацыя прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ствараецца пры дапамозе педагагічных умоў, якія даюць магчымасць эфектыўна фарміраваць ўказаную кампетэнтнасць у студэнтаў. Немагчыма абмежавацца толькі знешнімі або ўнутранымі ўмовамі. Такім чынам, на занятках са студэнтамі ў ВНУ неабходна арганізоўваць педагагічныя ўмовы, якія ўяўляюць сабой такую форму арганізацыі заняткаў у ВНУ, што пры ўмове ўліку асаблівасцей кожнага студэнта дазваляе ствараць пазітыўны мікраклімат унутры групы і дае магчымасць развіваць прафесійна-камунікатыўныя адносіны паміж настаўнікам і навучэнцамі.

Згодна з распрацоўкамі К.Ю. Паспеева, намі былі вылучаны педагагічныя ўмовы з наступным зместам: крэатыўнае асяроддзе; дыялагічнае ўзаемадзеянне суб'ектаў адукацыйнага працэсу; улік індывідуальна-псіхалагічных уласцівасцей асобы студэнтаў.

Зыходным палажэннем для вылучэння першай псіхолага-педагагічнай умовы – *крэатыўнага асяроддзя*, якое спрыяе пашырэнню камунікатыўна-паводзіннага рэпертуару, стымулюючага матывацыю дасягнення поспеху, – з'яўляюцца ідэі Я.П. Ільіна [50], А.М. Князевай [62].

Паняцце "крэатыўнасць" увёў у навуковы ўжытак амерыканскі даследчык Э.П. Торэнс. Ён разглядае крэатыўнасць у якасці здольнасці "да пэўнага стылю дзейнасці, з прычыны чаго атрымліваецца арыгінальны вынік, прадукт, які адпавядае патрабаванням канкрэтнай жыццёвай сітуацыі" [цыт. па: 146].

Асяроддзе можа быць у большай або меншай ступені спрыяльным для крэатыўнай дзейнасці, аднак лепшым варыянтам лічыцца асяроддзе, што мабілізуе, стымулюе сілы студэнта на дасягненне прафесійна значнага

выніку. У межах нашага даследавання крэатыўнае асяроддзе дае магчымасць фарміраваць упэўненыя паводзіны ў сітуацыі прафесійнай камунікацыі педагога і рэалізоўваць большую свабоду студэнтам у пошуку магчымых варыянтаў рашэння пастаўленых задач.

Другая ўмова – *дыялагічнае ўзаемадзеянне* суб’ектаў адукацыйнага працэсу – грунтуецца на ідэях М.М. Бахціна [цыт. па: 130], В.А. Кан-Каліка [56], А.А. Лявонцьева [78; 79; 80],Г.П. Шчадравіцкага [163].

У працах М.М. Бахціна ў якасці прадуктыўных ідэй лічыцца дыялог як стасункі ў своеасаблівым прадукце культуры. Для нас у разуменні М.М. Бахціным дыялогу значным з’яўляецца прадстаўленне пра “трэці сэнс”. У М.К. Мамардашвілі вялікую ролю для нас адыгрывае канцэпцыя саўдзельнасці ведаў, прасторы пераўтварэнняў, уяўленне пра зместавы характар камунікацыі. У Г.П. Шчадравіцкага мы запазычылі ідэю пра камунікатыўны характар сэнсу і зместу дзейнасці.

Камунікацыя праз дыялог у прафесійна-камунікатыўнай дзейнасці студэнтаў разглядаецца ў якасці ўмовы рэалізацыі суб’ект-суб’ектных адносін паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу [123, с. 87].

Эфектыўнасць трэцяй педагагічнай умовы – *уліку індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей асобы студэнта* – вызначалася на аснове даследаванняў А.А. Бодалева, Л.С. Выгоцкага, А.М. Лявонцьева. Фарміраванне і дынаміка прафесійна-камунікатыўных паводзін і этнапедагагічнай свядомасці студэнтаў ВНУ – будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы – залежыцьад такіх фактараў, як, з аднаго боку, адукацыя, светаадчуванне, з другога – ад індывідуальна-псіхалагічных уласцівасцей асобы. Усё гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў паводзінах студэнта.

Пры фарміраванні прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці неабходна ўлічваць такія якасці асобы студэнтаў, як наяўнасць пазнавальнай матывацыі, узровень камунікатыўных схільнасцей, агульны ўзровень таварыскасці, уменне слухаць у сітуацыі дыялогу, уважлівасць і чуллівасць у адносінах да іншых людзей, пэўны стыль узаемадзеяння.

Для рэалізацыі педагагічных умоў у межах разглядаемага намі выпадкутрэба выкарыстоўваць пэўныя тэхналогіі. Сучасным патрабаванням, што прад’яўляюцца да вышэйшай адукацыі, адпавядаюць гуманітарныя тэхналогіі.

Шырокае разуменне гуманітарных тэхналогій як “разнавіднасцей сацыяльных тэхналогій, заснаваных на практычным выкарыстанні ведаў пра чалавека з мэтай стварэння ўмоў для свабоднага і ўсебаковага развіцця асобы” [1, с. 139] прадстаўляе цікавасць у кантэксце нашай мадэлі.

Рэпазіторый ВГУ

Вышэйшая адукацыя, арыентуючыся на падрыхтоўку спецыяліста для прадуктыўнай жыццядзейнасці і прафесійнай дзейнасці ў грамадстве, нясе адказнасць перад студэнтамі за тое, наколькі паспяхова яны будуць падрыхтаваныя да будучай прафесіі. Згодна з меркаваннем вучоных універсітэта імя А.І. Герцэна, “важна фарміраваць праз адукацыю чалавека,што разумее, які дзякуючы дадзенай здольнасці паспяхова праходзіць працэс сацыялізацыі, прафесійнай адаптацыі як свабодная і творчая асоба” [22, с. 11].

Так, вынікам фарміраванняпрафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасці ў будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах ВНУ з’яўляецца станоўчая дынаміка ў руху ад элементарнага ўзроўню валодання прафесійна-камунікатыўнай і этнапедагагічнай кампетэнтнасцю да прафесійнага праз пераходны этап, што характарызуецца ў большай ступені колькаснымі паказчыкамі ў авалоданні кампетэнтнасцю, чым якаснымі.

Разглядаючы этнапедагагічную мадэль з функцыянальнага боку, варта зазначыць, што ў сценах ВНУ будучы спецыяліст сацыяльнай сферы атрымлівае асновы прафесійнай кампетэнтнасці як сукупнасці ведаў і ўменняў, якія вызначаюць выніковасць працы; як аб’ёму навыкаў выканання задачы; як камбінацыі асобасных якасцей і ўласцівасцей; як комплексу ведаў і прафесійна значных якасцей асобы; як вектара прафесіяналізацыі; як адзінства тэарэтычнай і практычнай гатоўнасці да працы; як здольнасці ажыццяўляць міжкультурную камунікацыю ў адпаведнасці са спецыфікай прафесійнай дзейнасці.

Прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста сацыяльнай сферы як складанае інтэгратыўнае ўтварэнне ўключае шэраг кампанентаў: аксіялагічны, прадстаўлены агульначалавечымі каштоўнасцямі, якія абіраюцца, абмяркоўваюцца, крытычна ацэньваюцца і становяцца складнікамі духоўнага свету чалавека; культуралагічны, які адлюстроўвае разнастайныя культурныя сферы, у якіх адбываецца жыццядзейнасць чалавека (акадэмічная, аздараўленчая, крэатыўная); агульнакультурныя здольнасці, неабходныя ў прафесійнай дзейнасці; каштоўнасці і традыцыі нацыянальнай культуры і дзеянні па іх захаванні, адраджэнні, рэтрансляцыі; маральна-этычны, што разумеецца як станаўленне грамадзянскай пазіцыі і назапашванне вопыту: перажыванні і пражыванні эмацыянальна насычаных сітуацый; гуманных паводзін; арганізацыя акцый міласэрнасці; клопат пра блізкіх; памяркоўнасць да іншых людзей; адэкватная самаацэнка.

Камунікатыўная кампетэнтнасць як адзін з асноўных параметраў прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльнай сферы разглядаецца намі ў кантэксце ацэнкі асноўных бакоў камунікацыі: абмену інфармацыяй, узаемадзеяння і ўзаемаразумення.

Репозиторий ВГУ

Спецыялiства ўстановах, падпарадкаваных Мiнiстэрству працы i сацыяльнай абароны насельнiцтва, пастаянна вядзе зносiны з клiентамi: наведвальнiкамi, прасiцелямi, заступнiкамi, г.зн. адной з самых галоўных асаблiвасцей прафесiйнай дзейнасцi спецыялiста з'яўляецца клiентурная дзейнасць. Крызiсная сiтуацыя клiента, з якой мае справу спецыялiст, абумоўлiвае пэўную ступень напружанасцi ў зносiнах з клiентам, што прад'яўляе строгiя патрабаваннi да камунiкатыўных навыкаў спецыялiста, якiя можна аб'яднаць паняццем "камунiкатыўная кампетэнтнасць". Ад ступенi развiцця дадзенай якасцi шмат у чым будзе залежаць эфектыўнасць узаемадзеяння з клiентам.

Спецыялiст устаноў адукацыi або сацыяльна-педагагiчных устаноў ажыццяўляе арганiзацыю i каардынацыю сацыяльна-педагагiчнай дапамогi, падтрымкi i суправаджэння дзяцей, якiм неабходна дзяржаўная абарона, арганiзуе i карэктуе ўзаемаадносiны ў адукацыйным працэсе ўстановы адукацыi i ў адкрытым соцыуме, актыўна кантактуючы з усiмi ўдзельнiкамi педагагiчнага працэсу – педагогамi, вучнямi, бацькамi/законнымi прадстаўнiкамi дзiцяцi.

Этнапедагагiчная падрыхтаванасць студэнта-выпускнiка да будучай прафесii з'яўляецца iнтэгратыўным утварэннем, якое, па-першае, падкрэслiвае грамадскую, этнасацыяльную прыналежнасць студэнта да пэўнага народа, народнасцi або нацыi (ментальнасць студэнта), па-другое, паказвае актыўны ўплыў на асяроддзе студэнта, уклад жыцця, на якасныя характарыстыкi яго як будучага спецыялiста сацыяльнай сферы (этнасацыяльны вопыт сям'i i асяроддзя студэнта, яго самога), па-трэцяе, падразумявае наяўнасць рэшткавага ўзроўню этнапедагагiчных ведаў, значных у будучай прафесiйнай дзейнасцi.

